# Маладзёвы рух паміж дзвюма войнамі (1921–1939 гг.)

## *(Главы з кнігі)*

Чэсць і слава табе, беларуская моладзь, паўстаючая з-пад беларускай саломеннай страхі. Ты сама сваімі рукамі адбудуеш сабе і сваім патомкам лепшую і святлейшую будучыню. На бок з дарогі, панове і гаспада з Захаду і Усходу! Беларуская моладзь ідзе!

*Янка Купала*

### Прадмова

*Моладзь заўсёды з'яўлялася самай дзейснай палітычнай і сацыяльнай сілай, галоўным чыннікам зменаў у грамадстве. Гістарычны досвед даказвае гэта. У ЗША ў канцы 1960-х — пачатку 1970-х гг. амерыканская моладзь склала аснову ўдзельнікаў масавых акцый за адмену расавай сегрэгацыі і расізму, супраць вайны ў В'етнаме. Гішпанскія студэнты сваімі масавымі акцыямі грамадскага непадпарадкавання дабіліся ў пачатку 1970-х гг. дэмантажу аўтарытарнага франкісцкага рэжыму і пазней не дазволілі путчыстам вярнуць краіну ў «новае сярэднявечча». Мірныя рэвалюцыі ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. супраць савецкай акупацыі і камуністычнага дыктату былі немагчымыя без масавага чыну моладзі. Тое ж самае можна было бачыць у пачатку XXI стагоддзя ў Грузіі, Украіне, Малдове. У безнадзейным супрацьстаянні з камуністычным рэжымам на пекінскай плошчы Цяньаньмэнь у чэрвені 1989 г. стаялі і гінулі кітайскія студэнты, якія самаахвярна дабіваліся дэмакратычных пераменаў у краіне. Не выключэнне і моладзь Беларусі, якая заўсёды была ў авангардзе руху за незалежнасць краіны, за сцвярджэнне дэмакратычнага ладу, за сацыяльныя пераўтварэнні ў грамадстве, за свабоднае развіццё роднай мовы і культуры.*

*Гісторыя беларускага маладзёвага руху налічвае ўжо амаль 200 гадоў. Ён зарадзіўся ва ўмовах расійскага панавання, з часу, калі пачалося фармаванне сучаснай беларускай нацыі, калі стварылася першая кагорта патрыятычна настроенай моладзі, здолеўшая асэнсаваць галоўныя патрэбы беларускага народа, вызначыць тыя заданні, што паставіў перад беларусамі Час, а таксама шляхі іх дасягнення.*

*Станаўленне і развіццё маладзёвага руху ў найноўшай айчыннай гісторыі мае шмат агульнага з гістарычнымі лёсамі іншых народаў, якія працяглы час не мелі сваёй дзяржаўнасці і былі паняволеныя г. зв. «гістарычнымі нацыямі». Раўналежна з украінскай, чэшскай, польскай паступовай моладдзю маладыя беларусы змагаліся ў першых шэрагах за сваю нацыянальную незалежнасць. Як і літоўцы, украінцы і латышы, яны актыўна супрацьстаялі дэнацыяналізацыі свайго народа, стваралі першыя адукацыйныя асяродкі на роднай мове выкладання, закладалі нацыянальныя бібліятэкі і чытальні, арганізоўвалі тэатральныя і харавыя гурткі, якія станавіліся важнейшымі чыннікамі грамадскай кансалідацыі і нацыянальнага ўсведамлення народных мас.*

*Разам з тым сітуацыя ў Беларусі, тыя вонкавыя і ўнутраныя варункі, у якіх прыходзілася дзейнічаць актывістам беларускага маладзёвага руху, істотна адрозніваліся ад сітуацыі ў суседзяў. Працэс крышталізацыі беларускай нацыі быў моцна запаволены шматлікімі войнамі і ваеннымі канфліктамі, з'яўленнем чарговых акупантаў, якія рушылі на беларускія землі то з усходу, то з захаду, прыносячы з сабой незлічоныя чалавечыя ахвяры, вялізныя матэрыяльныя разбурэнні і культурныя страты. Гэтаму перашкаджала мэтанакіраваная паланізацыя і русіфікацыя краю на працягу XVII–XX стагоддзяў. Суседнія пануючыя этнасы — расійцы і палякі — актыўна выкарыстоўвалі беларускі*

*этнаграфічны матэрыял для развіцця сваёй высокай культуры. Многія ўраджэнцы краю, беларусы паводле паходжання, выдатна праявілі сябе на расійскай ці польскай культурнай глебе: Адам Міцкевіч, Станіслаў Манюшка, Фёдар Дастаеўскі, Міхаіл Глінка, Мікалай Мікешын, Іосіф Казлоўскі, Іван Хруцкі... Гэты спіс можна доўжыць доўга. У неспрыяльных умовах беларускі народ не паспяваў аднавіць свой дэмаграфічны і інтэлектуальны патэнцыял, пaступова адстаючы ад суседзяў у палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці. Усё гэта негатыўным чынам адбівалася на нацыятворчых працэсах у краіне.*

*Беларускую этнаграфічную масу вызначала аморфнасць нацыянальнага самаўсведамлення, невысокі ўзровень этнічнай кансалідацыі, адносна нізкі адукацыйны ўзровень, неразвітая сацыяльная структура грамадства, дзе абсалютную большасць складалі сяляне і былі слаба прадстаўлены шляхецкі стан, гарадскі элемент і прадпрымальнікі. Усё XX стагоддзе працягваўся няўхільны працэс размывання беларускага этнасу, у першую чаргу пад уздзеяннем русіфікацыі. Пад уплывам дэнацыяналізуючай ролі мясцовага клеру каталіцкай і праваслаўнай цэркваў значнай перашкодай у згуртаванні беларускага народа станавіўся яго этнаканфесійны дуалізм — калі беларусы-каталікі ўспрымалі сябе «палякамі» (асабліва заможная шляхта), а праваслаўныя беларусы — расійцамі.*

*Усведамляючы сваю місію, маладыя актывісты з імпэтам браліся за нацыянальную працу ў змаганні за палітычныя, сацыяльныя і культурныя правы свайго народа. Шырачы беларускую асвету, тэатральную і музычную справу, яны імкнуліся дагрукацца да сэрцаў сваіх суайчыннікаў, абудзіць іх да кансалідаванай грамадскай працы. І народ паступова абуджаўся ад спячкі, пачынаў варушыцца, усведамляць свае нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы, змагацца за іх.*

*Дзеячы беларускага маладзёвага руху канца XIX — пачатку XX стагоддзяў фактычна не мелі папярэднікаў, на дасягненні якіх можна было б абаперціся ў сваёй працы. Збольшага ім даводзілася рабіць усё ўпершыню, часам упоцемку, навобмацак, штораз памыляючыся, але свята верачы ў сваё прызначэнне званароў беларускага Адраджэння.*

*Адраджэнне... Вельмі ёмістае і трапнае слова для пазначэння аднаўлення беларускай нацыянальнай самасці, вяртання беларусаў у еўрапейскую цывілізацыйную і культурную прастору. Як і дзеячы еўрапейскага Рэнесансу, беларускія маладыя адраджэнцы ахоплівалі сваёй чыннасцю многія дзялянкі грамадска-палітычнай і культурнай працы. Калі гэтага вымагала справа, паэты і мастакі станавіліся дыпламатамі, выдаўцамі, прадпрымальнікамі, а каморнікі, бухгалтары і інжынеры — журналістамі, бібліятэкарамі, настаўнікамі, тэатральнымі дзеячамі. Зразумела, што ўсё гэта было не ад вялікага дабра, а вынікала з недахопу прыдатных да такой справы працаўнікоў. Не было тады іншага выйсця — яны мусілі працаваць там, дзе было патрэбна, каб паступова крышталізаваць з рыхлай этнаграфічнай народнай масы мадэрную нацыю.*

*Праз гісторыю беларускага маладзёвага руху канца XIX — першай паловы XX стагоддзя (да 1939 г.) мы імкнёмся адлюстраваць агульную гісторыю беларускага нацыянальнага руху, гісторыю антысавецкага супраціву, чыннасць нацыянальна-дэмакратычных арганізацый, галоўнымі мэтамі якіх было дасягненне палітычнай незалежнасці краіны і рэалізацыя дэмакратычных каштоўнасцяў. Праз гісторыю беларускага маладзёвага руху мы разглядаем пачатак станаўлення нацыянальнага школьніцтва, тэатра, музыкі, літаратуры, прэсы, кнігавыдавецтва ды іншых аспектаў грамадска-культурнай чыннасці. Наагул, без вывучэння гісторыі беларускага маладзёвага руху цяжка будзе да канца зразумець феномен станаўлення беларускай грамадзянскай супольнасці і сучаснай беларускай культуры.*

*Стары рымскі афарызм — «Гісторыю пішуць пераможцы» — вельмі прыдатны да нашай сітуацыі, якая тычыцца гістарыяграфіі гісторыі беларускага маладзёвага руху. Пра станаўленне і развіццё камсамолу і піянерыі ў СССР за 70 гадоў існавання савецкай улады напісаны тысячы манаграфій, артыкулаў, выдадзена вялікая колькасць дакументальных зборнікаў і ўспамінаў актывістаў камуністычнага руху. Цяпер яны пыляцца незапатрабаванымі ў кнігасховішчах і мала хто жадае звярнуцца да гэтай літаратуры, каб успомніць, напрыклад, сваю камсамольскую маладосць. І не таму, што ўсё напісанае ў іх — няпраўда. Найчасцей, ва ўмовах*

*тагачаснай палітычнай цэнзуры, праўда ў гэтых «сведчаннях» была максімальна выпрашчана. Многія факты з гэтых выданняў настолькі перакручаныя, што ўжо цяжка аддзяліць ману ад ісціны. Зусім адваротная сітуацыя з адлюстраваннем у навуковай і навукова-папулярнай літаратуры чыннасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных суполак, згуртаванняў і асацыяцый. Гэты чын у савецкі час, за малым выняткам, ніколі не быў асобнай тэмай даследаванняў.*

*У цэлым можна сказаць, што да гэтага часу дадзеная праблема пакуль што не стала аб'ектам глыбокага і ўсебаковага вывучэння ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. У беларускай навуковай літаратуры прадстаўлены асобныя сюжэты па дадзенай праблематыцы, якія не прэтэндуюць на ўсебаковасць і глыбіню даследавання праблемы. Фактычна застаецца недаследаванай гісторыя беларускага маладзёвага руху падчас Першай сусветнай вайны 1914–1918 гг., польска-савецкага ваеннага супрацьстаяння. Што вельмі істотна — дагэтуль слаба вывучаны новыя архіўныя крыніцы па абранай тэме, якія захоўваюцца ў архівах Беларусі, Расіі, Польшчы, Латвіі, Літвы, Украіны ды іншых краін. Гэта тычыцца ў першую чаргу збораў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Менску, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага архіва Менскай вобласці, дзе пасля 1993 г. былі адкрыты для шырокага доступу раней засакрэчаныя фонды Беларускага студэнцкага саюза, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры ў Вільні, Беларускага культурна-асветнага таварыства ў Барысаве і шэрагу іншых арганізацый.*

*Дадзенае даследаванне павінна запоўніць наяўны прагал па гэтай праблеме. Яно прадстаўлена на суд чытача ў выглядзе навукова-папулярнага нарыса і папярэднічае навуковай манаграфіі па згаданай тэме, якую аўтар плануе выдаць праз нейкі час.*

*Важна падкрэсліць, што ў шэрагах беларускіх нацыянальных арганізацый былі не толькі этнічныя беларусы. Тут мы бачым таксама этнічных габрэяў, літоўцаў, немцаў, палякаў, расійцаў, татар, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Беларускі вызвольны рух занадта шырокая з'ява, каб акрэсліваць яго рамкамі этна-культурнага нацыяналізму. Беларускі патрыятызм атаясамліваецца не толькі з беларускім этнасам, але з усімі этнічнымі супольнасцямі, што разам стала жывуць на гэтай зямлі не адно стагоддзе. Беларускі патрыятызм — гэта непарыўная повязь з беларускай гістарычнай і культурнай традыцыяй, якая склалася ва ўмовах нацыянальнай і рэлігійнай талерантнасці. Беларускі патрыятызм — гэта жаданне свабоды, змаганне за свабоду ўсіх грамадзян краіны, не зважаючы на іх этнічнае паходжанне і веравызнанне.*

*Нарыс пабудаваны паводле праблемна-храналагічнага прынцыпу і падзелены на тэматычныя блокі, якія адпавядаюць агульнапрынятай перыядызацыі гісторыі Беларусі. На старонках «Спадчыны» друкуюцца раздзелы, у якіх адлюстравана праца беларускіх маладзёвых асяродкаў ва ўмовах бальшавіцкага рэжыму (у геаграфічным аспекце гэты раздзел ахоплівае тэрыторыю БССР, а таксама Савецкай Расіі і іншых саюзных рэспублік, дзе дзейнічалі беларускія вучнёўскія і студэнцкія арганізацыі ды зямляцтвы), а таксама чыннасць беларускіх маладзёвых палітычных асяродкаў, студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый у Заходняй Беларусі. Падчас напісання работы былі выкарыстаны дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Менску, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага архіва Менскай вобласці, Архіва новых актаў у Варшаве, рукапіснага аддзела Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.*

*Публікацыя багата аздоблена ілюстратыўным матэрыялам —фотаздымкамі і выявамі дакументаў, якія былі выяўлены ў зборах беларускіх, літоўскіх, польскіх і расійскіх архіваў, музеяў і бібліятэк. Многія з гэтых матэрыялаў візуальнага характару друкуюцца ўпершыню.*

# «Усходні фронт» змагання за вольную Беларусь

**Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый ва ўмовах бальшавіцкага рэжыму ў 20–30-я гады XX ст.**

***

*Сёння некаторыя аганжаваныя гісторыкі і публіцысты робяць спробу «гуманізацыі» бальшавіцкай улады, акцэнтуючы ўвагу на поспехах савецкага ладу ў справе індустрыялізацыі краіны і стварэння моцнага ваенна-прамысловага комплексу, які, маўляў, дапамог перамагчы нацысцкую Нямеччыну ў Другой сусветнай вайне. Яны таксама адзначаюць паспяховае правядзенне савецкай культурнай рэвалюцыі, увядзенне ў краіне ўсеагульнага пачатковага навучання і ліквідацыю непісьменнасці. Праўда, пры гэтым забываецца, што народамі СССР на «капішча» савецкай імперыі нават не ў ваенныя, а ў мірныя міжваенныя і пасляваенныя гады былі пакладзены мільёны чалавечых жыццяў. Людзі гінулі ў сталінскіх катоўнях, на лесапавалах, рудніках і капальнях, знаходзячыся ў канцлагерах і «вольных пасяленнях». У выніку антынароднай палітыкі ў нацыянальных рэспубліках і акругах быў знішчаны цвет інтэлектуальнай эліты гэтых народаў, знявечаны дзясяткі мільёнаў людскіх лёсаў. Усё гэта апалагеты савецкага перыяду гісторыі імкнуцца замоўчваць або знаходзіць яму цынічныя апраўданні: іншага шляху, як кардынальная перабудова былой царскай Расіі, якая апынулася ў варожым капіталістычным атачэнні, не было; панесеныя людскія страты ў працэсе «сацыялістычнай мадэрнізацыі» былі непазбежныя; нягледзячы на ўсе цяжкасці, народ і бальшавіцкая партыя заўсёды былі адзіныя; нарэшце, нягледзячы на пэўныя перагібы сталінскага рэжыму, масавага супраціву савецкай уладзе ў міжваенны час не было.*

*СССР, як і шэраг іншых краін Еўропы, Азіі, Амерыкі і Афрыкі, што адносіліся да т. зв. «даганяючай цывілізацыі», у XX ст. прайшоў шлях мадэрнізацыі — пераход ад аграрнага да індустрыяльнага грамадства. На працягу мінулага стагоддзя з рознымі вынікамі падобныя працэсы адбываліся не толькі ў «краіне Саветаў». Яны былі ўласцівыя Іспаніі, Партугаліі, Югаславіі, Турцыі, Японіі, Кітаю, Індыі, дзяржавам арабскага свету, Лацінскай Амерыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі. Шмат дзе гэтая мадэрнізацыя здзяйснялася ва ўмовах панавання таталітарных і аўтарытарных рэжымаў, праз усталяванне партыйнай і асабістай дыктатуры. Выкарыстанне жорскіх валюнтарысцкіх метадаў па карэннай рэарганізацыі грамадства сведчыла пра неразвітасць эканамічных і сацыякультурных інстытутаў і адносін, пра слабасць нацыянальнай буржуазіі і ў цэлым грамадзянскай супольнасці ў гэтых краінах. Антаганізму і жорсткасці ў сферы сацыяльных, міжэтнічных і міждзяржаўных дачыненняў дадала Першая сусветная вайна і яе наступствы. Усталяваны ў міжваенны час сусветны парадак цяжка было назваць справядлівым і гарманічным. У краінах, якія страцілі свае «суверэнныя тэрыторыі» і пры гэтым былі абцяжараныя вялізнымі кантрыбуцыямі, пацярпелі ад празмернай мілітарызацыі эканомікі і перажылі рэвалюцыйныя закалоты, узніклі масавыя антыдэмакратычныя і рэваншысцкія настроі, з якіх скарысталіся палітыкі і ідэолагі, што прапагандавалі класавую і нацыянальную непрымірымасць, шавінізм і мілітарызм, займаючыся пры гэтым папулізмам. Прынятыя на ўзбраенне ў гэтых краінах лозунгі аб сацыяльнай дзяржаве, справядлівым грамадстве і роўных магчымасцях, аказаліся ўсяго толькі ідэалагічнай заслонай. Акрамя тэхніка-тэхналагічнай мадэрнізацыі асобных галін эканомікі, у першую чаргу прыналежных да ваенна-прамысловага комплексу, таталітарныя мадэрнізацыі нічога пазітыўнага прынесці не маглі. Замест сацыяльнай дзяржавы і роўных магчымасцяў з'явіўся «дзяржаўны капіталізм» з новым пануючым класам — партыйнай наменклатурай і бюракратыяй, пры гэтым нішчыліся апошнія дэмакратычныя свабоды, апошнія асяродкі грамадзянскай супольнасці. Аналізуючы эпоху «вялікіх сацыяльных эксперыментаў» і параўноўваючы іх вынікі і наступствы, прыходзіцца канстатаваць: па масавасці і нялюдскасці бальшавіцкую рэпрэсіўную палітыку можна параўнаць бадай*

*што толькі са злачынствамі нацыстаў у Еўропе падчас Другой сусветнай вайны, мааістаў у Кітаі і «чырвоных кхмераў» у Камбоджы ў пасляваенны час. Немагчыма прымірыцца з думкай, што гэта было «непазбежнае зло», што беларусы добраахвотна і без супраціву пагадзіліся жыць ва ўмовах бальшавіцкай азіяцкай дэспатыі.*

*Тэзісы аб еднасці партыі і народа, аб адсутнасці масавага супраціву савецкай уладзе ў Беларусі абвяргаюць шматлікія архіўныя дакументы і сведчанні відавочцаў. Маецца вялізная дакументальная база, у тым ліку матэрыялы з ГПУ-НКВД, якія сведчаць пра масавыя антысавецкія настроі сярод насельніцтва. У большыні выпадкаў гэтыя настроі праяўляліся ў пасіўнай форме, бо ва ўмовах таталітарнага рэжыму адкрыты масавы супраціў у СССР быў рэдкі. Да канца 1924 г. у краіне былі знішчаны ўсе небальшавіцкія палітычныя арганізацыі, а манаполію на ўладу і ідэалогію ў дзяржаве захапіла ў свае рукі адна партыя — камуністычная, у якой вельмі хутка сфармавалася абсалютная ўлада аднаго чалавека — Іосіфа Сталіна-Джугашвілі. Усе спробы палітычнай апазыцыі хутка выяўляліся і жорстка падаўляліся органамі дзяржаўнай бяспекі.*

*Не трэба перабольшваць узровень асабістай і грамадскай свабоды ў СССР падчас правядзення новай эканамічнай палітыкі ў 1920-я гг. Пры пэўным лібералізме ў сферы эканомікі ўсе «камандныя вышыні» і рычагі кіравання краінай заставаліся ў руках бальшавікоў. Менавіта ў гэтыя гады ўсталявалася жорсткая цэнзура друку, паступова праводзілася «зачыстка» ўсяго недзяржаўнага сектару, падчас якой былі ліквідаваны ўсе не падпарадкаваныя бальшавіцкай партыі і ўрада ўстановы і арганізацыі. Ва ўсіх сферах грамадскага жыцця панавалі нечалосны палітычны кантроль і сачэнне, паўсюль за грамадзянамі назіралі «вочы» і «вушы» ГПУ.*

*Тым не менш, у пачатку 1920-х гг., пакуль на краіну яшчэ не апусціўся змрок таталітарызму, заставалася магчымасць грамадскай чыннасці ў культурна-асветнай сферы, можна было адносна свабодна выяўляць сваю індывідуальнасць на ніве літаратурнай і мастацкай творчасці. Прадстаўнікі вольных прафесій пакуль яшчэ не былі закутыя ў ідэалагічныя ланцугі сталінскіх «творчых саюзаў», іх творы яшчэ не ацэньвалі праз прызму г. зв. сацыялістычнага рэалізму.*

*Квазідзяржаўнае ўтварэнне Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусі (ССРБ) пасля падзелу нашай краіны паводле ўмоваў Рыжскага міру 18 сакавіка 1921 г. складалася з няпоўных 7-мі паветаў былых Менскай і Віленскай губерняў (пазней часткі Вілейскага павета былі далучаныя да Барысаўскага і Менскага паветаў). У 1922 г. Іосіф Сталін прапаноўваў уключыць гэтую рэспубліку, а таксама Савецкую Украіну і Закаўказзе, у склад РСФСР у якасці нацыянальных аўтаномій. Аднак Уладзімір Ленін, дбаючы пра ўнутраную стабільнасць дзяржавы і маючы на ўвазе знешнепалітычныя чыннікі (многія прыгнечаныя народы Азіі і Афрыкі бачылі ў Савецкай Расіі аплот нацыянальна-вызвольных рухаў прыгнечаных народаў супраць каланіялізму і імперыялізму і прыклад справядлівага вырашэння нацыянальнага пытання), прапанаваў стварыць саюз савецкіх рэспублік. Ленінскі план быў падтрыманы рашэннем XI з'езда Расійскай камуністычнай*



*Яўхім Кіпель, старшыня Гуртка беларускае моладзі «Беларуская хатка» ў Менску. Фота 1921 г. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь*



*Тодар Апацёнак, сябра Гуртка беларускае моладзі «Беларуская хатка» ў Менску. Фота пачатку 1920-х гг. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*



Апалонія Савёнак-Раткевіч, актывістка беларускага маладзёвага руху, студэнткі Белдзяржуніверсітэту ў 1920-я гг. Фота 1924 г. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.

*партыі (бальшавікоў) (РКП(б)) у сакавіку 1922 г. 30 снежня таго ж года паміж саюзнымі рэспублікамі быў заключаны дагавор аб утварэнні СССР.*

*XII з'езд РКП(б) у красавіку 1923 г. прыняў важныя рашэнні па нацыянальным пытанні і нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве. Былі прынятыя ключавыя рашэнні, у якіх ставіліся задачы «ліквідацыі гаспадарчай і культурнай няроўнасці паміж нацыямі і народнасцямі ў Савецкім Саюзе», а таксама абвяшчалася палітыка спрыяння «развіццю нацыянальных моваў і культураў нерасійскіх нацыянальнасцяў». Асноўным дакладчыкам па нацыянальным пытанні з'яўляўся І. Сталін. Рашучы праціўнік суверэнізацыі савецкіх рэспублік, ён вымушаны быў тады лічыцца з аўтарытэтам У. Леніна і пайсці на саступкі нацыянал-камуністам, пагадзіўшыся з многімі іх патрабаваннямі. Ён яшчэ не кантраляваў увесь партыйны апарат і меў сярод аднапартыйцаў сур'ёзных праціўнікаў. Але нават і тады, у красавіку 1923 г., будучы «бацька народаў» недвухсэнсоўна заяўляў пра тое, што ён застаецца прыхільнікам жорскай цэнтралізацыі ў савецкай краіне і што яму чужыя ідэі класічнага федэралізму. У сваіх тэзісах да з'езда «Нацыянальныя моманты ў партыйным і дзяржаўным будаўніцтве» ён заявіў: «Палітычнай асновай пралетарскай дыктатуры з'яўляюцца перадусім і галоўным чынам цэнтральныя раёны (г. зн. еўрапейская частка Расіі. —* **У. Л.***), а не ўскраіны, якія ўяўляюць з сябе сялянскія краіны. Калі мы перагнем палку ў бок сялянскіх ускраін..., то можа атрымацца расколіна ў дыктатуры пралетарыяту... Варта памятаць, што акрамя права народаў на самавызначэнне ёсць яшчэ права рабочага класа на ўмацаванне сваёй улады, і гэтаму апошняму праву падпарадкавана права на самавызначэнне... права на самавызначэнне не можа і не павінна служыць перашкодай справе здзяйснення права рабочага класа на сваю дыктатуру. Першае павінна адступіць перад другім».*

*Прыхільнікі жорскага цэнтралізму ў першую чаргу не маглі дапусціць стварэння самастойных нацыянальных кампартый. Адзіная кампартыя заставалася галоўным аплотам бальшавіцкай дыктатуры, галоўнай апорай у стварэнні савецкай імперыі. Камуністычныя партыі, якія кіравалі «самастойнымі» рэспублікамі, па-ранейшаму ўваходзілі ў склад адзінай Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) і выконвалі яе дырэктывы. Для праформы РКП(б) у 1925 г. была перайменавана ва ўсесаюзную кампартыю бальшавікоў — УсеКП(б).*

*У Савецкай Беларусі ўсе рычагі ўлады трымала ў сваіх руках бальшавіцкае партыйнае кіраўніцтва. На чале Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (фармальна заканадаўчага органа) да сваёй смерці ў 1937 г. стаяў беларус Аляксандр Чарвякоў. Ён жа, а потым беларусы Язэп Адамовіч і Мікалай Галадзед, узначальвалі ў 1920–1937 гг. і Савет Народных Камісараў (урад) ССРБ. Беларускія камуністы займалі і іншыя кіраўнічыя пасады, аднак у Цэнтральным Бюро Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (з 1924 г. — Бюро ЦК КП(б)Б) беларусы не складалі большыні. Адказнымі сакратарамі ЦБ КП(б)Б — з 1925 г. першымі сакратарамі ЦК КП(б)Б — былі людзі, прызначаныя Масквой. У міжваенны час гэтыя пасады займалі 10 чалавек, і толькі адзін з іх быў беларусам. Ключавой была таксама пасада ўпаўнаважанага палітычнай паліцыі — ГПУ (расійская абрэвіятура Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення) у ССРБ, а з 1934 года — кіраўніка НКВД (Народнага камісарыята ўнутраных спраў) БССР. Гэтыя пасады ў міжваенны час займалі 12 чалавек, і сярод іх не было ніводнага беларуса. Першыя сакратары і кіраўнікі палітычнай паліцыі кантралявалі кожны крок мясцовай савецкай адміністрацыі.*

*Нягледзячы на гэта, варта адзначыць, што беларускія нацыянал-камуністы мелі смеласць адстойваць нацыянальныя інтарэсы беларусаў. У*

*1922 г. яны выступілі супраць сталінскага плана ўключэння ССРБ у склад РСФСР. Яны неаднаразова ініцыявалі звароты да кіраўніцтва СССР з прапановай вярнуць у склад Беларусі віцебскія, магілёўскія і смаленскія землі.*

*Зважаючы на настроі ў нацыянальных рэспубліках і на тое, што за межамі СССР жыла немалая колькасць беларусаў, украінцаў, азербайджанцаў, армян і прадстаўнікоў іншых народаў, якія насялялі Савецкі Саюз, Масква на пачатку 1920-х гг. пайшла на пэўныя саступкі ў нацыянальнай палітыцы. Паводле рашэнняў XII з'езда РКП(б), у 1923 г. у БССР пачала здзяйсняцца палітыка беларусізацыі. У гэты ж час была абвешчана амністыя дзеячам БНР і антысавецкіх узброеных фармаванняў.*

*Як вядома, у студзені 1919 г. Масква адарвала ад Беларусі і далучыла да Расіі частку Менскай, Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні. У 1924–1926 гг. значная частка гэтых беларускіх этнаграфічных зямель была вернута ў склад БССР. Так афармілася сучасная ўсходняя мяжа Беларусі.*

*Важным дасягненнем нацыянал-камуністаў была таксама аграрная палітыка, накіраваная на ўмацаванне аднаасобных сялянскіх гаспадарак і шырокую кааперацыю.*

*Нацыянал-камуністы, якія займалі адказныя партыйныя і дзяржаўныя пасады, абапіраліся ў сваёй дзейнасці на людзей, якіх у 1926 г. бальшавіцкая прапаганда назвала «нацыянал-дэмакратамі» і «нацыянал-ухілістамі».*

*У авангардзе руху за беларусізацыю, за вяртанне ў склад Беларусі яе ўсходніх тэрыторый стаяла патрыятычная моладзь. Яна стварае культурна-асветныя гурткі, драматычныя дружыны, бібліятэкі-чытальні, прэзентуе сярод тутэйшага жыхарства беларускае тэатральнае і музычнае мастацтва, шырыць друкаванае слова на беларускай мове. Моладзь складае абсалютную большасць беларускага настаўніцтва, якое ў гэты час самаахвярна працуе на ніве нацыянальнае асветы: выкладае навуку для дзяцей беларусаў на матчынай мове, знаёміць іх з роднай літаратурай і гісторыяй, далучае да беларушчыны.*

*Лідары беларускага маладзёвага руху вызнаюць дэмакратычныя каштоўнасці, адвяргаюць палітычную практыку бальшавізму і стаяць да існуючага рэжыму ў апазіцыі. Найбольш красамоўна іх погляды выявілі ў сваіх палітычных і літаратурных творах т. зв. «лістападаўцы». Той жа кантэкст гучыць у вершах Алеся Дудара, у творчасці «ўзвышанцаў» ды іншых маладых беларускіх літаратараў. Іх галоўная мэта — рэалізацыя ідэі самастойнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах і на прынцыпах сацыяльнай дэмакратыі, шырокае развіццё нацыянальнай культуры. Іх праграма не насіла безадказнага характару, яна не была накіравана на бяздумнае разбурэнне існуючага ладу. Маладая генерацыя беларускага нацыянальнага адраджэння ставіла перад сабой канструктыўныя задачы:*

- *паступовая дэмакратызацыя савецкай дзяржаўнай сістэмы праз правядзенне свабодных выбараў, арганізацыю замест бальшавіцкіх саўдэпаў сялянска-работніцкіх рад і падпарадкаваных ім выканаўчых органаў;*
- *падтрымка курсу нацыянал-камуністаў па «ўзвышэнні» беларускага селяніна і работніка, паляпшэнні іх сацыяльнага і матэрыяльнага становішча;*
- *дасягненне Беларуссю рэальнай палітычнай самастойнасці; узбуйненне яе тэрыторыі за кошт вяртання ўсходнебеларускіх этнаграфічных тэрыторый, уключаючы і заходнюю Смаленшчыну;*
- *скасаванне Рыжскай мірнай дамовы 1921 г. і далучэнне да Беларускай рэспублікі Віленшчыны і Гарадзеншчыны (з Беластокам);*
- *правядзенне шырокай беларусізацыі ўсіх сфераў дзяржаўнага і грамадска-культурнага жыцця Беларусі, наданне беларускай мове дзяржаўнага статусу, усямерная падтрымка нацыянальнай культуры і мастацтва, стварэнне паўнавартаснай нацыянальнай сістэмы адукацыі,*



*Казімір Гладкі, сябра Беларускай навукова-літаратурнага таварыства ў Барысаве, адзін з арганізатараў першых беларускіх школ на Барысаўшчыне ў пачатку 1920-х гг. Друкуецца ўпершыню.*

*прыцягненне на кіраўнічыя пасады мясцовых кадраў;*

- *забеспячэнне іншым этнічным супольнасцям Рэспублікі рэальных магчымасцяў у развіцці сваёй нацыянальнае культуры і адукацыі, у захаванні сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці.*

Дадзеная праграма была сугучная з пазіцыяй беларускіх сацыялістычных партый і кіраўніцтва БНР і складала адзіную ідэйную платформу беларускага вызвольнага руху.

Першачарговым заданнем з пералічаных павінна было стаць рэалізацыя палітыкі беларусізацыі і далучэнне да Савецкай Беларусі ўсходніх этнаграфічных тэрыторый. Гэтая праграма атрымала назву «ўсходні фронт беларускага руху». Беларускія маладзёвыя гурткі з'яўляліся галоўнай ударнай сілай дадзенага «фронту». Яны павінны былі разрасціся ў масавы грамадскі рух дзеля адбудовы самастойнай і дэмакратычнай Беларусі. Але ці было гэта рэальна здзейсніць ва ўмовах бальшавіцкага рэжыму, калі з кожным годам узмацняліся таталітарныя парадкі ў краіне, калі ўсталёўваў сваю манаполію на грамадскую працу сярод моладзі камсамол? Гэтае пытанне будзе развязана толькі ў канцы 1920-х гг. Пакуль жа прыхільнікі дэмакратычнага выбару яшчэ не ведаюць пра гэтую трагічную развязку, ідуць на «Вы», не зважаючы на відавочную перавагу праціўніка, спадзеючыся ўзварушыць народ і павесці яго за сабой — будаваць новую свабодную Беларусь.

Бальшавіцкае кіраўніцтва выдатна разумела значэнне маладзёвага фактару ў палітыцы.



Язэп Пушча, Андрэй Александровіч, Алесь Дудар. Менск, 1926 г. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

З самага пачатку свайго прыходу да ўлады яно рабіла ўсё, каб падпарадкаваць моладзь свайму ідэалагічнаму кантролю праз адукацыйна-выхаваўчыя ўстановы і стварэнне масавых прабальшавіцкіх арганізацый — камсамола і піянерыі. Апошнія ніколі не былі самастойнымі ў сваёй чыннасці і заўсёды з'яўляліся праваднікамії лініі партыі па ўмацаванні бальшавіцкай манаполіі на ўладу. У канцы 1920-х гг. яны становяцца безальтэрнатыўнымі арганізацыямі, якія імкнуліся ахапіць бальшавіцкай прапагандай і працай усю моладзь у СССР.

Першыя ячэйкі Камуністычнага саюза моладзі былі арганізаваныя «зверху» на неакупаванай немцамі тэрыторыі Усходняй Беларусі ў лістападзе 1918 г., адразу пасля 1-га з'езда Расійскага камуністычнага саюза моладзі (РКСМ). Пасля другога абвяшчэння ССРБ у канцы верасня 1920 г. у Менску адбыўся 1-ы ўсебеларускі з'езд Камуністычнага саюза моладзі Беларусі (КСМБ), на якім быў прыняты новы статут рэспубліканскай арганізацыі, а таксама аднагалосна прынята рашэнне аб уваходжанні КСМБ у склад расійскага камсамолу. Дадзенае рашэнне было прынята за 2 гады да стварэння СССР, і нічога дзіўнага тут няма. Як і кампартыя, камсамол у Беларусі ніколі не з'яўляўся самастойнай арганізацыйнай структурай, якая б прадстаўляла інтарэсы беларускай моладзі. З самага пачатку гэта была бальшавіцкая рэгіянальная структура, якая верна служыла інтарэсам Расійскай кампартыі. Беларусы, як прадстаўнікі тытульнай нацыі, не складалі нават намінальнай большасці ў складзе КСМБ да сярэдзіны 1920-х гг., што сведчыць пра непапулярнасць камсамолу сярод беларускай моладзі.

У першыя гады свайго існавання шэрагі рэспубліканскага

*камсамолу папаўняліся за кошт актывістаў «Югенд-Бунда», «Макабі», маладзёвай філіі «Паалей-Цыён» ды іншых небеларускіх маладзёвых арганізацый. Гэта былі ў асноўным выхадцы з гарадоў і мястэчак. Галоўным матывам уступлення ў камсамол нярэдка былі не ідэйныя, а кар'ерысцкія памкненні, магчымасць атрымаць рэкамендацыю для паступлення на вучобу ў вышэйшую школу ці тэхнікум, а таксама дамагчыся лепшай пасады ў дзяржаўным, камсамольскім, а потым і партыйным апараце.*

*Колькасны рост членаў камсамольскіх ячэек у Беларусі ў пачатку 1920-х гг. адбываўся вельмі павольна. Калі ў 1920 г. камсамольцаў у рэспубліцы налічвалася каля 2 тыс. чалавек, то ў сярэдзіне 1923 г. — усяго каля 3,8 тыс.*

*Сітуацыя змянілася пасля 1924 г., калі бальшавіцкія дзяржаўныя структуры забаранілі ці змусілі «самарапусціцца» амаль усе іншыя маладзёвыя некамуністычныя арганізацыі моладзі. Дзякуючы вялізнай палітычнай і фінансавай падтрымцы дзяржавы і камуністычнай партыі, камсамолу ўдалося ўсталяваць сваю манаполію ў маладзёвым руху ў СССР. У 1926 г., улічваючы значнае ўзбуйненне тэрыторыі БССР, колькасць членаў камсамолу ў рэспубліцы дасягнула 42 тыс. чалавек. Рэшткі антыбальшавіцкай апазіцыі ў маладзёвым асяродку сыходзілі ў падполле, якое выкрывалася і няшчадна вынішчалася органамі дзяржаўнай бяспекі.*

*Задума народнага камісара асветы ССРБ Усевалада Ігнатоўскага і яго намесніка Антона Баліцкага «скрасціць» (скрыжаваць) камсамол і беларусізацыю пацярпела фіяска. Ідэі нацыянал-камунізму і нацыянал-дэмакратызму былі нясумяшчальныя з бальшавіцкай ідэалогіяй. Гэта прывяло толькі да падпарадкавання камсамолам беларускіх маладзёвых арганізацый, вымываннем іх нацыянальнай і дэмакратычнай сутнасці, заменай яе на «пралетарскі інтэрнацыяналізм».*

*Бальшавіцкай уладнай вярхушцы было недастаткова арганізацыйнай ліквідацыі грамадскай апазіцыі ў краіне. На парадку дня стаяла фізічнае знішчэнне ўнутранага іншадумства. Архіўныя дакументы, якія датычаць дзейнасці органаў дзяржбяспекі, даюць нам падставу меркаваць, што масавыя судовыя працэсы над апазіцыяй у нацыянальных рэспубліках СССР павінны былі пачацца ўжо пасля 1925 г. Але абвастрэнне барацьбы ў самой бальшавіцкай партыі і неспрыяльная знешнепалітычная кан'юктура адсунулі рэалізацыю задуманага на пачатак 1930-х гг.*

*1930–1931 гг. адзначыліся ў БССР сфабрыкаванай справай «Саюза вызвалення Беларусі», 1932–1934 гг. — справамі «Беларускай народнай грамады» і «Беларускага нацыянальнага цэнтра». У тыя ж гады ГПУ сфабрыкавала таксама справы «Беларускага філіяла меншавікоў», «Беларускага філіяла прампартыі», «Беларускага філіяла працоўнай сялянскай партыі» і «Беларускага тактычнага цэнтра». Палітычны тэрор дасягнуў свайго піку ў 1937–1938 гг., якія ўвайшлі ў гісторыю як гады «вялікага тэрору».*

*«Ворагаў народа» спачатку падвяргалі адміністратыўным высылкам за межы Беларусі, а пазней прыгаворвалі «асобымі нарадамі», «тройкамі» і «двойкамі» да расстрэлу ці на працяглыя тэрміны зняволення. Такім чынам адбылася расправа і з большасцю актывістаў беларускага маладзёвага руху.*

## Беларускі маладзёвы рух на Меншчыне

З аднаўленнем савецкай улады ў ліпені 1920 г., у разгар баявых дзеянняў на польска-савецкім фронце, чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацыяў на Меншчыне на нейкі час была паралізавана. Другое абвяшчэнне ССРБ (31 ліпеня 1920 г.), легалізацыя Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, уваходжанне нацыянал-камуністаў у склад ЦВК і СНК рэспублікі, вяртанне на радзіму многіх вядомых беларускіх працаўнікоў з бежанства ці пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі садзейнічае ажыўленню беларускай нацыянальнае працы ў Савецкай Беларусі.

Тое, што ў пачатку 1920-х гг. у ССРБ—БССР[1] легальна дзейнічалі беларускія эсэры, дапамагло хутчэйшаму аднаўленню чыннасці беларускіх нацыянальных арганізацый і кансалідацыі іх вакол ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння. У жніўні 1920 г. эсэры дамагліся ад савецкіх улад утварэння сваёй уласнай культурніцкай установы — Беларускага работніцкага (работніцка-сялянскага) клуба, які месціўся на Юраўскай вуліцы. Ён хутка стаў вельмі папулярным сярод менскага студэнцтва, настаўніцтва, беларусаў-чыгуначнікаў, якія жылі ў Серабранцы, на Ляхаўцы

і Грушаўцы. Беларускі работніцкі клуб ставіў за мэту «згуртаванне ўсіх працоўных беларусаў, узняцце іх нацыянальна-культурнай і палітычнай свядомасці», стварэнне «асноў новага жыцця», навуковае вывучэнне Беларусі «ў яе мінулым і сучасным, развіццё беларускай культуры, забеспячэнне эканамічных і духовых інтарэсаў сваіх сяброў». У склад Управы гэтай установы ўвайшлі Сцяпан Некрашэвіч (першы старшыня), Палута Бадунова, Яўсей Трахімаў, Уладзіслаў Дзяржынскі (Чаржынскі), Антон Равенскі, Міхал Шыманскі, Паўлюк Касмовіч, Мікола Шыла ды інш. Пры БРК былі ўтвораны драматычная секцыя (кіраўнік Уладзіслаў Галубок), харавая (пад кіраўніцтвам Міколы Равенскага), прыгожага пісьменства (на чале з Францішкам Аляхновічам). Пры Клубе дзейнічалі бібліятэка-чытальня, беларуская пачатковая вечаровая школа для непісьменных дарослых, курсы беларускай мовы і беларусазнаўста для ўсіх ахвотных.

Увосень 1921 г. пры БРК ствараецца беларускі маладзёвы гурток, названы ў гонар заўчасна памерлага маладога беларускага настаўніка і камуніста Сцяпана Булата. Гурток, які ўзначаліў малады літаратар У. Дзяржынскі, складаўся не толькі з менскай вучнёўскай і студэнцкай моладзі, але таксама з маладых чыгуначнікаў і прамысловых работнікаў. Актывісты арганізацыі наведвалі курсы беларускай мовы, прымалі чынны ўдзел у беларускім культурным жыцці, цікавіліся краязнаўствам.

Моладзь складала абсалютную большасць харавой капэлы Міколы Равенскага і тэатральнай трупы Уладзіслава Галубка. Разам яны ладзяць у БРК сумесныя беларускія вечарыны, спалучаюць тэатральныя паказы з харавымі нумарамі, рэалізуючы ідэю стварэння сінтэтычнага тэатра, дзе музыка арганічна ўпісваецца ў палатно драматургічных твораў.

За 3 гады існавання Клуба дзякуючы чыннасці яго музычна-драматычнай трупы работнікі прамысловых прадпрыемстваў, чыгуначнікі менскіх ускраін і сяляне навакольных вёсак чулі са сцэны сваю родную мову. Драматычна-музычная трупа пераўтвараецца ў своеасаблівы вандроўны тэатр, які гастралюе па мястэчках і гарадах рэспублікі, прэзентуючы беларускае мастацтва. Напрыклад, у 1921 г. трупа дала 176 спектакляў, а ў 1922 г. — 193. У музычна-тэатральнага калектыву была вельмі бедная матэрыяльная база. Мізэрную фінансавую дапамогу яму аказваў Наркамасветы. У красавіку 1921 г. на нядоўгі час трупа была ўзята на дзяржаўнае ўтрыманне і прымацавана да Галоўпалітпрасветы ССРБ.

У гэты час у маладзёвым гуртку імя С. Булата, у канцэртах музычна-драматычнай трупы БРК удзельнічалі ўжо згаданы ў. Дзяржынскі і яго жонка Яўгенія, вядомы беларускі журналіст Лявон Савёнак, славуты ў будучыні беларускі этнограф і гісторык Майсей Грынблат, паэтка-рэвалюцыянерка Вера Мурашка (Матэйчук-Маслоўская), жонка Сцяпана Некрашэвіча Вольга, а таксама Марыля Васільева, Яўгенія Якавіцкая, Вольга і Марыя Пратасоўскія, Паўлюк Касмовіч, Сымон Старасценкаў, Апалінарый Халева, Алесь Гарабцоў, Ілья Палівода, Хрыстафор Загорскі, Пятро Зарэмба і інш.

Другі маладзёвы асяродак у Менску узнік у 1921 г. у ранейшай сядзібе беларускай інтэлігенцыі — «Беларускай хатцы», што месцілася на Конным пляцы, побач з Камароўкай. Ініцыятарам аднаўлення гэтага беларускага клуба стаў 25-гадовы Яўхім Кіпель, былы камандзір батальёна ў Заходняй чырвонай дывізыі, якая вяла баявыя дзеянні на польска-савецкім фронце на тэрыторыі Беларусі. Ён жа ўзначаліў і новаўтвораны Гурток менскай беларускай моладзі пры «Беларускай хатцы». Маючы бездакорную, паводле савецка-бальшавіцкіх крытэрыяў, біяграфію, ён разгарнуў актыўную чыннасць на ніве беларускай нацыянальнай культуры і ў справе кансалідацыі маладзёвага руху ва ўсходняй Беларусі. Пры «Беларускай хатцы» была адноўлена бібліятэка-чытальня, зачыненая ў ліпені 1920 г., паспяхова дзейнічаў драматычны гурток, шырылася краязнаўчая праца. У склад гуртка ўваходзілі сябра ЦК Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў Мікола Пашковіч, яго брат Янка (апошні працаваў у рэдакцыі «Савецкай Беларусі»), Барыс Платонаў (у будучыні выбітны акцёр Купалаўскага тэатра, у 1948 г. удастоены звання народнага артыста СССР), Яўген Рамановіч (вядомы беларускі драматург і тэатральны дзяяч, заслужаны артыст БССР), паэт Алесь Дудар, маладыя «самадзейныя» артысты Уладзімір Сенька, Алесь Каралецкі, настаўнік Тодар Апацёнак і інш. Як пазней сведчыў А. Дудар, гурток «панадворным выглядам культурна-асветнай арганізацыі, безумоўна хаваў нацыяналістычную антыпралетарскую сутнасць. Даволі сказаць,

што... ў гуртку не было аніводнага камсамольца ці камуніста... і ўся праца мела падкрэслены характар «апалітычнасці».

Гурток менскай беларускай моладзі ўсталяваў шчыльныя кантакты з іншымі беларускімі маладзёвымі арганізацыямі Меншчыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны, Гомельшчыны, а таксама Масквы і Петраграда. Яўхім Кіпель і яго паплечнікі імкнуліся пераўтварыць «Беларускую хатку» ў каардынацыйны цэнтр усіх беларускіх маладзёвых асяродкаў не толькі ў ССРБ, але таксама на ўсёй этнаграфічнай тэрыторыя Беларусі і беларускай дыяспары ў іншых саюзных рэспубліках СССР. З гэтай мэтай, дзякуючы дапамозе Я. Пашковіча, гурткоўцы 6 красавіка 1921 г. надрукавалі ў «Савецкай Беларусі» свой зварот да ўсёй беларускай моладзі: «Клічам Вас злучыцца ў гурткі, якія павінны будуць пашыраць беларускую культуру ў вёсцы... Таварышы, памятайце, што толькі ў арганізацыі сіла, і дзеля таго нам трэба злучыцца, зліцца ў адно цэлае; трэба, каб нашы праграмы не розніліся. Толькі тады мы зможам пашырыць нашу працу, толькі тады мы зможам пашырыць нашу культуру і асвяціць нашага селяніна. Таварышы, хто любіць сваю вольную бацькаўшчыну, хто жадае дабра ёй, арганізуйцеся і злучайцеся».

На жаль, у тагачасных палітычных умовах стварэнне адзінага каардынацыйнага маладзёвага цэнтру, які б аб'яднаў чыннасць большасці беларускіх маладзёвых арганізацый у Савецкай Беларусі і на абшарах СССР, было немагчымым.

Найважнейшым напрамкам нацыянальна-культурнай чыннасці актывістаў беларускага маладзёвага руху ў Менску заставалася беларусізацыя мясцовых адукацыйных асяродкаў. Перавод школьнага навучання на беларускую мову ў сталіцы ССРБ, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі рэспублікі, ішоў значна шпарчэй. Беларусізацыю ў цэнтры падтрымліваў Наркамасветы ССРБ, тут у дастатковай колькасці меўся штат беларускіх педагогаў, вучні забяспечваліся навучальнай літаратурай на беларускай мове. Каб задаволіць патрэбу ў школьных падручніках, урад ССРБ нават пайшоў на стварэнне выдавецтва і друкарні ў Нямеччыне.

У 1920 г. у Менску пад кіраўніцтвам Язэпа Лёсіка адчыніліся 9-месячныя беларускія педагагічныя курсы, а таксама курсы па падрыхтоўцы беларускіх школьных інструктараў для правінцыі. У 1923 г. гэтыя курсы былі перайменаваны ў Вышэйшыя курсы беларусазнаўства, і яны адыгралі значную ролю ў справе фармавання беларускай нацыянальнай эліты. Многія беларускія студэнты БДУ і іншых вышэйшых навучальных установаў Менска спалучалі вучобу з настаўніцтвам у беларускіх пачатковых вучэльнях. Дзякуючы іх намаганням пры многіх школах ствараліся тэатральныя і гісторыка-краязнаўчыя гурткі, беларускія харавыя калектывы. Падчас пазашкольных факультатываў дзяцей знаёмілі з літаратурнымі творамі беларускіх пісьменнікаў, а падчас летніх вакацый вучні разам з настаўнікам выязджалі ў прадмесці Менска ў пошуках беларускай старасветчыны і дзеля знаёмства з вуснай народнай творчасцю.

Але працэс беларусізацыі школьнай справы ў Менску ішоў не так проста, як гэта падаецца. З боку розных партыйных і савецкіх дзяржаўных установаў неаднаразова рабіліся спробы павярнуць гэты працэс назад. Настаўнікам і бацькам вучняў менскіх беларускамоўных школ неаднаразова прыходзілася бараніць свае асяродкі ад наскокаў савецкіх русіфікатараў. Яшчэ на пачатку існавання савецкай улады, у траўні 1919 г., менскае беларускае настаўніцтва публічна заявіла новым школьным функцыянерам, што будзе цвёрда адстойваць сваё права вучыць дзяцей на матчынай мове. «Лічачыся з тым, — цытуем іх зварот у Менскі аддзел народнай адукацыі, — што менскія беларускія школы павінны цёнгля быць ачагамі беларускай культуры і беларускай мовы, і настаўніцы, і настаўнікі павінны правадзіць, як шчырыя беларусы, дзеці сваёй бацькаўшчыны, усё гэта не толькі ў сценах школы, але і ў прыватным жыцці, — агульны сход настаўніц і настаўнікаў менскіх беларускіх школ, які адбыўся 11 мая 1919 г., вынес гэткую пастанову:

«Хто з 1 верасня 1919 г. з тых беларускіх настаўніц і настаўнікаў школ, якія будуць лічыцца ў беларускіх школах да таго часу, не зможа весці навуку ў школе па-беларуску — чытаць і пісаць граматычна, гаварыць з дзяцьмі і цёнгля паміж сабой толькі па-беларуску, не будзе знаць літаратуры беларускае і граматыкі, і гісторыі Беларусі — той павінен сам прасіць да таго часу пераводу ў вялікарасійскія ці іншыя школы, інакш ён будзе звольнены Саюзам беларускіх настаўнікаў з беларускіх школ 10 верасня 1919 года».

Разам з Сымонам Рак-Міхайлоўскім, Язэпам Лёсікам, Аляксандрам Данілевічам, Вацлавам Іваноўскім, Макарам Касцевічам (Краўцовым), Паўлюком Дземідовічам, Чаславам Родзевічам, Аркадзем Смолічам гэтую адозву падпісалі тады маладыя настаўнікі, якія яшчэ вучыліся ў Беларускім педагагічным інстытуце: Міхась Міцкевіч (Антось Галіна), Міхась Кудзелька (Чарот), Казімір Гладкі, Ванда Лявіцкая, Хведар Бандарчык, Пятро Зарэмба, Апалонія Гірконт, Мікалай і Янка Пашковічы, Кастусь Пуроўскі, Кастусь Ламака, Аляксей Башкевіч і інш. (усяго 29 подпісаў).

Менскае беларускае настаўніцтва адстаяла беларускую школу і пры немцах, і пры паляках, і ў час існавання Літоўска-Беларускай ССР, і пасля аднаўлення савецкай улады ў ліпені 1920 г. На гэты момант у горадзе дзейнічалі 11 беларускіх пачатковых і 3 сярэднія школы. На пачатак 1923 г. ужо 17 элементарных (4-гадовых) школ і 6 сямігодак былі чыста беларускамоўнымі. Выкладанне беларускай мовы, літаратуры і беларусазнаўства было абавязковым ва ўсіх іншых школах (расійскамоўных, польскіх і габрэйскіх). Праўда, 7-гадовыя школы горада ўпарта трымаліся расійшчыны. Гэта тычылася ў першую чаргу тых навучальных устаноў, якія раней былі элітнымі навучальнымі ўстановамі (гімназіямі, рэальнымі і камерцыйнымі вучэльнямі).

Яшчэ цяжэй было рухаць беларускую культуру і асвету ў паветах. З-за няпэўнасці пазіцыі ў нацыянальна-моўным пытанні цэнтральных органаў ССРБ і адкрытага байкоту беларусізацыі на месцах пашырэнне беларускага школьніцтва і мастацкай самадзейнасці, а таксама распаўсюджанне беларускай літаратуры і перыёдыкі ішло вельмі марудна.

Каардынацыйным цэнтрам усёй беларускай справы ў ССРБ стаў Наркамат асветы. У самым пачатку жніўня 1920 г. пры наркамаце быў арганізаваны беларускі аддзел, у абавязак якому было пастаўлена стварэнне беларускамоўных адукацыйных і культурна-асветных асяродкаў. Яму актыўна дапамагалі беларускія маладзёвыя арганізацыі, што працягвалі сваю чыннасць з часу польска-савецкай вайны. Першымі кіраўнікамі названага аддзела былі беларускія эсэры Янка Бялькевіч і Язэп Шнаркевіч. Але бальшавіцкае кіраўніцтва дамаглося іх звальнення. У сярэдзіне 1921 г. на гэту пасаду быў прызначаны ўраджэнец Глыбоччыны Алесь Сабалеўскі.

Дзякуючы руплівасці беларускіх маладзёвых арганізацый паступова аднаўлялася беларуская культурная праца ў Менскім павеце. У 1920–21 гг. тут працаваў Крайскі культурна-асветны гурток «Вянок», пры якім дзейнічалі самадзейная драматычная дружына, педагагічны клуб і бібліятэка-чытальня. На Случчыне ў гэты час працягвалі працаваць старыя культурна-асветныя гурткі: слуцкая «Папараць-Кветка» і старыцкая «Зарніца». У снежні 1920 г. падала вестку пра тое, што працягвае дзейнічаць, «Кутнёўская навуковая грамада». Яе нязменны кіраўнік С. Курцэвіч-Сяўрук паведамляў у беларускі аддзел Наркамасветы аб стварэнні сіламі грамадоўцаў у вёсцы Куцянёў беларускай грамадскай школы, а таксама дзіцячага гуртка ў колькасці 50 чалавек.

У Барысаве працягвала дзейнічаць Беларускае навукова-літаратурнае таварыства. У вёсцы Туміловічы Барысаўскага павета працаваў маладзёвы культурна-асветны гурток імя Янкі Купалы. У Юраўскай воласці Барысаўскага павета дзейнічалі культурна-асветныя гурткі ў вёсках Кашчыная Слабада і Рагатка. У Смалявічах плённа працаваў культурна-асветны гурток «Ніўка», у вёсцы Слабада Заслаўскай воласці — «Беларуская хатка». Беларускія маладзёвыя гурткі дзейнічалі ў Асіповічах, Рудзенску, Уздзе, Карме, Магільным, іншых вёсках і мястэчках Ігуменскага павета.

Няма звестак пра чыннасьць у пачатку 1920-х гг. нацыянальных гурткоў моладзі ў Мазырскім павеце. Беларуская культурная праца ў гэтым палескім рэгіёне ў гэты час праяўляла сябе вельмі слаба і не знайшла адлюстравання ні ў архіўных дакументах, ні ў тагачасных газетных паведамленнях.

Найбольш плённа пасля Менска ў межах маленькай тэрыторыі ССРБ беларуская праца развівалася на Бабруйшчыне. Многія з актывістаў мясцовых беларускіх маладзёвых арганізацый былі ўжо добра загартаваныя пераследамі з боку розных акупацыйных улад. Гэта ў першую чаргу былі Юлія Бібіла, Кастусь Шчыгельскі, Васіль Дружчыц, Мікалай Азбукін, Адам Цераховіч, Яўген Успенскі, Янка Самахвал, а таксама Мікалай Мамчыц, які прыехаў са Случчыны, і прысланы з Менска па заданні Наркамата асветы Алесь Адамовіч. Да іх далучыліся нядаўнія вучні тутэйшых гарадскіх і вясковых школ Алесь і Мікола Некрашэвічы[2], Янка Шахоцька, Алесь і Міхась

Рынейскія, Рудзік, Корбуш, Кітайчык, Бобрык ды інш.

Яшчэ да ўтварэння ў Бабруйскім павеце беларускага школьнага пададдзела тут дзейнічалі беларускія вучнёўскія і маладзёвыя гурткі ў Бабруйску, Глуску, Качэрычах, Любанічах, Турках, іншых вёсках і мястэчках. Напрыклад, утвораны Алесем Некрашэвічам Глускі беларускі гурток налічваў каля 140 сябраў.

У першы перыяд сваёй працы Беларускі аддзел Наркамасветы ССРБ выкарыстоўваў ранейшую практыку Часовага Беларускага нацыянальнага камітэту. З загартаваных працаўнікоў быў сфармаваны штат школьных інструктараў, якіх накіравалі ў правінцыю для арганізацыі беларускіх школ і культурна-асветных гурткоў. Але бяспраўнасць гэтых «беларускіх рэвідэнтаў» перад непрыхаванай варожасцю да ўсяго беларускага з боку мясцовага партыйна-савецкага апарату і большасці кіраўнікоў павятовых аддзелаў адукацыі, адсутнасць у патрэбнай колькасці беларускіх настаўнікаў, недахоп школьных падручнікаў на беларускай мове прымусілі кіраўнікоў Беларускага аддзела звярнуцца да кіраўніцтва наркамата з патрабаваннем аказаць прынцыповую падтрымку справе беларусізацыі. 15 жніўня 1920 г. на нарадзе інструктараў Беларускага аддзела была прынята рэзалюцыя «Аб ужыванні беларускай мовы ў культурна-асветных установах Беларусі». У ёй заяўлялася: «Нарада лічыць неабходным прыняць усе належачыя меры для падрыхтоўкі большага ліку работнікаў асветы, якія маглі б працаваць сярод беларускага сялянства на роднай беларускай мове і для шырокага выдавецтва кніг і падручнікаў на гэтай мове. Беларуская мова павінна па меры магчымасці... уводзіцца ў вясковыя школы ўжо ў цяперашнім навучальным годзе, асабліва ў пачатковых класах. У пазашкольным выхаванні дзяцей беларусаў адзінай мовай можа быць толькі беларуская. У школьнай рабоце з дарослымі беларусамі належыць мажліва шырэй карыстацца гэтай жа мовай».

Баючыся негатыўнай рэакцыі з Масквы, кіраўніцтва Наркамасветы, а таксама вышэйшыя асобы ЦВК і СНК ССРБ захоўвалі ў гэтай справе маўчанне. 20 лістапада 1920 г. загадчык Беларускага аддзела Я. Бялькевіч зноў звярнуўся да наркама асветы Марыі Фрумкінай у справе беларусізацыі школы: «На аснове пастановы пасяджэння Калегіі Камасветы Беларусі ад 29 кастрычніка 1920 г. ... была склікана нарада беларускіх інструктараў, дзе і пастаноўлена на абгавор пытанне аб пашырэнні працы беларускіх секцый пры павятовых аддзелах Камасветы. З дакладаў прыехаўшых з мейсцаў інструктараў выявілася, што ўвесь тормаз у самадзейнасці беларускіх секцый у тым, што дагэтуль Камасветы не выказаў рашуча свайго погляду на беларускую мову ў школах, і не выдаў ад сябе ніводнага цыркулярнага распараджэння ў гэтым кірунку. Праца інструктараў, працуючых без дырэктыў зверху, не прыводзіць да тых вынікаў, якія абавязкова патрэбны і павінны быць... Аб тым, што школа вясковая павінна быць беларускай, Камасветы добра ведае, але дагэтуль па невядомых прычынах утварэнне беларускай школы пакладаецца на сялянства саўсім несвядомае ў законах педагогікі. Такі ненармальны погляд Камасветы на справу робіць тое, што ў школе дагэтуль яшчэ цягнецца старое ламанне душы дзіцяці беларускага селяніна чужой для яго мовай. Без афіцыйнага распараджэння Камасветы аб рэформе школы і рэарганізацыі павятовых аддзелаў асветы, уся інструктарская праца зводзіцца да нуля. Секцыйны метад правядзення беларускай культуры ў шырокія масы сялянства дзеліць школу на дзве часткі — расійскую і беларускую, і дае магчымасць чарнасоценна настроенай частцы настаўніцтва агітаваць проці беларускай школы і адхіляць ад яе сялянства — дыскрэдытуе працу інструктараў і ў выніку ізноў застаецца школа з выкладаннем навукі на чужой мове. Для нармальнага развіцця беларускай культуры Камасветы Беларусі павінен неадкладна: 1) выдаць цыркуляр аб пераходзе выкладання навукі ў сялянскіх школах на беларускай мове; 2) выдаць цыркулярнае распараджэнне аб рэарганізацыі павятовых аддзелаў Камасветы і ўтварэнні пры іх секцыі нацыянальных меншасцяў (габрэйскай, польскай і расійскай); 3) увясці абавязковае выкладанне беларускай мовы і беларусазнаўства ў школах іншых нацыянальнасцяў, школах 2-й ступені і вышэйшых навучальных установах. Калі гэта не будзе зроблена, то пашырэнне дзейнасці беларускіх секцый выпаўніць немагчыма». Гэты зварот Я. Бялькевіча таксама застаўся без адказу.

Сітуацыя памянялася ў снежні 1920 г. з прыходам на пасаду наркама асветы рэспублікі Усевалада Ігнатоўскага. У апараце наркамата зацвярджаецца новая

«Інструкцыя аб Беларускім аддзеле Наркамасветы ССРБ», якая адразу зрушвае справу беларускай школьнай справы з мёртвай кропкі. Вось асноўныя палажэнні гэтай інструкцыі:

«І.1. Беларускі аддзел знаходзіцца пад непасрэдным загадам Наркамасветы ССРБ.

І.2. Беларускі аддзел мае права мець п/аддзелы і павятовыя філіі. [...]

ІІ.1. Беларускі аддзел мае за мэту канцэнтрацыю размеркавання культурных і педагагічных працаўнікоў, нагляд і вызначэнне напрамку ў беларускай культурнай працы.

ІІ.2. Беларускі аддзел здзяйсняе нагляд з боку ідэйнага кіраўніцтва над беларускімі школамі, дзіцячымі прытулкамі, дамамі, садкамі, клубамі і іншымі культурнымі ўстановамі, якія займаюцца выхаваннем.

ІІ.3. Аддзелам прызначаюцца кіраўнікі для ўсіх беларускіх устаноў, якія зацверджваюцца адпаведнымі глаўкамі або ўстановамі, у якую прызначаецца працаўнік.

ІІ.4. Інструктары, працуючыя на вёсках, апрача тых, якія выконваюць заданні секцыі нацыянальных меншасцяў, выконваюць заданні Беларускага аддзела і п/аддзелаў, а ў гарадах атрымліваюць заданні ад Беларускага аддзела і п/аддзелаў, апрача агульных заданняў, якія яны маюць ад сваіх устаноў.

ІІ.5. Беларускі аддзел дбае пра беларускае выдавецтва і вядзе нагляд за гэтым выдавецтвам».

За кароткі час пасля таго, як Наркамасветы ССРБ узначаліў У. Ігнатоўскі, у 6-ці паветах ССРБ было ўтворана некалькі дзясяткаў беларускіх пачатковых школ, культурна-асветных гурткоў, клубаў, бібліятэк-чытальняў. Толькі ў адным Бабруйскім павеце за лістапад 1920 г. — студзень 1921 г. былі адчынены ці аднавілі сваю працу 27 беларускіх школ у Асавецкай, Бортнікаўскай, Броскай, Бацэвіцкай, Акцябрскай (былой Рудабельскай), Глускай і Любанскай валасцях, у тым ліку адна сярэдняя школа 2-й ступені імя Янкі Купалы ў Бабруйску. У шэрагу сярэдніх школ 2-й ступені павета было ўведзена выкладанне беларусазнаўства. У пашырэнні беларускай школьнай справы асабліва вызначаліся браты Алесь і Мікалай Некрашэвічы. Літаральна за студзень 1921 г. яны «перавярнулі» ў беларускія Рамонавіцкую пачатковую школу, якую назвалі ў гонар Янкі Купалы, Запольскую імя Якуба Коласа і Карніцкую імя Алеся Гаруна, а ў 2-х школах увялі выкладанне беларускай мовы і беларусазнаўства. У студзені 1921 г. у Бабруйску быў арганізаваны беларускі народны культурна-асветны клуб імя Алеся Гаруна, які адразу набыў папулярнасць сярод мясцовай вучнёўскай моладзі. Нагадаем, што імя слыннага беларускага песняра ўжо тады не надта шанавалася савецкімі ўладамі (падчас польска-савецкай вайны ён узначальваў Беларускую вайсковую камісію і стаяў на выразна антыбальшавіцкіх пазіцыях).

Беларусізацыя навучальных устаноў і стварэнне новых культурна-асветных асяродкаў адбывалася дзякуючы намаганням у першую чаргу маладых працаўнікоў, большасць з якіх былі беспартыйнымі. Было таксама нямала тых, хто належаў да камуністаў і сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Розная партыйная прыналежнасць, аднак, не перашкаджала ім у супольнай беларускай працы.

І ўсё ж гэта была толькі лакальная перамога прыхільнікаў беларушчыны. Поступ беларусізацыі ў ССРБ у пачатку 1921 г. быў пазней перакрэслены масавымі арыштамі сябраў беларускіх арганізацыяў падчас вынішчэння эсэраўскіх і эсдэкаўскіх «гнёздаў». Прычынамі рэпрэсій стала негатыўная рэакцыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, сацыял-дэмакратаў і значнай часткі беларускага беспартыйнага актыву на заключэнне Рыжскай мірнай дамовы, паводле якой беларуская этнічная тэрыторыя была разарвана паміж Польшчай і Савецкай Расіяй.

Антыэсэраўская і антыэсдэкаўская акцыя рыхтавалася ў Маскве загадзя. У канцы 1920 г. у мясцовых аддзелах ГПУ ССРБ ужо меліся спісы сябраў ЦК і рэгіянальных аддзелаў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. «Усебеларускі стараста» Алесь Чарвякоў, схільны да палітычных кампрамісаў, даведаўшыся пра запланаваныя арышты, намагаўся, каб яны не закранулі «непавінных» — беспартыйных працаўнікоў. Ён раіў Ігнатоўскаму і іншым нацыянал-камуністам устрымацца на пэўны час ад актыўных дзеянняў у пашырэнні беларусізацыі. Ад імя ЦВК ССРБ 5 снежня 1920 г. ён выдаў цыркуляр, у якім загадваў: «Впредь до особого декрета, сношения между учреждениями должны вестись на русском языке». 4 лютага 1921 г. ЦВК Беларусі сваёй пастановай пацвердзіў ранейшы дэ-

крэт Літоўска-Беларускай ССР аб раўнапраўі беларускай, расійскай, польскай і габрэйскай моваў. Але гэты крок не прадухіліў расправу над беларускай нацыянальнай элітай, якая распачалася літаральна праз некалькі дзён пасля прыняцця названай пастановы.

Масавыя арышты ў ССРБ пачаліся ў сярэдзіне лютага 1921 г. За некалькі дзён было затрымана больш як 1200 беларускіх актывістаў. З іх 860 былі сябрамі БПС-Р, некалькі дзясяткаў — сацыял-дэмакратамі, а астатнія — беспартыйнымі. «Хапун» сябраў Беларускага работніцкага клуба, паводле словаў Міколы Равенскага, адбыўся падчас выступлення беларускага хору. «Арышту падвергглі, — успамінаў кампазітар, — не толькі сяброў клубнага камітэта і ягонага загадчыка (роднага брата М.Равенскага — Антона. — **У. Л.**), а нават усю беларускую інтэлігенцыю, якая ў той момант прысутнічала на канцэрце, як, напрыклад, Лёсіка, Іллючонка, Ляжневіча, Калевіча і шмат іншых (пераважна чыгуначнікаў), што цалкам спаралізавала шпаркія крокі развіцця клубнай працы. Зразумела, гэты арышт не абмінуў гэтаксама Галубка і мяне». Былы сябра Беларускай камуністычнай арганізацыі, малады пісьменнік Васіль Сташэўскі, які ў той час служыў у менскай вайсковай камендатуры, быў часова затрыманы па абвінавачванні ў «эсэраўскай агітацыі сярод чырвонаармейцаў». Тодар Апацёнак быў схоплены ў студэнцкім інтэрнаце за «антысавецкую прапаганду сярод слухачоў Менскіх беларускіх педагагічных курсаў». Былы адказны сакратар слуцкай «Папараць-Кветкі» Янка Ракуцька, які ў канцы 1920 г. быў прызначаны загадчыкам Менскага дзіцячага прытулку № 4, арыштаваны як «контррэвалюцыянер-эсэр» за тое, што ўводзіў беларускую мову ў гэтай навучальна-выхаваўчай установе.

У паветах былі арыштаваныя бадай што ўсе беларускія культурныя работнікі і настаўнікі, не зважаючы на іх партыйную прыналежнасць. Былі затрыманыя амаль усе актывісты слуцкай «Папараць-Кветкі» і большасці іншых маладзёвых гурткоў Беларусі. Двойчы падвергліся арышту ў 1921 г. супрацоўнікі Бабруйскага беларускага павятовага пададдзела народнай адукацыі, якія адначасова выкладалі ў мясцовай беларускай сярэдняй школе 2-й ступені імя Янкі Купалы: Ю. Бібіла, К. Шчыгельскі, В. Дружчыц, А. Цераховіч, М. Азбукін. Прычым арыштоўвалі іх дэманстратыўна, у сценах школы падчас заняткаў, у прысутнасці навучэнцаў. Тым самым хацелі запалохаць і дзяцей, якія навучаліся па-беларуску. Эсэраў Цераховіча і Шчыгельскага чэкісты пратрымалі ў вязніцы некалькі месяцаў, астатніх выпусцілі праз некалькі дзён пад падпіску аб нявыездзе.

Адначасова з арыштамі выкарыстоўваліся і іншыя сродкі ўздзеяння. Прыхільнікаў беларушчыны незаконна звальнялі з працы, выкідалі з універсітэта, пагражалі выслаць за межы ССРБ. У тым жа 1921 г. пад ціскам ГПУ з Белдзяржуніверсітэта былі выключаны Мікалай Каспяровіч, Васіль Камлюк, Тодар Гаўрыловіч і Гіпаліт Поляк. Апошнія двое былі не эсэрамі, а былымі сябрамі Беларускай камуністычнай арганізацыі, а ў канцы 1920 г. нават былі прыняты ў члены КП(б)Б. Але праз нейкі час яны напісалі заявы аб выхадзе з кампартыі: першы «дыпламатычна» патлумачыў прычыну дрэнным станам здароўя, другі напісаў шчыра, што расчараваўся ў камуністычнай ідэі. Выключалі іх з тыповай надуманай фармулёўкай «За непрадстаўленне дакументаў пра вайсковую службу ў чырвоным войску». У старшыні Кутнёўскай навуковай грамады, інваліда Першай сусветнай вайны С. Курчэвіч-Сеўрука, якому да таго ж падчас Яраслаўскага антыбальшавіцкага паўстання 1918 г. адарвала асколкам руку, мясцовыя міліцыянты забралі друкарку фірмы «Ундэрвуд», з дапамогай якой ён нешта мог зарабіць сабе на жыццё, друкуючы левай рукой па просьбе сялян розныя заявы і скаргі на мясцовую ўладу. Зроблена гэта было дзеля таго, каб не пісаў больш свае звароты ў Менск, у Беларускі аддзел Наркамасветы ССРБ.

Гэта быў сапраўдны «лютаўскі» пагром беларускай культуры і беларускага маладзёвага руху. Пад шумок «антыэсараўскай акцыі» арыштоўваліся ўсе, хто меў дачыненне да беларускай справы. Канфіскоўваліся і нішчыліся беларускія кніжкі і геаграфічныя карты, была знішчана ўся канцылярыя беларускага школьнага пададдзела ў Бабруйску. Органы ГПУ ліквідавалі Бабруйскі культурна-асветны клуб імя Алеся Гаруна, абвінаваціўшы ініцыятараў яго стварэння ў тым, што яны ў асобе паэта прапагандуюць беларускага шавініста і ворага савецкай улады. Памяшканне клуба было аддадзена пад патрэбы мясцовай вайсковай часткі. Дайшло да таго, што сакратар

Бабруйскага павятовага камітэта КП(б)Б Ц. Равінскі назваў беларускую мову «шавіністычнай» і заклікаў забараніць яе для шырокага грамадскага ўжытку.

Больш чым на месяц спынілі сваю працу беларускамоўныя школы ў Слуцкім, Ігуменскім, Бабруйскім і Менскім паветах. Алесь Тамашаў Адамовіч паведамляў з Бабруйска ў тыя дні: «На месцах у грамадстве склалася цвёрдае ўражанне, што савецкая ўлада свядома робіць уціск беларусаў, іхнай мовы і культуры. Прыкладам гэтага з’яўляецца тое, што на працу ў беларускі пададдзел ніхто не хоча ісці, баючыся арыштаў. Асобы, якія маюць беларускую літаратуру, пачалі хаваць яе або паліць».

Праз тыдзень ці месяц чэкісты выпусцілі ўсіх, але «прафілактычная» праца была праведзена. У многіх з арыштаваных надоўга застаўся страх, адчуванне таго, што вызвалілі ненадоўга і хутка прыйдуць зноў. Маральна слабейшых чэкісты прымусілі падпісаць дамовы аб «добраахвотным супрацоўніцтве з органамі ГПУ». Але рэпрэсіі і запалохванні не пахіснулі перакананняў большасці. Прыкладам служыць пазіцыя сябраў беларускага вучнёўскага гуртка пры Бабруйскай сярэдняй школе імя Янкі Купалы. 19 лютага 1921 г. яны звярнуліся ў Наркамасветы БССР з наступнай заявай: «Мы, навучэнцы Першай беларускай савецкай школы 2-й ступені, моцна абураны ўчынкам Палітбюро ГПУ[3], якое быццам бы (на наш пагляд) жадае знішчыць у нашай школе нашу арганізацыю, а таксама забараніць займацца вывучэннем сваёй роднай старонкі. Цяпер у нас заняткі амаль спыніліся і ў нас, вучняў, настрой надта падаўлены. Мы, навучэнцы 1-й беларускай савецкай школы 2-й ступені, у адзін голас клічам і будзем клікаць: «Няхай жыве свабодная Савецкая Беларусь!» I нас нічога не заставіць адыйсці ад гэтага. Мы пратэстуем супраць гэтага ўчынку, якім, як бачна, жадаюць задавіць нас — беларусаў, жадаюць задавіць развой беларускай культуры. Мы не контррэвалюцыянеры, а верныя сыны Савецкай Беларусі, і мы пратэстуем супраць гэтага ярлыка, якім нас клеймяць, чаго не павінна быць. Няхай не папракаюць нас, няхай не прымушаюць нас адрачыся ад сваёй роднай зямлі, Маткі Беларусі, таму што ніхто не заставіць нас гэта зрабіць. Які жах наводзіць на нас учынак Палітбюро — узброеныя людзі прыходзяць у школу, каб арыштаваць нашых выкладчыкаў, якія нас навучаюць роднай беларускай мове. Факты падаўлення беларускай культуры, якія тварацца палякамі на занятай імі частцы Беларусі, не павінны паўтарацца ў гэтай частцы Беларусі, якая называецца Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай. Сябры культурна-драматычнага гуртка пры 1-й беларускай савецкай школе 2-й ступені, знаходзяцца ў падаўленым настроі, але няхай не думаюць ворагі Беларусі, што ў нашай беларускай школе будзе «рэарганізацыя» нашага гуртка і мы адмовімся ад беларускай мовы. Ніколі на свеце! Просім Наркамасветы прыйсці нам на падтрымку і хадайнічаць аб вызваленні выкладчыкаў 1-й беларускай савецкай школы 2-й ступені, і каб нам не перашкаджалі весці вучэбныя заняткі і працу культурна-драматычнага гуртка, у чым і падпісваемся». Гэтая заява-пратэст была прынята аднагалосна на сходзе гуртка, на якім прысутнічалі 129 чалавек (!).

У адказ беларускі вучнёўскі гурток быў разагнаны па загаду ДПУ. Але ўжо ў студзені 1922 г. маладыя настаўнікі — браты Некрашэвічы, Рынейскі, Кітайчык і інш. — засноўваюць у Бабруйску новы беларускі педагагічны гурток і, нягледзячы на «няістаўства» мясцовага кіраўніка павятовага аддзела адукацыі Бабачонка, адкрываюць «Бабруйскую павятовую хату беларускай культуры і мастацтва». Пры падтрымцы У. Ігнатоўскага гурток дабіваецца ад мясцовага кіраўніцтва арганізацыі ў Бабруйску беларускіх павятовых настаўніцкіх курсаў, увядзення выкладання беларускай мовы і прадметаў беларусазнаўства ў мясцовым педтэхнікуме, ва ўсіх сярэдніх школах 2-й ступені. Пры «Беларускай хатцы» дзейнічаюць драматычная, харавая і літаратурна-гістарычная секцыі. Драматычная дружына і хор беларускага гуртка ў Бабруйску даюць прадстаўленні не толькі для маладой публікі. Штораз спектаклі і канцэрты ставяцца для вайскоўцаў 8-й тэрытарыяльнай дывізыі. Летам маладыя артысты зрабілі ўдалыя мастацкія вандроўкі ў Броскую і Любанскую воласці, заахвочваючы да нацыянальна-культурнай працы мясцовую моладзь.

Беларуская нацыянальная справа цяжка прабівала сабе дарогу. Вялікі рэзананс у рэспубліцы атрымаў «моўны інцыдэнт» у 2-й Менскай савецкай школе 2-й ступені — былой мужчынскай казённай гімназіі. Гісторыя пачалася яшчэ ў верасні 1922 г., а скончылася ўвесну 1923 г. На па-

чатку навучальнага года гарадскі аддзел адукацыі накіраваў на працу ў названую сярэднюю школу ў якасці настаўнікаў малодшых класаў ужо вядомых нам Я. Кіпеля і Т. Апацёнка. Сваю педагагічную чыннасць яны пачалі з пераводу выкладання школьных прадметаў на беларускую мову. У хуткім часе дырэкцыя школы, дзе заселі заўзятыя русіфікатары — Уладзімір Клімантовіч, былы дырэктар гімназіі, і яго намеснік, выкладчык гісторыі Мікалай Маслаковец, — самавольна адмянілі «гэтую беларусізацыю». Настаўнікі, са свайго боку, праігнаравалі загад дырэкцыі і надалей працягвалі выкладаць па-беларуску. Адказам на гэта было іхнае звальненне. Маладыя беларускія педагогі доўгі час дамагаліся свайго аднаўлення на ранейшых пасадах. Розгалас гэтага «моўнага супрацьстаяння» дайшоў і да кіраўніцтва КП(б)Б, пасля чаго інцыдэнт быў разгледжаны на паседжанні Цэнтральнага Бюро кампартыі Беларусі. Папярэдне планавалася ўсіх удзельнікаў канфлікту выслаць за межы Рэспублікі. Але дзякуючы заступніцтву Ігнатоўскага і Баліцкага настаўнікаў Кіпеля і Апацёнка ўдалося тады адбіць (праўда, без права аднаўлення на ранейшым месцы працы).

1922 год стаў апошнім у працы Беларускага работніцкага клуба. Спробы нацыянал-камуністаў абараніць БРК былі дарэмныя. Гэтаму не паспрыяла нават акцыя па стварэнні пры клубе камуністычнай і камсамольскай суполак. Пасля ліквідацыі БРК Беларускі вандроўны тэатр У. Галубка перайшоў на «сабекошт». Гэта дрэнна адбілася на яго працы: трупу адзін за адным пачалі пакідаць лепшыя яе артысты. І толькі ў 1923 г. фінансавая падтрымка Наркамасветы ССРБ выправіла справы ў тэатры. Пазней на яго аснове быў утвораны Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр (БДТ-3).

Нацыянал-дэмакратычныя арганізацыі, у тым ліку і маладзёвыя, падвяргаліся пераследу і касаваліся па розных матывах. Ім адмаўлялі ў ранейшай юрыдычнай рэгістрацыі, звальнялі яе актывістаў з працы або выключалі з ліку студэнтаў. Праз цэнзуру жорстка рэгламентавалася літаратурная і тэатральная чыннасць. Улады аператыўна перапісвалі адміністратыўнацывільнае заканадаўства ў бок большай яго жорскасці.

22 снежня 1921 г. паводле пастановы ЧК-Бел (Надзвычайнай Камісіі ССРБ) за подпісам яе старшыні Я. Ольскага загадвалася ўсе драматычныя творы, што ставіліся ў тэатрах і клубах, абавязкова прадстаўляць у аддзел ваеннай цэнзуры, «для накладання дазвольнай візы, без якой ніводзін твор не павінен быць пастаўлены на сцэне… Пры невыкананні гэтай пастановы не будзе дазволена друкаванне адпаведных афіш, анонсаў, праграм і г. д., а віноўныя, якія абышлі цэнзуру тым ці іншым шляхам, будуць сурова пакараны».

11 кастрычніка 1922 г. быў выдадзены «драконаўскі» дэкрэт ЦВК ССРБ «Аб парадку зацвярджэння і рэгулявання таварыстваў і саюзаў, якія не прадугледжваюць мэтаў атрымання прыбытку, і аб парадку нагляду за імі». Свабоднае існаванне няўрадавых арганізацый моцна абмяжоўвалася. Усе дакументы на рэгістрацыю спачатку накіроўваліся ў НКВД, а адтуль — у сакрэтны аддзел ГПУ Беларусі. Толькі пасля санкцыі апошняй інстытуцыі статут і іншыя рэгістрацыйныя дакументы зацвярджаліся ў міліцыі. Для рэгістрацыі былі неабходныя наступныя «паперы»: статут арганізацыі, спіс яе заснавальнікаў з адзначэннем іх месца жыхарства, сацыяльнага паходжання і маёмаснага стану, працоўны стаж з 1914 г., а таксама партыйнасць. Яшчэ патрэбна было назваць месца знаходжання арганізацыі, якая падлягала рэгістрацыі. Зразумела, што ўсе дакументы павінны былі прадстаўляцца на расійскай мове.

У тым жа 1922 г. была абвешчана перарэгістрацыя старых грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. Падчас гэтай рэгістрацыі была ліквідавана чыннасць менскага кааператыўнага выдавецтва «Адраджэнне», слуцкай «Папараць-Кветкі», менскага маладзёвага гуртка «Беларуская хатка», «Кутнёўскай навуковай грамады», больш як дзясятка іншых беларускіх культурнаасветных гурткоў. «Бабруйскай павятовай хаце беларускай культуры і мастацтва» ўдалося захаваць сваю чыннасць, цалкам падпарадкаваўшыся мясцовай камсамольскай арганізацыі, што фактычна было раўнасільна самаліквідацыі. Па волі ГПУ Беларусі не былі зарэгістраваны беларускае літаратурнае таварыства «ВІР» у Менску, Таварыства беларускіх працаўнікоў асветы, а таксама шэраг іншых беларускіх грамадскіх устаноў.

Як мы бачым, палітычны і прававы пераслед дзеячаў беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху ў Савецкай Беларусі ніколі

не спыняўся. Праўда, у пэрыяд новай эканамічнай палітыкі, калі дзеячы і арыштоўваліся, то хутка адпускаліся. Тады культурнікаў яшчэ рэдка прыгаворвалі да расстрэлу за «антысавецкую чыннасць» ці за «шпіянаж на карысьць замежных выведак». У 1920-я гг. да іншадумцаў яшчэ не выкарыстоўвалі «фізічных сродкаў дазнання». Пакуль што, як правіла, усё абмяжоўвалася «тлумачальнымі гутаркамі» ў кабінеце следчага ГПУ, які намагаўся маральна напалохаць падследнага, а калі «пашанцуе» — завербаваць яго ў якасці «сексота».

Да ліпеня 1924 г. савецкія органы дзяржбяспекі ліквідавалі рэшткі небальшавіцкіх палітычных і грамадскіх структур. Такім чынам яны расправіліся з Беларускай партыяй сацыялістаўрэвалюцыянераў. Спачатку некаторым яе сябрам — Я. Шнаркевічу, М. Шылу, П. Бадуновай, В. Матэйчук — у «добраахвотна-прымусовым парадку» было прапанавана паехаць у Заходнюю Беларусь і арганізаваць там антыпольскае эсэраўскае падполле. Затым былі праведзены масавыя арышты ўсіх, хто застаўся і хто належаў да гэтай партыі. У гэты час удалося завербаваць некаторых сябраў БПС-Р, змусіць іх прызнаць «кіруючую ролю камуністычнай партыі», паставіць ім задачу забеспячэння арганізацыйнага расколу партыі і яе «палітычнага разбраення». Пасля абвяшчэння ў 1923 г. амністыі ранейшым праціўнікам савецкай улады з Заходняй Беларусі, Ковенскай Літвы і Чэха-Славакіі былі выцягнутыя ў БССР аўтарытэтныя прадстаўнікі БПС-Р Алесь Карабач, Аляксандр Галавінскі, Рыгор Казячы, Улас Дубіна, Алесь Парук і інш. У рэшце рэшт ад іх дамагліся згоды на самаліквідацыю партыі беларускіх эсэраў у чэрвені 1924 г. Але завяршальны ўдар па «нацыянал-дэмакратызму» ў Беларусі быў яшчэ наперадзе.

### «Лістападаўская справа» 1925 г.

Расправа маскоўскіх бальшавікоў над слуцкімі паўстанцамі ў 1920 г. не спыніла нацыянальна-вызвольнага руху на Случчыне. Эстафету змагання пераймае з рук старэйшага пакалення малодшае. На Случчыне неўзабаве паўстае новая маладзёвая паўстанцкая арганізацыя, якая набывае яшчэ больш выразны нацыянальны і антыбальшавіцкі характар. Ініцыятары стварэння патрыятычнага гуртка, сведкі нядаўнага збройнага чыну, зноў узнялі бел-чырвона-белы штандар. Беларускі нацыянальны супраціў працягваўся…

Для слуцкага аддзела ГПУ было поўнаю нечаканасцю з'яўленне ў жніўні 1925 г. у вёсках Селішча, Дарасіно, Еўлічы, Пагост улётак з антыбальшавіцкімі і антырасійскімі заклікамі. У адной з адозваў, прылепленай мякішам жытняга хлеба да тэлеграфнага слупа каля будынку валаснога савета, ад рукі было напісана: «Браты-сяляне! На нашых вачох адбылася рэвалюцыя. Вы бачылі тое, што не бачылі вашы дзяды. Сем год ужо пануюць у нас бальшавікі. За гэты час колькі вашых сыноў і братоў пайшло на той свет! Колькі знішчана дабра і спалена будоўлі, адабрана ад вас коней і кароў! Наш родны край Беларусь заліты крывёй нашай і вагнём. Нашы палеткі зрыты акопамі і магіламі нашых сыноў. Нам абяцаліся, што не будуць браць падаткаў, дадуць свабоду, дармовыя школы, бальніцы і г. д. Рай дакларавалі бальшавікі нам на словах, але што мы бачым? Савецкая ўлада забірае апошнюю кароўку за падатак. Хлеб ідзе задарма. Школ няма. За вучобу трэба плаціць. За лекі плаці. У сельскай радзе — плаці. Без грошай ні кроку! Нас ашукалі. Дык вон ашуканцаў!.. Сяляне! Не плаціце падаткаў! Гуртуйцеся цэлымі вёскамі і не плаціце!.. Сяляне! Кіньце сварыцца! Арганізуйцеся ў сялянскі хаўрус! Наш вораг не сусед, а бальшавікі. Зноў турмы запоўнены сялянамі за падатак і іншае. Зноў селянін павінен здымаць шапку перад савецкім панам. Далоў новых паноў — камуністых. Сяляне, арганізуйцеся! Брат з братам, сусед з суседам, вёска з вёскай і так далей, пакуль не будзе злучана ўся Беларусь! Нас сілком падзялілі. Адну частку Беларусі душаць польскія паны, а другую — маскоўскія бальшавікі. Нашай працай, працай гаротнага беларускага селяніна кормяцца ўсе дармаеды! Мы павінны сказаць: Наша праца, наш хлеб — наш! Далоў ашуканцаў! Далоў паноўкамуністых! Мы хочам быць самі над сабою панамі!.. Няхай жыве праўда! Няхай жыве Вольная Беларусь! Арганізуйцеся!»

Былі і больш лаканічныя ўлёткі: «Сяляне, Браты родныя! Зноў нас заціснулі паны і бальшавікі. Дзяруць вялікія падаткі і шмат іншага… Даволі стагнаць! Давайце збудуем сваю ўладу, Дзяржаву Беларусь! Народ, паўстань!».

Праз паўтара месяца, з дапамогай сваёй агентуры, ГПУ ўдалося выйсці на след антыбальшавіцкай



*Нічыпар Мяцельскі, кіраўнік і ідэолаг беларускага падпольнага маладзёвага гуртка «лістападаўцаў» на Случчыне. Фота 1920-х гг. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*

арганізацыі. Гэта былі маладыя настаўнікі і навучэнцы са Случчыны: Нічыпар Мяцельскі, Міхась Макарэня, браты Рыгор і Мікалай Казакі, Міхась Дземідовіч і інш. Падчас навучання на Слуцкіх агульнаадукацыйных настаўніцкіх курсах яны складалі ядро гуртка беларусазнаўства, якім кіраваў выкладчык беларускай мовы і літаратуры, былы слуцкі паўстанец Юрка Лістапад. Можа, таму кіраўніком новай паўстанцкай арганізацыі чэкісты «прызначаюць» менавіта Лістапада, хоць супраць яго не было выяўлена кампрамату. Але чэкісты не забыліся пра тое, што ён быў удзельнікам Слуцкага збройнага чыну, а потым нейкі час жыў і працаваў у Вільні.

У апошнія дні кастрычніка 1925 г. усе падазраваныя ў арганізацыі антыбальшавіцкай змовы былі арыштаваныя, на іх кватэрах праведзеныператрусы. У маладога настаўніка з вёскі Бясяды Лагойскага раёна Міхася Макарэні чэкісты знайшлі ліст з Прагі ад аднаго з лідараў Слуцкага збройнага чыну Сяргея Бусла, які ў той час вучыўся ў Чэхіі, у горадзе Падэбрады, у Украінскай вышэйшай гаспадарчай акадэміі, а таксама рукапісны часопіс «Наша слова», які стане потым ледзь не галоўным абвінаваўчым аргументам на судзе. Падчасператрусу на кватэры Лістапада гэпэушнікамі нічога выяўлена не было, калі не лічыць гадавіка газеты «Вольная Беларусь» за 1918 г. і ўласных ягоных рукапісаў з літаратурнымі творамі і перакладамі. Следчы звярнуў увагу таксама на фотакартку Якуба Коласа з дарчым надпісам, якую Лістапад захоўваў на добрую памяць пра супольную педагагічную працу з паэтам на настаўніцкіх курсах у Слуцку ў 1923 г. Гэты факт і прыцягнуў найбольшую ўвагу кіраўніцтва ГПУ БССР.

Шэф савецкай ахранкі ў Беларусі Іосіф Апанскі праславіўся тым, што ў 1920 г. з'яўляўся намеснікам начальніка Асобага аддзела 16-й арміі, якая ўдзельнічала ў задушэнні Слуцкага збройнага чыну. Яму даўно карцела распраўіцца і з нацыяналкамуністамі, што намагаліся разгарнуць у рэспубліцы палітыку беларусізацыі. За галоўныя «гнёзды» беларускага нацыяналізму ў Савецкай Беларусі Апанскі лічыў Наркамат асветы і Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), якія ўзначальвалі Усевалад Ігнатоўскі і Антон Баліцкі. У Інбелкульце, дарэчы, працаваў і Якуб Колас. ГПУ быў вядомы факт, што ўлетку 1924 г. на менскай кватэры пісьменніка спыняўся былы яго навучэнец, а цяпер адзін з галоўных змоўшчыкаў Нічыпар Мяцельскі. У Менску Мяцельскі меў кантакты і з іншымі вядомымі ў беларускіх колах людзьмі.

Апанскаму, відаць, ужо мроіўся гучны судовы працэс над лідарамі беларускага нацыянальна-культурнага руху. 24 кастрычніка 1925 г. ён падпісвае ордэр наператрус у кватэры Якуба Коласа. Праз дзень на допыце ў ГПУ напалоханы паэт заявіць, што ні ў якіх палітычных арганізацыях пры савецкай уладзе не ўдзельнічаў і не ўдзельнічае, што зараз цікавіцца толькі сучасным побытам беларускіх працоўных масаў для напісання новых літаратурных твораў.

Рэалізаваць задуманае Апанскаму перашкодзіла найвышэйшае кіраўніцтва АГПУ ў Маскве. Там палічылі гэтую акцыю нясвоечасовай і не адпаведнай тагачаснай палітычнай сітуацыі. Яшчэ не была да канца расколата антысавецкая апазіцыя за кардонам, яшчэ заяўляла пра сябе беларуская эміграцыя ў Чэхаславакіі, Латвіі і Літве, яшчэ мелася апазіцыя ўнутры бальшавіцкай партыі. Таму трэ-



Няхай жыве Вольная Беларусь!

Наша слова.

Беларуская часопісь розных галін літаратуры.

№ 1.

1925 г.

Беларускае вучнёўскае т-ва „Згода".

Слуцак — 1925 г.

*Тутульная старонка рукапіснага часопісу «лістападаўцаў» «Наша слова». 1925 г. З архіва КДБ Рэспублікі Беларусь.*

ба было пакуль што працягваць імітацыю падтрымкі палітыкі беларусізацыі, прэзентуючы Менск у якасці адзінага цэнтра культурнага і дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі. Яшчэ толькі што адбылася сумнавядомая Берлінская палітычная канферэнцыя, дзе было абвешчана пра самаліквідацыю ўрада БНР. З мэтай завабіць лідараў беларускай палітычнай эміграцыі ў СССР савецкі ўрад абвесціў у 1923 г. палітычную амністыю ўдзельнікам антыбальшавіцкіх выступленняў. Гэта «амністыя» была прадублявана ў 1923 г. урадам БССР. Паверыўшы ў шчырасць бальшавіцкай улады, многія дзеячы БНР (Аляксандр Цвікевіч, Лявон Заяц, Уладзімір Пракулевіч, Аляксандр Галавінскі, Алесь Карабач і інш.) прыедуць у савецкі Менск. Дарэчы, тут яны атрымаюць халодную сустрэчу з боку мясцовых нацыянал-камуністаў і нацдэмаў. Пазней Міхась Чарот адкрыта выкажа А. Цвікевічу прычыну гэтае нядобразычлівасці: «Пакуль Вы былі там (за кардонам. — **У. Л.**) — нам тут дыхалася лягчэй». Гэта значыць — дазвалялася больш.

Не забудземся і пра тое, што на 1926 год у Менску была запланавана прадстаўнічая акадэмічная канферэнцыя, куды запрашаліся вядомыя мовазнаўцы-славісты з Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Трэба было пусціць пыл у вочы гасцям, каб тыя паверылі ў вялікія поспехі бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі. Арганізацыя шырокамаштабнага судзілішча над беларускімі патрыётамі ў такіх умовах магла парушыць далёкасяжныя планы маскоўскага кіраўніцтва. Гучныя судовыя працэсы над беларускімі дэмакратамі яшчэ наперадзе, а пакуль Крэмль яшчэ спрабуе дэманстраваць прыязнасць да нацыянальных рухаў на абшарах былой царскай імперыі. Над «групай Лістапада» вырашана было правесці непрацяглы паказальны судовы працэс і паказаць абвінавачаных на ім як банду кулацкіх сынкоў, якія рыхтавалі ўзброенае паўстанне з мэтаю зрынуць савецкую ўладу і ўсталяваць уладу кулакоў і абшарнікаў.

Кім жа былі папраўдзе тыя маладыя случакі, якія ўступілі ў няроўнае змаганне з бальшавіцкім рэжымам? Свае думкі яны выклалі ў рукапісным часопісе «Наша слова», для выдання якога маладыя патрыёты аб'ядналіся ў гэтак званае Беларускае выдавецкае таварыства «Згода». Галоўнымі лозунгамі свайго выдання аўтары абралі два: «Няхай жыве вольная Беларусь!» і «Роднае слова — пашырайся!».

Першыя старонкі часопіса (а выйшла ўсяго 2 сшыткі) знаёмяць нас з жыццяпісамі ягоных творцаў. Міхась Дземідовіч пад псеўданімам «Пачатковы Міхась» так распавядае пра сябе: «Нарадзіўся я 24 чэрвеня 1905 г. у невялікім засценку Панічы (назвы родных мясцінаў зашыфраваныя следчымі ГПУ. — **У. Л.**) Слуцкага павета Меншчыны ў небагатай сям'і хлебароба. Раней бацькі мае жылі ў вёсцы Мікалаеўшчына... але ў 1894 г. пачулі аб продажы зямлі ў двары Панічы нейкай князёўны, прадаюць свой кавалак зямлі ў Мікалаеўшчыне Міцкевічу, дзеду сучаснага вядомага беларускага паэта Я. Коласа — Міцкевіча, і пераязджаюць на жыццё ў Панічы...

Пад наглядам бацькі і маці хутка ўцяміў літары і, прайшоўшы лемантар, на другую зіму пайшоў вучыцца па хатах у сваім засценку разам з другімі хлапцамі». Потым Міхась здабываў навуку ў народнай школе мястэчка Пагост і ў Дарасінскай вясковай школе. Увосень 1918 г. паступіў у Слуцкую рускую мужчынскую гімназію. Але хвароба перашкодзіла вучобе. Праз год скончыў Пагосцкую валасную гімназію. Увосень 1924 г. паступіў на агульнаадукацыйныя настаўніцкія курсы ў Слуцку.

Кароткі жыццяпіс юнака можна дапоўніць звесткамі з архіўных крыніц. Небагатыя бацькі Міхася Дземідовіча мелі 5 дзесяцін зямлі і 12 душ едакоў, працаздольныя былі толькі бацька і старэйшая сястра. Падчас допыту ў ГПУ Міхась скажа: «Савецкая ўлада не звяртае ўвагі на беднату. З курсаў звольнілі за нявыплату грошай за навучанне». На заняткі часам хадзіў босы. Сярод аднакурснікаў быў адметны. Кепска вучыўся па матэматыцы, «вусна сказаць нічога не мог», як засведчыць потым ягоны ранейшы настаўнік Ціт Курбыка, але на беларускай мове пісаў «па-мастацку», таму Лістапад ставіўся да яго вельмі прыхільна. На курсах лічыўся лепшым беларусазнаўцам. «Астатняе да яго, як да каменя, нічога не прыставала»,— здзіўляўся Курбыка.

Пасля арышту Дземідовіч прызнаўся, што пісаў і расклейваў адозвы разам з навучэнцам Слуцкіх курсаў Дубоўскім вакол вёскі Пагост. Тэкст улёткі супадае з запісамі ў ягоным нататніку, знойдзеным прыператрусе. «Супраць волі сціскаецца сэрца, калі бачыць увесь здзек над сялянамі. Калі ж, Беларусь,

пабачыш ты ўдзячнасць за сваю цяжкую працу?.. Вочы нашы адкрыліся, туман пачаў рассейвацца. Мы ў рэшты-рэшт убачылі ўсю праўду... Мы скінем гэтае ярмо...». У будучыні Дземідовіч бачыў сябе сялянскім правадыром. Паводле ягонага ліста да Курбыкі: «Народ наш у няволі. Аб'яднацца нам дапамогуць нацыя і рэлігія. Трэба падтрымліваць беларускі рух нават сярод буржуяў і паноў». З усіх духоўных каштоўнасцяў прыярытэт юнак надаваў нацыянальнай ідэі. У тым самым лісце ён разважаў, што «лозунг, вакол якога ўзнялі партыйцы лямант — «Тварам да вёскі» — на самай справе — пусты гук». Ставіўся з павагай да расійскіх літаратурных класікаў і паступовых дзеячаў. Прыператрусе ў бацькавай хаце ў Панічах знайшлі творы Максіма Горкага, Аляксандра Пушкіна, Мікалая Гогаля, Івана Ганчарова, кнігу Пятра Крапоткіна «Хлеб і воля».

Спадзеючыся хутка зламаць дух рамантызму ў Міхася Дземідовіча, у ягоную камеру пасадзілі «сексота», нейкага Лукашова, які ўвесь час старанна апрацоўваў хлопца, «тлумачачы» таму, што казаць і што пісаць, асабліва пра Якуба Коласа і Юрку Лістапада. Але ў лютым 1926 г., напярэдадні суда, Дземідовіч адмовіўся ад ранейшых паказанняў, спасылаючыся на прымус з боку Лукашова і пагрозы арышту ды расстрэлу бацькоў. Падкрэслім, што гэтаму «контррэвалюцыянеру» было толькі 20 гадоў, калі ён стаў перад бальшавіцкім судзілішчам.

Наступны кароткі нарыс свайго жыцця на старонках «Нашага слова» пакінулі «Апавядальнік Алесь» і «Малы Язэп» (браты Рыгор і Мікалай Казакі). Браты нарадзіліся (старэйшы — 20 лістапада 1907 г., малодшы — 20 кастрычніка 1908 г.) у сям'і паштовага чыноўніка ў Вільні. Яны з самай калыскі выхоўваліся на расійскай і нямецкай мовах. Беларускай мовы ў дзяцінстве «не чулі ніводнага слова, як быццам яна зусім не існавала. Вясковага жыцця зусім не ведалі». Першая сусветная вайна ператварыла іх родны горад у лазарэт. «Паветра напоўнілася пахам крыві, стагнаннем, крыкамі і плачам». Такія ўспаміны захаваліся з дзяцінства. Сям'я знайшла прытулак у матчынага бацькі ў вёсцы Еўлічы Слуцкага павета. Тут яны ўпершыню сутыкнуліся з цяжкім сялянскім жыццём, упершыню пачулі беларускае слова. Але вайна пагнала далей. Пасля вандровак па расійскіх гарадах сям'я Казакоў прыпынілася ў Разані, дзе браты пачалі вучыцца ў г. зв. «пушкінскай вучэльні» — трохгадовай пачатковай школе, а пазней працягвалі навучанне ў Разанскай мужчынскай гімназіі. У 1918 г. пачаўся выкліканы бальшавіцкай палітыкай голад. У пошуках паратунку сям'я вяртаецца ў Беларусь, у Еўлічы, дзе пасля адыходу немцаў запанавала савецкая ўлада. Калі новая ўлада «занялася хатнімі справамі», як зазначылі браты, у Слуцкай земскай гімназіі пачалі вучыць на беларускай мове. Захапленне хлапчукоў родным словам, як ні крыўдна, не падзялялі іхныя бацькі, якія ад беларускай мовы адцураліся. «Зышлі са сцежкі роднай, блукаючы на чужацкай невядомай дарозе»,— з горыччу пісалі юнакі. Затое паразуменне яны знайшлі сярод сваіх аднакласнікаў.

З'едліва і ў палітычным сэнсе трапна гучыць сатырычны памфлет Рыгора Казака на ўсю партыйна-савецкую наменклатуру і яе маладзейшы рэзерв — камсамол і піянерыю, пад назвай «Хто такія?»:

Хто сядзіць у самаходзе
Гэтак паважна і чынна,
Хто крыкунчык у народзе,
Адгадай сукіна-сына?
Камунар!
У каго «сабачка» з боку,
Ад якое гінуць людзі?
Хто баіцца зрабіць кроку
За «свабоду» ставіць грудзі?
Камісар!
Хто згубіў у народзе веру,
Жар чужой рукой зграбае,
Піша тое на паперы,
Што на свеце не бывае?
Камуніст!
«Вызваліцель» хто сялянства,
Што падатак выціскае,
Хто найгоршы нават панства,
Дым у вочы ўсім пускае?
Камуніст!
Хто гардзіцца, што ўсё знае
І гарой стаіць за ўладу,
Хто мандат аршынны мае
І зрабіць гатовы здраду?
Камсамолец СССР.
Хто з дзяцей надта вучоны,
Хто свайго бацьку навучае?
Носіць гальштучак чырвоны,
Розны штукі вытварае?
Піянер!

І тут мы дапоўнім наш аповед архіўнымі звесткамі. Рыгор Казак, ён жа «Апавядальнік Алесь», ужо навучэнец Менскага беларускага педтэхнікума, пасля першага допыту ад 25 кастрычніка быў з-пад арышту вызвалены. Са слоў Рыгора следчы запісаў наступнае: «...в 1924–25 учебном году я, учась на Слуцких общеобразовательных курсах, участвовал в легальном кружке по белорусоведению, старшиной коего был Макареня Михаил, секрета-

рём — Демидович Михаил. С течением времени из указанного кружка выделился нелегальный антисоветский кружок, в состав которого входили: Макареня, Демидович, Казак Николай, Ничипор Мятельский и др., чьих фамилий не знаю. Макареня и меня вербовал в этот кружок. [Он] говорил мне, что у них имеются револьверы, хотел дать и мне оружие, но я отказался. Брату моему Макареня оружие показывал действительно. Цель кружка — создание незалежной Вольной Белоруссии. Макареня был в тесной связи и даже в дружбе с Листопадом, и я подозреваю, что Листопад идейно влиял на слуцкую молодёжь, пошедшую по нелегальной дороге…».

Наколькі задаволілі гэпэушніка паказанні Казака, невядома. Рыгор скардзіўся, што за выхад з гуртка яму пагражалі і называлі здраднікам. На лаву падсудных сядзе яго малодшы брат Мікалай, які скажа на судзе, што ў адозвах «як думаў, так і пісаў» і расклейваць іх не баяўся, «бо савецкая ўлада дае свабоду слова». Сям'я Казакоў небагатая, на 4 чалавекі прыходзілася 4 дзесяціны пясчанай зямлі і вельмі вялікі падатак. Слуцкая школьная рада вымагала вялікія грошы за навучанне. Мікола бачыў, што на курсах мала сялянскіх дзяцей, галоўным чынам дзеці габрэйскіх «спекулянтаў і лавачнікаў». На курсах, нават сярод слухачоўбеларусаў, мала ўжывалася беларуская мова. Мікалай тлумачыў прычыну стварэння часапісу «Наша слова» і сваё аўтарства ў ім тым, што рэдкалегія насценнай газеты курсаў «Чырвоны курсант» адмаўляецца змяшчаць творы па-беларуску.

Моўную праблему ўздымае і аўтар наступнага «абеглага самарысу жыцця» — «Самотны Міхась», ён жа Міхась Макарэня, ураджэнец вёскі Сухаўчыцы Слуцкага павета. Пачынаў ён вучыцца ў Слуцкай рускай мужчынскай гімназіі ў тыя часы, калі пра выкладанне на беларускай мове нават не заікаліся. «Калі сам гаварыў на ёй, то ўсе смяяліся з мяне… і толькі ў 1923 годзе пад уплывам адной асобы (Ю. Лістапада, як няцяжка здагадацца. — **У. Л.**) я зрабіўся гэтакім, і цяпер пазнаў сапраўднае жыццё».

У дзевятнаццацігадовага Міхася Макарэні былі свае важкія прычыны выступіць з пратэстам супраць бальшавіцкай улады. Ён, як вынікае з артыкульных тэкстаў, «быў супраць парадкаў, таму што бачыў, як савецкія адказныя працаўнікі, асабліва партыйныя, не лічыліся з інтарэсамі бедных сялян. Адзін з такіх пабіў маці. Жыццё бацькі дрэннае. Ён не меў магчымасці ў 1923–24 гадах заплаціць падаткі. Па суду спагналі ў два разы больш…». У дзённіку Макарэня запісаў: «Цяпер становіцца ясным, што ніякага раўнапраўя няма. Раўнапраўе толькі на паперы. Не скінуўшы савецкай улады, не будзе раўнапраўя». Ён лічыў, што «там пачынаецца класавая барацьба, дзе аднаму класу (пралетарыяту) даюць большыя правы». На пытанне следчага, каго ён лічыць сапраўдным беларусам і каго несапраўдным (гэтае пытанне задавалася кожнаму арыштаванаму. — **У. Л.**), Макарэня адказаў: «хто прызнае беларускую мову і літаратуру, сваю культуру — сапраўдны беларус. Толькі з дапамогай сваёй мовы народ можа ўзняцца. Несапраўдныя — гэта тыя, хто па нацыянальнасці беларусы, але супраць беларускай мовы». У лістах да сяброў (Казакоў, Мяцельскага) ён распавядаў, як доўга пераконваў сялян вёскі Бясяды, дзе працаваў настаўнікам, у неабходнасці вучыць дзяцей на роднай мове, тым больш, што самі яны «гавораць на мове чыстай, як у даўнейшых беларускіх кніжках». Макарэня адзначаў, што на вёсцы «культуры толькі вяршкі… некаторыя камсамольцы п'юць самагон і не ходзяць у хату-чытальню». З гонарам ён пісаў, што ў ягонай школе «летась быў сам Янка Купала». Як сведчыў пазней Рыгор Казак, Макарэня быў фактычна рэдактарам «Нашага слова», дзе змяшчаліся ягоныя артыкулы, прысвечаныя цяжкому становішчу беларускіх сялян.

У часопісе ёсць яшчэ адзін не заяўлены спачатку аўтар, і менавіта яго пяру належыць бальшыня сур'ёзных публіцыстычных артыкулаў: «Камуністычны інтэрнацыянал (крытыка)», «Што трэба беларусу?». Аўтарам гэтым быў Нічыпар Мяцельскі (свае творы ён падпісваў літарай «Н» ці «Н.Смутны»). Можна ўпэўнена сказаць, што ён быў сапраўдным лідарам і галоўным ідэолагам гуртка.

Свайго «жыццяпісу» Нічыпар Мяцельскі на старонках «Нашага слова» не пакінуў, таму дадамо, што ён нарадзіўся ў звычайнай сялянскай сям'і, з малых гадоў любіў чытаць, «пасвіў кароў і чытаў, чытаў, што пад рукі пападала». Яго «малая радзіма» — вёска Апудзевічы Грэскай воласці Слуцкага павета. Пасля заканчэння Слуцкіх агульнаадукацыйных настаўніцкіх курсаў выкладаў

у Кавалевіцкай пачатковай школе Шацкага раёна. Як пісаў ён сам, усвядоміў сябе беларусам з 1921 г.

У архіве КДБ Беларусі захаваўся дзённік Мяцельскага, у якім ён запісаў свае разважанні на палітычныя тэмы, аналіз савецкай рэчаіснасці, сучаснага становішча вёскі; ёсць тут і накіды палітычнай праграмы, лозунгі і г. д. Менавіта гэты дзеяч быў галоўным творцам палітычных улётак і адозваў, што распаўсюджвалі слуцкія патрыёты. Вось некаторыя вытрымкі з ягоных запісаў:

«Калі пачнецца вайна, яна, безумоўна, застане нас далёка не падрыхтаванымі да ажыццяўлення нашых думак аб пабудове Беларускай дзяржавы. Мы не маем канчаткова выпрацаванай ідэалогіі, тактыка не выяўлена і, галоўнае, няма арганізаванай сілы. У сувязі з гэтым нам з першых дзён вайны прыйдзецца весці наступную працу:

- неабходна будзе выкарыстаць усе элементы незадаволеных савецкай уладай, арганізаваць іх. Больш увагі звярнуць на дэзерціраў… арганізаваць аддзелы, якія будуць знаходзіцца ў лесе;
- з сябраў аддзела стварыць сапраўдных свядомых беларусаў. Гэта можа быць дасягнута шляхам размоваў аб гісторыі Беларусі, цяжкіх умовах сялянскага жыцця, параўноўваючы жыццё вёскі і горада і г. д. Каб пазбегнуць развалу ў аддзеле, трэба прымаць людзей, не звязаных ні з сям'ёй, ні з гаспадаркай. Вольны час трэба запоўніць лекцыямі і размовамі;
- усякі арганізатар такога аддзела павінен помніць, што галоўная і асноўная мэта — гэта выхаваць кадры, на якія б магла абаперціся новая нацыянальная ўлада;
- павінна павялічвацца не колькасць людзей у аддзеле, а колькасць новых невялікіх аддзелаў;
- калі аддзелаў набярэцца дастаткова, стварыць агульны штаб. Абавязак яго — выпрацаваць агульны план барацьбы і стаць яе ідэйным кіраўніком. Аддзелы павінны быць маральна вытрыманымі і заваяваць давер сялянства».

Гэта вельмі цікавы дакумент, асабліва што тычыцца дэталізацыі па арганізацыі партызанскага сялянскага супраціву. Аўтар тут запазычваў досвед слуцкіх паўстанцаў, «зялёнадубцаў», балахоўцаў, якія яшчэ ў 1923 г. працягвалі дзейнічаць на Случчыне, выкарыстоўваючы партызанскія метады змагання з бальшавіцкімі карнымі аддзеламі.

Зноў звернемся да дзённіка Мяцельскага: «Уся наша праца павінна праходзіць пад лозунгам «За свабоду!». Свабода слова і друку, свабода веравызнання — вось гарантыя ад прыгнёту, ад крыўды, улады… Да чаго апусціўся наш народ! Кучка рознага зброду адабрала ў народа галоўнае — волю… Марыць аб захопе ўлады сялянамі… вельмі небяспечна… Гэта толькі мара. Сялянскі рух вельмі слабы… Нам прыдзецца шмат працаваць… Савецкая ўлада зусім не адпавядае сваёй назве — «рабоча-сялянская»… Гэта толькі шыльда». Далей ён прыводзіць доказы недэмакратычнасці бальшавіцкай выбарчай сістэмы, адзначаючы, што «больш справядліва выбары праходзяць у капіталістычных краінах».

Аўтар акрэсліваў тыя задачы, якія стаялі перад свядомым беларусам, што жадаў працаваць на карысьць Беларусі, хацеў «паказаць шлях… па якому трэба ісці». «Першае і агульнае заданне — разумець селяніна, ведаць яго эканамічныя, культурныя і духовыя патрэбы. Без гэтага немагчыма лічыць сябе сапраўдным сынам вёскі».

Першы абавязак, лічыў Мяцельскі — гэта «звярнуць увагу на самога сябе, выхаваць сябе ў пэўным напрамку, пашырыць свой маральны светапогляд. Трэба навучыцца быць далікатным, праўдзівым і, галоўнае, навучыцца шчыра кахаць чалавека… Трэба навучыцца так падыходзіць да селяніна, каб ён мог смела адчыніць сваю душу, паказаць болькі свайго сэрца… Трэба пераканаць селяніна ў патрэбнасці арганізавання, трэба будзіць думку аб вялікай карысці ўзаемнай дапамогі як матэрыяльнай, так і духовай… Нацыянальная незалежнасць, толькі яна, можа падняць эканамічнае і культурнае становішча краю і народа. Для гэтага мы павінны пераканаць нашага селяніна, што ён можа збудаваць лепшае жыццё, злучыўшыся ў нацыянальную адзінку… Сучасная ўлада выяўляе сваю кансерватыўнасць у тым, што не дае ніякай мажлівасці творчым сілам і здольнасцям. Уся палітыка сучаснай улады — заціснуць увесь народ у зараней прыгатаваныя краты».

Палітычная праграма Нічыпара Мяцельскага яшчэ не зусім сталая. Ён яшчэ да канца не разумеў

усіх цяжкасцяў і перашкод на шляху антыбальшавіцкага змагання, не ўсведамляў да канца ўсю інэртнасць і палітычную пасіўнасць беларускага селяніна. Мяцельскі не бачыў магчымасці стварэння паміж сялянствам і прамысловымі рабочымі адзінага палітычнага фронту. У Оксфардзе ён не вучыўся, не меў нават вышэйшай адукацыі, да ўсяго даходзіў сваім розумам. У цытаваных тут фрагментах праграмных палажэнняў Мяцельскага бачны вялікі інтэлектуальны і арганізацыйны патэнцыял гэтага маладога чалавека. У яго праграме бачна галоўнае — выразны разрыў з бальшавіцкай, «лявацкай» традыцыяй і сугучнасць з ідэалагічнымі асновамі беларускай сацыял-дэмакратыі.

Судовая справа слуцкіх партыётаў атрымала назву »Справа Лістапада», паводле прозвішча «галоўнага злачынцы і кіраўніка падпольнай арганізацыі», як лічылі самі чэкісты. Працэс над «лістападаўцамі» адбыўся з 5 па 16 сакавіка 1926 г. у Доме працаўнікоў асветы БССР. Уваход быў па білетах, разасланых акруговым судом у грамадскія арганізацыі і ўстановы. Публіка была падабраная загадзя. Як паведамляла газета «Звезда» (тады расійскамоўная) ад 7 сакавіка, зала была перапоўненая. Перад суддзямі па чарзе ўставалі і давалі паказанні абвінавачаныя. Іх шасцёра: Міхась Дземідовіч, Ціт Курбыка, Міхась Макарэня, Нічыпар Мяцельскі, Мікола Казак і Юрка Лістапад. Прысутных уразіла маладосць падсудных. «Обвиняемый [Мікола] Казак,— паведамляў карэспандэнт «Звезды»,— на вид наивный неоперившийся юнец, на ўстах его всё время ўлыбка».

Судом з самага пачатку быў узяты абвінаваўчы кірунак. Якая там прэзумпцыя невінаватасці, калі штораз з «высокай трыбуны» на адрас арыштаваных сыпалася: «Авантурнікі, кулацкія сынкі, белагвардзейцы...»

«Палітычны твар» падсудных «дамалёўвае» дзяржаўны абвінаваўца. Гэта не хто іншы, як Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны), шчыры беларускі бальшавік і паэт: «Таварышы суддзі! Я прайшоў загартоўку рэвалюцыйнай барацьбой. Таму для мяне зусім відавочнай з’яўляецца белагвардзейска-кулацкая сутнасць лістападаўшчыны. Як вядома, сам Лістапад адыграў значную ролю ў дапамозе чыннасці паўстанцаў, мэтай якіх было не дапусціць у Случчыну Чырвонай Арміі і Савецкай улады, стварыўшы праз паўстанне г. зв. «вольную незалежную Беларусь». Змест улётак змоўшчыкаў і іх часопіса «Наша слова» я знаходжу контррэвалюцыйным і пагромным...» Не ведаў Цішка Гартны, што за сваю службу маскоўскім бальшавікам ён у 1935 г. будзе таксама названы ворагам той улады, баронячы якую ў 1926 г., ён паслаў за краты шчырых беларускіх патрыётаў.

На судзе большыня падсудных будзе адмаўляць свой удзел у нелегальнай арганізацыі, заяўляючы, што распаўсюджвалі ўлёткі самачынна, без змовы. Былы выкладчык Слуцкіх курсаў Ціт Курбыка здолеў нават выйсці «сухім з вады», заявіўшы, што нічога агульнага з астатнімі падсуднымі не меў і ніколі не падзяляў іхных думак і метадаў. За «пакаянне» ён будзе апраўданы. Дземідовіч пацвердзіў існаванне падпольнага гуртка, на чале якога стаяў Мяцельскі, але ўдзел у ім Лістапада цалкам адмаўляў. Сам Лістапад пацвердзіў гэтыя словы, заявіўшы, што нават не чытаў часопіса «Наша слова». Сшытак, праўда, яму перадаў напярэдадні арыштаў Дземідовіч, але, пачуўшы праператрусы на кватэрах сваіх вучняў, ён спаліў рукапіс у печы.

Не даказаўшы віны Лістапада, акруговы суд, тым не менш, прысудзіў яму найбольшы тэрмін зняволення — 5 гадоў. Мяцельскага, Макарэню і Дземідовіча прыгаварылі да 3-х гадоў турмы. Мікалаю Казаку далі 3 гады ўмоўна і вызвалілі з-пад варты. Улада прадбачліва няжорстка пакарала «контррэвалюцыянераў». Ішоў яшчэ толькі 1926-ты, а не 1930-ы год. На знак негалоснай падтрымкі падсудных каля Дому працаўнікоў асветы падчас працэсу сабраўся вялікі натоўп моладзі, сярод якіх было відаць шмат навучэнцаў Менскага беларускага педтэхнікуму, студэнтаў БДУ. Прысутныя на працэсе прадстаўнікі беларускай нацыянальнай эліты адмыслова апрануліся ў нацыянальныя строі... У 1927 г., з нагоды 10-й гадавіны Кастрычніцкага перавароту, «лістападаўцы» будуць амніставаныя.

«Справа Лістапада» нечакана атрымала працяг праз 17 гадоў, падчас Другой сусветнай вайны. Гісторыя гэтая стала вядома дзякуючы руплівасці менскай даследніцы Галіны Кнацько, якая ў ваенных справах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь адшукала «Адмысловае паведамленне пра чыннасць удзельнікаў кон-

трэвалюцыйнай нацдэмаўскай арганізацыі лістападаўцаў на акупаванай тэрыторыі Менскай вобласці». Дакумент, складзены 19 ліпеня 1943 г. у штабе аднаго з савецкіх партызанскіх аддзелаў, што дзейнічаў на Случчыне, быў накіраваны на імя 1-га сакратара ЦК КПБ Панцеляймона Панамарэнкі.

Перадгісторыя гэтай падзеі наступная. 25 сакавіка 1943 г. у «Беларускай газэце» быў надрукаваны артыкул Рыгора Крушыны «З мінулых дзён. Судовы працэс над Лістападам». У ім распавядалася гісторыя судзілішча над слуцкімі патрыётамі ў 1926 г. Прозвішчы герояў падзеяў былі пададзеныя сапраўдныя, не зважаючы на тое, што бальшыня з іх, акрамя Юркі Лістапада, былі яшчэ жывыя і знаходзіліся на акупаванай немцамі тэрыторыі. Пад псеўданімам «Рыгор Крушына» (вельмі прадбачліва) хаваўся не хто іншы, як ужо раней згаданы намі Рыгор Казак.

Артыкул у «Беларускай газэце» вельмі зацікавіў савецкіх дыверсантаў, што займаліся «адстрэлам» найбольш актыўных прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага актыву, каб запалохаць астатніх і паралізаваць нацыянальную працу ў акупаваным краі. Неўзабаве чырвоныя бандыты атрымалі звесткі, што адзін з лістападаўцаў, Нічыпар Мяцельскі, у дадзены час жыве ў вёсцы Цітва Рудзенскага раёна. Пасля свайго вызвалення ў траўні 1925 г. ён жыў разам з бацькамі і працяглы час не мог знайсці працы. Пазней працаваў у калгасе «Ленінская слабада» Пухавіцкага раёна, з 1931 г. быў грамадскім інспектарам і інструктарам раённай «камісіі па ліквідацыі непісьменнасці», адначасова настаўнічаючы ў Пудзіцка-Слабодскай сямігодцы. У 1932 г. нават паступіў на фізіка-матэматычны факультэт БДУ, адкуль, праўда, хутка быў выключаны з «вядомых» прычын». Падчас нямецкай акупацыі актыўна не выяўляў сваёй палітычнай пазіцыі і толькі зрэдку друкаваўся па аграрнай тэматыцы ў «Менскай газэце» і «Голасе вёскі», ліставаўся з былымі сябрамі Міхасём Макарэнем і Міколам Казаком, якія жылі ў Слуцку.

6 красавіка 1943 г. Мяцельскі быў схоплены чырвонымі дыверсантамі і, паводле пастановы начальніка асобага аддзела Менскай партызанскай брыгады, у той жа дзень расстраляны.

Мікола Казак трагічна загінуў дзесьці адразу пасля вайны. Яго старэйшы брат, Рыгор летам 1944 г. пакіне Беларусь разам з адступаючымі нямецкімі войскамі. У 1950-я гг. ён перабярэцца на жыхарства ў ЗША і памрэ ў сваёй пасцелі ў 1979 г.. Ужо як вядомы паэт, пад псеўданімам «Рыгор Крушына» ён выдаў у Амерыцы некалькі сваіх паэтычных зборнікаў. Апошнім часам тры яго кнігі выйшлі і на Бацькаўшчыне. Лёс іншых «лістападаўцаў», на жаль, да сёння не высветлены.

### Беларускае культурнае жыццё ў Менскім белпедтэхнікуме і Белдзяржуніверсітэце

Гісторыя беларускага маладзёвага руху ў межах ССРБ—БССР будзе няпоўнай, калі мы абмінем увагай культурную працу беларускіх навучэнцаў і студэнтаў у сценах Менскага беларускага педагагічнага тэхнікума і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Сапраўднай «літаратурнай акадэміяй» для беларускіх маладых літаратурных талентаў стаў у 1920-я гг. Менскі белпедтэхнікум. Ён быў утвораны ў 1922 г. на аснове 2-га аддзялення скасаванага Менскага інстытута народнай адукацыі. Падчас беларусізацыі ўсё выкладанне ў тэхнікуме было пераведзена на беларускую мову. У 1925 г. яму было прысвоена імя Усевалада Ігнатоўскага. Маючы ў складзе такіх вядомых педагогаў-беларусістаў, як Якуб Колас, Язэп Лёсік і Янка Бялькевіч, біёлаг і географ Міхайла Грамыка, грамадазнавец Язэп Васілевіч і інш., гэтая навучальная ўстанова ўзгадавала цэлую кагорту выдатных беларускіх літаратараў і публіцыстаў. У розны час тут навучаліся Андрэй Александровіч, Антон Адамовіч, Уладзімір Глыбінны, Алесь Дудар, Пятро Глебка, Паўлюк Трус, Сяргей Дарожны, Валер Маракоў, Максім Лужанін, Лукаш Калюга, Сяргей Астрэйка, Сцяпан Ліхадзіеўскі, Міхась Кавыль ды інш. У лістападзе 1923 г. маладыя беларускія літаратары ініцыявалі ўтварэнне аб'яднання беларускіх маладых літаратараў «Маладняк», якое пры падтрымцы ў першую чаргу У. Ігнатоўскага было афіцыйна зарэгістравана ўладамі БССР.

Вельмі важнай падзеяй для педтэхнікума стала адкрыццё пры гэтай навучальнай установе культурна-асветнага клуба ў лютым 1924 г. Ён адразу пераўтварыўся ў цэнтр мастацкай самадзейнасці навучэнцаў і сапраўдны літаратурны «гайд-парк», На творчыя сустрэчы ў клуб прыходзілі Янка Купала,



*Беларускі хор навучэнцаў Мінскага беларускага педагагічнага тэхнікуму імя У. Ігнатоўскага пад кіраўніцтвам хармайстра У. Тэраўскага. Мінск, 1924 г. Дзяржаўны архіў Менскай вобласці.*

Змітрок Бядуля, Міхась Чарот і іншыя літаратары, якія ўжо заявілі пра сябе на поўны голас. Але найчасцей у гэтых сценах абмяркоўваліся творы пачынаючых паэтаў і празаікаў, у тым ліку тых, хто вучыўся тады ў педтэхнікуме. Тут маладая публіка ўпершыню пачула вершы Валера Маракова, якія потым увайшлі ў яго паэтычныя зборнікі «Пялёсткі» і «На залатым пакосе», нашумелую паэму Сяргея Астрэйкі «Бенгалія», дзе пад апошняй разумелася зняволеная бальшавікамі Беларусь.

Гэтыя маладыя літаратурныя таленты ўсім сэрцам успрынялі беларускае адраджэнне і гатовыя былі служыць яго ідэалам. Беларусь, яе слаўнае мінулае, ідэі свабоды і нацыянальнага вызвалення — вось галоўны кантэкст іх першых літаратурных твораў. Гэта была сапраўдная «залатая беларуская моладзь», краса і надзея Беларусі. «Нацыянальнае адраджэнне, — пісаў у той час Аляксандр Цвікевіч, — творыць у першую чаргу не роздум, а пачуццё народа... Зара кожнага нацыянальнага адраджэння пачынаецца не розумам, а сэрцам, пачынаецца не формулай, а песняй. Паэт — вось хто звычайна з'яўляецца ініцыятарам нацыянальнага абуджэння, вось хто адкрывае першую страніцу «Новага Запавету».

У сярэдзіне 1920-х гг. у маладым літаратурным асяродку разгараюцца вострыя эстэтычныя і ідэйна-палітычныя дыскусіі аб далейшых шляхах развіцця беларускай літаратуры. Навучэнцы педтэхнікума былі ў цэнтры гэтых «баталій». Тэмы, якія абмяркоўваліся тут, былі розныя: ад забароненага цэнзурай рамана Барыса Пільняка да «ганебнай Рыжскай змовы». Магчыма, у сценах культурніцкага клубу педтэхнікума, у вузкім коле сваіх аднадумцаў Алесь Дудар прачытаў упершыню свой знакаміты верш «Пасеклі наш край папалам...»:

Пасеклі наш край папалам,
Каб панскай вытаргаваць ласкі.
Вось гэта — вам, а гэта нам,
Няма сумлення ў душах рабскіх.

І цягнем мы на новы строй
Старую песню і чужую,
Цыгане шумнаю талпой
Па Бесарабіі качуюць...

За ўсходнім дэспатам-царком
Мы бегаем на задніх лапках,
Нью-Ёрку грозім кулаком
І Чэмбэрлена лаем трапна

Засыплем шапкамі яго,
Ура, ура патопім у соплях.
А нас, тым часам, з году ў год
Тут прадаюць у разброд і оптам.

Мы не шкадуем мазалёў.
Мы за чужых праклёны роім,
Але без торгу і без слоў
Мы аддаем сваіх герояў

Не смеем нават гаварыць
І думаць без крамлёўскай візы,
Без нас усё робяць махляры,
Ды міжнародныя падлізы.

Распаўся б камень ад жальбы,
Калі б ён знаў, як торг над намі
Вядуць маскоўскія рабы
З вялікапольскімі панамі.

О, ганьба, ганьба! У нашы дні
Такі разлом, туга такая!
...І баюць байкі баюны
Северо-Западного края...

Пяюць на сонца і на дзень.
О, дух наш вольны, дзе ты, дзе ты?
Ім мураўёўскі б гальштук удзець,
Нашчадкам мураўёўскім гэтым...

Незадаволенасць савецкімі парадкамі, усведамленне акупацыйнай сутнасці бальшавіцкага панавання ў Беларусі хутка перарастае ў маладых беларусаў у патрэбу змагацца за свабоду, за незалежнасць Бацькаўшчыны:

Знае ўсяк, як лясная варта
Шанавала нязваных гасцей.
Было ўчора так, будзе заўтра,
Курганам не схаваць касцей.

Але паэт не летуценнік, ён разумее, якая сіла супрацьстаіць

вызвольнаму народнаму руху. Таму трэба загадзя рыхтавацца да бескампраміснай барацьбы. Трэба гуртавацца ў грамады, збіраць сілы для вырашальнай бойкі. Алесь Дудар прадбачыць вялікія ахвяры на шляху змагання за народную свабоду:

Але яшчэ глушыце кроў.
Гарыць душа і час настане,
Калі з-за поля, з-за бароў
Па-беларуску сонца гляне.

Тады мы ў шэрагах сваіх
Быць можа, шмат каго не ўбачым.
З тугою ў сэрцы ўспомнім іх,
Але ніколі не заплачам.

А дзень чырвоным зацвіце
і мы гукаем яму: «Дабрыдзень».
Ці са шчытом, ці на шчыце
У краіну нашу зноў мы прыйдзем

У траўні 1926 г. з «Маладняка», які трапіў пад «пяту» бальшавіцкай партыі і камсамолу, многія сябры якога пачалі бяздумна ўслаўляць ідэі вульгарнага сацыялагізму, класавы падыход у літаратуры, «асавечваць» беларускую мову і засмечваць яе русізмамі, выйшлі Адам Бабарэка, Уладзімір Дубоўка, Кузьма Чорны, Язэп Пушча, Кандрат Крапіва. Яны заснавалі новае літаратурнае аб'яднанне — «Узвышша». Пазней да іх далучыліся Пятро Глебка, Андрэй Мрый, Тодар Кляшторны, Максім Лужанін ды іншыя маладыя пісьменнікі.

Калі ў творах «маладнякоўцаў» пераважна гучалі рэвалюцыйны імпэт і вера ў сацыялістычную будучыню, а таксама тэма класавай барацьбы, то «ўзвышанцы» імкнуцца ствараць новую літаратурную традыцыю, становяцца на новы ідэйны грунт. Лідары «Узвышша» вельмі блізка падышлі да разумення, што не класавы падыход, не партыйныя ідэалагічныя прыярытэты, а гуманізм у шырокім разуменні гэтага слова, духоўны пачатак выяўляюць жыццятворную сутнасць літаратуры і мастацтва. Той, хто працуе на ніве беларускай культуры — лічылі яны — павінен творча пераасэнсаваць культурны досвед еўрапейскай і ўсходняй літаратурных традыцый. «Узвышша» ў разуменні А. Бабарэкі, У. Дубоўкі, Я. Пушчы і К. Чорнага — гэта, адначасова і новы, якасны ўзровень беларускай літаратуры і мастацтва, і новы творчы метад у літаратурнай чыннасці.

Паняцце «ўзвышша» выяўляла таксама новую культурную парадыгму для Беларусі. Беларускай літаратуры і мастацтву, — сцвярджалі «ўзвышанцы» — неабходна стаць на грунт новага жыцця, як «формы матэрыялізацыі вялікага стыку Захаду і Усходу». Нацыянальная культура, на іх думку, павінна быць паліфанічнай,




*Выкладчыкі і студэнты 3 курсу фізыка-матэматычнага факультэту Белдзяржуніверсітэту. Менск, 1926 г.*



*Слухачы работніцкага факультэта Белдзяржуніверсітэта разам з Я. Коласам і З. Бядуляй. Менск, 1922 г.*



*Сябры маладзёвага літаратурнага аб’яднання «Маладняк» разам са старэйшым пакаленнем беларускіх літаратараў. Сярод сфатаграфаных Нічыпар Чарнушэвіч, Паўлюк Шукайла, Язэп Падабед, Міхась Чарот, Змітрок Бядуля, Цішка Гартны, Янка Купала, Алесь Дудар, Адам Бабарэка, Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Паўлюк Трус, Анатоль Вольны і іншыя. Фота 1924 г. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.*

разнастайнай па сваім жанравым змесце, разам з тым яна мусіць цвёрда трымацца «беларускай глебы». «Узвышанцы» выступалі за паглыбленае вывучэнне беларускай самабытнасці, яны рупліва даследуюць беларускі фальклор, шмат увагі надаюць культуры беларускай мовы.

«Узвышша» — гэта і цывілізацыйны выбар Беларусі. Услед за Ігнатам Абдзіраловічам (Канчэўскім) «узвышанцы» пагаджаліся з тэзай, што Беларусь з’яўляецца своеасаблівым мостам паміж Захадам і Усходам. «Асноўны характар Беларусі ў тым, — пісаў А. Бабарэка, — што яна *вузел* Усходу і Захаду, Поўдня і Поўначы, цэнтр Еўропы, узвышша, з якога разыходзяцца рэкі ўва ўсе бакі. Кругом узвышша, а ў сярэдзіне балота (крыніцы), гэтак высмактаныя прабежнымі рэчкамі ў моры чалавецтва, у выключна чужыя культуры». Галоўнае заданне беларускага адраджэння ў дадзеную гістарычную эпоху — на думку А. Бабарэкі, У. Дубоўкі і іх аднадумцаў — гэта пераўтварыць «беларускае балота» ў культурнае «ўзвышша» Еўропы. Шмат абяцаў



*Вокладка часопісу «Маладняк Калінкаўшчыны» (1925 г. – № 5–6).*

для будучыні Беларусі і яе культуры творчы чын «узвышанцаў».

Беларуская культурна-асветная праца ў сценах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта рабілася рукамі тых жа студэнтаў, што раней працавалі ў складзе беларускіх маладзёвых арганізацый у Менску ды іншых мясцінах Беларусі. У пачатку 1920-х гг. тут утварыліся беларускі тэатральны гурток пад кіраўніцтвам галоўнага рэжысёра Беларускага драматычнага тэатра (БДТ-1) Еўсцігнея Міровіча, беларускі студэнцкі хор, што ўзначальваў Уладзімір Тэраўскі. Пры ўніверсітэце дзейнічалі 4 краязнаўчыя гурткі, аб’яднаныя ў 1925 г. у адзінае Краязнаўчае таварыства БДУ пад старшынствам рэктара ўладзіміра Пічэты. Дзейнымі сябрамі яго з’яўляліся Мікола Каспяровіч, Яўхім Кіпель, Тодар Апацёнак, Апалонія Савёнак, Алесь Аніхоўскі, Тодар Забела, Мікалай Улашчык, Кастусь Ламака ды інш. Яны задавалі рытм усёй краязнаўчай працы ў БССР, былі аднымі з ініцыятараў стварэння Цэнтральнага бюро краязнаўства ў БССР. У летнія і зімовыя вакацыі сябры Краязнаўчага таварыства БДУ здзяйснялі гістарычныя, этнаграфічныя і прыродазнаўчыя вандроўкі па мястэчках і вёсках Меншчыны, Віцебшчыны, Гомельшчыны і Магілёўшчыны ў мэтах збірання вуснай народнай творчасці, пошуку беларускай старасвеччыны, вывучэння флоры і фаўны беларускага краю.

З сярэдзіны 1920-х гг. паступова выкладанне ва ўніверсітэце пераводзілася на беларускую мову. У 1925/26 навучальным годзе выкладанне 57 вучэбных дысцыплін у БДУ ужо вялося па-беларуску. Гэта тычылася не толькі педагагічнага факультэта



*Тодар Кляшторны, беларускі паэт, студэнт педагагічнага факультэту Белдзяржуніверсітэта. Менск, 1926 г. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.*

і факультэта грамадскіх навук. Усё выкладанне было пераведзена на беларускую мову на рабфаку, лекцыі па-беларуску чыталіся і на медфаку. Выпускнікі БДУ, якія не паспелі засвоіць беларускую мову падчас навучання, абавязаныя былі на працягу года наведваць адмысловыя моўныя курсы, здаць па беларускай мове залік і атрымаць адпаведнае пасведчанне. Пад шыльдай гістарычнага гуртка па вывучэнні анархізму студэнты вывучалі гісторыю першых беларускіх палітычных арганізацый — «гоманаўцаў», Беларускай Сацыялістычнай Грамады і інш.

Маладыя беларускія пісьменнікі, што навучаліся ў БДУ — Андрэй Александровіч, Тодар Кляшторны, Уладзімір Дзяржынскі (Чаржынскі), Іван Шчасны, Пятро Глебка, Адам Бабарэка, «маладнякоўцы» і «ўзвышанцы», — таксама актыўна ўдзельнічалі ў культурна-асветнай і краязнаўчай працы.

Адзначаючы гэтыя факты, нельга абыйсці і негатыў у студэнцкім жыцці ўніверсітэта. У першую чаргу гэта тычылася сацыяльнай пасіўнасці і апатыі большасці слухачоў БДУ. У пачатку 1920-х гг. студэнтаў універсітэта, паводле іх сацыяльнага і нацыянальнага паходжання, цяжка было назваць



*Родная веска Т. Кляшторнага Парэчча Лепельскага павету. Графічны малюнак. Невядомы мастак. 1920-я гг. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.*



*Пятро Глебка, беларускі паэт, студэнт педагагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Менск, канец 1920-х гг. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*

пралетарыямі або беларусамі. Самым прэстыжным аддзяленнем БДУ ў гэты час лічыўся факультэт грамадскіх навук, дзе рыхтавалі суддзяў, адвакатаў, работнікаў крымінальнага вышуку і пракуратуры, бухгалтараў і эканамістаў. У перыяд нэпу ён лічыўся «мяшчанскім бамондам», дзе навучаліся пераважна дзеці мясцовых прадпрымальнікаў, гандляроў, прадстаўнікоў савецка-партыйнай наменклатуры. Расійскамоўную абрэвіятуру факультэта ФОН (факультет общественных наук) студэнты-жартаўнікі перакручвалі як «факультет ожидающих невест». Нямала тут круцілася «благородных девиц», якія не столькі наведвалі ўніверсітэцкія аўдыторыі, колькі бавілі час у кавярнях і рэстарацыях у чаканні «выгаднай партыі» для шлюбу. Іншыя партыі іх не цікавілі. Як паведамляла ўвосень 1924 г. газета «Савецкая Беларусь», на гуманітарных аддзяленнях



*Арганізацыйнае ядро «Маладняка». Сядзяць (злева направа): Язэп Падабед, Алесь Якімовіч, Міхась Чарот, Алесь Дудар, Язэп Пушча, стаяць: Нічыпар Чарнушэвіч, Паўлюк Трус, Анатоль Вольны, Андрэй Александровіч, Кузьма Чорны. Мінск, 1923 г. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.*

універсітэта траплялiся студэнты, якія за 4 семестры здалі толькі 1–2 залікі. Іх чамусці не адлічвалі, і яны працягвалі сваё вольнае жыццё за кошт «пралетарскай дзяржавы». У гэты час сярод студэнтаў названага факультэта выхадцы з прамысловых рабочых складалі менш за 3%, з сялян — трохі больш за 20%, астатнія паходзілі з мяшчанскага асяроддзя. Паводле нацыянальнага складу беларусы, як прадстаўнікі тытульнай нацыі, налічвалі на ФОНе менш за трацiну студэнтаў, габрэі — каля 60%, расійцы — каля 5%, палякі — менш за 1%. Прыкладна такая ж сітуацыя назіралася і на медычным факультэце БДУ: дзяцей прамысловых рабочых тут налічвалася менш за 10%, сялян — каля 35%, мяшчан і служачых — больш за 50%; паводле нацыянальнай прыналежнасці: беларусаў — каля 40%, а габрэяў — больш за палову. Самым «беларускім» у БДУ лічыўся педагагічны факультэт, дзе прадстаўнікі тытульнай нацыі складалі каля 55% слухачоў.

Трэба сказаць і пра тое, што расійшчына моцна яшчэ трымалася ва ўніверсітэце таксама з-за негалоснага супраціву беларусізацыі з боку прафесуры і партыйнага актыву. Для гэтага меліся аб'ектыўныя прычыны — абсалютная большасць прафесарска-выкладчыцкага складу і пераважная большасць партыйнай арганізацыі ўніверсітэта складалі не беларусы паводле нацыянальнасці. З ідэйных і чыста псіхалагічных меркаванняў яны ставіліся да пераводу выкладання на беларускую мову варожа.

У справе «беларускасці» сітуацыя ў многіх тэхнікумах і 7-гадовых школах БССР не надта адрознівалася ад БДУ. Паводле інфармацыі Наркамасветы БССР, на пачатак 1924/25 навучальнага года сярод навучэнцаў тэхнікумаў рэспублікі беларусаў паводле нацыянальнасці налічвалася толькі каля паловы. Самым беларускім сярод сярэдніх спецыяльных навучальных установаў лічыўся Менскі педагагічны тэхнікум, дзе прадстаўнікі тытульнай нацыі складалі каля 60%. Сярод навучэнцаў старэйшых класаў сямігодак БССР беларусаў было каля 44%, у той час як габрэяў — 37%, расійцаў — менш за 14%, палякаў — каля 5%. Можна канстатаваць, што «пладамі рэвалюцыі» найлепшым чынам скарысталіся не беларусы, у большасці сваёй выхадцы з вёскі, а прадстаўнікі гарадскога і мястэчковага мяшчанства небеларускага паходжання.

Такое становішча тлумачылася не толькі слабой сацыяльнай мабільнасцю тытульнай нацыі. У большай ступені гэта з'яўлялася наступствам савецкай сацыяльнай палітыкі ў тыя гады. У перыяд нэпу бралася значная плата за навучанне ў школах і ВНУ для дзяцей т. зв. «заможных станаў» грамадзянства. Пад гэты «пункт» трапляла значная частка беларускага сялянства. Наяўнасць у селяніна пары коней і некалькіх кароў, 3–4 дзесяцін зямлі рабілася падставай для абкладання яго «школьным падаткам». Сярод навучэнцаў сямігодак бацькі 41% навучэнцаў абкладаліся гэтым падаткам, і ў асноўным гэта былі беларускія сяляне. Сын ці дачка гандляра або прадпрымальніка маглі за хабар ці іншую «паслугу» купіць для сябе ў гарадскім ці раённым выканкаме пасведчанне аб сваім «пралетарскім паходжанні» і атрымаць права бясплатна вучыцца ў вышэйшай школе. Падобныя перакосы ў сацыяльнай і школьнай палітыцы савецкай дзяржавы дэфармавалі і абвастралі міжнацыянальныя дачыненні ў

БССР, правакавалі антысеміцкія настроі ў грамадстве.

Можна таксама канстатаваць слабое веданне многімі студэнтамі БДУ ў тыя гады айчыннай гісторыі, а таксама іх палітычную непісьменнасць. Падчас праверкі Белдзяржуніверсітэта ў 1924 г. адмысловай камісіяй Наркамасветы БССР выявілася, што некаторыя са студэнтаў не ведалі, напрыклад, хто такія Кастусь Каліноўскі ці Янка Купала, чыім органам з'яўляецца газета «Правда», якая цяпер улада ва Ўкраіне, колькі і якія рэспублікі ўваходзяць у склад Савецкага Саюза, што вышэй: ЦВК СССР ці Рэўваенсавет.

Марудна павялічвалася ва ўніверсітэце і колькасць студэнтаў-камсамольцаў. У 1922 г. ячэйка ЛКСМБ БДУ налічвала 44 чалавекі — менш як 4% ад агульнай колькасці слухачоў. Найбольш камсамольцаў было на рабфаку — прыкладна чвэрць студэнтаў. Многія з іх прыйшлі вучыцца ва ўніверсітэт ужо з камсамольскімі значкамі і білетамі. У старэйшых класах сямігодак БССР па стане на 1924 г. было ўсяго 7 камсамольцаў з больш чым 13 тыс. навучэнцаў. Але ідэалагічна-выхаваўчая праца сярод студэнцтва, шматлікія «сацыяльныя чысткі» сярод навучэнцаў, пратэкцыяніцкія ільготы для камсамольцаў пры паступленні ва ўніверсітэт давалі свае вынікі. У 1926/27 навучальным годзе камсамольская арганізацыя ў БДУ складала ўжо 600 чалавек. Сярод 4425 студэнтаў менскіх ВНУ 107 з'яўляліся камуністамі, а 1017 — камсамольцамі. У склад камсамолу ўліліся былыя сябры забароненых «Югенд-Бунда», «Цыйрэ-Цыёна» ды іншых левых маладзёвых арганізацый.



*Рэдкалегія часопіса «Узвышша». Сядзяць Кузьма Чорны, Уладзімір Дубоўка, Кандрат Крапіва і іншыя; стаяць: Адам Бабарэка, Язэп Пушча, Уладзімір Жылка, Пятро Глебка і іншыя. Менск, 1927 г. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.*

Партыйныя структуры імкнуліся калі не знішчыць, дык у значнай ступені паралізаваць грамадска-культурную чыннасць студэнцкай і вучнёўскай моладзі. Тэатральны гурток прымушалі ставіць не п'есы на нацыянальна-гістарычную тэматыку, а рэвалюцыйныя пастаноўкі расійскіх аўтараў. З ЦК КП(б)Б прыходзілі інструкцыі, каб на лекцыях краязнаўства падаваліся звесткі не пра беларускую старасвеччыну і фальклор, а пра рэвалюцыйныя падзеі 1905 ці 1917 гг., або пра дзейнасць бальшавікоў у Беларусі. Недзе ў 1928 г. аднаму з актывістаў беларускага краязнаўчага руху Я. Кіпелю ў адным з «высокіх кабінетаў» было рэкамендавана замест этнаграфічных вандровак у беларускія вёскі Меншчыны сабраць біяграфічны матэрыял пра жыцце і дзейнасць Фелікса Дзяржынскага і яго сям'ю, якія родам былі з Койданаўшчыны і Бабруйшчыны. Праўда, студэнт далікатна адмовіўся ад такой «прапановы».

### Беларускі маладзёвы рух на ўсходнебеларускіх землях у 1919–1929 гг.

У лютым 1919 г., разагнаўшы першы ўрад ССРБ, маскоўскія бальшавікі далучылі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні да Савецкай Расіі (РСФСР). Адпаведнае рашэнне ЦК РКП(б) прыняў 16 студзеня 1919 г. — праз два тыдні пасля абвяшчэння «незалежнай» Савецкай Беларусі. У Крамлі было вырашана ліквідаваць і саму ССРБ шляхам яе зліцця з Літоўскай ССР і ўтварэння Літоўска-Беларускай ССР (Літбел). Аднак мясцовыя камуністы і нават такія дзеячы, як Аляксандр Мяснікоў, Вільгельм Кнорын ды Ісак Рэйнгольд, выступілі супраць гэтага намеру Масквы. Для таго, каб пераканаць дзеячаў КП(б)Б у слушнасці такога кроку, у Менск быў накіраваны член ЦК РКП(б) Адольф Іофе. Аднак бальшавіцкаму дыплама-

ту не ўдалося выканаць сваёй місіі. Тады на 2 лютага 1919 г. быў скліка্ны I з'езд Саветаў Беларусі. Для ўдзелу ў працы гэтага з'езда ў Менск адмыслова прыехаў другі чалавек у бальшавіцкай партыі, старшыня Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Якаў Свярдлоў. Пад яго ціскам кіраўнікі КП(б)Б капітулявалі. Сфармаваны бальшавікамі З'езд Саветаў Беларусі («прадстаўнікі працоўнага народа Беларусі») прынялі пастанову аб выдзяленні са складу Рэспублікі Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў і ўваходжанні іх у склад РСФСР. Была прынята таксама пастанова пра зліццё астатняй часткі ССРБ з Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай Літвой. Так у канцы лютага 1919 г. на кароткі час на карце рэгіёна з'явілася квазідзяржаўнае ўтварэнне пад назвай Літбел.

У ліпені таго ж года адбылася адміністратыўная рэарганізацыя Магілёўскай губерні: губернскі цэнтр перамясціўся ў Гомель, а сама губерня была перайменавана ў Гомельскую. Частка Магілёўскай губерні (Сенненскі павет) была далучана да Віцебскай губерні, а частка (Мсціслаўскі павет) — да Смаленскай. Цягам 1919 г. да РСФСР былі далучаныя Рэчыцкі, Мазырскі і амаль увесь Бабруйскі паветы, а таксама асобныя воласці Барысаўскага і Ігуменскага паветаў Менскай губерні. У жніўні 1920 г., пасля другога абвяшчэння ССРБ, Мазырскі павет і адзначаныя вышэй воласці Ігуменскага і Бабруйскага паветаў былі вернутыя Савецкай Беларусі, але Рэчыцкі павет і Бялыніцкая воласць Барысаўскага павета засталіся ў складзе Савецкай Расіі.



*Майсей Шыманскі, беларускі журналіст. У 1924–1926 гг. загадчык Раснянскага раённага аддзелу народнай адукацыі Калінінскай акругі. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*



*Пятро Юргелевіч, вядомы беларускі мовазнавец, у 1926–1927 гг. адказны сакратар клімавіцкай газэты «Наш працаўнік». Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*



*Павал Каравайчык (Любецкі), адзін з ідэолагаў беларускага маладзёвага руху, у 1921–1922 гг. сакратар Беларускага бюро Наркамасветы РСФСР. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*

Знаходжанне ўсходнебеларускіх губерняў у складзе РСФСР значна замарудзіла працэс нацыянальнай кансалідацыі аўтахтоннага жыхарства — беларусаў. Не спрыялі гэтаму адсутнасць моцнага каардынацыйнага цэнтру і слабасць мясцовых беларускіх нацыянальных арганізацый, а таксама панаванне ва ўладных структурах на губернскім і павятовым узроўнях зрусіфікаваных і чужародных элементаў, якія варожа ўспрымалі ўсё беларускае. Пераадолець гэты супраціў прыхільнікам беларусізацыі і ўзбуйнення тэрыторыі Савецкай Беларусі магчыма было толькі праз сумесныя намаганні мясцовых нацыянальных арганізацый і ўрадавых структур ССРБ—БССР, якімі апекаваліся нацыянал-камуністы. «Усходні фронт» беларускага руху паступова адваёўваў у «дамарошчаных» русіфікатараў камандныя пазіцыі ў сферы адукацыі, культуры, эканомікі і сацыяльнай палітыкі, пашыраў у рэгіёне беларускую асвету і друкаванае слова, рыхтаваў глебу для далучэння гэ-

тых беларускіх этнаграфічных земель да Савецкай Беларусі.

Доўгі час уся нацыянальная справа ва ўсходнебеларускім рэгіёне трымалася выключна на малалікіх беларускіх маладзёвых гуртках, вакол якіх гуртаваліся вучні старэйшых класаў сярэдніх навучальных установаў, а таксама студэнты мясцовых педагагічных і іншых вышэйшых школ. Гэтыя адукацыйныя асяродкі якраз і з'яўляліся галоўнымі выспамі беларускай культурніцкай працы.

Першай такой «выспай» на Магілёўшчыне стаў беларускі вучнёўскі гурток пры сельскагаспадарчых вучэльнях у Горы-Горках, які быў арганізаваны яшчэ ў сакавіку 1917 г. Гаўрылам Гарэцкім (братам класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага), Сцяпанам Журыкам і Яўгенам Чарняўскім. Увосень таго ж года да іх далучыліся Мікалай Ганчарык і іншыя навучэнцы.

Цяжка прабівала сабе дарогу беларуская нацыянальная свядомасць сярод беларусаў-навучэнцаў названых сельскагаспадарчых навучальных установаў. «Зараз тут, — успамінаў М. Ганчарык, — сярод вучняў горацкіх школ, я пачаў свае размовы аб беларускай мове, але мала знаходзіў прыхільнікаў і спачуваючых гэтай «простай» сялянскай мовы. Сярод вучняў класа мяне амаль ніхто не падтрымаў у гэтых адносінах, але з боку некаторых з іх я не бачыў і актыўных праціўнікаў, яны прыслухоўваліся да маіх размоваў і асабліва не супярэчылі». Нягледзячы на малалікасць, горацкая маладзёвая арганізацыя паступова пачынае разгортваць сваю культурна-асветную і прапагандысцкую чыннасць. У палітычным кірунку сябры гуртка вызнавалі ідэалогію, блізкую да праграмы беларускіх эсэраў. Іх светапогляд добра адлюстраваны ў аповесці Максіма Гарэцкага «Дзве душы», літаратурныя персанажы якой (Мікола Канцавы, Сухавей і іншыя) спісаныя з рэальных асобаў — сяброў Горацкага беларускага вучнёўскага гуртка. Відавочна, што многія сюжэты чыннасці маладзёвых актывістаў у «Дзвюх душах» былі ўзятыя М. Гарэцкім дзякуючы расповедам брата Гаўрылы, з «натуры» — са штодзённай чыннасці горацкага беларускага гуртка. У аповесці, дарэчы, прысутнічае сюжэт арышту кіраўнікоў гуртка Канцавога і Сухавея «чрэзвычайкай» у канцы 1918 г. Ва ўспамінах Г. Гарэцкага і М. Ганчырыка, напісаных у савецкі час, пра гэты факт нічога не згадваецца. Не выяўлена інфармацыя пра арышты сяброў гуртка і ў архіўных зборах. Але эпізод з арыштам, адлюстраваны ў літаратурным творы, ускосна можа пацвярджаць яго рэальнасць у жыцці горацкага гуртка, тым больш што ва ўсходняй Беларусі ў гэты час пракацілася цэлая хваля антыбальшавіцкіх сялянскіх паўстанняў, выкліканых «продразверсткой», а ўслед за імі адбыліся масавыя рэпрэсіі з боку савецкіх карных органаў.

Актывісты горацкага беларускага гуртка верылі, што «толькі на шляху нацыянальна-сацыяльным беларускае адраджэнне будзе поўным і абхопіць шыбка і памысна вялізныя масы беларускага сялянства. І не толькі сялянства, адылі і беларускага мяшчанства..., дзе яно яшчэ ёсць і мае ў сваёй ідэалогіі і сваім жыцці шмат беларускасці». Яны спадзяваліся, што праз культурна-асветную чыннасць ды гутаркі з мясцовым жыхарствам на нацыянальныя і сацыяльна-палітычныя тэмы яны здолеюць прыцягнуць да нацыянальнай справы найбольш прыдатныя і дзейсныя беларускія сацыяльныя сілы горацкіх ваколіц і наогул усходняй палавіны Беларусі.

Чыннасць гуртка з кожным днём шырылася. На першым паверсе агранамічна-каморніцкай школы быў адчынены беларускі вучнёўскі клуб, што дазволіла стварыць пры ім бібліятэку-чытальню і драматычную дружыну. У 1918 г. горацкія беларусы выпусцілі праз друкарню ўлётку «Як правільна чытаць па-беларуску», у якой даваліся асноўныя асаблівасці беларускай мовы і правільнасць вымаўлення літар *ў*, *дз*, *дж* і *шч*. Па-ранейшаму, найбольш дзейсным сродкам нацыянальнай агітацыі заставаўся тэатр. Сябрамі гуртка быў складзена драматычная дружына, якая пачала рыхтаваць сваё першае «тэатральнае ігрышча» па п'есе ўкраінскага драматурга Марка Крапіўніцкага «Пашыліся ў дурні». Ганчарык, як адзін з кіраўнікоў гэтай драматычнай дружыны, успамінаў: «Артысты, пастаноўшчыкі. мастакі, рэжысёры, — увесь калектыў складаўся з 18-ці асоб. Мы добра ведалі, што першая ў Горках пастаноўка павінна была быць выдатнай, бо інакш мы маглі толькі дапамагчы тым, якія крычалі, што беларускай мовы няма, ёсць толькі мужыцкае вымаўленне расійскай мовы. І наш тэатральны гурток прыклаў усе свае намаганні да таго, каб пастаноўка была ўдалай. Рэпетыцыі праводзілі вельмі часта, ролі вывучалі добра». Прэм'ера адбылася ў студзені 1918 г. і мела вялікі розгалас у

Горках і нават ва ўсім павеце. «Для многіх, — згадваў той жа Ганчарык, — з'явілася зусім нечаканым, што беларуская мова не дубовая нейкая…, але даволі меладычная і што на ёй можна выказваць усе свае пачуцці, смутак, радасць і іншыя перажыванні. Сярод вучняў і насельніцтва горада яшчэ доўгі час перадаваліся ўражанні ад беларускага спектаклю». У далейшым сіламі гэтай беларускай самадзейнай трупы былі пастаўлены паэма «Тарас на Парнасе», «Паўлінка» Янкі Купалы, «Апошняе спатканне» Уладзіслава Галубка, «Птушка шчасця» Францішка Аляхновіча, п'есы іншых аўтараў. Пры падтрымцы сябраў арганізацыі былі створаныя маладзёвыя самадзейныя культурна-асветныя і тэатральныя гурткі ў мястэчках Дрыбін, Раманава, Гарадзішча, у вёсках Сарцiслаў, Малая Багацькаўка і Малышэвічы.



*Язэп Мацюкевіч, былы сябра адэскага «Беларускага гаю», у 1924 г. загадчык Калінінскага акруговага аддзелу народнай адукацыі. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*

Таксама вялікай папулярнасцю сярод горацкай моладзі карысталіся вучнёўскія вечарыны. У мастацкай частцы выконваліся старасвецкія рамансы, класічная музыка, дэкламаваліся вершы беларускіх паэтаў. А пасля былі скокі: моладзь танчыла мадэрновыя «падэкатр», «падэспань», традыцыйны кракавяк, польку-какетку і розныя вальсы.

У 1919 г. на базе дзвюх



*Міхась Урублеўскі, выпускнік Менскага белпедтэхнікуму, настаўнік Крычаўскай прафесійнай сярэдняй школы. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*

горацкіх сельскагаспадарчых вучэльняў была заснавана вышэйшая навучальная ўстанова. Адбылася рэарганізацыя і мясцовага беларускага вучнёўскага гуртка. Ён быў пераўтвораны ў Беларускую секцыю студэнтаў (БСС) Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. 15 кастрычніка 1919 г. статут арганізацыі быў зацверджаны ў Горацкім павятовым выканкаме. Галоўная мэта гуртка заставалася нязменнай — «пашыраць свядомасць



*Сцяпан Рабцэвіч, выпускнік Менскага белпедтэхнікума, настаўнік Клімавіцкай беларускай пачатковае школы ў 1924–1927 гг. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*

паміж беларусамі, знаёміць іх з літаратурай. тэатральнымі творамі, гісторыяй, культурным і эканамічным становішчам Беларусі». Праца беларускай студэнцкай сэкцыі была падзелена на аддзелы: гісторыка-эканамічны, літаратурны, тэатральны, музычны і «чыстага мастацтва».

Пад уплывам Г. Гарэцкага і С. Журыка горацкі беларускі студэнцкі гурток у сваёй чыннасці робіць ухіл на навуковае вывучэнне гісторыі, культуры і эканомікі Беларусі. Гуртkоўцы займаюцца ўкладаннем беларускай сельскагаспадарчай тэрміналогіі (прынамсі, у пачатку 1920 г. склалі «Беларускі батанічны слоўнік»), перакладаюць на беларускую мову навуковую літаратуру па аграрных і эканамічных пытаннях. Стараннямі Гарэцкага выкладчыкамі інстытута і нават прафесарамі Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі з Масквы для сябраў гуртка і ўсіх ахвотных чыталіся лекцыі

па розных аспектах беларускай праблематыкі. Горацкія студэнты ў гэты час падтрымліваюць шчыльныя кантакты з іншымі беларускімі студэнцкімі і вучнёўскімі гурткамі. У 1921 г. горацкая БСС вітае ініцыятыву Менскага гуртка беларускай моладзі аб стварэнні адзінага каардынацыйнага цэнтру беларускага маладзёвага руху.

Трэба сказаць, што горацкая БСС адразу была ўспрынята «ў штыхі» мясцовым камсамолам і кіраўніцтвам павятовага аддзела народнай адукацыі. У 1920 г. адбываецца перарэгістрацыя горацкага беларускага гуртка. Беларускі вучнёўскі клуб, які месціўся ў актавай зале былой агранамічна-каморніцкай школы, быў ліквідаваны (зала пераабсталявана пад студэнцкія аўдыторыі). Ад'езд на вучобу ў Маскву Г. Гарэцкага паўплываў на зніжэнне актыўнасці беларускага студэнцкага гуртка. Ён усё больш падпарадкоўваўся камсамолу. «Спрыяла» гэтаму кампрамісная пазіцыя новага старшыні — М. Ганчарыка, які быў прыхільнікам камуністычнай ідэалогіі і ў 1924 г. нават уступіў у бальшавіцкую партыю.

Замест беларускага клуба кіраўніцтва сельскагаспадарчага інстытута ўтварыла Камуністычны студэнцкі клуб імя Анатоля Луначарскага. Пакуль гэтай установай загадваў М. Ганчарык, сябры Горацкай беларускай студэнцкай секцыі яшчэ мелі магчымасць ставіць свае спектаклі і ладзіць літаратурна-музычныя вечарыны. Але паступова «свядомых» адхіляюць ад клубнай працы, уводзячы «ўнутраную» цэнзуру на тэатральныя пастаноўкі беларускай трупы. З 1922 г. гурток «уключылі» ў склад Усерасійскага пралетарскага студэнцтва. Яго чыннасць апынулася пад жорсткім кантролем інстытуцкай камсамольскай суполкі.

Горацкая БСС існавала да лета 1924 г., пакуль Магілёўшчына не ўвайшла ў склад БССР. Парадокс: сябры гуртка, якія актыўна дамагаліся далучэння Магілёўшчыны да Савецкай Беларусі, сталі аднымі з першых ахвяраў гэтага ўзбуйнення. Працуючы пад дахам дзяржаўных устаноў Савецкай Расіі, яны лічыліся арганізацыяй, што прадстаўляла нацменшасць. Дзякуючы гэтаму статусу «беспартыйны» гурток доўгі час выжываў у няпростых варунках. Паводле ж адміністратыўнага заканадаўства БССР, чыннасць арганізацый і аб'яднанняў «тытульнай» нацыі, якія ставілі перад сабой чыста нацыянальныя заданні, не дазвалялася.

Горацкая БСС не была адзінай нацыянальнай маладзёвай арганізацыяй на Магілёўшчыне ў 1917–1918 гг. У гэты час тут дзейнічалі беларускія «інтэлегенцкія» гурткі ў Нова-Быхаве, а таксама ў вёсках Сялец-Халяпееўскі і Іскань. Але праіснавалі яны нядоўга і хутка распаліся. Трэба адзначыць плённую працу на ніве беларушчыны маладога беларускага літаратара Андрэя Шашалевіча, больш вядомага пад літаратурным псеўданімам Андрэй Мрый, які ў 1921–1926 гг. працаваў настаўнікам у Краснапольскай пачатковай школе імя Пірагова. Разам з братам Васілём і сястрой Настассяй ён стварыў пры школе беларускі вучнёўскі гурток і народны тэатар, а таксама разам з вучнямі збіраў вусную народную творчасць, дасылаючы фальклёрныя запісы ў Менск, у Інбелкульт.

Немалаважную ролю ў справе нацыянальнага згуртавання тутэйшай беларускай моладзі адыграў магілёўскі вучнёўскі гурток «Асвета». Гісторыя яго ўтварэння і чыннасці ў нечым падобная да гісторыі горацкай БСС. Паўстаў ён у сакавіку 1918 г., яшчэ падчас нямецкай акупацыі горада, у сценах Магілёўскай настаўніцкай семінарыі. Увосень 1919 г. магілёўскі гурток ужо налічваў больш за 100 чалавек. Да яго далучыліся студэнты мясцовага педагагічнага інстытута, навучэнцы старэйшых класаў сярэдніх навучальных устаноў горада.

Галоўным ініцыятарамі стварэння «Асветы» стаў навучэнец семінарыі Макар Выдрыцкі. Ягонымі стараннямі ў 1919 г. была арганізавана самадзейная тэатральная трупа, якая абрала сваёй сядзібай магілёўскі Дом працоўнага селяніна. Дэбютаваў гурток на сцэне гарадскога тэатра, на якой было інсцэніравана беларускае вяселле. У далейшым аматары беларускага тэатральнага мастацтва ставілі спектаклі не толькі ў горадзе, але і рабілі вандроўкі па павеце, паказваючы п'есы Янкі Купалы, У. Галубка, Ф. Аляхновіча і Л. Родзевіча. Паводле словаў Выдрыцкага, гурткоўцы, акрамя тэатральных пастановак, вялі «зацікаўленыя бяседы» з тутэйшым сялянствам пра неабходнасць далучэння Магілёўшчыны да Савецкай Беларусі, вучылі іх правільна чытаць і пісаць па-беларуску. Пазней пры гуртку ўзнік вучнёўскі хор пад кіраўніцтвам хормайстра Л. Грайкі, які складаўся з 80-ці чалавек.

У 1920 г. гурток атрымаў назоў «Асвета», што падкрэслівала яго галоўную задачу: праз школу, тэатр, кнігавыданне шырыць нацыянальнае ўсведамленне сярод мясцовага жыхарства. Гурток дапамагаў станавіцца на ногі іншым беларускім маладзёвым арганізацыям у Мсціславе, Чавусах, Бялынічах, у вёсцы Фашчаўка ды ў іншых мясцінах.

1921 год выявіў арганізацыйную і ідэйную сталасць «Асветы». Віленская газета «Беларускія ведамасьці», з якой, дарэчы, гурткоўцы мелі негалосны кантакт, пісала: «Доўгі час іх праца насіла характар пачынальны, бо сябры, атрымаўшыя ў наследак вядомую загнанасць, былі няпэўныя ў сваёй працы. Але ў абноўленым складзе гурток адкінуў прэч ад сябе ўсякую няпэўнасць і пільна прыступіўся да працы... Гурток мае ў думцы, што блізка тая часіна, калі Магілёўшчына скажа бацьку-Менску: «Забяры мяне ў сваю сям'ю»».

Асветаўцы дамагліся ўтварэння беларускай секцыі пры Магілёўскім павятовым аддзеле народнай адукацыі, які стаў арганізацыйным апірышчам у пашырэнні беларускамоўнай адукацыі ў рэгіёне. Гурток меў моцную падтрымку з боку Цэнтральнага беларускага бюро Наркамасветы РСФСР і яго сакратара, Паўла Каравайчыка (Любецкага), праз якога арганізацыя час ад часу атрымлівала пасільную фінансавую дапамогу.

У 1922 г. магілёўскі беларускі вучнёўскі гурток быў пераўтвораны ў Беларускую студэнцкую асацыяцыю «Асвета» пры Магілёўскім інстытуце народнай адукацыі. З гэтых ды іншых прычын арганізацыя набывае выразны «акадэмічны» характар. Гурткоўцы рабілі ўхіл на вывучэнне беларускай мінуўшчыны, этнаграфіі, даследаванне эканамічнага і дэмаграфічнага становішча Беларусі. Яны плённа супрацоўнічалі са сталымі беларускімі навукоўцамі — Зміцерам Даўгялам, Ісакам Сербавым, пісьменнікам Міхасём Зарэцкім, мовазнаўцам Сцяпанам Жураўскім, тэатральным дзеячам Алесем Ляжневічам і інш.

Праўда, ужо з 1921 г. гурток сутыкаецца з адкрытай варожасцю да сябе з боку мясцовага камсамола, які намагаецца калі не ліквідаваць «Асвету», то паставіць яе працу пад свой кантроль. У гэтым маладым камуністам актыўна дапамагалі мясцовыя ўлады. У ранейшыя часы (1919–1920 гг.), мясцовым камсамольскім арганізацыям было не да беларускіх нацыяналдэмакратаў. Іх увага была прыцягнута ў першую чаргу да змагання з больш моцнымі «канкурэнтамі» — бой-скаўтамі, габрэйскімі маладзёвымі арганізацыямі «Югенд Бунд» і «Цэйрэ Цыён», а таксама сябрамі т. зв. «III Інтэрнацыяналу», які аб'яднаў сацыялістаў-небальшавікоў розных адценняў. Але хутка прыйшла чарга і да «асветаўцаў».

У пачатку гэтага супрацьстаяння сябры «Асветы» выказалі сваю прынцыповую пазіцыю, што іх мэты адрозныя ад мэтаў камуністычнага саюза моладзі. Паміж камсамольскімі лідарамі і беларускімі маладзёвымі актывістамі ў 1921 г. распачалася вострая ідэалагічная дыскусія. Цэнтральнай трыбунай для яе была абрана старонка КСМБ «Малады араты» ў газеце «Савецкая Беларусь». Акрамя таго, магілёўскія камсамольцы актыўна выкарыстоўвалі дзеля гэтага і рэгіянальныя савецкія перыядычныя выданні — магілёўскую «Соха и молот», гомельскую «Набат» і інш.

13 верасня 1921 г. у «Савецкай Беларусі» нечакана з'явіўся невялічкі артыкул А. Зніча «Сапраўдны шлях». У ім нясмела выказвалася нязгода з намаганнямі КСМ падпарадкаваць свайму ўплыву ўвесь маладзёвы рух у Беларусі. Аўтар заяўляў, што толькі шырокая беспартыйная культурная праца на роднай мове ёсць «тым сапраўдным шляхам, па каторому нашая пралетарская моладзь дойдзе да лепшага жыцця». Зніч тлумачыў, што свядомая беларуская моладзь не можа пайсці ў шэрагі камсамолу, бо праца апошняга скіравана на русіфікацыю беларускіх сялян, «каб прыціснуць мужыка, забраць у яго ўласнасць».

Камсамольскімі «важакамі» гэтая заява была расцэнена як «вылазка дробнабуржуазнага элементу». Адзін з іх, хто схаваўся пад псеўданімам «Рунь», ў той жа «СБ» за 16 верасня нервова зрэагаваў на выступ Зніча, назваўшы апошні «самым езуіцкім наступам на камуністычны саюз моладзі». Другі камсамольскі апалагет, М. Шэйман, абвінаваціў нацыянальныя беспартыйныя гурткі ў сепаратызме. «Трэба сказаць адкрыта, — пісаў ён, — што ў культурна-асветных гуртках кіруе інтэлігенцыя. Запраўды ж тыя кіраўнікі, якія крычаць за беспартыйнасць — самі з'яўляюцца не беспартыйнымі, а скрытымі контррэвалюцыянерамі, ці нацыяналістамі... Абсалютнай беспартыйнасці няма. Калі не

спачуваеш савецкай уладзе, дык ты вораг яе і спачуваеш контррэвалюцыі. Вось так стаіць пытанне».

Нарастаючае супрацьстаянне з партыйнымі і камсамольскімі структурамі хоць і не прывяло «Асвету» адразу да ліквідацыі, але звяло яе ідэйна-арганізацыйную самастойнасць да мінімуму. Увосень 1921 г., не маючы фінансавай падтрымкі і пазбаўлены магчымасці даваць канцэрты ў горадзе і ў павеце, спыніў сваё існаванне беларускі маладзёвы хор. Неўзабаве сваёй сядзібы ў Доме працоўнага селяніна пазбавілася і тэатральная трупа гуртка. Адзінае месца, дзе «асветаўцы» яшчэ маглі збірацца, — гэта аўдыторыі мясцовага інстытута народнай адукацыі. Але за 1921 г. аддзел прапаганды і агітацыі Магілёўскага гаркама РКП(б) запатрабаваў за выступы хору і трупы «Асветы» плаціць грошы. У той жа самы час расійскамоўным тэатральным калектывам даваліся ў гэтым плане значныя паслабленні і ільготы.

Падчас рэарганізацыі гуртка ў 1922 г. істотна змяніўся змест статута арганізацыі. У самым пачатку дакумента абвяшчалася галоўная яе мэта: «Культурна-асветнае і эканамічнае адраджэнне беларускага народа ў камуністычным напрамку». Дэвізам БСА «Асвета» стаў «Да Асветы, да Камунізму», а на пячатцы арганізацыі красаваўся камуністычны лозунг: «Пралетарыі ўсіх краінаў, злучайцеся». Статут быў зацверджаны ў мясцовым выканкаме толькі на пачатку 1923 г. Гурткоўцы спадзяваліся, што пасля разбаўлення праграмных палажэнняў арганізацыі камуністычнымі дэкларацыямі іх пакінуць у спакоі. Аднак яны памыляліся. Камсамольская ячэйка Магілёўскага інстытута народнай адукацыі ўвесь час зацята нападала на кіраўніцтва «Асветы» за яе беспартыйны характар і за праявы «шавінізму». Ініцыятыва стварыць пры гуртку камсамольскую ячэйку была расцэнена як «засмечванне» КСМ варожымі элементамі. Апошняя арганізацыйная зборка «Асветы» адбылася 23 красавіка 1923 г. Летам таго ж года Магілёўскі інстытут народнай адукацыі быў расфармаваны, а большасць яго студэнтаў перавялі вучыцца ў Менск — у Белдзяржуніверсітэт. З ліквідацыяй Магілёўскага ІНА канчаткова распаўся і гурток «Асвета». За 5 гадоў свайго існавання ён выхаваў не адзін дзясятак беларускіх патрыётаў, якія склалі авангард руху за далучэнне ўсходніх зямель да Беларусі і актыўна праявілі сябе падчас правядзення беларусізацыі на Магілёўшчыне.

Значна слабей выглядаў беларускі маладзёвы рух на Гомельшчыне, Віцебшчыне і асабліва на Смаленшчыне. На Гомельшчыне, як сведчаць архіўныя дакументы, адзін з першых беларускіх гурткоў паўстаў у Брадзецкай воласці, якую ў склад РСФСР забралі з Ігуменскага павета Менскай губерні ў 1919 г. Гурток быў заснаваны ў лістападзе 1920 г. маладымі настаўнікамі мясцовых пачатковых школ, прыхільнікамі беларусізацыі. У снежні 1920 г. яны звярнуліся ў Наркамасветы ССРБ з просьбай выслаць ім камплекты школьнай літаратуры па беларускай мове і беларусазнаўству для 21 школы. На жаль, гэтая заяўка не была выканана своечасова. Беларускамоўных падручнікаў не хапала нават для Менска: ек хапала друкарскага абсталявання, адсутнічаў у належнай колькасці друкарскі шрыфт на беларускай мове, не хапала паперы. Вядомы факт: Наркамат асветы ССРБ, выбіўшы ў 1920 г. у маскоўскіх чыноўнікаў неабходныя фінансавыя сродкі ў замежнай валюце, наладзіў друк беларускіх падручнікаў і іншай літаратуры ў Берліне.

Архіўныя крыніцы пачатку 1920-х гг. пакінулі вельмі мала звестак пра чыннасць беларускіх маладзёвых гурткоў на Гомельшчыне. Вядома, што, акрамя Брадзецкага гуртка, беларуская маладзёвая суполка пад назвай «Гай» існавала ў Рэчыцы пры былой Дзвінскай рэальнай вучэльні, эвакуяванай сюды падчас Першай сусветнай вайны.

Увесну 1921 г. у Гомелі з’явілася ініцыятыўная група па стварэнні беларускага вучнёўскага гуртка. Вучні мясцовых сярэдніх школ і маладая беларуская інтэлігенцыя ініцыявалі ў Гомелі 27 траўня 1921 г. арганізацыйны сход, на якім была прынята рэзалюцыя з патрабаваннем да губернскіх уладаў распачаць працу дзеля арганізацыі ў рэгіёне беларускага школьніцтва. Першым крокам для гэтага павінна была стаць арганізацыя пры мясцовым аддзеле народнай адукацыі беларускай секцыі.

Арганізацыйнае афармленне асяродку беларускай моладзі ў горадзе на Сожы адбылося толькі ўвосень 1921 г. Паўстаў ён у сценах мясцовага педагагічнага тэхнікума. 4 лістапада 1921 г. на арганізацыйнай зборцы вучняў гэтай вучэльні была абрана рада гуртка ў складзе 5 чалавек: Мяфодзіеў (старшыня), Язерскі

(сакратар), Валынец, Лашкевіч і Бандарэнка. У рэвізійную камісію абралі Кліндукова, Пяскоўскага і Лагуту. Дзеля большай прадуктыўнасці ўся праца арганізацыі была падзелена на тры секцыі: літаратурна-мастацкую, гістарычную і геаграфічную.

У хуткім часе былі арганізаваныя пазакласныя заняткі па беларусазнаўстве для гурткоўцаў і ўсіх ахвотных (3 разы на тыдзень). Дзеля гэтага запрашаліся дасведчаныя лектары — вядомы беларусазнаўца І. Сербаў, а таксама Міхайлаў, Людкоўскі і Руткоўскі. На працягу двух гадоў у сценах педтэхнікума чыталіся курсы па беларускай мове, гісторыі і культуры беларускага народа. У 1922 г. гурткоўцы дамагліся ад кіраўніцтва гарадскога аддзела народнай адукацыі ўвядзення выкладання ў тэхнікуме беларускай мовы і літаратуры як абавязковых прадметаў. Тады ж была ўтворана і кафедра беларусазнаўства. У гэты час былі таксама арганізаваныя вучнёўскі хор і тэатральная трупа, якія прэзентавалі беларускае мастацтва сярод навучэнцаў і жыхароў Гомеля і яго ваколіц. Дзякуючы падтрымцы Наркамасветы ССРБ у педтэхнікуме была створана невялічкая беларуская бібліятэчка.

Улетку 1922 г. у Гомелі арганізавалася беларуская секцыя пры губернскім аддзеле народнай адукацыі ў складзе… адной штатнай адзінкі (!) «І таго — зашмат!» — «пажартаваў» загадчык аддзела Нэйман. Падобнае стаўленне да нацыянальных патрэбаў тытульнай нацыі, якая ў губерні складала болей за 80% жыхарства, было здзекам для прадстаўнікоў мясцовага беларускага нацыянальнага актыву. Пры гэтым такое адбывалася ў той час, калі пры дамінуючым становішчы расійскай школы тут стала працавалі габрэйская, польская і нават латышская нацыянальныя школьныя секцыі, дзейнічалі дзясяткі школ і культурна-асветных клубаў узгаданых нацыянальнасцяў. Аднак яны аніяк не замахваліся на расійскую гегемонію ў рэгіёне і з'яўляліся шырмай для русіфікатараў, якія спадзяваліся і надалей кіраваць на гэтых землях.

Бадай, адзіным арганізаваным асяродкам беларушчыны на Віцебшчыне ў пачатку 1920 г. з'яўляўся беларускі студэнцкі гурток, які аб'яднаў прыхільнікаў беларушчыны ў сценах мясцовага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута і Віцебскага інстытута народнай адукацыі. Прызнанымі лідарамі «беларускай партыі» ў Віцебску з'яўляліся ўжо вядомыя грамадскія дзеячы Міхась Мялешка і Аляксандр Шлюбскі.

Беларуская школьная секцыя пры Віцебскім губернскім аддзеле народнай адукацыі была ўтворана па ініцыятыве Цэнтральнага беларускага бюро пры Наркамасветы РСФСР у кастрычніку 1921 г. Аднак пры адсутнасці падтрымкі з боку мясцовых нацыянальных арганізацый беларуская школьная і культурна-асветная праца рухалася тут вельмі марудна. Адзінай навучальнай установай у губерні, дзе выкладалася беларусазнаўства, была Лепельская працоўная школа 2-й ступені № 3 (былая земская змешаная гімназія). І тое гэта рабілася толькі дзякуючы намаганням дырэктара школы, вядомага беларускага культурніка Палікарпа Шчансновіча. Анкетаванне настаўнікаў пачатковых і сярэдніх навучальных устаноў Віцебшчыны за 1922 г. адлюстроўвала нізкую нацыянальную свядомасць мясцовых беларускіх настаўнікаў. З 305 педагогаў Аршанскага, Віцебскага, Гарадоцкага, Лепельскага, Полацкага, Сенненскага і Суражскага паветаў сваёй роднай мовай беларускую назвалі толькі 23 чалавекі (7,5%), у той час як расійскую — 234 чал. (76,7%), іншыя мовы — 48 (15,8%). Вынікі дадзенага апытання з'яўляюцца паказчыкам не столькі антыбеларускай пазіцыі тутэйшых школьных работнікаў, колькі жорсткага русіфікатарскага курсу мясцовага губернскага партыйнага і савецкага начальства. Заявай аб сваёй беларускасці можна было сур'ёзна сапсаваць адносіны са школьным кіраўніцтвам. Міхась Мялешка пісаў у 1921 г.: «Праводзячы сваю працу на Віцебшчыне, расійцы знішчалі ўсё беларускае. Усё беларускае высмейвалася… Паны-русіфікатары, што засталіся, памянялі толькі сваё вонкавае аблічча. Адны з іх сталі «камуністамі», другія — беспартыйнымі «спецамі», трэція засталіся такімі ж манархістамі, як і былі… Беларускае адраджэнне, беларуская мова, беларуская культура і яшчэ беларуская незалежнасць — гэта самае страшнае для «русских» людзей на Віцебшчыне». У 1918–1920-х гг. на Віцебшчыне рабіліся і яшчэ спробы ўтварыць новыя беларускія культурна-асветныя гурткі, але яны разбіваліся аб бюракратычны мур мясцовай уладнай вертыкалі.

Стомлены безупынным супрацьстаяннем з праціўнікамі беларусізацыі, М. Мялешка просіць

у чэрвені 1923 г. У. Ігнатоўскага паспрыяць яму ў атрыманні накіравання для паездкі ў навуковую камандзіроўку ў пражскі Карлаў універсітэт. Лёс, аднак, склаўся інакш. Замест Прагі Мялешку даручылі ўзначаліць адмысловую камісію па апрацоўцы і сістэматызацыі навукова-літаратурнай спадчыны гісторыка і архівіста Аляксея Сапунова, памерлага ў 1921 г.

Чыннасць нешматлікіх мясцовых беларускіх інтэлектуалаў у Віцебску да 1924 г. адбывалася пераважна ў «акадэмічным кірунку». Студэнты археалагічнага інстытута так і не дабіліся стварэння асобнай беларускай секцыі пры Расійскім гісторыка-мастацкім і археалагічным таварыстве, якое мела сваю філію ў Віцебску. «Але, — пісаў Аляксандр Шлюбскі ў Наркамат асветы ССРБ у Менск 23 ліпеня 1922 г., — гэтае «Общество» не даўгавечна. Мусіць Віцебск быць пад валадарствам Менска. Трэба яго заставіць быць бліжэй да нашага беларускага цэнтру».

На Смаленшчыне, дзе ў той час пражывала больш як 700 тыс. аўтахтоннага беларускага насельніцтва, мелася толькі адна арганізацыйная структура, якая была здольная праводзіць беларускую нацыянальную працу — гэта Беларуская секцыя пры губернскім аддзеле народнай адукацыі. У гады беларусізацыі тут дзейнічалі некалькі дзясяткаў беларускіх нацыянальных школ. Аднак пасля пагрому беларускага нацыянальнага руху ў 1930-я гг. ад іх нічога не засталося.

Беларускія нацыянал-камуністы, разумеючы няпэўнасць і няжыццяздольнасць існавання ССРБ у межах няпоўных 6-ці паветаў Менскай губерні і часткі Вілейскага павета Віленскай губерні, ужо ў лістападзе 1920 г. уздымалі пытанне аб узбуйненні тэрыторыі Савецкай Беларусі шляхам вяртання ў яе склад Віцебшчыны, Магілёўшчыны, Смаленшчыны і Гомельшчыны. У лютым 1921 г. гэтае патрабаванне было паўторана ў «Заяве 32-х» — звароце новаспечаных камуністаў, большую частку якіх складалі колішнія сябры Беларускай камуністычнай арганізацыі. Гэтыя звароты былі расцэнены ў ЦК КП(б)Б як нясвоечасовыя і парушаючыя партыйную дысцыпліну. Летам таго ж года пытанне «аб адміністратыўна-эканамічным аб'яднанні ўсіх беларускіх губерняў у межах БССР» горача абмяркоўвалася на Эканамічнай нарадзе ў СНК Савецкай Беларусі.

Кіраўніцтва Савецкай Беларусі разумела, што на шляху ўзбуйнення тэрыторыі рэспублікі ёсць яшчэ шмат перашкод. Найбольш супраціўлялася ўзбуйненню савецка-партыйная наменклатура на губернскім узроўні. Кіраўніцтва Гомельскай і Смаленскай губерняў высунула свой альтэрнатыўны праект, які прадугледжваў аднаўленне былой Заходняй вобласці ў складзе РСФСР з цэнтрам у Смаленску. Яшчэ адзін красамоўны факт: старшыня Гомельскага губвыканкама Пястун у 1921 г. катэгарычна заявіў: «В моей губернии белорусов нет, их выдумали интеллигенты». Пераадольваючы такі моцны супраціў, менскія нацыянал-камуністы спасылаліся на рашэнні XII з'езда ВКП(б) па нацыянальным пытанні і працягвалі настойліва «гнуць сваю лінію». Неабходна было правесці вялізарную культурна-асветную працу дзеля ўзмацнення нацыянальнай свядомасці тамтэйшага беларускага жыхарства.

Праца мясцовых беларускіх гурткоў у гэтым кірунку была вельмі важнай, але іх чыннасць не мела б сур'ёзнага поспеху, каб не моцная падтрымка з боку дзяржаўных органаў Савецкай Беларусі. Галоўным штабам беларусізацыі ўсходнебеларускіх зямель стаў Наркамат асветы на чале з У. Ігнатоўскім і А. Баліцкім. Яны дамагліся ад урада РСФСР дазволу пачаць арганізацыю беларускіх нацыянальных школ на беларускіх этнічных тэрыторыях у складзе РСФСР. Нягледзячы на адкрыты байкот і адміністрацыйныя перашкоды, якія чынілі губернскія чыноўнікі на месцах, у 1921–1922 гг. НКА БССР праз Цэнтральнае беларускае бюро пры НКА РСФСР у Віцебску, Смаленску і Гомелі дабіўся стварэння беларускіх губернскіх школьных секцый. На працу ў гэтыя рэгіёны былі накіраваныя здольныя арганізатары беларускай школьнай справы — Пракоп Шчарбінскі, Алесь Агейчык, Лявон Більдзюкевіч ды інш. У Віцебску беларускую губернскую секцыю ўзначаліў мясцовы беларускі дзеяч А. Шлюбскі. Летам 1922 г. у Менску для настаўнікаў усходніх рэгіёнаў былі ўтвораны Цэнтральныя беларускія настаўніцкія курсы з 2-месячным тэрмінам навучання. Да 1926 г. на гэтых курсах было падрыхтавана некалькі дзясяткаў настаўнікаў для ўсходніх рэгіёнаў Беларусі. Першыя беларускія школы пачалі ўзнікаць тут у 1922/23 навучальным годзе пры маральнай і арганізацыйнай падтрымцы горацкай Беларускай студэнцкай секцыі,

магілёўскага гуртка «Асвета», Гомельскага вучнёўскага гуртка ды іншых беларускіх маладзёвых асяродкаў. Пры педагагічных тэхнікумах у Оршы, Гомелі, Магілёве, Рагачове і Мсціславе пачалі дзейнічаць настаўніцкія курсы беларусазнаўства. У 1923 г. Наркамасветы дамогся ад расійскага кіраўніцтва прызнання за Белдзяржуніверсітэтам «краёвага статусу» для ўсёй этнаграфічнай прасторы Беларусі. Гэта абавязвала губернскія органы Віцебшчыны, Смаленшчыны, Гомельшчыны і Браншчыны камандзіраваць беларускіх абітурыентаў на вучобу ў Менск. Нарэшце, летам 1923 г. кіраўніцтва БССР дамаглося ад Крамля прынцыповай згоды на ўзбуйненне тэрыторыі Савецкай Беларусі коштам усходнебеларускіх этнічнаграфічных зямель. З гэтага часу, як эмацыйна выказаўся П. Каравайчык, распачаўся планамерны «штурм русацяпскіх крэпасцяў Усходняй Беларусі».

У лютым 1924 г. адбылося першае ўзбуйненне тэрыторыі Савецкай Беларусі, якое было заканадаўча замацавана ў сакавіку таго ж года на VI Надзвычайным з'ездзе Саветаў БССР. Да БССР адышлі 15 паветаў і асобныя валасці Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў. Другое ўзбуйненне БССР адбылося ў снежні 1926 г.: да яе былі далучаныя Гомельскі і Рэчыцкі паветы. Пачынаючы з 1924 г., праца па беларусізацыі ўсходнебеларускіх тэрыторый вялася больш актыўна і свабодна, без сур'ёзных перашкод з боку мясцовага партыйнага і савецкага апарату.

У ліпені 1924 г., паводле рашэння пленума ЦК КП(б)Б і сэсіі ЦВК БССР, у рэспубліцы быў узяты курс на правядзенне беларусізацыі, абвешчанай у якасці дзяржаўнай палітыкі. Былі складзеныя рэальныя планы правядзення нацыянальнай палітыкі на новадалучаных землях. Яны тычыліся шырокай тлумачальнай працы па папулярызацыі беларускай культуры і асветы, пераводу на беларускую мову ўсяго дзяржаўнага справаводства, школьнага навучання і чыннасці культурных установаў, арганізацыі беларускіх настаўніцкіх курсаў, школ для дарослых па ліквідацыі непісьменнасці. Найважнейшым чыннікам пашырэння беларушчыны ва ўсходнебеларускім рэгіёне стаў беларускі краязнаўчы рух. Краязнаўчыя суполкі, праца якіх каардынавалася Цэнтральным краязнаўчым бюро, дзейнічалі ва ўсіх раёнах БССР. Краязнаўчы часопіс «Наш край» рэгулярна змяшчаў на сваіх старонках хроніку краязнаўчага руху ў Беларусі, у тым ліку і ва ўсходніх рэгіёнах рэспублікі.

Асаблівая ўвага з боку нацыянальнай эліты ў справе рэалізацыі беларусізацыі надавалася кадраваму пытанню. Быў кінуты кліч усім беларускім патрыётам ехаць у правінцыю, актыўна ўключацца ў нацыянальна-дзяржаўную працу. «Беларусі лёс, сваёй краіны, хутка будзеце тварыць вы самі», — звяртаўся да моладзі ў 1925 г. паэт Уладзімір Дубоўка. І моладзь паверыла, што палітыка беларусізацыі, якую абвесцілі КП(б)Б і кіраўніцтва БССР, — гэта ўсур'ёз і надоўга, і яе поспех залежыць ад іхнай энэргіі і розуму.

Маладыя беларускія патрыёты, колішнія сябры маладзёвых гурткоў на Меншчыне, яшчэ не закончыўшы вучобу ў вышэйшых школах, па заклiку Наркамасветы, Інбелкульта і «Маладняка» ехалі ў правінцыю, займалі пасады загадчыкаў раённых аддзелаў народнай адукацыі, культурна-асветных клубаў, бібліятэк, настаўнікаў, рэдактараў беларускамоўных газет. Асабліва былі неабходныя іх веды і арганізацыйныя здольнасці на ўсходзе Беларусі, дзе якраз бракавала беларускіх свядомых працаўнікоў. Студэнты 2–4 курсаў БДУ, жадаючы ехаць працаваць на ўсход, пісалі ў сваіх заявах на адрас рэктара, што маюць жаданне «працаваць на карысць адраджэння беларускай культуры». Сюды былі адкамандзіраваныя Алесь Аніхоўскі, М. Мамчыц, Антон Піскун, Пятро Бабарэка, сёстры Барбара і Паліна Івашыны, Зося Вашкевіч, Юля Ларкова, Алена Шымко, эмігрант з Заходняй Беларусі Уладзімір Скабей, Міхась Лычкоўскі, Зіна Папраўка, Янка Пшанічны, Янка Юшкевіч, Мікола Каспяровіч, Іван Шчасны (бацька вядомай сучаснай беларускай мастачкі Нінэль Шчаснай), Міхась Ганчарык, Алесь Вечар, выпускнікі Беларускага педтэхнікума Вера Ванькевіч, Ілля Гурыновіч, Надзея Паграбіцкая, Максім Макарэвіч, Міхась Урублеўскі, Сцяпан Рабцэвіч. «Гэнеральнымі мэнэджарамі» ў правядзенні палітыкі беларусізацыі на гэтых тэрыторыях сталі Алесь Адамовіч, Алесь Сташэўскі, Пракоп Шчарбінскі і іншыя загартаваныя беларускія нацыянальныя дзеячы.

Яскравым прыкладам паспяховай рэалізацыі палітыкі беларусізацыі можа служыць Калінінская акруга (названая ў гонар «усесаюзнага старасты» М. Калініна), якая была сфарма-

вана з трох ранейшых паветаў — Клімавіцкага, Чэрыкаўскага і часткі Мсціслаўскага. Гэтую тэрыторыю слушна называлі «Сахалінам Беларусі» за тое, што яна знаходзілася на далёкай адлегласці ад Менска і ў межах беларуска-расійскага этнакультурнага памежжа. Сакратаром акруговага камітэта КПБ сюды быў прызначаны 24-гадовы Алесь Адамовіч, які за 2 гады зрабіў столькі ў справе пашырэння беларушчыны, што раней на гэта спатрэбілася б гадоў з дзесяць.

Постаць Алеся Тамашава Адамовіча з'яўлялася адной з ключавых фігур у палітыцы беларусізацыі 1920-х гг. Равеснік XX ст. (нарадзіўся ў 1900 г. у Вілейскім павеце), ён з 17 гадоў далучыўся да беларускага руху. Ён быў з той кагорты адэскіх беларусаў, якія шмат зрабілі для згуртавання беларусаў-уцекачоў на поўдні Украіны ў 1918–1920 гг. У 1920 г. ён уступіў у камуністычную партыю, пераехаўшы на працу ў Беларусь. «Ён, як ніхто іншы, — піша даследніца Аляксандра Гесь, — адпавядаў вызначэнню нацыянал-камуніста, які хутка вычуў сутнасць тактыкі і метадаў, накінутых Беларусі расійскімі бальшавікамі». Прыкрываючыся партыйным білетам, Адамовіч аддаваў усю сваю энэргію і арганізатарскія здольнасці дзеля пашырэння беларушчыны, назапашвання беларускіх грамадскіх сілаў. Ён выдатна праявіў сябе як арганізатар беларускай культурнай справы на Бабруйшчыне, Барысаўшчыне, Магілёўшчыне, Полаччыне. У сваіх поглядах прытрымліваўся схаванага нонканфармізму ў дачыненні да існуючага палітычнага рэжыму. Ён падтрымаў стварэнне літаратурнага аб'яднання «Узвышша», якое ставіла за мэту ўзняць нацыянальную літаратуру на ўзровень лепшых сусветных здабыткаў. Менавіта Адамовіч, дарэчы, у 1927 г. таемна пераслаў у Вільню, сябрам мясцовага Беларускага студэнцкага саюза, знакаміты верш Алеся Дудара «Пасеклі наш край папалам».

Пасля прызначэння на пасаду сакратара Калінінскага акруговага камітэта А. Адамовіч пачаў актыўна гуртаваць вакол сябе маладых энэргічных супрацоўнікоў, якіх ведаў па ранейшай сумеснай чыннасці. За першыя месяцы знаходжання ў Клімавічах ён прыцягнуў сюды не адзін дзясятак актывістаў беларускага маладзёвага руху з Меншчыны. Калі яму бракавала здольных людзей для працы, ён тэрмінова тэлеграфаваў у Менск: «Тав. Баліцкі! Будзь ласкаў, прышлі абешчаных працаўнікоў, школьных беларусаведаў. Тут яны вельмі патрэбны. Іначай план правядзення нацыянальнай палітыкі можа быць не выпаўнены». Памочнікам яму ў гэтым быў старшыня Калінінскага акруговага выканкама, прыхільнік беларусізацыі Алесь Кондраль, а таксама загадчык акруговага аддзела народнай асветы Язэп Мацюкевіч (паплечнік Адамовіча па адэскім «Беларускім гаі»).

Па запрашэнні А. Адамовіча ў канцы 1924 г. у Клімавічы прыязджае вядомы беларускі тэатральны дзеяч, колішні сябра Першага таварыства беларускай драмы і камедыі Сымон Музыка (А. Іваноў-Казельскі). Апошні ўзначаліў мясцовы Дом асветы і за кароткі час заснаваў тут беларускі хор, музычна-вакальны гурток і Таварыства беларускіх культурнікаў.

Пад кіраўніцтвам мовазнаўцы Я. Бялькевіча, які таксама прыехаў з Менска, навучанне ў Мсціслаўскім педтэхнікуме было хутка пераведзена на беларускую мову. Тут была створана філія «Маладняка», якая дала для будучай беларускай літаратуры такіх пісьменнікаў, як Аркадзь Куляшоў, Змітрок Астапенка, Юлі Таўбін ды інш. Трэба наагул сказаць, што ў беларускіх педтэхнікумах, арганізаваных у 1920-я гг., была выхавана цэлая плеяда маладых літаратурных талентаў.

Такая актыўнасць і руплівасць у правядзенні беларускай нацыянальнай палітыкі паступова давала свае вынікі. Паводле дадзеных гісторыка Аляксея Караля, па стане на 1927/28 навучальны год каля 80% школ у БССР былі пераведзеныя на беларускую мову навучання. «У школах пачалі з восені вучыць пабеларуску. — дзяліўся ў 1925 г. сваімі ўражаннямі М. Гарэцкі пасля наведвання сваёй роднай Мсціслаўшчыны. — Справа ідзе добра. «Ад веку мы спалі» ведае цяпер і стары і малы... Я бачу, як падкупіла іх «гэтая ўжо Беларусь» не толькі кніжкай, а і пяром, асадкай, лістом паперы».

## Беларускія нацдэмаўскія студэнцкія зямляцтвы ў Савецкай Расіі ды іншых савецкіх рэспубліках

У міжваенны час некалькі тысяч беларусаў-студэнтаў навучаліся па-за межамі ССРБ— БССР — у Савецкай Расіі ды іншых саюзных рэспубліках Саюза. Нягледзячы на аддаленасць ад Беларусі, там таксама вiравала беларускае студэнцкае жыц-

цё, дзейнічалі беларускія маладзёвыя асяродкі. Галоўнымі цэнтрамі беларускага студэнцкага руху на абшарах СССР былі Масква і Петраград (з 1924 г. — Ленінград). Яшчэ падчас Першай сусветнай вайны тут асела шмат ураджэнцаў Беларусі — уцекачоў і вайскоўцаў. Напрыклад, у Петраградзе з 1916 г. дзейнічалі 2 беларускамоўныя школы. Адна з іх у 1918 г. была пераўтворана ў сярэднюю навучальную ўстанову.

Самай яскравай з'явай у гісторыі беларускага студэнцкага руху на тэрыторыі Савецкай Расіі можна лічыць чыннасць Беларускай культурна-навуковай асацыяцыі пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі (ПСГА) у Маскве. Яна была ўтворана па ініцыятыве былога кіраўніка Беларускага вучнёўскага гуртка ў Горы-Горках Гаўрылы Гарэцкага на арганізацыйнай зборцы студэнтаў-беларусаў 14 лістапада 1920 г. Перад гэтым Г. Гарэцкі правёў вялікую арганізацыйную працу сярод сваіх землякоў. Для выяўлення колькасці беларусаў, што навучаліся ў ПСГА, ён і яго прыхільнікі правялі іх рэгістрацыю. Такім чынам было выяўлена 79 беларусаў-студэнтаў. Большасць з іх паходзілі з Усходняй Беларусі. Не ўсе з іх пагадзіліся ўвайсці ў склад БКНА, многія яшчэ цьмяна ўсведамлялі сваю нацыянальную прыналежнасць, цураліся нацыянальна-грамадскай працы. Але гэта не спыніла Гарэцкага. Ён працягваў актыўна прапагандаваць свае ідэі сярод суайчыннікаў. А перад БКНА ставіліся сур'ёзныя задачы:

- вывучэнне ўсіх бакоў гістарычнага, эканамічнага і культурнага развіцця беларускага краю;
- высвятленне шляхоў і магчымасцяў культурна-эканамічнага адраджэння Беларусі;
- непрыняцце вузканацыяналістычных ідэй у беларускім вызвольным руху;
- кансалідацыя ўсіх маладзёвых беларускіх сіл, падрыхтоўка нацыянальнай эліты для ўсіх сфераў дзяржаўнага і грамадскага жыцця;
- шырокая нацыянальна-культурная праца сярод беларускай моладзі і ўсяго насельніцтва краю, усямернае спрыянне палітыцы беларусізацыі;
- глыбокае навуковае даследаванне Беларусі ў розных кірунках, правядзенне навукова-даследных экспедыцый па розных беларускіх рэгіёнах;
- арганізацыя на належным узроўні беларускай выдавецкай справы.

Чыннасць Беларускай культурна-навуковай асацыяцыі студэнтаў-аграрыяў была вельмі разнастайнай і насычанай. Пры Асацыяцыі былі створаны агранамічны гурток, дзейнічалі навуковыя секцыі па жывёлагадоўлі, расліна- і лесазнаўству, па эканамічнай статыстыцы і дынаміцы развіцця на-



*Сябры менскага беларускага інтэлектуальнага асяродаку ў нацыянальных строях (злева направа): Алена Вайцеховіч, Захары Філіповіч (у будучым дацэнт Цімiразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі ў Маскве), Віктар Грабоўскі (у будучым — прафесар Уладзікаўказскага сельскагаспадарчага інстытуту), Алесь Сабалеўскі (загадчык Беларускага аддзелу Наркамасветы БССР), Вольга Дрозд-Сабалеўская. Мінск, 1920-я гг.*

роднай гаспадаркі Беларусі. Не забываліся і пра нацыянальную культуру і асвету, якія мелі вялікі кансалідацыйны і мабілізуючы фактары. Пры БКНА была адчынена навуковая бібліятэка, у якой па стане на 1922 г. налічвалася каля 300 кніг, у тым ліку творы беларускіх пісьменнікаў, працы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі. Студэнтамі-беларусамі былі арганізаваныя беларускі студэнцкі хор і драматычная дружына. Яны падтрымлівалі кантакты з навучэнцамі Беларускай драматычнай студыі ў Маскве Міколам Міцкевічам, Канстанцінам Саннікавым, Паўлам Малчанавым і Аляксандрам Чахоўскім, якія дапамагалі сябрам гуртка ў арганізацыі тэатральна-мастацкіх прадстаўленняў.

Г. Гарэцкаму і ягоным сябрам вельмі імпанавала ідэя, якую выношваў разам з нацыянальна арыентаванымі эканамістамі будучы наркам земляробства БССР Зміцер Прышчэпаў — пераўтварэнне Беларусі ў «Чырвоную Данію». Прадстаўнікі беларускай нацыянальнай эліты прапагандавалі ідэю, паводле якой Беларусь у развіцці аграрнага сектара павінна ісці па шляху Галандыі і скандынаўскіх краін і «мусіць стаць Даніяй на ўсходзе Еўропы». Стаўка рабілася на самастойнага гаспадара, на інтэнсіфыкацыю сельскай гаспадаркі, пераўтварэнне яе ў прыбытковую галіну эканомікі. Праз некалькі гадоў Гарэцкі напіша Ігнатоўскаму: «У нас ёсць рэальная мэта: праз 20–30 гадоў ператварыць Беларусь у Данію».

У навуковых даследаваннях беларускія студэнты — сябры БКНА, шчыльна




*Сябры беларускага студэнцкага зямляцтва ў Маскве (сядзяць злева направа): Уладзімір Дубоўка, Мікалай Філіповіч, Алена Вайцеховіч. Масква, 2-я палова 1920-х гг.*

кантактавалі з вядомымі беларускімі нацыянальнымі дзеячамі — Аркадзем Смолічам, Аляксандрам Бурбісам, паўнамоцным прадстаўніком урада ССРБ у Маскве Міхаілам Марозам і інш. Летам 1922 г сябры Асацыяцыі ўдзельнічалі ў навукова-даследчай экспедыцыі па вывучэнні народнай гаспадаркі ў Менскім і Мазырскім паветах, арганізаванай пры дапамозе наркама земляробства ССРБ. У выніку гэтых вандровак студэнтамі былі падрыхтаваны грунтоўныя навуковыя даследаванні па аграрнай і лесапрамысловай тэматыцы.

Нядрэнна была пастаўлена ў БКНА выдавецкая справа. У 1921–1922 гг. былі выдадзены брашуры гадавых справаздач чыннасці Асацыяцыі, а таксама навуковы зборнік, у якім прысутнічалі артыкулы такіх паважаных навукоўцаў, як Васіль Вільямс і Аляксандр Дубах.

У гэты час няспынна расце колькасны склад Асацыяцыі. Калі на пачатку сваёй чыннасці ў ёй налічвалася 27 чалавек, то ў канцы 1922 г. — ужо 200. Але мэта Г. Гарэцкага не абмяжоўваецца толькі рамкамі БКНА. Ён марыць пра стварэнне ўсерасійскага саюза беларускіх студэнтаў, бо пад уплывам чыннасці БКНА ствараюцца беларускія студэнцкія гурткі ў іншых вышэйшых шко-

лах Масквы і Петраграда. Увесну 1921 г. актывістам БКНА ўдалося склікаць агульную канферэнцыю беларусаў-студэнтаў горада Масквы. На форуме было ўтворана Бюро беларускіх студэнцкіх арганізацый, якое аб'яднала каля 300 студэнтаў-беларусаў маскоўскіх вышэйшых школ. Гэта быў сур'ёзны поспех беларускага маладзёвага руху ў Расіі, які ў гэты час з ідэйна-арганізацыйнага пункту гледжання развіваўся больш дынамічна, чым у ССРБ.

У 1921 г. Бюро беларускіх студэнцкіх арганізацый у Маскве стварыла ўласнае выдавецтва, якое выдала ў свет нашумелы альманах «Маладая Беларусь». Праграмнымі ў альманаху сталі артыкулы П. Каравайчыка (Любецкага) «Беларуская культурна-нацыянальная справа ва ўсходняй Беларусі» і Г. Гарэцкага «На новы шлях».

П. Каравайчык абазначыў вялікую важнасць «Усходняга фронту» беларускага вызвольнага руху, галоўнымі мэтамі якога ён лічыў далучэнне да ССРБ усходнебеларускіх этнаграфічных абшараў і неадкладнае правядзенне беларусізацыі. У сваім выступленні Г. Гарэцкі абазначыў важнасць будаўніцтва эканамічнага падмурку беларускага нацыянальнага адраджэння: «Кожны народ, каторы хоча жыць, хоча сам сваімі рукамі паводлуг сваёй думкі будаваць сваю будучыню, павінен ісці да сваёй мэты дзвюма дарогамі: адна — гэта пашырэнне асветы, развіццё грамадзянскай і нацыянальнай свядомасці народа; другая — развіццё яго эканамічнай сілы, стварэнне цвёрдага эканамічнага фундаменту». Гарэцкі адзначаў, што якраз недастатковая ўвага да сацыяльна-эканамічных аспектаў і прыводзіла беларускі вызвольны рух да паражэнняў у змаганні за незалежнасць краіны.

Незалежніцкі дух большасці матэрыялаў «Маладой Беларусі» быў варожа ўспрыняты ў ЦБ КП(б)Б. У 1923 г. орган палітычнай цэнзуры БССР, Галоўліт, забароніць распаўсюд часопіса ў рэспубліцы і загадае канфіскаваць яго з бібліятэк за «беларускі шавінізм».

Сябрамі Асацыяцыі былі падрыхтаваны да друку і іншыя матэрыялы, але яны не паспелі выйсці ў свет. 31 жніўня 1922 г. кіраўнік БКНА і Бюро беларускіх студэнцкіх арганізацый Масквы Г. Гарэцкі будзе арыштаваны маскоўскім ГПУ па абвінавачанні ў антысавецкай дзейнасці. Яго арышт супадзе з масавымі арыштамі па-антысавецку настроенай маскоўскай і піцерскай інтэлектуальнай эліты, а таксама з судовымі працэсамі над расійскімі эсэрамі. Ужо 4 верасня, пасля правядзення следчых мерпрыемстваў, кіраўніцтвам ГПУ РСФСР было папярэдне вырашана «в целях пресечения злостной антисоветской деятельности» выслаць Гарэцкага за кардон. «Выдварэнне» ў апошні момант адмянілі. «Паспрыяла» гэтаму меркаванне Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. Вось вытрымка з яго паслання ў ГПУ БССР за 4 снежня 1922 г.: «Центральному Бюро Коммунистической партии Белоруссии Горецкий всесторонне известен. Известен лишь как белорус-шовинист... ЦБ КПБ, узнав о предполагаемой высылке Горецкого заграницу, обратилось к вам дать телеграмму в ГПУ [РСФСР] с ходатайством в случае, если высылка Горецкого заграницу должна состояться, то выслать его вместо заграницы в одну из отдаленных губерний РСФСР по следующим мотивам — высылка Горецкого заграницу могла бы помешать работе ЦБ по расколу белорусов-шовинистов, находящихся заграницей». «Рэкамендацыі» ЦБ КП(б)Б і ГПУ ССРБ не былі выкананы да канца: Гарэцкага ў выніку выпусцяць з чэкісцкай вязніцы і нават пакінуць далей вучыцца ў Пятроўскай сельгасакадэміі. Паводле непацверджанай версіі, рашэнне спыніць рэпрэсіі ў дачыненні да яго прыняў адзін з тагачасных кіраўнікоў ГПУ Вячаслаў Мянжынскі.

Пасля гэтага інцыдэнту Г. Гарэцкі быў вымушаны адысці ад актыўнай працы ў БКНА і цалкам сканцэнтравацца на навуковай чыннасці. Іншага лідара ўзроўню Гарэцкага ў Асацыяцыі не знайшлося, і яе праца паступова затухла. Канчаткова чыннасць БКНА спынілася ўлетку 1924 г. не без дапамогі КП(б)Б і КСМБ, якія намагаліся замест нацыянальна-дэмакратычных маладзёвых арганізацыяў ствараць альтэрнатыўныя пралетарскія студэнцкія зямляцтвы.

### Чыннасць «пралетарскіх» студэнцкіх зямляцтваў

Ужо ў 1922 г. у Менску было арганізавана Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі, галоўнай мэтай якога стала «ідэйнае і арганізацыйнае змаганне з буржуазна-нацыяналістычнай і непралетарскай ідэалогіяй». Новая арганізацыйная структура паступова падпарадкавала свайму ўплыву і беларускае студэнцтва за межамі рэспублікі.

Першае беларускае пралетарскае студэнцкае зямляцтва было ўтворана ў Маскве ў траўні 1923 г. Пазней падобныя зямляцтвы былі арганізаваны ў Ленінградзе, Кіеве, Смаленску, Растовена-Доне, Волагдзе, Саратаве, Казані, Томску, а таксама пры Варонежскім сельскагаспадарчым інстытуце, Тбіліскім дзяржаўным політэхнічным інстытуце. Нягледзячы на вузкаідэалагічны кірунак дзейнасці і залежнасць ад камсамолу, студэнцкія зямляцтвы ў 1920-я гг. адыгралі пэўную станоўчую ролю па ўмацаванні нацыянальнага ўсведамлення сярод беларускіх студэнтаў за межамі БССР. Тут функцыянавалі беларускія культурна-асветныя клубы, дзе гучала беларуская мова, ладзіліся беларускія спектаклі і канцэрты. Пры зямляцтвах былі створаны навуковыя таварыствы, бібліятэкі з беларускамоўнай літаратурай, функцыянавалі курсы беларускай мовы, краязнаўчыя гурткі. З Менска да землякоў-студэнтаў нярэдка прыязджалі беларускія пісьменнікі — «маладнякоўцы», «узвышанцы», «палымянцы», сябры іншых літаб'яднанняў, якія чыталі свае новыя творы. У Беларускі работніцкі клуб у Маскве, які апекаваўся беларускім студэнцкім зямляцтвам, прыходзілі паэт У. Дубоўка і кампазітар М. Равенскі, тагачасны студэнт Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, і разам абмяркоўвалі сумесныя творчыя планы. Магчыма, якраз тут нарадзілася ідэя стварэння першай беларускай оперы «Браніслава». Тут таксама чыталі свае вершы Янка Купала, Цішка Гартны, Язэп Пушча. Сталым госцем маскоўскага беларускага зямляцтва была вядомая беларуская паэтэса Канстанцыя Буйло, якая пасля шлюбу пераехала на сталае жыхарства ў Маскву.

Падобная культурная ўстанова, Беларускі дом асветы (БДА), была створана ў 1928 г. і ў Ленінградзе. Пры ленінградскім БДА меліся добрая бібліятэка і тэтральна-канцэртная зала на 400 месцаў. Тут дзейнічалі кінафатаграфічны гурток, драматычная дружына, а таксама 4 гурткі музычнай самадзейнасці.

Акрамя грашовых датацый з боку ўрада БССР, беларускія студэнцкія зямляцтвы ў РСФСР і іншых саюзных рэспублік фінансаваліся таксама з бюджэтаў выканкамаў Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў, дзе ў мясцовых вышэйшых школах вучыліся беларусы.

Сітуацыя рэзка змянілася ў 1930-я гг., калі пачалася масавая ідэалагічная чыстка студэнцтва. Многія сябры беларускіх зямляцтваў былі выключаны са складу студэнтаў, шмат хто з іх трапіў пад палітычныя рэпрэсіі па абвінавачанні ў «беларускім шавінізме», «нацыянал-дэмакратызме», «шпіянажы на карысць замежных выведак». У гэты час большасць беларускіх студэнцкіх асяродкаў была ліквідавана ўладамі. Працягвалі сваю чыннасць толькі зямляцтвы ў дзвюх расійскіх сталіцах. Шмат у чым іх дзейнасць стала насіць фармальны характар. Многія студэнты ў гэтых арганізацыях былі «мёртвымі душамі», актыўнага ўдзелу ў мерапрыемствах зямляцтва не прымалі. Нягледзячы на татальны ідэалагічны нагляд за студэнтамі і перманентную «зачыстку» іх шэрагаў, бальшавіцкая ўлада не без падстаў апасалася, што падобныя зямляцтвы заўсёды патэнцыйна будуць несці пагрозу краёвага сепаратызму.

Пасля праведзенай улетку 1936 г. інструктарамі ЦК КП(б)Б ідэалагічнай праверкі беларускіх студэнцкіх клубаў у Ленінградзе і Маскве бальшавіцкае кіраўніцтва прыняло рашэнне аб ліквідацыі тамтэйшых зямляцтваў. У адпаведнай партыйнай рэзалюцыі за сакавік 1936 г. мы чытаем:

«Беларускі клуб у Ленінградзе ўзнік як прадаўжацель традыцыйных беларускіх нацыяналістычных арганізацый, узнікшых у дарэвалюцыйны час (1914 —1917 гг.). Гэта культурна-асветнае таварыства «Беларуская суполка», выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца», на чале з такім зубрам беларускага нацыяналізму, як Эпімах-Шыпіла... Там жа выдавалася, вядома, Жылуновічам газета «Дзянніца». Стаўшы на чале шэрагу важнейшых participaчасткаў «нацыянальна-культурнай будоўлі» ў БССР, беларускія нацдэмы і правакатары Эпімах-Шыпіла, Ігнатоўскі (Інбелкульт), Жылуновіч, Баліцкі (Наркамасветы) сталі ідэйнымі натхніцелямі і фактычнымі арганізатарамі гэтых беларускіх клубаў.

У Маскве беларускі клуб узнік у 1926 г., як база былога Таварыства палітвязняў Заходняй Беларусі. Непасрэднымі арганізатарамі яго з'яўляліся Уладзімір Дубоўка (былы сакратар Пастаяннага прадстаўніцтва БССР у Маскве (вядомага нацдэма)), Шукайла — нацыяналіст і авантурыст, пры непасрэдным удзеле былых сталых прадстаўнікоў [БССР] Браўковіча, а затым Паўлюкевіча. Клуб і сёння хаваецца пад шыльдай «Цэнтральнага беларускага

работніцкага клуба ў Маскве». Такім чынам, прызначэннем гэтых клубаў было служэнне мэтам прапаганды нацыялістычных ідэй, збіранне сваіх кадраў пад выглядам літаратурных, харавых і іншых гурткоў, устанаўленню патрэбных сувязяў і г. д. Аб гэтым кажуць некаторыя дакументы (адозвы, ліставанне)...

Неабходна адзначыць, што ў Ленінградзе і Маскве асела значная колькасць адкрытых і схаваных нацдэмаў, якія былі высланы з Беларусі ў аддаленыя месцы жыхарства і вярнуліся, якія працягваюць весці сваю контррэвалюцыйную працу больш абачліва... З ліку асеўшых на сённяшні дзень у Ленінградзе нацдэмаў намі ўстаноўлены наступныя:

1. Шлюбскі — былы работнік Інбелкульта, быў высланы, працуе ў Акадэміі навук;

2. Бандарэнка — былы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства БАН, арыштоўваўся за контррэвалюцыйную чыннасць;

3. Сушынскі — былы афіцэр старой арміі, ураджэнец Заходняй Беларусі, быў высланы з БССР, працуе загадчыкам беларускага аддзела Этнаграфічнага музея ў Ленінградзе;

4. Замбжыцкі — у 1929–1930 гг. выкладаў літаратуру на педагагічных курсах у Менску, вядомы сваімі нацыяналістычнымі выступленнямі ў друку па пытаннях літаратуры.

У Маскве: Лужанін — нацдэмаўскі пісьменнік, Шукайла і інш...

Беларускія клубы ў Маскве і Ленінградзе не толькі не выкрывалі ў сваёй працы контррэвалюцыйную чыннасць нацдэмаў як у мінулым, так і сёння, але самі з'яўляліся месцам прытулку шэрагу нацдэмаўскіх элементаў, адыгрываючых кіруючую ролю ў клубнай працы. Так, напрыклад, у Ленінградскім клубе працаваў у 1934 г. у якасці кіраўніка харавога гуртка брат правакатара-нацдэма Ігнатоўскага — Мікалай. У якасці лектараў і дакладчыкаў выкарыстоўваліся да апошняга часу Замбжыцкі (лекцыі па літаратуры), Ступінскі, якія выкарыстоўваліся і ў дадзены час, прычым для чыткі лекцый на адказныя тэмы — «Становішча вёскі пры феадалізме, капіталізме і сацыялізме».

У ліку актыву Беларускага клуба ў Маскве маюцца такія асобы, як нацдэм Лужанін, які ахайна наведвае клуб і па сёння. Жыдовіч (будучы народны артыст СССР Іосіф Жыновіч. — **У. Л.**), выкрыты і высланы з БССР у 1934 г. як класава варожы элемент і беларускі нацыяналіст, сын буйнога кулака знайшоў прытулак у клубе ў якасці кіраўніка гуртка цымбалістаў. У апошні час высланы з Масквы органамі НКВД. Дарэчы, неабходна адзначыць абурэнне загадчыка клуба, камуніста Абакшонка, які нам заявіў: «Жыдовіча выслалі з Масквы за тое, што граў на цымбалах», чым пакрываў контррэвалюцыйную асобу Жыдовіча. Маецца шэраг іншых сумнеўных асоб сярод т. зв. клубнага актыву, не кажучы ўжо пра ўсіх, хто яго наведвае.

Разам з тым, бібліятэка, якая дзейнічае пры клубе, з'яўляецца рассаднікам і правадніком нацдэмаўскай ідэалогіі не толькі ў мінулым, але і сёння. Наяўнасць у вялікай колькасці ў гэтай бібліятэцы нацдэмаўскай літаратуры з'яўляецца непасрэдным вынікам варожай чыннасці па камплектаванні бібліятэкі. Канфіскацыя нацдэмаўскай літаратуры пачалася толькі ў канцы 1935 г. і ў лютым 1936 г. (у Ленінградзе). Да лютага 1936 г. у бібліятэцы беларускага клуба ў Ленінградзе меліся такія нацдэмаўскія імёны, як, напрыклад, Дубоўка, Гарэцкі, Бабарэка, Нікановіч, Сольскі-Паханскі, белагвардзейскія выданні з Польшчы і інш. Рэшткі нацдэмаўскай літаратуры і па сёння знаходзяцца ў бібліятэцы ў масавым карыстанні. Напрыклад, у беларускім клубе ў Маскве выяўлены творы Лужаніна, Пушчы і інш. Акрамя таго, не канфіскаваны камплекты часопіса «Полымя» за 1927–1928 гг., насычаныя нацдэмаўскімі артыкуламі Ігнатоўскага, Цвікевіча і інш. Канфіскаваныя кнігі знаходзяцца тут жа ў бібліятэцы (Ленінград».

Ва ўнісон партыйным структурам БССР падобную ацэнку чыннасці беларускіх студэнцкіх зямляцтваў і іх культурна-асветных асяродкаў давалі гарадскія ўлады Масквы і Ленінграда, якія выконвалі новую партыйную лінію ЦК УсеКП(б) па ліквідацыі па ўсёй краіне «гнёздаў» нацыяналізму, а таксама не былі зацікаўленыя ў далейшым фінансаванні культурных устаноў «нацменаў». У 1935 г. аддзел масавай палітычнай і культурна-асветнай працы Ленінградскага гаркама кампартыі заявіў, што беларусы «не цікавяцца сваёй нацыянальнай мовай і туляцца да культурных устаноў больш высокай вартасці» — г. зн. да расійскай культуры. Аднак пазней выявілася сапраўдная прычына нежадання піцерскіх уладаў утрымліваць дамы асветы нацыянальных меншасцяў. У жніўні 1936 г. Ленінградскі гарkam ВКП(б)

выдаў пастанову за подпісамі Андрэя Жданава і Аляксандра Угарава, у якой адкрыта адзначалася, што дамы асветы нацыянальных меншасцяў «з'яўляюцца згуртаваннямі варожых нам груп і ствараюць спрыяльныя ўмовы для працы нацыяналістычных элементаў».

Да пачатку 1937 г. беларускія «пралетарскія» студэнцкія зямляцтвы і клубы ў Маскве і Ленінградзе былі ліквідаваныя. Многія з клубных актывістаў былі арыштаваныя, некаторыя (як Паўлюк Шукайла, Язэп Сушынскі, Аляксандр Шлюбскі) — паўторна.

Праца беларускіх студэнцкіх зямляцтваў па-за межамі Беларусі, нягледзячы на няпростыя ўмовы чыннасці ва ўмовах савецкай рэчаіснасці, мела плён. Праз нацыянальную чыннасць у беларускіх маладзёвых гуртках па-за межамі Беларусі атрымалі сваё ідэйнае і грамадскае загартаванне ўжо згаданы Г. Гарэцкі, будучы беларускі акадэмік, таксама будучы акадэмік Павел Рагавы, вядомы беларускі эканаміст-аграрнік Сяргей Жданові, гісторык і этнограф Майсей Грынблат, народны артыст СССР, кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра БССР Іосіф Жыновіч і інш.

У беларускіх энцыклапедычных даведніках мы не знойдзем артыкула пра ўраджэнца Гомельшчыны Васіля Старавойтава. Ён уваходзіў у эліту найбольш вядомых савецкіх канструктараў, быў адным з распрацоўшчыкаў знакамітага савецкага танка Т-64, абсталяванага антыядзернай абаронай, «рухомай» панцырнай бранёй з фарфоравымі напаўняльнікамі і суперсучасным на той час газатурбінным рухавіком. Ён удзельнічаў у праекце па стварэнні хадавой часткі знакамітых «лунаходаў», паспяхова апрабаваных на паверхні Месяца ў 1970 г. Толькі нядаўна стала вядома, што ў 1936 г. ён, выпускнік гомельскай сярэдняй школы, студэнт 1-га курса Вышэйшай тэхнічнай вучэльні імя Мікалая Баўмана, з'яўляўся сябрам беларускага студэнцкага зямляцтва ў Маскве (яго прозвішча значыцца ў агульным спісе сябраў зямляцтва за 1936 г.). Пра беларускасць Васіля Старавойтава вельмі сціпла згадвала ягоная дачка, Галіна Васільеўна Старавойтава, вядомы расійскі этнапалітолаг і праваабаронца, народны дэпутат СССР і адна з лідараў партыі «Дэмакратычная Расія» у 1990-я гг. Гадаванец беларускамоўнай школы, Васіль Старавойтаў цэлы год не мог адаптавацца да расійскай мовы выкладання. Слухаючы лекцыі па «супрамату» і начартальнай геаметрыі, ён перакладаў іх у галаве і адначасова запісваў у канспект па-беларуску. Васіль Старавойтаў быў адданым чалавекам савецкай дзяржаўнай сістэмы, шчырым камуністам, і сістэма яму напоўніцу за гэта «аддзячыла»: 20 лістапада 1998 г. за свае дэмакратычныя перакананні і непрыманне нарастання аўтарытарызму ў расійскім палітычным жыцці Галіна Старавойтава будзе застрэлена платным наймітам у Санкт-Пецярбурзе каля свайго дому. Бацька перажыве дачку на некалькі гадоў і памрэ ад цяжкой хваробы ў адной з лонданскіх клінік 29 сакавіка 2002 г.

На сённяшні дзень мы дакладна не ведаем, колькі таленавітых навукоўцаў, педагогаў, інжынераў, гаспадарнікаў, лекараў, мастакоў і музыкантаў выйшла з тагачаснага беларускага студэнцкага асяроддзя. Неміласэрная эпоха расцярушыла іх па свету, пазбавіла Бацькаўшчыны, знішчыла нават успаміны пра многіх з іх. Адзін з абавязкаў сучасных даследнікаў — пастарацца ўзнавіць гэтыя спісы...

### Расправа з актывістамі беларускага маладзёвага руху ў 1930-я гг.

Даследуючы чыннасць маладых настаўнікаў, навукоўцаў і актывістаў краязнаўчага руху, распавядаючы пра дасягненні маладых тэатралаў, музыкантаў і мастакоў, перачытваючы творы А. Дудара, У. Дубоўкі, Я. Пушчы, А. Бабарэкі, У. Жылкі, Т. Кляшторнага, А. Мрыя, К. Чорнага, напісаныя ў 1920-я гг., не перастаеш здзіўляцца таму, наколькі гэтыя маладыя інтэлектуалы глыбока ведалі і духоўна адчувалі нацыянальную культуру і традыцыі свайго народа, наколькі дакладна разумелі і адэкватна вызначалі тыя галоўныя задачы, што стаялі перад беларускай грамадскасцю. Можна толькі здагадвацца і ўяўляць, якой магла б быць краіна, якой вышыні дасягнула б беларуская культура гадоў гэтак праз 20–30, калі б былі рэалізаваныя задумы гэтага пакалення, калі б не адбыўся сапраўдны пагром нацыянальнай эліты ў 1930-х гг. і не былі знявечаныя лёсы гэтых людзей — наватараў беларускага культурнага адраджэння.

Большасць з іх не ўяўляла з сябе афармленую палітычную апазіцыю існуючаму ладу. Бальшавізм у іх выклікаў толькі духоўнае непрыняцце, маральны нонканфармізм ці, як саркастыч-



*Фелікс Купцэвіч, актывіст беларускага маладзёвага руху ў 1920-я гг. пасля арышту ГПУ ў 1930 г. З архіва КДБ Беларусі.*

на казаў пазней Андрэй Сіняўскі, «стылістычныя рознагалоссі». Але менавіта іх, прадстаўнікоў новай генерацыі беларускай эліты, у першую чаргу імкнуўся знішчыць таталітарны рэжым. «Сёння, — з сумам піша вядомы беларускі літаратуразнаўца Аляксей Каўка, — з адлегласці прамінулага часу выразней і дакладней успрымаецца патомнымі вяршыня мастацкага ўзвышэнства тых світальна-трывожных дваццатых — вяршыня ўвогуле трагічная, з крыжом на самым піку. Вядома, не ўсе ўдзельнікі таго рамантычна-цярністага ўзыходжання ў гісторыі беларускай культуры дазналі нясцерпных пакут укрыжавання. Хоць, магчыма, кожны з іх так ці іначай дасведчыў сам і пасведчыў іншым адвечную беларускую аксіёму: шлях да Бацькаўшчыны, да Вольнай Беларусі, пакуль тут валадаром прышлы пан ці дамарослы хам, — толькі праз церніі і ахвяры».

Задоўга да масавай расправы над беларускім нацыянальным актывам органы ГПУ пачалі агентурную вярбоўку сярод нацыянал-камуністаў і нацдэмаў. У першую чаргу «сексоты» вышукваліся ў студэнцкім асяродку. У БДУ гэтую «аператыўную работу» здзейсняў прыстаўлены да рэктара Уладзіміра Пічэты чэкісцкі функцыянер Слонім, у Менскім інстытуце масавага завочнага навучання — будучы вядомы «пагромшчык» нацдэмаў, гістпартавец Андрэй Зюзькоў, аўтар «славутай» кніжкі «Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі», у Інбелкульце — «бальшавіцкі неафіт», паэт Андрэй Александровіч, у Менскім беларускім педагагічным тэхнікуме — выкладчык дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму Якаўлеў. Як гэта «праца» праводзілася ў сценах педагагічнага тэхнікума, пазней успамінаў адзін з былых яго навучэнцаў, схаваны пад псеўданімам «У. Свіслацкі»:

«Якаўлеў перш-наперш забараніў культурнай і свядомай частцы студэнтаў-гурткоўцаў праводзіць самастойна справу беларусізацыі. Ад гэтага часу ніхто не меў права займацца гэтым без самаго Якаўлева. Можна лёгка сабе ўявіць, што атрымалася з гэтага гвалтоўна захопленага ім «падраду». Нічога іншага, акрамя поўнага правалу справы змагання за культуру мовы, не магло быць, бо калі за яе пачалі брацца самі бальшавікі, усё пераўтваралася ў траскучы палітычны буф... Найбольш паслядоўная і ваяўнічая частка студэнтаў пачала пратэставаць супраць перашкод у культурнай справе, чынімых Якаўлевым і К°, і часам выказваць гэты пратэст гучна на сходах ці праз насценную газету. У выніку гэтых сутычак увесь актыў літгуртоўцаў і змагальнікаў за культуру мовы, як і культуру наогул, апынуўся ў ліку падазроных. Прозвішчы іх былі занатаваныя ў органах ГПУ. Апошняе ад гэтага часу наогул пачынае пільна цікавіцца справамі ў тэхнікуме. Дасылаюцца «личные» агенты пад выглядам новых студэнтаў альбо вярбуюцца з ліку «старых», што ўжо вучыліся ў тэхнікуме. Пачынаецца ўзмоцненая асока агульным фронтам... Літаратурны гурток навадняецца новымі сябрамі з адмысловымі заданнямі — сачыць і занатоўваць усё, што ў ім дзеецца і гаворыцца. Дзе толькі апошнія не давалі гэтыя звесткі — і ў адмысловых кватэрах, і ў магазінах ці аптэках, аб якіх было загадзя дамоўлена. Пад строгім сакрэтам дзяўчаты з тэхнікумаўскіх інтэрнатаў бегалі на ўмоўныя месцы даваць чарговыя «зводкі» і атрымліваць далейшыя заданні, каб пасля, гуляючы ў інтымных адносінах з хлапцамі, што выбіраліся не імі, а чэкістамі з ГПУ, залазіць з бруднымі намерамі ў чыстыя душы гэтых маладых людзей, даверлівых, як тыя галубы».

«Вушы» і «вочы» чэкістаў былі паўсюль: «сексотамі» было пранізана ўсё грамадства, і ў першую чаргу інтэлектуальная эліта краіны, у якой бальшавікі бачылі найбольшую небяспеку для сябе. Паэт А. Дудар, не вытрымаўшы гэтай удушлівай атмасферы «стукацтва», адказаў платным агентам ГПУ эмацыйным вершам:

Цені блудзяць па твары,
Сэрца точыць нуда.
Сёння лепшы таварыш
Можа цябе прадаць.

Сёння не верыш нікому,
Можа я сам шпіён.
Сціснуць рукамі скроні,
Няхай пагасне агонь.

Многія маюць сховы
У шкліцах чырвоных маніст,
Скажы па-свойму слова
Крыкнуць — ты шавініст.

Але махавік палітычных рэпрэсій ужо запушчаны. Хутка бальшавікі распачнуць «вялікі тэрор» супраць сваіх ідэйных апанентаў, будуць «веяць душы ад целаў».

Першым масавым працэсам супраць беларускай нацыянальнай эліты стала сфальсіфікаваная крымінальна-палітычная справа пад гучнай назвай «Саюз вызвалення Беларусі». Назва была запазычана ў суседзяў-украінцаў, дзе ў 1929 г. адбылося падобнае масавае судзілішча над украінскімі нацдэмамі па справе «Спілки визволення України». Маюцца ўсе падставы сцвярджаць, што і «СВБ», і «СВУ» былі выдуманы ў кабінетах ГПУ ў Маскве. Чэкісты проста выкарысталі назву былой украінскай нацыянальнай арганізацыі, якая дзейнічала на тэрыторыі Нямеччыны і Аўстра-Вугоршчыны ў перыяд Першай сусветнай вайны (1914–1918 гг.). У асяродку беларускай інтэлігенцыі, безумоўна, вяліся антысавецкія размовы, шырока абмяркоўвалася антыдэмакратычная, антыбеларуская сутнасць бальшавіцкага рэжыму, але далей гэтых размоў і абмеркаванняў справа не ішла. У нацдэмаў былі спадзяванні, што «паўзучая беларусізацыя» дазволіць мірным шляхам заваяваць «камандныя вышыні» ў рэспубліцы, ім думалася, што бальшавіцкі рэжым сам паступова эвалюцыянуе ў бок «народнай дэмакратыі».

У 1930 г. па справе «СВБ» органамі ГПУ былі арыштаваныя 108 беларускіх нацыянальных дзеячаў. Разам з вядомымі нацыянал-камуністамі Алесем Адамовічам, Антонам Баліцкім, Змітром Прышчэпавым, Пятром Ільючонкам, Язэпам Дылам, былымі дзеячамі БНР Янкам Серадой, Вацлавам Ластоўскім, Аляксандрам Цвікевічам, Аркадзем Смолічам, Сцяпанам Некрашэвічам, Леанардам Зайцам і Уладзімірам Пракулевічам, удзельнікамі Слуцкага збройнага чыну Паўлам Жаўрыдам і Юркам Лістападам, ветэранамі нацыянальна-культурнага руху Браніславам Эпімах-Шыпілам, Максімам Гарэцкім, Язэпам Лёсікам, Хведарам Імшэннікам, Сяргеем Скандраковым, Язэпам Сушынскім, Чаславам Родзевічам і іншымі былі арыштаваныя многія актывісты беларускага маладзёвага руху: былыя актывісты «Маладой Беларусі» Янка Бялькевіч, Мікалай Каспяровіч, Міхась Гурскі і Пракоп Шчарбінскі, браты Мікалай і Янка Пашковічы, сябра Беларускай вучнёўскай грамады Сяргей Мялешка, кіраўнікі Менскага маладзёвага гуртка «Беларуская хатка» Яўхім Кіпель і Тодар Апацёнак, актывісты беларускага маладзёвага руху на Случчыне і Бабруйшчыне Алесь Аніхоўскі, Цімох і Міхась Адзярыхі, Мікола Азбукін, Мікола Мамчыц, Пётра Зянюк, Алесь Каўпак, былыя кіраўнікі беларускага студэнцкага руху ў Маскве Гаўрыла Гарэцкі і Павел Каравайчык (Любецкі), «маладнякоўцы» і «ўзвышанцы» Алесь Дудар, Адам Бабарэка, Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Уладзімір Жылка і дзясяткі іншых дзеячаў, якія «засвяціліся» ў беларускім нацыянальна-дэмакратычным руху. Па гэтай інспіраванай справе было асуджана 86 чалавек. Дзевяць з іх, якім прыпісалі кіраўніцтва «СВБ», асудзілі на 10 гадоў зняволення, а астатніх (77) выслалі за межы БССР ва ўнутраныя раёны Савецкага Саюза (Расіі). Праз некалькі гадоў многія справы тых, хто праходзіў па «СВБ», будуць перагледжаны ў бок «ужесточения наказания». У 1937–1941 гг. многія фігуранты гэтага




*Мікола Улашчык, беларускі гісторык і краяўнавец пасля арышту ГПУ у 1930 г. З архіва КДБ Беларусі.*

працэсу будуць расстраляныя або асуджаныя на многія гады зняволення ў сталінскіх канцлагерах.

У 1931 г., як мы ведаем, ГПУ БССР сфабрыкавала таксама «справы» «Беларускага філіяла меншавікоў», «Беларускага філіяла Прампартыі» і «Беларускага філіяла Працоўнай сялянскай партыі». Па першых дзвюх «справах» прайшлі 60 чалавек, а па «справе» «Беларускага філіяла Працоўнай сялянскай партыі» — 59. Сярод прыцягнутых да адказнасці па «справе» «Беларускага філіяла Працоўнай сялянскай партыі» былі ўжо вядомыя нам акадэмік Г. Гарэцкі, акадэмік А. Дубах, а таксама сын славутага сацыяліста-рэвалюцыянера і сам рэвалюцыянер Радыён Бонч-Асмалоўскі ды іншыя дзеячы. Шэсць фігурантаў гэтай «справы», у тым ліку Г. Гарэцкі, будуць асуджаныя на смерць, але потым чатыром з іх расстрэл памянялі на 10 гадоў лагераў.

У 1933 г. ГПУ БССР сфабрыкавала чарговую «справу», якая атрымала назву «Беларуская Народная Грамада» і разглядалася як працяг «справы» «СВБ». Па гэтай «справе» да адказнасці былі прыцягнутыя 68 чалавек, у тым ліку былыя студэнты Менскага беларускага педтэхнікума Сяргей Астрэйка, Сяргей Гайка, Франц Гінтаўт, Уладзімір Гуцька (у будучыні вядомы беларускі паэт пасляваеннай эміграцыі Уладзімір Дудзіцкі), Язэп Лешчанка (ён жа Міхась Кавыль, у будучыні вядомы паэт-эмігрант), Канстанцін Вашына (ён жа празаік Лукаш Калюга), Аляксандр Каратай (ён жа Максім Лужанін) і Уладзімір Сядура (Уладзімір Глыбінны), былыя студэнты Мсціслаўскага педтэхнікума Зьмітрок Астапенка і Юлі Таўбін.

Пад абвінавачанне трапілі паэт Уладзімір Жылка (ён ужо праходзіў па «справе» «СВБ») і крытык Фелікс Купцэвіч. Прыцягненне да названай «справы» гэтых двух дзеячаў спатрэбілася для таго, каб паказаць, што, маўляў, праз іх астатнія фігуранты «справы» ажыццяўлялі сувязь з беларускімі арганізацыямі ў замежжы (вядома, што У. Жылка пэўны час жыў у Чэхаславакіі, а Ф. Купцэвіч вёў ад імя КП(б)Б працу ў беларускім асяродку ў Латвіі).

«Сябраў» прыдуманай у кабінетах ГПУ арганізацыі вінавацілі ў тым, што яны хацелі адарваць БССР ад СССР і стварыць буржуазна-дэмакратычную Беларускую Народную Рэспубліку. Следчыя-чэкісты настолькі ўцягнуліся ў сваю чорную справу, што змушалі падсудных выдумляць сабе і сваім сябрам канспіратыўныя мянушкі, якія быццам выкарыстоўваліся паміж «змоўшчыкамі».

Судовыя працэсы над сябрамі «БНГ» адбыліся ў Менску, Магілёве, Гомелі, Бабруйску, Барысаве, Слуцку. Адным з самых гучных аказаўся судовы працэс над «Слуцкай філіяй БНГ», які адбыўся 25 красавіка 1933 г. Падсудных абвінавацілі ў падрыхтоўцы ўзброенага паўстання з мэтай далучэння Случчыны да Польшчы. Да расстрэлу было прыгаворана 6 чалавек: Пётра Данісевіч (пададзены пад мянушкай «Кастыль») — т. зв. «старшыня» слуцкай сябрыны БНГ, Пётра Махнач («Малы») — яго «намеснік старшыні», Зоська Іванчык («Дымок»), Мікола Іванчык («Жаўнëровіч»), Кузьма Галушка («Коська»), Сцяпан Панукевіч («Паддубны»). Расстрэльныя прысуды пазней, праўда, былі заменены на працяглыя тэрміны зняволення ў вязніцах.

У тым жа 1933 г. ГПУ БССР распачало фабрыкацыю справы пад назвай «Беларускі нацыянальны цэнтр». Па гэтай «справе» ў 1934 г. быў пакараны 161 чалавек. Пад каток тэрору трапілі дзеячы нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі, у тым ліку былыя паслы (дэпутаты) польскага сейма Павел Валошын, Флягонт Валынец, Язэп Гаўрылік, Ігнат Дварчанін, Пятро Мятла і Сымон Рак-Міхайлоўскі і іншыя, якія ў якасці палітэмігрантаў пераехалі ў БССР, а таксама навукоўцы, пісьменнікі, кіраўнікі гаспадарчых органаў. Усіх вінавацілі ў падрыхтоўцы антысавецкага паўстання, якое павінна было прывесці да польска-савецкай вайны і ўтварэння пад эгідай Польшчы буржуазна-дэмакратычнай беларускай дзяржавы. У ліку арыштаваных сярод іншых быў і Міхась Ганчарык. У складзе «БНЦ», як і ў «БНГ», чэкісты «выкрылі» маладзёвую арганізацыю ў складзе 47 чалавек.

У канцы 1933 г. — першай палове 1934 г. большасці прыцягнутых да адказнасці органы ГПУ прызначылі ў якасці пакарання лагеры на Салавецкіх выспах і ў Комі АССР. 40 чалавек, у тым ліку П. Валошын, Ф. Валынец, І. Дварчанін і С. Рак-Міхайлоўскі, былі асуджаныя на смерць. Праўда, былым паслам і яшчэ адзінаццаці асуджаным смяротную кару тады замянілі на папраўча-працоўныя лагеры, а 25 чалавек былі адразу расстраляныя. У ліку расстраляных быў 27-гадовы заходнебеларускі паэт Алесь Салагуб.

У пазнейшыя часы чэкісты больш не праводзілі чыста нацдэмаўскіх працэсаў. Былых актывістаў беларускага дэмакратычнага руху судзілі ўжо па справах, дзе іх абвінавачвалі ва ўдзеле ў трацкісцка-зіноўеўскай і рыкаўска-бухарынскай («правай») апазіцыі, асуджалі як пасобнікаў фашысцкіх арганізацый, інкрымініравалі шпіянаж, учыненне дыверсійных і тэрарыстычных акцый і г. д. Значна больш жорсткімі сталі і пакаранні, якія здзяйснялі пазасудовыя «тройкі». Да падсудных сталі стасаваць фізічныя катаванні, каб сілай выбіць з іх прызнанні. Большы працэнт асуджаных сталі прыгаворваць да расстрэлу. Нярэдка дастаткова было нейкай адметнай «дробязі», каб быць залічаным у шпіёны той ці іншай замежнай выведкі. Так, былы сябра Беларускай камуністычнай арганізацыі, актыўны ўдзельнік антыпольскага супраціву ў 1919–1920 гг. Гіпаліт Поляк быў асуджаны на расстрэл у якасці «баевіка» «Польскай арганізацыі вайсковай» толькі таму, што для гэтага «надавалася» ягонае прозвішча. Чэкісты не надта тлумілі сабе галовы, каб выдумаць нешта больш арыгінальнае. Галоўнае было — засудзіць і знішчыць канкрэтнага чалавека, былога нацыянал-камуніста.

Органы ГПУ—НКВД рабілі ўсё, каб вынішчыць у Беларусі парасткі беларускага нацыяналізму і не дапусціць больш паўтарэння Слуцкага збройнага чыну і «Лістападаўскай справы». Праўда, былі выпадкі, калі арышт па даносе «сексота» бязвіннага юнака, абвінавачанага ў беларускім нацыяналізме, прыводзіў да адваротнага. Вядомы ў будучыні паэт беларускай пасляваеннай эміграцыі Міхась Кавыль упершыню ўсвядоміў сябе беларускім патрыётам не ў сценах Менскага белпедтэхнікума, дзе ён вучыўся ў 1930–1933 гг., а на Далёкім Усходзе, у сталінскім «Дальлагу»:

Пад сібірскімі корчыўся сцюжамі,
Без хлеба азыз…
А і я ж з сябрамі, лапцюжнымі,
«Кароткі курс» грыз.

Падрастаў і мужнеў з пяцігодкамі
На роднай траве;
Гарлапаніў, як трэ', з аднагодкамі:
«Жыве! Хай жыве!…»

Я любіў на начлезе ў сасонніку
Распальваць агні.
І не сніў пра вызвольнага
Конніка —
«Пагоню» не сніў.

Першы раз мне паштоўку
з «Пагоняю» —
Вянок, БНР… —
Паказала следчая… З іроніяй
Сказала: «Цяпер

Ты не будзеш мне болей
адбрыкваццa:
«Не знаю, не я…»
Прызнавайся, буржуйскі
прыхвасцень:
«Пагоня» твая?..

Мы знайшлі ў цябе пад падушкаю…
Не смейся, дурак!
Ты не быў яшчэ, мабыць,
пад мушкаю?
Кажы, што ды як!..»

Я «паздравіў» яе з перамогаю.
Ці сон быў, ці яў?..
Адказаў я ёй словамі строгімі:
«Пагоня» мая…

Рассмяялася: «Цябе мы вылечым
Ад уяў, праяў…»
Перад следчай тады нехта велічны,
А не я стаяў…

Ліквідацыя нацдэмаўскіх «гнёздаў» не змагла цалкам знішчыць антысавецкіх настрояў у грамадстве. Дзеці расстраляных, раскулачаных і высланых у Сібір ці на расійскую Поўнач бацькоў марылі адпомсціць бальшавікам і іх памагатым. Шукаючы ідэйнае апірышча ў сваім непрыняцці існуючага рэжыму, палітычна непісьменныя хлопцы, якія, акрамя савецкіх газет і радыё, іншай інфармацыі не мелі, звязвалі свае надзеі на знішчэнне існуючай улады з Адольфам Гітлерам, а таксама з лютым ворагам Іосіфа Сталіна Львом Троцкім, якіх тады ўвесь час бэсцілі сродкі масавай інфармацыі СССР. Прыніжаныя і пакрыўджаныя чакалі хуткай вайны, якая, паводле іх спадзяванняў, прывядзе да вызвалення ад камуністаў. Пры гэтым маладыя і сталыя праціўнікі бальшавізму мелі цьмянае ўяўленне пра сутнасць гітлераўскага нацызму, італьянскага фашызму і палітычных поглядаў Троцкага. У барацьбе супраць ненавіснай ім улады, якая арыштавала іхных бацькоў і пазбавіла іх саміх нармальнага дзяцінства ды пераўтварыла ў ізгояў грамадства, ім было ўсё роўна, да каго звяртацца па дапамогу: да Гітлера ці да Троцкага. Галоўнае, што дадзеныя асобы лічыліся ворагамі іх ворагаў.

У другой палове 1930-х гг. у зводках НКВД БССР усё часцей з'яўляюцца факты аб праяўленні «фашысцкіх настрояў» у маладзёвым асяродку. Самы гучны інцыдэнт адбыўся ў Лоеве ў 1939 г. Вучнямі 9-га класа мясцовай школы, былымі камсамольцамі Міхасём Плюшчом і Наталляй Захарэўскай былі расклееныя самапісныя ўлёткі фашысцкага зместу як у школе, так і ў мястэчку. Ва ўлётках усхваляліся Гітлер і Троцкі, а так-

сама «распаўсюджваліся правакацыйныя чуткі, што быццам бы хутка будзе вайна».

Пазней выявілася, што гэтыя «фашысты» дзейнічалі не паасобку, а мелі шмат прыхільнікаў сярод сваіх аднакласнікаў. У красавіку таго самага года падчас правядзення нарады раённага актыву камсамолу, прысвечанага XVIII з'езду ВКП(б), быў выяўлены цэлы стос антысавецкіх улётак, напісаных ад рукі, а таксама пасланні-пагрозы з выявамі нацысцкай сімволікі на імя дырэктара і сакратара камсамольскай арганізацыі мясцовай школы. «Глядзі, брат, кулацкі Абдула, — звярталіся змоўшчыкі да школьнага дырэктара Кільчэўскага, — шануй сваю скуру, долга не будзеш уладаром школы, на цябе ўжо адточаны нож і просіць міласці парнуць у кільчэўскую гадзіну». «Ачкастым дуракам, предсядацелям комсомола Гофману і Горэўцову, — гэта ўжо да камсамольскіх важакоў, — вучні выб'юць з башкі палітыку, хоць ноччу з—за вугла, хоць летам у адпачынку». Быў зварот і да вучняў: «Вучні, помніце заветы народа — калі старшых кровапіўцаў меншасць, нада караць іх большасцю, арганізоўвайце падпольныя гурткі, пішыце лістоўкі і раскідвайце іх па школе, не слухайце сваіх настаўнікаў і іхніх падхалімаў, злосных убівайце ноччу камнямі. Вучні, даставайце ржавае аружжа, рабіце самастрэлы, аб'яднайцеся ў партыю, будзьце гатовы, скора будзе вам свабода ад германскага народу, няхай жыве Гітлер!» Аўтарамі гэтых самаробных улётак былі 16–17-гадовыя хлопцы — Уладзімір Якіменка, Кастусь Лапкоўскі, Іван Гунька, бацькі якіх былі арыштаваныя ў 1937–1938 гг. як антысаветчыкі-кулакі.

Згадваючы факты і праявы «фашысцкай ідэалогіі», якія назіраліся напярэдадні Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Савецкай Беларусі, і асэнсоўваючы ў сувязі з гэтым праблему т. зв. «калабарацыянізму»[4], звязанага з нацысцкім акупацыйным рэжымам, прыходзіш да важнай высновы, што бальшавікі не менш прычыніліся да ўзнікнення гэтай з'явы, чым самі нямецкія акупанты. Гэта яны стварылі шырокую сацыяльную глебу для яе падчас «вялікага тэрору» 1930-х гг., раскалоўшы грамадства на «сваіх» і на «ворагаў народа».

# Пад знакам Пагоні

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ ЧЫННАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ МАЛАДЗЁВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І УСХОДНЯЙ ЛАТГАЛІІ

*У выніку польска-савецкай вайны, якая скончылася ў сакавіку 1921 г. падпісаннем Рыжскай мірнай дамовы, этнічныя землі Беларусі былі падзелены паміж Варшавай і Масквой: да Польшчы адышлі былая Гарадзенская губерня, большая частка Віленскай, заходнія паветы і воласці Менскай і Віцебскай губерняў, а пад юрысдыкцыю Савецкай Расіі (з 1922 г. — СССР) трапіла астатняя частка Меншчыны і Віцебшчыны, уся Гомельшчына і Магілёўшчына, а таксама беларускія паветы Смаленшчыны, Браншчыны і Чарнігаўшчыны. Частка беларускіх этнічных тэрыторый паўднёва-ўсходняй Латгаліі, якія раней уваходзілі ў Віцебскую губерню, са згоды Масквы ў жніўні 1920 г. атрымала Латвія.*

*Заходнебеларускія тэрыторыі мелі для польскай дзяржавы важнае геапалітычнае значэнне. Разам з украінскай Усходняй Галіччынай і Валынню Заходняя Беларусь стварала своеасаблівы буфер, які аддзяляў этнічную польскую тэрыторыю ад непасрэднага суседства з Савецкай Расіяй. Акрамя таго, гэты рэгіён, арыентаваны на вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, адыгрываў не апошнюю ролю ў гаспадарцы Польшчы.*

*Нягледзячы на афіцыйныя заявы польскай прапаганды аб тым, што Гарадзеншчына і Віленшчына — «rzeczywiście polskie wshodnie kresy», прадстаўнікі польскай палітычнай эліты, якія рэальна ацэньвалі стан рэчаў, разумелі, што на ўсход ад Горадні і Берасця жыве ў асноўным зусім не польскае насельніцтва. Таму з самага пачатку свайго панавання на гэтых землях польскія ўлады пачалі здзяйсняць палітыку асіміляцыі беларусаў. Адзін з лідараў польскай эндэцыі (народных дэмакратаў) Леапольд Скульскі, які ў 1920 г. узначальваў урад і міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, выказаў свой «прагноз» адносна таго, што праз 50 гадоў ніякіх беларусаў у Польшчы фактычна не будзе, і што ўсіх іх можна будзе пасадзіць на адной лаве. Станіслаў Грабскі, былы сацыяліст, а ў пазнейшы час адзін з эндэцкіх ідэолагаў, які ў сярэдзіне 1920-х гг. курыраваў у польскім урадзе справы народнай асветы і веравызнанняў, быў упэўнены, што ў хуткім часе не толькі «wschodnie kresy» стануць часткай польскай дзяржавы, але і іх насельніцтва — часткай польскай нацыі.*

*У кантэксце такіх заяваў можна меркаваць аб тым, што польская ўлада не бачыла вялікіх перашкодаў на шляху паскоранай паланізацыі тутэйшага беларускага насельніцтва. Мяркуючы, што нацыянальнае ўсведамленне тутэйшых сялянскіх масаў моцна размыта, афіцыйная Варшава не чакала сур'ёзнага супраціву ў здзяйсненні сваёй асіміляцыйнай палітыкі. Значная ўвага пры гэтым надавалася «wykształceniu w duchu» маладых беларусаў. Гэтую задачу планавалася рэалізаваць праз насаджэнне польскамоўнай адукацыі, з дапамогай Каталіцкага касцёла, Войска Польскага і праз паланізацыю Праваслаўнай царквы. Маладое пакаленне беларусаў імкнуліся таксама ахапіць сеткай прапольскіх маладзёвых арганізацый, гурткі якіх ствараліся ў гарадах і мястэчках краю, а таксама пры мясцовых дзяржаўных навучальных установах. Такім чынам тутэйшую моладзь імкнуліся адвярнуць ад удзелу ў беларускім руху, ад культурна-асветнай працы на карысць беларушчыны, якая таксама прыроўнівалася да апазіцыйнай дзейнасці.*

*Беларускія нацыянальныя дзеячы разумелі ўсю актуальнасць пытання змагання за моладзь. Нешматлікая кагорта адраджэнцаў намагалася праз арганізацыю беларускіх нацыянальных школ, культурна-асветную дзейнасць, вывучэнне гісторыі і народных традыцый роднага краю абудзіць у маладых суайчыннікаў пачуццё нацыянальнай годнасці, патрыятычны гарт, жаданне працаваць на карысць Беларусі. Галоўнымі асяродкамі беларускага маладзёвага руху ў Заходняй Беларусі з'яўляліся нешматлікія беларускія гімназіі, Віленскі ўніверсітэт Стэфана Баторыя, у сценах якога ў 1920 г. узнік Беларускі студэнцкі саюз, а таксама іншыя маладзёвыя арганізацыі.*

*Стаўленне да беларускага пытання ва ўладных колаў Латвіі ў пачатку 1920-х гг. было значна лепшым. Тамтэйшы ўрад на чале з сацыял-дэмакратычнымі палітыкамі ў гэты перыяд даволі лаяльна ставіўся да грамадскай і культурна-асветнай чыннасці мясцовых беларусаў і не бачыў у гэтым пагрозы для дзяржаўнасці Латвіі. Беларускім дзеячам аказвалася матэрыяльная і арганізацыйная падтрымка па развіцці ўласнага нацыянальнага школьніцтва, культурна-асветнай і выдавецкай чыннасці. Галоўнымі асяродкамі развіцця беларускага маладзёвага руху ў Латгаліі, як і ў Заходняй Беларусі, сталі беларускія школы і гімназіі, у сценах якіх дзейнічалі тэатральныя, мастацкія, краязнаўчыя і скаўцкія гурткі, што спрыялі нацыянальнаму ўсведамленню тутэйшай моладзі.*

*Але з другой паловы 1920-х гг., з абвастрэннем палітычнай сітуацыі ў Латвіі, дэтэрмінаванага эканамічным крызісам, стаўленне да нелатышскіх нацыянальных супольнасцяў у цэлым і да дзейнасці беларускіх грамадскіх і культурніцкіх арганізацый у прыватнасці значна пагоршылася. Пасля дзяржаўнага перавароту 1934 г. беларуская нацыянальна-культурная чыннасць усё часцей стала ўспрымацца афіцыйнай Рыгай як антыдзяржаўная і сепаратысцкая.*

*Згуртаванасці і кансалідацыі беларускай моладзі ў Заходняй Беларусі і Латгаліі нярэдка перашкаджала яе празмерная палітызацыя, у чым ёсць віна і некаторых дзеячаў нацыянальнага руху старэйшага пакалення, якія бяздумна ўцягвалі маладых людзей з яшчэ не сфармаваным светапоглядам у міжпартыйнае супрацьстаянне, а нярэдка і ў свае міжасабовыя канфлікты.*

*Усе адзначаныя сацыяльна-палітычныя працэсы ў той ці іншай ступені ўплывалі на дзейнасць беларускіх студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый у Заходняй Беларусі і Латгаліі. Таму пры расповедзе пра гісторыю беларускага маладзёвага руху на забраных Польшчай і Латвіяй землях трэба, безумоўна, улічваць агульны фон тагачасных гістарычных падзей.*

## Ва ўмовах польскага панавання: паміж камуністамі і хадэкамі

Рэалізоўваючы сваю каланіяльную палітыку на ўсходзе, накіраваную на паланізацыю заходнебеларускіх зямель, афіцыйная Варшава пралічылася адносна палітычнай пасіўнасці тутэйшага жыхарства. Наступствы Першай сусветнай вайны і рэвалюцыйныя падзеі на абшарах былой Расійскай імперыі выклікалі значны рост палітычнай актыўнасці сярод беларускага сялянства, і ў першую чаргу вясковай моладзі. Многія з маладых беларусаў перажылі бежанства ў Расіі, а ў 1917–1918 гг. актыўна ўдзельнічалі ў тамтэйшым палітычным жыцці. Вярнуўшыся на бацькаўшчыну, ужо падчас польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. яны далучыліся да працы ў беларускіх нацыянальных арганізацыях. Абсалютная большасць маладзёвых актывістаў нацыянальна-вызвольнага руху свой палітычны ідэал бачылі ў «народным сацыялізме» і ставіліся варожа да польскіх парадкаў. Перажыўшы бежанства, вайсковыя рэквізіцыі, прымусовыя работы і іншыя неправавыя дзеянні з боку розных акупацыйных рэжымаў, яны гатовыя былі ісці ў сваім змаганні да канца.

Афіцыйная Варшава, добра ведаючы пра гаротны стан былых уцекачоў з Гарадзеншчыны і Віленшчыны, мала чым дапамагала апошнім уаднаўленні разбураных гаспадарак. Наадварот, тутэйшыя сяляне былі абкладзеныя высокімі падаткамі, а атрымаць ільготны крэдыт у польскіх дзяржаўных банках было безнадзейнай справай[5]. У той жа час польскія ўлады выдаткоўвалі немалыя сродкі на падтрымку мясцовых абшарнікаў і для здзяйснення палітыкі асадніцтва (раздачы былых казённых зямель каланістам з этнічнай Польшчы).

Выкліканы гэтай палітыкай пратэст выліўся ў пачатку 1920-х гг. у падпольны і ўзброены партызанскі супраціў. Ідэйна і арганізацыйна беларускія партызаны былі звязаныя з эміграцыйным урадам Беларускай Народнай Рэспублікі на чале з Вацлавам Ластоўскім і загранічнай групай Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Антыпольскі рух на «kresach wschodnich» у сваіх інтарэсах падтрымлівалі літоўскія і савецкія ўлады, зацікаўленыя ў аслабленні польскай дзяржавы. Прынамсі, літоўскі ўрад, які знаходзіўся ў Коўне, хацеў выкарыстаць беларускую партызанку для таго, каб далучыць да Літвы Віленскі край. Апагеем гэтага сялянскага бунту стаў 1922 год. Зонамі найбольшай актыўнасці беларускай партызанкі былі літоўска-польскае памежжа, дзе дыверсійныя рэйды з тэрыторыі ковенскай Літвы здзяйсняла 4-я беларуская група Саюза літоўскіх стральцоў, а

таксама раён Белавежскай пушчы. Актыў беларускіх партызан і падпольшчыкаў складалі пераважна юнакі і маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 30 гадоў. Сярод іх варта ўзгадаць былых удзельнікаў Слуцкага збройнага чыну 1920 г. — паручніка Якуба Гузнея, былых сябраў «Папараць-Кветкі» Васіля Русака, Сяргея Бусла і Уласа Дубіну. Актыўнымі ўдзельнікамі партызанкі на Гарадзеншчыне з'яўляліся таксама былыя актывісты «Грамады беларускай моладзі ў Горадні» Уладзімір Курбскі-Кузняцоў, Вера Маслоўская-Матэйчук, яе родная сястра Яўгенія Матэйчук, кіраўнік беларускага маладзёвага гуртка ў Крынках Алесь Парук, былыя школьнікі — 14–18-гадовыя Кірыла і Кузьма Бартасюкі, Аляксей і Зміцер Стасюкі, Андрэй Тамашук, Дзям'ян Мартынюк, Панцеляймон Нічыпарук ды шмат іншых. Польскія ўлады называлі іх «бандытамі», але ў партызанку яны ішлі па ідэйных перакананнях, каб змагацца з несправядлівасцю і бяспраўем, за вольную Беларусь.

Да 1923 г. польскім уладам з дапамогай рэгулярных вайсковых частак і паліцыі ўдалося справіцца з беларускімі партызанкай і падполлем. Спадзеў на падтрымку з-за кардону не апраўдаўся: польска-літоўскі канфлікт, завязаны са спрэчкамі адносна дзяржаўнай прыналежнасці Віленскага краю, перайшоў у «халодную фазу»[6]. У выніку 4-я беларуская партызанская група была расфармавана.

Лёс большасці беларускіх партызан Гарадзеншчыны склаўся трагічна. Гісторык Алег Латышонак падае гісторыю аднаго з партызанскіх аддзелаў, які дзейнічаў у Белавежскай пушчы з вясны 1922 г. і быў разбіты польскімі жандарамі. Пяць схопленых партызанаў (Андрэй Тамашук, Дзям'ян Мартынюк, Іван Сахарчук і Іван Піцалюк) ваенна-палявы суд у Беластоку 23 траўня 1922 г. прыгаварыў да смяротнага пакарання, а Панцеляймону Нічыпаруку, якому яшчэ ў той час не споўнілася 17 гадоў, смяротную кару замянілі на пажыццёвае зняволенне. Здрада кіраўніка Сакольскага павятовага падпольнага камітэта Эдуарда Лянкевіча дазволіла польскай дэфензіве выйсці на след усяго беларускага падполля на Гарадзеншчыне. Большасць яго ўдзельнікаў з Беластоцкага, Бельскага, Сакольскага, Гарадзенскага і Ваўкавыскага паветаў апынуліся за кратамі. У траўні 1923 г. у Беластоку адбыўся суд над беларускімі партызанамі і падпольшчыкамі, які атрымаў назву «працэс 45-ці». 20 падсудных былі ў выніку яго прыгавораныя да турэмнага зняволення тэрмінамі ад аднаго года да пажыццёвага. 20 красавіка 1925 г. у Горадні прайшоў чарговы судовы працэс над беларускімі партызанамі і падпольшчыкамі («працэс 72-х»), на якім многія абвінавачаныя былі таксама асуджаныя на розныя тэрміны зняволення.



*Выкладчыкі і слухачы Віленскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў (віньетка). Вільня, Фота 1921 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

На гэтай хвалі антыпольскіх настрояў легальныя беларускія палітычныя арганізацыі здолелі дабіцца заўважных поспехаў на выбарах у польскі парламент 1922 г. Ад аб'яднанага выбарчага Блока нацыянальных меншасцяў беларускія прадстаўнікі здабылі 11 пасольскіх (дэпутацкіх) мандатаў у сейме і 3 месцы ў сенаце. Разам яны сфармавалі Беларускі пасольскі клуб, які імкнуўся выкарыстаць парламенцкую трыбуну для змагання за нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы сваіх выбаршчыкаў. Большая частка беларускіх паслоў



*Выхаванцы падрыхтоўчых бурсаў Віленскай беларускай гімназіі. У цэнтры сядзіць ацец Адам Станкевіч. Фота 1921 г. Нацыянальны гістарычны музей Беларусі.*

у 1922–1923 гг. прытрымлівалася памяркоўнай, канструктыўнай пазіцыі. Яны лічылі ўзброенае змаганне супраць Польшчы ў тагачасных умовах бесперпектыўным і імкнуліся дабівацца сваіх мэтаў легальнымі сродкамі.

Акрэслім галоўныя палажэнні праграмы Беларускага пасольскага клуба: 1) здабыццё аўтаноміі Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы; 2) увядзенне шырокага мясцовага самакіравання, рэальнае забеспячэнне дэмакратычных свабод; 3) спыненне асадніцтва, забеспячэнне тутэйшых малазямельных сялян зямлёй, дзяржаўная падтрымка іх гаспадарак праз ільготнае крэдытаванне і прадастаўленне ўрадавых субсідый; 4) наданне беларускай мове афіцыйнага статусу, шырокае развіццё беларускай культуры, адукацыі і выдавецкай справы.

Аднак парламенцкая дзейнасць беларускіх паслоў не дала чаканых вынікаў. Усе прапановы, звароты, патрабаванні і пратэсты беларускіх паслоў разбіваліся аб мур непрыняцця ўсяго беларускага ўрадам і большасцю польскага сейма. Ідэя будавання «беларускага дома» з апорай на Польшчу ў тых палітычных умовах фактычна правалілася.

Рэалізаваць сваю палітычную праграму пры слабой зваротнай сувязі з грамадствам і адсутнасці сур'ёзных фінансавых ды арганізацыйных рэсурсаў беларускім парламентарыям не ўдалося. Да таго ж іх дзейнасць была моцна абмежавана польскай уладай. Яўген Мірановіч справядліва адзначае, што польская «крэсовая» адміністрацыя надавала ўрадавай палітыцы яшчэ больш антыдэмакратычны рэпрэсіўны характар, успрымаючы беларусаў «элементам ніжэйшай катэгорыі, адсталым, прымітыўным, якога лёгка можна апалячыць». Насуперак патрабаванням беларускіх паслоў, на заходнебеларускіх землях працягвалася рэалізацыя дыскрымінацыйнай каланіяльнай палітыкі ў дачыненні да аўтахтоннага насельніцтва, што правакавала рост радыкальных антыўрадавых настрояў.

Усё гэта ў поўнай меры выкарысталі камуністы, якія набывалі ўсё большую папулярнасць на тэрыторыі краю. На левым фланзе беларускага вызвольнага руху намаганнямі былых эсэраў Леапольда Родзевіча і Арсеня Канчэўскага ўзнікла Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя, якая складалася пераважна з тутэйшай моладзі. Нягледзячы на камуністычны ўхіл, гэтае палітычнае ўтварэнне мела выразна беларускую нацыянальную афарбоўку. БРА выступала за палітычную самастойнасць Беларусі, пашырэнне грамадскага статусу беларускай мовы і г. д. У канцы 1923 г. яна, падпарадкоўваючыся загадам з Масквы, злучылася з левым крылом габрэйскага Бунда, а таксама з прапольскімі левага радыкальнымі групоўкамі. Вынікам гэтага аб'яднання стала стварэнне нелегальнай Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Ячэйкі КПЗБ пачалі ўзнікаць па ўсім краі. У ваяводскіх і павятовых цэнтрах, у пазаштатных гарадах дзейнічалі рэгіянальныя камітэты партыі, якім падпарадкоўваліся ніжэйшыя партячэйкі. Уся партыйная чыннасць КПЗБ жорстка падпарадкоўвалася прынцыпу «дэмакратычнага цэнтралізму». У першую чаргу гэта тычылася выканання палітычных інструкцый савецкіх эмісараў. Беларуская накіраванасць былой БРА паступова распусцілася ў класавай ідэалогіі КПЗБ. У акруговых, павятовых і гарадскіх структурах партыі пераважалі габрэйскія камуністы і былыя бундаўцы. На першым месцы партыйнай пра-

грамы КПЗБ стаялі класавая барацьба, ліквідацыя пануючых «эксплуататарскіх станаў», заваяванне ўлады і стварэнне «дыктатуры працоўных мас», з дапамогай якой камуністы хацелі рэалізаваць сваю сацыяльную праграму. Утапізм гэтых намераў быў відавочны, але ва ўмовах антыдэмакратычнага рэжыму, які панаваў на месцах, камуністычная ідэалогія станавілася вельмі прывабнай для значнай часткі беларускага жыхарства, асабліва моладзі.

Уся чыннасць камуністаў у міжваеннай Польшчы зводзілася да метадаў безадказнай апазіцыі. Сваю ідэалогію яны распаўсюджвалі сродкамі «вулічнай дэмакратыі», арганізуючы пратэстныя мітынгі і маніфестацыі, а таксама праз падпольную літаратуру і прэсу. Няма таямніцы ў тым, што такая актыўная прапагандысцкая чыннасць была магчымая толькі дзякуючы значнай фінансавай падтрымцы з боку адпаведных структур СССР. Галоўныя мэты камуністаў палягалі ва ўзмацненні сярод сялян і рабочых незадаволенасці існуючай уладай, павелічэнні колькасці сваіх сябраў і прыхільнікаў, у дэстабілізацыі палітычнага становішча ў краіне.

Нягледзячы на пераслед і рэпрэсіі з боку паліцыі, КПЗБ з другой паловы 1920-х гг. становіцца адной з самых уплывовых палітычных сілаў у краі. У пачатку 1924 г. быў арганізаваны таксама нелегальны Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі — найбліжэйшы рэзерв камуністычнага падполля. У многіх заходнебеларускіх гарадах, мястэчках і вёсках пачалі



*Выкладчыкі Віленскай беларускай гімназіі з першым выпускам беларускіх матурыстаў. Унізе сядзяць (злева направа): Г. Бонч-Асмалоўская, Л. Макоўская, М. Васільева; у 2-м радзе: Ф. Аляхновіч, айцец А. Станкевіч, М. Кахановіч (дырэктар), Ф. Мікуліна, А. Луцкевіч, М. Гарэцкі; у 3-м радзе: Г. Бонч-Асмалоўскі, А. Лабуць, В. Акушка, Л. Нядзвецкая, А. Уладамірская, Н. Арсеньева; у 4-м радзе: М. Пяткевіч, А. Клімовіч, В. Аляксюк, Л. Пусько, А. Сасноўскі. 15 чэрвеня 1921 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

ўзнікаць таемныя камсамольскія ячэйкі.

Радыкалізацыя настрояў заходнебеларускага жыхарства паўплывала на пазіцыю беларускіх паслоў у польскім сейме. Нацыятворчыя працэсы, якія адбываліся ў БССР падчас правядзення палітыкі беларусізацыі, рабілі ўсё больш прыцягальнай ідэю стварэння «Беларускага дома» на савецкай аснове. Безумоўна моцным аргументам на карысць прасавецкай пазіцыі было і тое, што ў 1924 г. і 1926 г. адбылося «ўзбуйненне» тэрыторыі БССР (у склад рэспублікі ўвайшлі вялікая частка Віцебскай і Гомельскай, а таксама некаторыя паветы Смаленскай губерняў). Летам 1925 г. Беларускі пасольскі клуб раскалоўся на дзве фракцыі: прыхільнікі левагадыкальнага курсу (Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Пятро Мятла і Павел Валошын) сфармавалі ў парламенце Польшчы свой асобны пасольскі клуб, які пасля стаў асновай для стварэння новай палітычнай партыі — Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), у той час як больш памяркоўныя палітыкі, якіх прадстаўлялі ўмераныя сацыялісты, хрысціянскія дэмакраты і беспартыйныя, працягвалі дзейнасць у рамках старой структуры.

Галоўным ідэйным фактарам, які развёў беларускіх палітыкаў у розныя «абозы», стаў навязаны бальшавікамі «антаганізм» паміж нацыянальнымі і класавымі прыярытэтамі. Супрацьстаянне на гэтай глебе з найбольшай сілай праявілася падчас другой «кадэнцыі» польскага сейма




*Падчас заняткаў па гісторыі ў Віленскай беларускай гімназіі з настаўнікам Мікалаем Ільяшэвічам. 1929 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

(1928–1930), калі палітычную канкурэнцыю Беларускаму пасольскаму клубу склала новаўтвораная левper радыкальная фракцыя «Змаганне».

Палітычны раскол у беларускім нацыянальным лагеры быў справакаваны камуністамі і савецкімі эмісарамі, якія не без падстаў асцерагаліся ўзмацнення нацыянальна-вызвольнага руху беларусаў і таму імкнуліся яго паслабіць, раздрабніць арганізацыйна і падпарадкаваць свайму ўплыву.

Маладыя людзі, якія далучаліся да нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі, мусілі выбіраць паміж «памяркоўнымі» палітыкамі і левымі радыкаламі. Сімпатыі большасці былі на баку апошніх. Пры існуючых тады парадках у тутэйшай моладзі не было сур'ёзных перспектыў, каб палепшыць свой матэрыяльны стан і ўзняцца ўверх па сацыяльнай лесвіцы. Замест пакоры многія абіралі шлях рэвалюцыянераў.

Гісторыя ўзнікнення і краху Беларускай сялянска-работніцкай грамады дагэтуль у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі ў поўнай меры не асэнсавана. Імклівы рост шэрагаў гэтай партыі сапраўды здзіўляе. Калі ў чэрвені 1926 г. налічвалася крыху больш за паўтары тысячы актывістаў БСРГ, то ўжо праз 4 месяцы колькасны склад грамадоўцаў сягаў да 60 тыс. сябраў, аб'яднаных у 800 партыйных гурткоў. У пачатку 1927 г. ужо дзейнічалі каля 2 тыс. гурткоў БСРГ, а колькасны склад яе сябраў перавысіў 100 тыс. чалавек. У гісторыі Беларусі БСРГ стала самай масавай беларускай нацыянальнай палітычнай арганізацыяй.

Беспадстаўна сцвярджаць, што БСРГ — выключна прадукт прасавецкай дзейнасці, рух, які арганізоўваўся і фінансаваўся з-за мяжы. Безумоўна, «савецкі след» меў месца ў справе арганізацыі БСРГ. Але не савецкія грошы і не чыннасць бальшавіцкіх агентаў з'явіліся галоўнай прычынай такога масавага антыпольскага руху, інстытуяванага ў створаную БСРГ.

Адзначым яшчэ, што асноўную масу грамадоўцаў складалі маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў. Моладзі заўсёды ўласціва катэгарычнасць і радыкалізм, жаданне аднім рухам перавярнуць свет. Яўген Мірановіч мае рацыю, кажучы, што маладым беларускім рэвалюцыянерам, малаадукаваным выхадцам з вёскі, незадаволеным польскімі парадкамі, больш даспадобы была бунтарская ідэалогія Грамады, чым, напрыклад, памяркоўная і канструктыўная праграма Беларускай хрысціянскай дэмакратыі ці звязанага з апошняй Беларускага сялянскага саюза. Хадэкі і сельсаюзнікі выступалі за паступовае дасягненне сваіх мэтаў, імкнуліся стварыць трывалую сацыяльную базу для беларускага руху, які б апіраўся на моцнага вясковага гаспадара. Але гэтая пазіцыя не знаходзіла тады масавай падтрымкі. Большая частка маладых вяскоўцаў прагнулі хуткіх зменаў і таму падтрымлівалі лозунгі БСРГ аб канфіскацыі абшарніцкай зямлі і бясплатнай перадачы яе бяднейшаму сялянству, ліквідацыі асадніцтва ды інш.

Палітычную эліту БСРГ — тых, хто ўзначальваў цэнтральныя структуры і рэгіянальныя суполкі партыі — складалі найбольш адукаваныя і энэргічныя выхадцы з вёскі. Гэта былі маладыя настаўнікі, былыя малодшыя афіцэры царскага войска, якія прайшлі Першую сусветную вайну, дробныя чыноўнікі, якія за польскай уладай не бачылі для сябе сур'ёзнай перспектывы для кар'ернага росту на дзяржаўнай службе ці ў развіцці сваёй уласнай гаспадарчай справы. Удзел у палітычнай чыннасці разам з

ідэйнай матывацыяй даваў ім шанец таксама павысіць свой сацыяльны статус.

Польскія ўлады, не дабіўшыся аслаблення дзейнасці Грамады праз контрагітацыю і ўзмацненне палітычнага і адміністрацыйнага ціску, у сакавіку 1927 г. аб'явілі партыю па-за законам, перад гэтым арыштаваўшы яе лідараў. Але гэта не спыніла працы арганізацыйных структур БСРГ. Апынуўшыся ў падполлі, яе сябры працягвалі сваю антыпольскую чыннасць, выкарыстоўваючы легальныя гурткі Таварыства беларускай школы — грамадскай культурніцкай арганізацыі, утворанай яшчэ ў 1921 г., якая ставіла за мэту развіццё нацыянальнай асветы і культуры на роднай мове беларусаў. У гэты час колькасць гурткоў і сяброў ТБШ істотна павялічылася за кошт прытоку ў таварыства былых грамадоўцаў. На ліпень 1927 г. у Заходняй Беларусі мелася 385 гурткоў, у якіх налічвалася больш як 10,5 тыс. сяброў[7]. Каардынацыю чыннасці гарадскіх і вясковых гурткоў ТБШ ажыццяўлялі Цэнтральная школьная рада (пазней — Галоўная ўправа) у Вільні, 9 акруговых упраў у Беластоку, Горадні, Лідзе, Глыбокім, Вілейцы, Наваградку, Міры, Слоніме, Косаве, аўтаномныя арганізацыі ТБШ у Наваградку, Радашковічах і Нясвіжы («таварыствы беларускай пачатковай і сярэдняй школы»). Пад апекай Таварыства беларускай школы ў гэты час функцыянавалі 4 беларускія гімназіі (у Вільні, Наваградку, Радашковічах і Клецку), 124 бібліятэкі-чытальні і 41 народны клуб. Гэты рэсурсавы патэнцыял ТБШ былы актыў Грамады актыўна выкарыстоўваў у прапагандысцкіх мэтах для павелічэння колькасці сваіх прыхільнікаў.



*Выкладчыкі Віленскай беларускай гімназіі з навучэнцамі 7-й класы. У 2-м радзе (злева направа): 3 — А. Дмоўскі, 4 — А. Луцкевіч, 5 — М. Кахановіч, 7 — Б. Тарашкевіч, , 9 — Ф. Аляхновіч, 10 — А. Сакалова-Лекант; у 3-м радзе чацверты злева — Г. Баргдановіч. Вільня, чэовень 1921 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

Для беларускай школьнай справы павелічэнне колькаснага складу ТБШ за кошт Грамады прынесла больш шкоды, чым карысці. У рэзалюцыях ТБШ патрабаванні аб развіцці нацыянальнай культуры і адукацыі былі адсунутыя на другі план. Яны патаналі ў масе палітычных лозунгаў антыўрадавага характару. Таварыства беларускай школы паступова пераўтварылася ў ідэалагічны філіял БСРГ і КПЗБ, стаўшы закладнікам прасавецкай прапаганды. Гэта справакавала раскол у яго кіраўніцтве. Больш памяркоўныя дзеячы, нязгодныя з пракамуністычным ухілам ТБШ, былі адсунутыя з кіраўнічых пасад арганізацыі як «паланафільскія элементы».

Польскія ўлады хутка зарыентаваліся ў сітуацыі і абрынулі супраць ТБШ палітычныя рэпрэсіі. Канчатковая ліквідацыя грамадоўскіх «гнёздаў» прывяла да пагрозы забароны і Таварыства беларускай школы. У 1928–1929 гг. дзейнасць большасці ўправаў і гурткоў гэтай культурна-асветнай арганізацыі спынілася ці была паралізавана.

Разам з ТБШ у Заходняй Беларусі існавалі іншыя беларускія культурна-асветныя ўстановы, якія ў сваёй чыннасці не вызнавалі прынцыпаў і метадаў КПЗБ—БСРГ і стаялі на памяркоўных пазіцыях. Старэйшай з такіх установ было Беларускае навуковае таварыства ў Вільні, утворанае яшчэ ў снежні 1917 г. Апошняе апекавалася Беларускім музеем імя І. Луцкевіча, а таксама займалася выпрацоўкай беларускай навуковай тэрміналогіі і падрыхтоўкай вучэбнай літаратуры для беларускіх гімназій і пачатковых школ. Другой паводле сваіх уплываў нацыянальнай культурніцкай арганізацыяй у Заходняй Беларусі пасля ТБШ



*Урок беларускай літаратуры ў Віленскай беларускай гімназіі. 1920-я гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

быў Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК), утвораны ў 1926 г. па ініцыятыве актывістаў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускага сялянскага саюза. Аднак БІГіК і іншыя культурна-асветныя ўстановы Заходняй Беларусі (Беларускі гаспадарчы звяз Янкі Станкевіча, розныя «паланафільскія» структуры) паводле сваёй масавасці і папулярнасці відавочна саступалі ТБШ.

Разгром БСРГ і распачатыя рэпрэсіі супраць ТБШ закранулі таксама і вышэй згаданыя інстытуцыі. Пасля 1928 г. адбываўся адток прыхільнікаў абсалютна з усіх беларускіх нацыянальных арганізацый. Усё нацыянальна беларускае цяпер успрымалася як варожае і дэструктыўнае ў дачыненні да афіцыйных уладаў Польшчы.

У гэткай сітуацыі група «памяркоўных сацыялістаў», у якую ўваходзілі Антон Луцкевіч, Антон Неканда-Трэпка, Радаслаў Астроўскі, Язэп Шнаркевіч, а таксама Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Мікалай Ілляшэвіч і шэраг іншых палітыкаў, што раней актыўна падтрымлівалі чыннасць БСРГ, вырашылі адмежавацца ад камуністаў і пайсці на дыялог з лаяльнымі да беларусаў дэмакратычнымі коламі Польшчы. Лідар дадзенай групы А. Луцкевіч ва ўмовах фактычнага пагрому беларускага левага лагера імкнуўся згуртаваць прыхільнікаў згаданай палітычнай платформы вакол новага цэнтра і з дадзенага «плацдарму» пайсці на чарговыя парламенцкія выбары. З гэтай мэтай у 1930 г. ім было ініцыявана стварэнне Цэнтральнага саюза культурных і грамадскіх арганізацый і інстытуцый (Цэнтрасаюз). Многія апаненты А. Луцкевіча, у першую чаргу камуністы, не прамінулі адразу «ахрысціць» яго за гэта «здраднікам», «прыхільнікам польскай санацыі», нават «нацыянал-фашыстам». Беларускія хадэкі таксама не ўтрымаліся ад палітычнай палемікі з лідарам беларускіх сацыял-дэмакратаў, нярэдка ўжываючы рыторыку, характэрную як для камуністаў, так і для польскіх кансерватараў[8]. У выніку, аднак, ніводная беларуская палітычная групоўка не здолела на выбарах 1930 г. самастойна правесці ў Сойм хоць бы аднаго свайго прадстаўніка.

Апошні факт сведчыў пра сур'ёзны палітычны крызіс у беларускім нацыянальным руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Разам з вонкавымі прычынамі, якія справакавалі раскол у беларускім палітычным лагеры, былі і чыста ўнутраныя фактары. Сваёй несамавітай чыннасцю многія заходнебеларускія палітыкі ў поўнай меры пацвярджалі вядомы афарызм: «Два беларусы — тры партыі». Будучы дырэктар Віленскай беларускай гімназіі Францішак Грышкевіч, тады яшчэ студэнт, у 1928 г. на старонках часопіса «Студэнцкая думка» задаваў сябе і сваім аднадумцам рытарычныя пытанні і не знаходзіў на іх адпаведных адказаў: «Чаму ў нас што асоба з сярэдняй ці вышэйшай асветай — то ўжо асобная палітычная партыя? Чаму спосаб партыйнага змагання ў нас ёсць такім брудным і нялюдскім?».

Пры гэтым праграмныя палажэнні большасці гэтых «партый» мала чым адрозніваліся паміж сабой. Шмат сіл і сродкаў трацілася на змаганне паміж сабой. У гэтым самабічаванні і самаедстве многія забываліся пра тое, што ўсім ім супрацьстаіць агульны праціўнік — уся ўрадавая Польшча разам з іншымі інстытутамі польскай дзяржавы. Няздольнасць значнай часткі беларускіх палітыкаў паставіць нацыянальныя інтарэсы вышэй за асабістыя ці вузка карпаратыўныя сведчыць, як лічыць беларускі даследчык Аляксандр Пашкевіч, аб незавершанасці працэсу фар-

мавання палітычнай эліты беларускага руху.

У 1927–1929 гг. многія былыя актывісты Грамады пад пагрозай арыштаў і рэпрэсій эмігруюць у «саветчыну» — Савецкі Саюз. Значная частка з іх трапляла туды нелегальна, таемна перайшоўшы польска-савецкую дзяржаўную мяжу, а некаторыя былі дэпартаваны ў СССР самімі польскімі ўладамі. Знаходзячыся пад моцным уплывам бальшавіцкай прапаганды, якая распавядала пра шчаслівае і заможнае жыццё ў «краіне саветаў», былыя грамадоўцы спадзяваліся на салідарнасць і падтрымку з боку савецкай улады і грамадства, прагнулі прысвяціць сябе будаўніцтву «новага ладу».

Савецкая рэчаіснасць, аднак, аказалася зусім не такой, як ім мроілася за кардонам, тым больш што бальшавіцкая ўлада сустрэла перабежчыкаў з непрыхаванымі недаверам і варожасцю. Большасць заходнебеларускіх рэвалюцыянераў у рэшце рэшт трапілі ў вязніцы ГПУ «для высвятлення іх палітычнага крэда». «Найбольш падазроныя элементы» пазней накіроўваліся на прымусовыя працы не толькі на тэрыторыі БССР, але таксама за межы рэспублікі: на ўзвядзенне аб'ектаў «сацыялістычнай індустрыі», дзе патрэбна была дармавая працоўная сіла. Многіх дэпартавалі назад у Польшчу — фактычна на расправу польскіх карных органаў.

Скупыя звесткі пра лёс былых грамадоўцаў пранікалі за межы СССР, прынамсі, у Заходнюю Беларусь. Але заходнебеларускія перыёдыкі, якія знаходзіліся пад кантролем камуністаў ці былых актывістаў БСРГ, адмаўляліся змяшчаць на сваіх старонках «пасквілі» на савецкую краіну. Надрукавала гэтую інфармацыю толькі газета «Беларускі дзень», што выдавала «паланафільская» Беларуская нацыянальная радыкальная партыя. Пачынаючы з 7 студзеня 1928 г. на працягу месяца тут быў змешчаны цыкл рэпартажаў пад агульным загалоўкам «Лёс грамадаўцаў у БССР». Вось некаторыя вытрымкі з гэтых публікацый:

«Казённая савецкая прэса ўвесь час стараецца пераканаць беларускіх сялян, што ў Польшчы ў адносінах да Грамады ўжываюцца страшны тэрор, што арыштаваны тысячы грамадаўцаў... Сягоння нам хочацца зачапіць толькі адну цёмную старонку ў гісторыі Грамады, а іменна застанавіцца на лёсу тых грамадаўскіх тысячаў, аб якіх шмат пісалася — хочацца паказаць нашаму народу, як спаткалі грамадаўцаў у гэтак званай Савецкай Беларусі бальшавіцкія ўлады... Ведама, што ў Грамаду ішлі масы, ішло сялянства і пераважна маладыя людзі. Яны спадзяваліся, што ў выпадку рэпрэсій з боку ўлады іх сустрэнуць з радасцю ў Савецкай Беларусі, што ім будзе прадстаўлены палітычны прытулак, дадуць працу, адным словам, грамадоўцы верылі, што калі ў саветах іх і не чакае рай, то ў кожным разе чакае спатканне з чырвоным сцягам, спатканне, якое, лагічна думаючы, і павінна чакаць змагароў супраць панскай Польшчы, прыхільнікаў савецкай улады... Якое ж горкае расчараванне чакала перабежчыкаў на тым баку граніцы. Уцякаючы ад праследу польскай паліцыі, сотні актыўных грамадаўцаў, прэзасаў гурткоў, сакратароў раённых і павятовых камітэтаў замест «чырвонага сцягу» і музыкі трапілі зноў за краты. На мяжы іх там чакала агентура ГПУ, якая большасць гэтых палітычных эмігрантаў арыштоўвала і садзіла ў турмы... Наша рэдакцыя мае... забойчыя матэрыялы і факты аб тых здзеках і нечалавечых муках, якія перажылі сотні грамадаўцаў у Полацку, Менску, Воршы, Койданаве і іншых савецкіх турмах. Іх трактуюць бальшавікі як звычайных крымінальных праступнікаў, бо ў камерах грамадаўцаў садзяць разам з забойцамі і злодзеямі... Значная група грамадаўцаў будавала новую савецкую турму ў Менску. З адной Наваградчыны, з паветаў Стаўпецкага і Наваградскага ў Менскай турме (ДОПРы) сядзіць больш шэсцьдзясят грамадаўцаў. Некаторыя з іх сядзяць больш года. Частка гэтых арыштаваных бальшавікамі грамадаўцаў былі адпраўлены на «папраўчыя работы»... К. Казлоўскі — актыўны сябра Грамады і скарбнік Стаўпецкага павятовага камітэта, паходзіць з вёскі Скамарошкі Мірскай воласці. Уцёк у Савецкую Беларусь падчас ліквідацыі Грамады.... Цяпер сядзіць у менскім ДОПРы. Палуян — старшыня Некрашэвіцкага гуртка Грамады Жухавіцкай воласці, адсядзеў каля 10 месяцаў у менскім ДОПРы, выселены назад у Польшчу... Кісцень Базыль — сакратар Вялетаўскага гуртка Ярэміцкай воласці, удачна перайшоў граніцу і даехаў аж да Ленінграда (Пецярбурга), дзе знаходзіўся на савецкай службе яго брат, які за яго паручыўся. Нягледзячы на гэта быў арыштаваны і пасаджаны ГПУ ў вастрог... этапным парадкам перавезены ў

Менск, дзе, прасядзеўшы некалькі месяцаў у вастрозе, выселены ў Польшчу».

Але трэба сказаць, што большая частка заходнебеларускага сялянства адмаўлялася прызнаць за праўду гэтыя сведчанні аб палітычных пераследах і рэпрэсіях у Савецкім Саюзе. Яны шчыра верылі, што ў СССР усталявана народная ўлада, што ў савецкай краіне пануюць сацыяльная справядлівасць і законнасць. Сяляне спадзяваліся, што Масква ў хуткім часе пачне вайну супраць Польшчы і вызваліць іх ад польскага прыгнёту.

Пісьменнік Аляксей Карпюк у сваіх успамінах распавядае пра сумную гісторыю, як адзін вясковец-перабежчык з Гарадзеншчыны, правёўшы два месяцы ў БССР, пасля вяртання ў родную вёску стаў распавядаць аб тым, як тамтэйшыя людзі ледзь зводзяць канцы з канцамі і гадзінамі стаяць у вялізных чэргах у дзяржаўных крамах па прадукты першай неабходнасці. Але, зноў жа, яму ніхто не паверыў, палічыўшы правакатарам, платным агентам дэфензівы. У роспачы былы перабежчык скончыў жыццё самагубствам.

Праўда, для асобных маладых палітэмігрантаў з Заходняй Беларусі спачатку ўсё складвалася някепска. Некаторыя маладыя беларусы — былыя студэнты Віленскага ўніверсітэта, а таксама навучэнцы Віленскай беларускай гімназіі, што актыўна ўдзельнічалі ў пракамуністычным руху на Віленшчыне і Гарадзеншчыне ды нелегальна перайшлі польска-савецкі кардон, былі ўзяты пад апеку старшынёй Інстытута беларускай культуры Усеваладам Ігнатоўскім і іншымі нацыянал-камуністамі. Урад БССР размеркаваў уцекачоў вучыцца ў савецкія тэхнікумы, у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у Менску, у Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках, Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт народаў Захаду, іншыя навучальныя ўстановы СССР. Многія з іх уступілі ў камсамол.

Мала хто з іх ведаў, што знаходзіцца пад пільным наглядам «сексотаў» ГПУ. Нагляд за былымі палітэмігрантамі быў арганізаваны нездарма. Многія былыя грамадоўцы вельмі хутка расчараваліся ў савецкай рэчаіснасці. Убачанае імі відавочна не супадала з уяўленнямі, складзенымі пад уплывам савецкай прэсы і радыё. Дзеля таго зразумела, чаму большасць з іх сталі першымі ахвярамі масавых палітычных рэпрэсій, якія распачалі савецкія карныя органы ў пачатку 1930-х гг. Паводле прысудаў сталінскіх «троек» яны былі расстраляныя ці памерлі ад непасільнай нявольніцкай працы ў канцлагерах.

Алесь Салагуб, таленавіты заходнебеларускі паэт, былы актывіст БСРГ, нелегальна перабраўшыся ў 1928 г. на савецкі бок, быў прыняты на вучобу на філфак БДУ, а пасля заканчэння ўніверсітэта — у аспірантуру Інстытута літаратуры і мастацтва Беларускай акадэміі навук. У жніўні 1933 г., вядомы літаратар будзе арыштаваны ГПУ па справе «Беларускага нацыянальнага цэнтру» і пазней прыгавораны да расстрэлу. Ці думаў ён, што так складзецца яго лёс у Савецкай Беларусі, што будзе яму адпушчана жыць усяго 28 год? У памяці ўсплываюць яго вершаваныя радкі:

Не для крыку, не для славы,
Мы павінны працаваць,
А за светлую ідэю
Разам усе мы мусім стаць.

Такі ж трагічны лёс чакаў трох сяброў, таленавітых мастакоў з Заходняй Беларусі, гадаванцаў Віленскай беларускай гімназіі Міхася Васілеўскага, Рамана Семашкевіча і Васіля Сідаровіча. Яны ў розны час эмігравалі з Польшчы ў Савецкі Саюз і былі накіраваны вучыцца ў Віцебскі мастацкі тэхнікум. Гэта былі яскравыя таленты, якія ў будучыні маглі стаць гонарам Беларусі. Але ў 1930-я гг. усе яны, былыя камсамольцы, сталі ахвярамі камуністычнага тэрору.

Немагчыма палічыць інтэлектуальныя страты, панесеныя Беларуссю падчас сталінскага генацыду. За 1930-я — 1950-я гг. быў знішчаны цэлы пласт нацыянальнай эліты — пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў, навукоўцаў, дзякуючы наватарству якіх пачала фармавацца новая беларуская традыцыя ў літаратуры, мастацтве і навуцы, грамадскім жыцці.

Сярод генератараў гэтай новай беларускай культурнай рэчаіснасці быў і выхадзец з засценку Яхімаўшчына былога Вілейскага павета Віленскай губерні Раман Семашкевіч. Равеснік стагоддзя, сын панскага садоўніка, ён пачаў маляваць з маленства, пасвячы жывёлу і выкарыстоўваючы «фарбы свайго вырабу — з бурака і кветак». Першую сапраўдную акварэль яму падараваў у 1916 г., падчас Першай сусветнай вайны, афіцэр расійскага войска, уражаны яго малюнкамі. У 1920 г. Р. Семашкевіч быў прыняты вучыцца ў Барунскую беларускую настаўніцкую семінарыю. Яе ды-

рэктар Сымон Рак-Міхайлоўскі адыграў значную ролю ў лёсе мастака. У 1921 г. будучы беларускі пасол паспрыяў, каб 21-гадовага «пераростка» ўзялі вучыцца ў чацвёрты клас Віленскай беларускай гімназіі і адначасова ў Віленскую школу прыгожага мастацтва мастака Медзыблоцкага. У 1922 г. Семашкевіч — сябра маладзёвай суполкі Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, якая таемна дзейнічала ў гімназіі. Але ў хуткім часе гэтая суполка была выкрыта, і маладому рэвалюцыянеру прыйшлося ўцякаць у Савецкі Саюз.

Трапіўшы ў Менск, ён звяртаецца да старшыні Інбелкульта У. Ігнатоўскага з заявай: «Жадаючы закончыць сваю асвету па малярству, прашу Інбелкульт камандзіраваць мяне ў адну з вышэйшых мастацкіх школаў». Ён будзе накіраваны вучыцца на скульптурнае аддзяленне Віцебскага мастацкага тэхнікума, які скончыць у 1927 г. з дыпломам мастака. Прагнучы вучыцца далей, малады мастак едзе ў Маскву, каб запісацца ў Маскоўскі вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут. Пасля яго заканчэння ў 1930 г. ён пачне актыўна выстаўляцца ў тамтэйшых галерэях, салонах і клубах. Усяго пару гадоў спатрэбілася яму для таго, каб заваяваць мастацкі бамонд савецкай сталіцы. Яго ведаюць маскоўскія мастацкія мэтры, яго лепшыя карціны («Аўтадор», «Чайная» ды інш.) набываюць Траццякоўка і ленінградскі Рускі музей. Па моцы таленту, арыгінальнасці і майстэрству Р. Семашкевіча параўноўвалі з Вінсэнтам Ван Гогам, Раулем Дзюфі, Ніко Пірасмані (Пірасманашвілі). Яго мастацкія вобразы па моцы ўздзеяння падобныя да музыкі Рыхарда Вагнера: «тварыў рэальна не для ілюзіі, тварыў рэальна да жудасці». А жыў «як птушка нябёсная, не ведаючы, што будзе заўтра есці, піць, ува што апранацца. Чаравікі ягоныя дзеля трываласці былі перацягнуты дротам. Грошай, вядома, не было. Галоўнае і адзінае было: пісаць, пісаць, пісаць...»[9]. За сваё кароткае жыццё ён стварыў больш чым за 300 карцін, меў 6 персанальных выстаў. І не забываўся пра Беларусь: здзейсніў некалькі творчых вандровак па Гомельшчыне, стварыў шэраг карцін, прысвечаных заходнебеларускай тэматыцы («Галадоўка палітзняволеных у Лукішскай турме», «Здзек паліцыі», «Бойка з секвестратарамі» ды інш.), намаляваў партрэты Антона Грыневіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа.

І раптам апала... Спачатку кампанія па дыскрэдытацыі і ганьбаванні яго творчасці ў маскоўскай прэсе за скажэнне савецкай рэчаіснасці, за «неадпаведную сацрэалізму інтэпрэтацыю вобразаў савецкіх людзей працы». А ў ноч з 1 на 2 лістапада 1937 г. — арышт, канфіскацыя 173 аўтарскіх карцін[10], камера ва ўнутранай вязніцы НКВД на Лубянцы, доўгія допыты ў кабінеце следчага, прысуд «тройкі» і расстрэл як «ворага народа». Сям'я даведаецца пра сапраўдны лёс Рамана Семашкевіча толькі праз 53 гады, у 1990 г.

Толькі адзінкі з былых грамадоўцаў эміґравалі не на Ўсход, а на Захад. Але і там многіх з іх дастала «рука Крамля». Колішні матурыст Віленскай беларускай гімназіі і студэнт Віленскага ўніверсітэта Пятро Бакач, які паходзіў з вёскі Казейкі Ізабелінскай воласці Ваўкавыскага павета, актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыйным руху Заходняй Беларусі. Як сябра Віленскага камітэта БСРГ і сакратар пасла польскага Сойма Браніслава Таршкевіча, ён быў арыштаваны польскай дэфензівай у 1931 г. Паводле судовага выраку 24-гадовы хлапец будзе асуджаны на 4 гады астрогу з пазбаўленнем правоў польскага грамадзянства на 5 гадоў і права служыць у польскім войску на 10 гадоў. Пакаранне адбываў у вязніцах Вільні і Горадні. У верасні 1935 г. Бакач выйшаў на свабоду і перад ім паўстала дылема, што рабіць далей. У 1920-я гг. ён нават не задумаўся б і папрасіў бы палітычнага прытулку ў СССР. Але ў 1930-я гг. ён ужо добра ўсведамляў, што чакае яго, колішняга актывіста БСРГ, у «савецкім раі». З дапамогай пражскіх беларусаў Бакач перабраўся на сталае жыхарства ў Чэхаславакію. Там ён скончыў Карлаў універсітэт, атрымаўшы ступень доктара філасофіі. У лютым 1938 г., пасля смерці Тамаша Грыба, узначаліў Беларускі загранічны архіў у Празе, а падчас Другой сусветнай вайны быў сябрам пражскага Беларускага нацыянальнага камітэта. Пятро Бакач з'яўляўся аўтарам «Падручніка нямецкага языка для беларусаў» (Прага, 1941), які карыстаўся добрым попытам не толькі ў эміграцыі, але і ў самой Беларусі. З 1943 г. Бакач пераязджае ў Берлін, дзе ўзначальвае тамтэйшую філію Беларускага камітэта самапомачы. У 1945 г. быў выкрыты і арыштаваны ў нямецкай сталіцы савецкай контрвыведкай «Смерш», затым этапаваны ў Менск, дзе яго чакаў

прысуд на 15 гадоў канцлагераў. Тэрмін адбываў у Магадане, а як скончыў свой жыццёвы шлях — дагэтуль невядома.

Была і сенсацыйая гісторыя зваротных нелегальных уцёкаў у 1930 г. з СССР у Польшчу былога навучэнца Менскага беларускага педтэхнікума Самуіла Кулеша, які ўцёк з Менска напярэдадні свайго арышту органамі ГПУ. Перабраўшыся ў Вільню, ён пэўны час працаваў у рэдакцыі часопіса «Студэнцкая думка».

Судовыя працэсы над грамадоўцамі і камуністамі ў 1928–1929 гг. негатыўна паўплывалі на грамадскія настроі большасці жыхарства Заходняй Беларусі. Гісторык Сяргей Токць для адлюстравання гэтай маральнай атмасферы, што панавала ў заходнебеларускіх вёсках, прыводзіць у сваёй манаграфіі вытрымкі са справаздачы беластоцкага ваяводы за кастрычнік 1930 г.: «У перадвыбарны перыяд цалкам згасла і без таго слабое грамадскае жыццё беларускага насельніцтва. Яно пасіўна ставіцца да выбараў і, нягледзячы на ўсе высілкі як польскіх палітычных партый, так і радыкальных беларускіх сіл, у масе сваёй абыякавае да перадвыбарных спраў». Вынікі гэтых выбараў у польскі сейм, пры відавочным абсентэізме многіх выбаршчыкаў з Заходняй Беларусі, асабліва праваслаўнага веравызнаня, пацвярджаюць гэтыя назіранні. На «kresach wschodnich» ва ўмовах жорсткага паліцэйскага нагляду, масавых парушэнняў падчас правядзення выбарнай кампаніі і самога галасавання, пры палітычнай апатыі большасці мясцовага жыхарства «перамог» выбарчы спіс № 1 — прыхільнікаў былога Начальніка Польскай дзяржавы Юзафа Пілсудскага.

Каб спыніць рост левага радыкалізму і мінімізаваць антыпольскія настроі сярод тутэйшай моладзі, польская ўлада імкнулася ахапіць яе сеткай польскіх маладзёвых арганізацый, якія прапагандавалі дзяржаўны патрыятызм, а таксама вернасць нацыянальным ідэалам і сімвалам Польшчы. З правага флангу шчыравалі функцыянеры ваенізаванай арганізацыі «Związek Strzelecki», суполак «Młodzież Wszechpolska», «Stowarzyszenie Młodzieży Polskej», «Koło Młodzieży Wiejskiej», якія не хавалі сваіх мэтаў па хутчэйшай асіміляцыі беларусаў. У «цэнтры» і на левым флангу дзейнічалі «Odrodzenie», «Organizacja Młodzieży Narodowej» і «Legion Młodych», якія на словах выказвалі салідарнасць з нацыянальнымі памкненнямі беларусаў, а на справе фактычна падтрымлівалі ўрадавую палітыку па дэнацыяналізацыі Заходняй Беларусі.

Асаблівая ўвага надавалася ідэалагічнай апрацоўцы студэнцтва як найбольш небяспечнай сацыяльнай групы для кіраўнічага рэжыму. Польскі ўрад шчора фінансаваў праўрадавыя студэнцкія карпарацыі, якія дзейнічалі ў Віленскім універсітэце Стэфана Баторыя і прапагандавалі польскі патрыятызм і адданасць польскай дзяржаве. У 1936 г. па ініцыятыве афіцыйных улад у Вільні быў утвораны «Студэнцкі хаўрус па развою ўсходніх крэсаў». Яго галоўнай мэтай было пашырэнне польскай прапаганды і асветы сярод жыхарства Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, укараненне на гэтых землях польскасці. З гэтай жа мэтай падтрымлівалася стварэнне прапольскіх студэнцкіх зямляцтваў.

Знішчаючы парасткі беларускага нацыянальнага ўсведамлення і грамадскай супольнасці, афіцыйная польская ўлада ў міжваенны перыяд сваёй галоўнай мэты не дасягнула. Прышчэпка польскай нацыянальнай ідэнтычнасці ў свядомасці маладых беларусаў прыжывалася вельмі марудна. Правядзенне палітыкі дэнацыяналізацыі толькі множыла грамадскую апатыю і сацыяльную амнезію. Пад уздзеяннем рэпрэсій у беларускай глыбінцы ў гэты час назіраўся выразны духоўны і сацыяльна-псіхалагічны надлом. Ён характарызаваўся ўзмацненнем рэлігійнага містыцызму сярод тутэйшага жыхарства больш сталага ўзросту, ростам бязбожніцтва — сярод моладзі. Узмацненне рэлігійнасці праяўлялася ў феномене праваслаўнага і каталіцкага фундаменталізму, а таксама ў пашырэнні неапратэстантызму ў форме метадызму і баптызму. Сацыяльная апатыя разам з нізкім узроўнем адукаванасці пладзілі сярод моладзі маральную распусту, рост злачынстваў і «сацыяльных хвароб». На вёсцы назіралася пашырэнне п'янства, захапленне азартнымі гульнямі, дзікунскімі бойкамі «сценка на сценку». Карэспандэнт віленскага часопіса «Шлях моладзі» Ігнат Пупін з вёскі Арэхаўка Браслаўскага павета з сумам пісаў увесну 1929 г.: «Прыкра, але трэба прызнаць, што нашая моладзь зусім не цікавіцца грамадскім жыццём. Яна цёмная, але і не хоча быць усвятлёнай... Адно і мае на мэце, каб гарэлкі напіцца, на вечарынку пайсці, а ў іншыя дні вечарамі

ў карты іграе...» Карэспандэнт М. Шчырык з мястэчка Астрына Лідскага павета паведамляў прыкладна тое ж: «Наша моладзь нічым не цікавіцца. Калі мае хто які грош, зараз яго пускае на гарэлку..., з прычыны чаго часта даходзіць да крывавай бойкі».

Замест таго, каб разам, талакой узяцца за вырашэнне многіх набалелых праблем і вырвацца з гэтай сацыяльнай пасткі, некаторыя маладыя, здаровыя хлопцы паступова пераўтвараліся ў інертных маргіналаў. Гэтую безвыходнасць і апатыю ў асяродзі тутэйшай моладзі выразна адчуў і таленавіта адлюстраваў у сваім вершы «Адвечныя рабы» паэт Пятро Сакол:

Шлопаюць лапці лазовыя,
Хлюпае юхтавы бот...
Па бездарожжу вясноваму
Йдуць яны з году ў год...

Рукі бязвольна хістаюцца,
Плечы ад торбы баляць.
Млеючы, ногі згібаюцца, —
Болей не хочуць ступаць.

Нізка галовы схіліліся.
У сэрцах пакрыўджаных — боль...
Гоніць іх цемра бязлітасна,
Гоніць спрадвечная голь!..

Усе маладыя і дужыя,
Ім бы на долю — пляваць!
Ім бы рукамі сталёвымі
Хату сваю будаваць!

Славіліcь сілай магутнаю
Дзеці крывіцкіх сяліб, —
Ім бы — плячом развярнуцца,—
Жартам сусвет занялі б!..

Але, — галовы схіліліся.
У сэрцах пакрыўджаных — боль...
Гоніць іх цемра бязлітасна,
Рыззямі ўкрытая голь...

У гэтых неспрыяльных варунках на арэну палітычнага і грамадскага жыцця ў Заходняй Беларусі выходзіць новае пакаленне актывістаў беларускага маладзёвага руху, выхаванае ў сценах заходнебеларускіх гімназій. Яно мела большы грамадскі і палітычны досвед за сваіх папярэднікаў, дзякуючы працы ў Беларускім студэнцкім саюзе, у суполках Таварыства беларускай школы, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, іншых нацыянальных інстытуцыях. Гэтае пакаленне было сведкам уздыму і заняпаду дзейнасці Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Многія з іх перахварэлі на камунізм і ўжо мелі імунітэт ад захаплення лявацкімі ідэямі. Іх грамадска-палітычная чыннасць была звязана ўжо не з камуністычным падполлем, а з дэмакратычнымі беларускімі арганізацыямі, хоць прыцягальнасць агітацыі КПЗБ і камсамолу на вясковую моладзь заставаласяся яшчэ даволі моцнай. Але ў 1930-я гг., пад уплывам палітычных працэсаў у СССР, дзе распачалося фізічнае вынішчэнне нацыянальнай інтэлігенцыі і іншадумства ў самой бальшавіцкай партыі, істотна зменшылі сімпатыі тутэйшага адукаванага грамадства да Савецкага Саюза. Сярод беларускай студэнцкай і вучнёўскай моладзі адчувалася расчараванне ў камуністычных каштоўнасцях. У іх свядомасці адбываўся паварот да канструктыўнай крытыкі сацыялістычнага светапогляду.

Разам з тым палітычная сітуацыя ў Польшчы і ў цэлым у Еўропе ў 1930-я гг. кардынальна змянілася. Падзеі, што разгортваліся ў свеце, не спрыялі росту дэмакратыі. У сусветнай эканоміцы адбывалася стагнацыя, якая стала наступствам глабальнага крызісу 1929–1932 гг. Услед за эканамічнымі цяжкасцямі і ростам сацыяльных праблемназіралася ўзмацненне палітычнай рэакцыі, якая характарызавалася ўзыходжаннем на палітычны алімп у многіх еўрапейскіх краінах правых папулістаў, прыхільнікаў аўтакратыі і ўвядзення таталітарных формаў праўлення.

Прыход да ўлады ў Нямеччыне нацыянал-сацыялістаў на чале з Адольфам Гітлерам, які адкрыта заявіў пра свае рэваншысцкія планы, абвастрыў міжнароднае становішча ў Старым Свеце да крайнасці. Спрацоўваў прынцып «даміно»: у адказ на нямецкую пагрозу краіны — суседзі Нямеччыны, якія атрымалі свой суверэнітэт дзякуючы Версальскай мірнай сістэме (Польшча, Югаславія, Літва і Латвія), таксама пачалі «закручваць гайкі» ва ўнутранай палітыцы.

Палітычны рэжым у Польшчы з другой паловы 1930-х гг. набывае выразна аўтарытарны характар, што праяўлялася ў адкрытай прапагандзе польскага шавінізму, паскоранай мілітарызацыі краіны, абмежаванні грамадзянскіх правоў і дэмакратычных свабод, ва ўзмацненні ганенняў супраць грамадзян няпольскай нацыянальнасці — этнічных немцаў, беларусаў, украінцаў, габрэяў, якіх усё часцей пачалі прыроўніваць да так званай «пятай калоны».

Усё гэта адбілася і на палітычных настроях польскага студэнцтва ды вучнёўства, сярод якіх было заўважна ўзмацненне шавіністычных і антысеміцкіх настрояў. Прыкрым сведчаннем гэтага можа служыць апытанне, праведзенае сярод навучэнцаў вышэйшых школ Польшчы ў 1936 г.,

паводле якога прадстаўнікі 52 польскіх студэнцкіх арганізацый выказаліся за асобнае пражыванне студэнтаў-палякаў ад габрэяў. Польскія студэнцкія карпарацыі левай арыентацыі толькі на словах выказаліся супраць этнічна-канфесійнай сегрэгацыі, але разам з тым выступалі за «абмежаванне эканамічнага панавання» габрэяў у Польшчы. І толькі Беларускі студэнцкі саюз у Вільні выказаў сваю салідарнасць з габрэйскім студэнцтвам[11].

Гэтая сітуацыя справакавала чарговы палітычны раскол у беларускім дэмакратычным лагеры. Большая частка беларускіх палітычных арганізацый як з левага флангу, так і з цэнтру — камуністы, сацыялісты, значная частка сябраў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (Беларускага народнага аб'яднання) пад кіраўніцтвам ксяндза Адама Станкевіча — выступалі за стварэнне адзінага дэмакратычнага фронту супраць наступу правай палітычнай рэакцыі. У той жа час частка беларускіх хадэкаў і беспартыйных актывістаў, якія гуртаваліся вакол ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага, былі катэгарычна супраць супрацоўніцтва з камуністамі.

Апошняя групоўка рабіла стаўку на хутчэйшае дасягненне палітычнай незалежнасці Беларусі, якая можа паўстаць у выпадку новай вайны Нямеччыны і яе хаўруснікаў супраць Польшчы і Савецкага Саюза. Ці ўсведамлялі яны да канца ўсю небяспечнасць стаўкі ў барацьбе за беларускую незалежнасць на гітлераўскую Нямеччыну?

У апраўданне пазіцыі гэтай палітычнай групы трэба сказаць, што яны не былі ідэйнымі прыхільнікамі фашызму ці нацыянал-сацыялізму. Апублікаваная публіцыстыка, а таксама выяўленыя новыя архіўныя дакументы сведчаць, што В. Гадлеўскі і яго прыхільнікі прытрымліваліся дэмакратычных каштоўнасцяў і адстойвалі дэмакратычны выбар Беларусі. Прынамсі, бліжэйшы супрацоўнік Гадлеўскага, тады яшчэ 28-гадовы Вацлаў Папуцэвіч (Пануцэвіч) усведамляў небяспеку збочвання еўрапейскай цывілізацыі да таталітарызму — дзіцяці XX стагоддзя, спароджанага «паўстаннем плебсу». У віленскім студэнцкім часопісе «25 Sakavika» за 1938 г. (№ 2) ён так ахарактарызаваў прыроду і сутнасць як «чырвонага», так і «чорнага» таталітарызмаў: «Эгаізм чалавека ёсць прычынай панавання над другім, усіх здзекаў і няволі. Гэты эгаізм з адзінкі пераходзіць на групы, класы і народы і хоча існаваць і жывіцца іншымі. У сіле, у звярынасці бачыць справядлівасць, якая яму прыносіць карысць. Вось гэты эгаізм і засланяе вочы людзей, туманіць розум, творачы тэорыі расізму і шавіністычнага нацыяналізму, і барацьбы класаў і народаў».

Але ўсё гэта ў тэорыі, а ў той рэальнай геапалітычнай сітуацыі, у якой апынулася Беларусь, было цяжка зрабіць адзіна правільны выбар і дакладна вызначыцца з прыярытэтамі. Стаўка групы В. Гадлеўскага на краіны восі «Берлін—Рым—Токіо» была іх палітычнай памылкай, але не маральным выбарам. Мала хто ў той час мог прадбачыць, што ў цывілізаванай Еўропе, у эпоху навукова-тэхнічнага прагрэсу магчыма такое нялюдства, што адбывалася падчас Другой сусветнай вайны, калі мараль і сумленне былі абвешчаны хімерай, а ў імя ідэй аб расавай і нацыянальнай выключнасці ды сусветнага панавання нішчыліся мільёны жыццяў і цэлыя народы.

Аналізуючы стан нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг., можна адзначыць: у многіх актывістаў тагачасных маладзёвых дэмакратычных арганізацый мелася ўжо цвёрдае перакананне, што свабода не даецца дарма, што за яе трэба змагацца, пашыраючы нацыянальнае і грамадскае ўсведамленне народа, ствараючы для будучай беларускай дзяржавы трывалы сацыяльны грунт, фарміруючы «крытычную масу», якая не дазволіць павярнуць гісторыю назад і дасць магчымасць беларусам увасобіць у жыццё свае вышэйшыя ідэалы.

Характэрным лозунгам заходнебеларускай моладзі гэтага часу становіцца кліч: «Чаго не здабылі сёння — здабудзем заўтра!». Станіслаў Станкевіч (С. Каліна) у сваім артыкуле «Беларуская моладзь і яе абавязкі», апублікаваным у часопісе «Шлях моладзі» за 1929 г. (№ 3), так сфармуляваў галоўныя задачы беларускага маладзёвага руху ў тых палітычных варунках: «Моладзь — гэта найздаравейшыя расткі грамадзянства, калі толькі гэта моладзь маральна і духоўна здаровая. Дык, каб... апраўдаць сваю задачу перад будучыняй, моладзь перад тым, як выступіць на грамадскую арэну дзейнасці, павінна быць да гэтага адпаведна падрыхтаванай. Моладзь павінна ўсебакова самаўзгадавацца ў чыста народным духу, павінна перадусім до-

бра пазнаць свой народ, яго балячкі і патрэбы, павінна добра пазнаць і ўсвядоміць тую ідэю, да якой народ імкнецца... Падымайце і ўсведамляйце цёмныя масы... Мала лічыць сябе свядамым беларусам ды быць толькі наглядальнікам, трэба самому дзеіць, бо той, хто ў сваёй працы не йдзе наперад, ён ідзе назад». Аўтар падкрэсліваў, што на першым месцы ў працы з моладдзю павінна быць яе нацыянальна-культурнае ўсведамленне, а не палітызацыя. Бо толькі гэты шлях творчага будавання прывядзе беларусаў да «Вольнай, Злучанай і Незалежнай Беларусі», пазбаўляючы іх тых «хістанняў і збачэнняў», «нявыстарчальнай свядомасці і грамадзянскай няспеласці».

Такім чынам, не шлях рэвалюцыі і бунтарства, а паступовае, «крок за крокам» умацаванне пачуцця нацыянальнай годнасці і салідарнасці ў тутэйшай моладзі, масавае прыцягненне яе да грамадскай і культурнай працы па-ранейшаму заставаліся галоўнымі асновамі той праграмы-мінімум, якую вызначылі для сябе актывісты маладзёвага руху ў Заходняй Беларусі.

### Чыннасць вучнёўскіх гурткоў у заходнебеларускіх гімназіях

*Дзейнасць заходнебеларускіх гімназій у міжваеннай Польшчы — яркая старонка ў гісторыі нацыянальнай асветы і вызвольнага руху Беларусі. Гэтыя асяродкі нацыянальнай адукацыі адыгралі выключную ролю ў выхаванні новага пакалення беларускіх адраджэнцаў, якія папаўнялі шэрагі змагароў за палітычную незалежнасць краіны, умацоўвалі беларускую грамадскую супольнасць, развівалі нацыянальную культуру і мастацтва*[12]*. З заходнебеларускіх гімназій выйшла цэлая плеяда выбітных грамадскіх дзеячаў, палітыкаў, таленавітых літаратараў, мастакоў, навукоўцаў і педагогаў.*

*У пачатку 1920-х гг. у Заходняй Беларусі дзейнічала 6 беларускіх сярэдніх школ: у Вільні, Горадні, Нясвіжы, Навагрудку, Радашковічах і мястэчку Гарадок Вілейскага павета. У тагачасных палітычных і эканамічных варунках на 1923 г. дзве гімназіі спынілі сваё існаванне — Гарадзенская і Гарадоцкая, а беларуская сярэдняя школа ў Нясвіжы, не атрымаўшы канцэсіі на далейшае сваё існаванне ў радавым гняздзе Радзівілаў, вымушана была пераехаць у Клецк*[13]*. Паводле сваёй спецыялізацыі з гэтых чатырох беларускамоўных сярэдніх школ Віленская і Радашковіцкая з'яўляліся «класічнымі» (з гуманітарным ухілам), а Навагрудская і Клецкая — «рэальнымі» (з паглыбленым вывучэннем матэматыкі і прыродазнаўчых дысцыплін).*

Да 1928 г. выпускнікі беларускіх гімназій у Польскай Рэспубліцы не мелі права паступаць у польскія вышэйшыя школы з-за таго, што іх атэстаты не прызнаваліся на дзяржаўным узроўні. Гэта прымусіла беларускія палітычныя і грамадскія ўстановы шукаць месца вучобы для беларускіх матурыстаў за межамі Польшчы. У гэтай справе дапамог урад Чэхаславакіі, які выдзяліў беларусам дзясяткі дзяржаўных стыпендый, каб тыя маглі атрымаць адукацыю ў вышэйшых навучальных установах Чэхаславакіі[14]. Каб спыніць выезды ў Чэхаславакію абітурыентаў з Заходняй Беларусі, польскі ўрад яшчэ ў 1927 г. стварыў адмысловую экзаменацыйную камісію на чале з прафесарам Марыянам Масоніўсам для вырашэння гэтага пытання. Камісія дазволіла 10-ці матурыстам Віленскай і Навагрудскай беларускіх гімназій паступаць ва ўніверсітэты Польшчы. У кастрычніку 1928 г. міністр па справах рэлігіі і асветы Польшчы прыраўняў статус Віленскай і Навагрудскай беларускіх гімназій да статусу дзяржаўных сярэдніх навучальных устаноў у тым, што тычылася права на паступленне ў польскія ВНУ. Гэта ў цэлым развязала пытанне і дало права выпускнікам гэтых школ паступаць у польскія вышэйшыя навучальныя ўстановы.

### Вучнёўскія арганізацыі ў Віленскай беларускай гімназіі

Рашэнне аб стварэнні першай беларускай сярэдняй школы ў Вільні, старажытнай сталіцы ВКЛ, прыняла яшчэ ў лютым 1918 г. Беларуская канферэнцыя, скліканая беларускімі нацыянальнымі дзеячамі з акупаванай немцамі часткі Беларусі ў студзені 1918 г. У канцы снежня 1918 г. беларуская дэлегацыя на чале з Іванам Луцкевічам дабілася ад літоўскага міністра асветы Міколаса Біржышкі дазволу на ўтварэнне 8-класнай беларускай сярэдняй школы ў Базыльянскіх мурах, дзе раней існавала епархіяльная праваслаўная духоўная семінарыя. Часовае знаходжанне ў горадзе бальшавікоў не перашкодзіла арганізацыі

навучальнай установы. Сваю працу новая беларуская сярэдняя школа афіцыйна распачала з 1 студзеня 1919 г. Праўда, у першы год яе існавання чыста беларускіх у гімназіі мелася толькі 2 падрыхтоўчыя класы. У астатніх школьных камплектах, дзе пераважалі небеларусы (галоўным чынам габрэі), выкладанне адбывалася па-расійску. Арганізацыйны камітэт навучальнай установы быў змушаны троху адступіць ад сваіх прынцыпаў і пайсці на часовы кампраміс, каб не згубіць спрыяльнага моманту для ўтварэння беларускай сярэдняй школы, а таксама каб захаваць за сабой выдзелены будынак. Было вырашана, што паступова ў старэйшых класах выкладанне будзе пераведзена на беларускую мову, «пакуль не будзе падабраны адпаведны педагагічны персанал, не з'явяцца беларускія падручнікі, не наплыве ў гімназію беларуская вясковая моладзь».

З другой паловы 1920-х гг. гімназія стала ўжо чыста беларускамоўнай. У 1927/28 навучальным годзе кантынгент яе вучняў на 75–80% складаўся з беларусаў. Са 171 навучэнца толькі 61 паходзіў з Вільні, а астатнія прыехалі вучыцца з блізкіх ці далёкіх вёсак Віленшчыны. Для апошніх пры гімназіі дзейнічаў інтэрнат.

У адрозненне ад іншых сярэдніх беларускамоўных навучальных устаноў, што дзейнічалі ў міжваеннай Польшчы, Віленская беларуская гімназія (ВБГ) бесперапынна праіснавала да пачатку Другой сусветнай вайны. Амаль 10 гадоў яна дзейнічала як грамадская няўрадавая ўстанова. Дырэкцыя школы атрымлівала дзяржаўную субсідыю, але яна складала толькі каля 30% ад усіх яе выдаткаў. Астатняя частка пакрывалася за кошт платы за навучанне, ахвяраванняў бацькоўскага камітэта, Цэнтральнай беларускай школьнай рады (пазней Таварыства беларускай школы), Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларускага дабрачыннага таварыства, Віленскай пратэстанцкай місіі метадыстаў, баптысцкіх місіянераў з Паўночнай Амерыкі ды іншых грамадскіх і прыватных фундатараў. Штогод большая палова вучняў з-за беднасці бацькоў або цалкам вызвалялася ад платы за навучанне, або мела ў гэтым пытанні значныя фінансавыя паслабленні.

Пасля 1928 г., у выніку адбыўшыхся антыўрадавых вучнёўскіх выступленняў, польскія ўлады пайшлі на скасаванне дзяржаўнай субсідыі гімназіі. Разам з тым школьная адміністрацыя Вільні стала настойліва дабівацца падпарадкавання свайму кантролю ўсяго навучальнага працэсу ў школе і пазбаўлення яе рэшткаў аўтаноміі. У 1932 г. ВБГ была пераўтворана ў казённую сярэднюю навучальную ўстанову і ў якасці беларускамоўнай філіі далучана да Віленскай польскай урадавай гімназіі імя Юліюша Славацкага. Быў узмоцнены кантроль за зместам навучання і пазашкольнай працай, за наборам новых вучняў у падрыхтоўчыя класы, хоць разам з тым матэрыяльнае становішча школы істотна палепшылася. У 1936 г. беларускамоўныя класы былой ВБГ былі прымусова пераведзены з Базыльянскіх муроў у іншы будынак. Адначасова пачалася ліквідацыя яе старэйшых класаў і перавод выкладання большасці дысцыплін на польскую мову. Наступ «паўзучай паланізацыі» спыніўся толькі з пачаткам Другой сусветнай вайны, калі Вільня на кароткі час перайшла пад юрысдыкцыю ковенскай Літвы. Прыход у горад савецкай улады летам 1940 г. не дазволіў аднавіць чыннасць ВБГ у поўным аб'ёме. Да 1941 г. яна мела статус «сямігодкі» (няпоўнай сярэдняй школы). Падчас нямецкай акупацыі працавала да чэрвеня 1944 г. і была зліквідавана пасля прыходу савецкіх войскаў.

Дадзеная навучальная ўстанова адзначалася высокім узроўнем выкладання, што прызнавалі многія, у тым ліку і польская школьная адміністрацыя. У Базыльянскіх мурах закладаліся асновы новай элітнай нацыянальнай школы, дзе ўсе дысцыпліны выкладаліся па-беларуску. У сценах гімназіі сабраліся лепшыя беларускія інтэлектуальныя сілы — цвет нацыянальнай інтэлегенцыі. Яны імкнуліся перадаць усе свае веды і духоўны досвед падрастаючаму пакаленню. У склад педагагічнай рады ў розны час уваходзілі Міхал Кахановіч (першы дырэктар), Алена Сакалова-Лекант, Францішак Аляхновіч, беларускія немкі Юліяна Мэнке і Наталля Банцлебен, ксёндз Уладзіслаў Талочка, Генадзь Багдановіч, Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Максім Гарэцкі, Леаніла Гарэцкая, Язэп Драздовіч, Міхал Красінскі, Радаслаў Астроўскі, Барыс Кіта (Кіт), Альбін Стаповіч, Рыгор Шырма, Антон Неканда-Трэпка, ксёндз Адам Станкевіч, Аляксандр Данілевіч, Ігнат Дварчанін, айцец Міхаіл Пліс, ксёндз Станіслаў Глякоўскі, Сяргей Паўловіч ды іншыя.

Разам з засваеннем ведаў важнейшай задачай у чыннасці гімназіі было выхаванне вучняў у беларускім духу. Патрыятычны гарт моладзі фармаваўся не толькі падчас заняткаў. Шмат увагі гэтаму аспекту надавалася падчас пазашкольнай працы — на «вольных занятках» па краязнаўстве, харавых спевах, дзякуючы тэатральнай творчасці і спартовым гульням. Праз гэтыя нефармальныя формы самадзейнасці юнакі і дзяўчаты ўцягваліся ў беларускую грамадскую і культурную працу.

Важным чыннікам па ўмацаванні сярод вучняў гімназіі нацыянальнага ўсведамлення і грамадскай еднасці з'яўлялася святкаванне ўсёй гімназічнай карпарацыяй у сценах навучальнай установы ўрачыстасцяў, прысвечаных найважнейшым падзеям у гісторыі Беларусі. Галоўным нацыянальным святам заўсёды лічылася 25 Сакавіка — Дзень Незалежнасці Беларусі. У гонар гэтай падзеі штогод у Базыльянскіх мурах праводзіліся святочныя акадэміі, ладзіліся спектаклі і канцэрты, адбываліся набажэнствы ў Траецкай царкве, Прачысценскім праваслаўным саборы (дзе служыў законавучыцель гімназіі а. Міхаіл Пліс, а рэгентам царкоўнага хору працаваў Рыгор Шырма), а таксама ў каталіцкім касцёле св. Мікалая.

Намаганнямі дырэкцыі ВБГ і ўсяго беларускага грамадства Вільні была ўтворана багатая на выданні вучнёўская бібліятэка (на 1926 г. яе фонд складаў звыш 14 тыс. кніг). Тут меліся выданні не толькі на беларускай, але і на польскай, расійскай, ангельскай, французскай ды іншых мовах. Сярод вучняў нелегальна распаўсюджвалася таксама літаратура з БССР.



*Школьны аркестр з навучэнцаў Віленскай беларускай гімназіі. У нізе крайні злева сядзіць Вітаўт Тумаш (у будучым вядомы дзеяч паваеннай беларускай эміграцыі, скарыназнавец). Другая палова 1920-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

З самага пачатку існавання гімназіі яе вучні прынялі актыўны ўдзел у беларускім маладзёвым руху. У 1919 г. многія гімназісты старэйшых класаў з'яўляліся сябрамі Грамады беларускай моладзі ў Вільні, а ў сакавіку 1921 г. арганізавалі свой уласны гімназічны гурток. Паводле ініцыятывы Адольфа Клімовіча, Мікалая Ільяшэвіча, Наталлі Арсеннева (расійкі паводле нацыянальнай прыналежнасці), Арнольда Дыліса (літоўца), Вінцэнта Жук-Грышкевіча і Уладзіміра Каржа быў склікаты сход навучэнцаў гімназіі, на якім быў ухвалены статут гуртка. Яго першачарговай справай стала выданне ўласнага часопіса, які вырашылі назваць «Маладое жыццё». Каб сабраць патрэбныя грошы на свой выдавецкі праект, маладыя актывісты амаль кожную суботу ладзілі дабрачынныя тэатральныя і музычныя вечарыны. Адначасова пачалася рэдакцыйная праца над першымі нумарамі часопіса. 14 лютага 1921 г. выйшаў першы сшытак «Маладога жыцця». У перадавым артыкуле вызначалася галоўная мэта выдання — «гартаванне маладых беларускіх сіл на змаганне за духоўнае адраджэнне Беларусі і заахвочванне ў свае шэрагі новых байцоў за гэтую ж ідэю». На старонках перыёдыка былі прадстаўлены публікацыі разнастайнай тэматыкі, звязаныя з «усебаковым адраджэннем беларускага народа». Аўтары часопіса імкнуліся абудзіць цікавасць вучнёўскай моладзі да беларусазнаўства, тэатральнай і музычнай творчасці, заняткаў скаўтынгам, фізічнай культурай і спортам. Са старонак выдання гучаў заклік да духоўнага і фізічнага самаўдасканалення школьнікаў. Дыскутаваліся пытанні аб неабходнасці і шляхах кансалідацыі беларускай моладзі Заходняй Беларусі «на шырэйшых падставах», каб стварыць сваю масавую арганізацыю.



*Беларускі вучнёўскі хор Віленскай беларускай гімназіі пад кіраўніцтвам А. Стэповіча. Крайні справа стаіць Хведар Ільяшэвіч, у будучым вядомы беларускі паэт. Другая палова 1920-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

У часопісе друкаваліся вершы тых, хто ўжо паспеў заявіць пра сябе ў літаратуры (Ігнат Дварчанін, Уладзімір Жылка), а таксама дэбютантаў, якія толькі пачыналі свой творчы шлях (Наталля Арсеннева, Мікалай Ільяшэвч, Юльян Сергіевіч). Чытачоў таксама знаёмілі з маладымі аўтарамі з БССР (прынамсі, былі надрукаваныя вершы будучага лідара «ўзвышанцаў» Уладзіміра Дубоўкі). Усяго за 1921–1922 гг. выйшла 7 нумароў часопіса. Раптоўная трагічная смерць А. Дыліса ў верасні 1921 г., а перад гэтым зыход з гімназіі пасля яе заканчэння і ад'езд у Чэхаславакію дзеля працягу вучобы большасці сябраў рэдакцыі сталі галоўнымі прычынамі спынення чыннасці выдання.

Пазней было выдадзена яшчэ многа іншых вучнёўскіх газет і часопісаў пад грыфам ВБГ, якія пабачылі свет ў 1920-я гг. Навучэнцы малодшых класаў гімназіі ў пачатку 1920-х гг. выдалі некалькі нумароў часопіса «Усход», а выхаванцы падрыхтоўчых класаў, у сваю чаргу, выпускалі сваю «Зорку». Апошнія, пасталеўшы, пачалі выдаваць новы часопіс «Рунь», мастацкім рэдактарам якога быў раней узгаданы Раман Семашкевіч. У другой палове 1920-х гг. пабачылі свет іншыя гімназічныя літаратурна-публіцыстычныя перыёдыкі: часопісы «Наперад», «Золак», «Вучнёўскі звон», «Пралескі», «Васілёк»; газеты «Покліч», «Рэха» і «Вучнёўскі голас». На жаль, выходзілі яны нерэгулярна і непрацяглы час, і ніводзін з іх не пакінуў па сябе заўважнага следу ў гісторыі беларускай літаратуры і грамадскай думкі. Вучням мала хто дапамагаў з дарослых педагогаў. Пры аналізе апублікаваных матэрыялаў кідаецца ў вочы недасканаласць і «сырасць» большасці з твораў школьнікаў, адчуваецца брак прафесійнай рэдактуры. Звязвала рукі і польская цэнзура. Заўсёды не хапала грошай на выдавецкія выдаткі і друк.

Для разгортвання планамернай працы і рэалізацыі сваіх мэтаў сябры вучнёўскага гуртка ВБГ падзялілі сваю чыннасць на адмысловыя секцыі: гісторыка-літаратурную, драматычную, музычную, мастацкую, бібліятэчную і эсперанта (апошняя — даніна тагачаснаму захапленню моладзі). Гісторыка-літаратурная секцыя займалася выданнем вучнёўскіх часопісаў і газет, ладзіла публічныя дыспуты (у форме «судоў» і «турніраў»), дзе разглядаліся вострыя пытанні айчыннай і сусветнай гісторыі, абмяркоўваліся паэтычныя і празаічныя творы вядомых творцаў і аўтараў-пачаткоўцаў. Драматычная, музычная і харавая секцыі ставілі спектаклі, канцэрты, ладзілі вучнёўскія вечарыны і творчыя суботнікі. У 1921/22 навучальным годзе былі заснаваны яшчэ прадметныя гурткі па геаграфіі, лаціне, прыродазнаўству, літаратуры і гісторыі. Гімназісты, акрамя таго, арганізавалі свой вучнёўскі кааператыў па вырабу розных пабытовых і канцылярскіх рэчаў, а таксама пераплётную майстэрню. Дзеля аказання падтрымкі бяднейшым гімназістам пры гуртку была створана каса ўзаемадапамогі.

Пачатак тэатральнай дзейнасці ў сценах Віленскай беларускай гімназіі паклала яшчэ ў 1919 г. выкладчыца польскай мовы і літаратуры, а адначасова з гэтым таленавітая драматычная актрыса Ганна Душэўская (род-

ная сястра вядомага дзеяча нацыянальнага руху Клаўдзія Дуж-Душэўскага). Кароткачасовая праца ў гімназіі Ф. Аляхновіча, які таксама быў запрошаны на выкладанне польскай мовы і літаратуры, дала новы імпульс для самаўдасканалення маладых артыстаў. Пад кіраўніцтвам Аляхновіча сябрамі драматычнай секцыі былі зроблены ўдалыя пастаноўкі па п'есах самога драматурга, а таксама Янкі Купалы і Уладзіслава Галубка.

Увогуле, 1921–1923 гг. былі даволі плённымі ў развіцці тэатральнай самадзейнасці ў Базыльянскіх мурах. Сыход з гімназіі ў 1921 г. Францішка Аляхновіча не спыніў працы гімназічнай драматычнай дружыны. Рэжысёрскую эстафету падхапіў Мікалай Красінскі, які, акрамя выкладання, выконваў абавязкі інспектара ВБГ. Гэты чалавек меў вялікую павагу сярод гімназістаў за тую ўвагу і асаблівую тактоўнасць у адносінах да іх. Высокаадукаваны і пры гэтым вельмі рэлігійны чалавек (сябра Віленскага Свята-Духава брацтва і актыўны прыхільнік беларусізацыі Праваслаўнай царквы), М. Красінскі ніколі не выхваляўся без патрэбы ўласнай эрудыцыяй, заўсёды праяўляў павагу да чужой думкі і на публіцы не надта выстаўляў сваёй набожнасці. За час сваёй працы ў гімназіі ён зрабіў, напэўна, больш за ўсіх для развіцця яе школьнага тэатра. Мікалай Красінскі — галоўны ініцыятар стварэння ў Вільні знакамітай Беларускай драматычнай майстроўні (БДМ), дзе большасць акцёраў складалі беларускія гімназісты.

Стваральнікі БДМ, сярод якіх трэба яшчэ назваць Леапольда Родзевіча, Аляксандра Міхалевіча і Зміцера Курыловіча, ставілі перад сабой высокую задачу — на аснове ўтворанай студыі арганізаваць сталы беларускі прафесійны тэатр. У 1922 г., адразу пасля заснавання Майстроўні, яе кіраўніцтва публічна заявіла аб сваіх намерах: «У гістарычны час надмернага змагання за элементарныя правы культурнага бытавання Беларусі, калі слова «беларус» наводзіць небяспеку розных рэпрэсій, трудна нам, грамадзянам гэтага краю, стварыць які-небудзь асяродак, каторы меў бы на мэце дабрабыт і фаховае развіццё нашай Бацькаўшчыны. Толькі грамадскім аб'яднаннем, зразуменнем агульных інтарэсаў, шчырай, непадкупнай любасцю да роднага краю, самаахвярнасцю і працай без адпачынку мы можам і мусім збудзіць да творчага жыцця заімшэлую нашую Вялікую Руіну. Мы, прадстаўнікі беларускага грамадзянства ў Вільні, закладаем Беларускую драматычную майстроўню (студыю), якая ўцвярдзіла гэткія тэзы:

1. Культурнае развіццё кожнага народа і ўзрост яго нацыянальнай свядомасці залежыць ад узросту творчай дзеяльнасці духовых сіл. Выдатную ролю ў гісторыі народаў займае тэатр. Беларускі тэатр за кароткі час існавання даў багатыя вынікі сваёй працы і абяцае спадзеўную будучыню.

2. Перыяд аматарскага трактавання Беларускага тэатра мінуў — даспеў час прыступіць да сапраўды мастацкай творчасці, каб наш Тэатр быў не толькі пaважна агітацыйным чыннікам у сацыяльна-нацыянальным развіцці Беларусі, але і абагачываў душу народную доследамі ў заваяваннях сучаснага тэатра ў абшарах чыстага мастацтва.



*Удзельніца тэатральнага гуртка пры Віленскай беларускай гімназіі Л. Нядзвецкая. Вільня 1921 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Друкуецца ўпершыню.*

3. Дзеля стварэння Беларускага тэатра (п. 2) з дружыны мастакоў у Вільні арганізуецца Беларуская драматычная майстроўня, якая мае на мэце:

а) прыблізіць тэатр да народа, а народ да творчасці;

б) шуканне новых праяў у творчасці тэатра.

в) тэатральная падгатоўка для аматараў.

г) пашырэнне мастацкага тэатра на Беларусі.

д) кіраўніцтва і арганізацыя правінцыйных драматычных гурткоў.

е) выданне сцэнічных твораў».

Дзеля таго, каб трапіць у склад Майстроўні, неабходна было прайсці конкурсны іспыт. Такім чынам, сярод гімназістаў было



*Навучэнцы Віленскай беларускай гімназіі — сябры скаўцкай вучнёўскай дружыны. Другая палова 1920-х гг.*

адабрана 25 самых здольных хлапцоў і дзяўчат, якія склалі аснову БДМ. У сценах студыі пачалі вывучаць тэорыю і гісторыю тэатра, асновы рыторыкі, мімікі, грыму, пластыкі і іншыя мастацкія дысцыпліны. Спектаклі БДМ ставіліся не толькі ў Вільні, але і ў навакольных вёсках і мястэчках. І нязменна з аншлагамі. Галоўным мастаком-афарміцелем і адначасова адным з вядучых акцёраў БДМ была будучая «зорка» савецкага «неарэалізму» 1930-х гг., ужо згаданы Раман Семашкевіч, які адначасова «гуляў на сцэне, рысаваў дэкарацыі, грыміраваў і рабіў шмат іншага».

Рэпертуар калектыву вызначаўся вострай сацыяльнай накіраванасцю, што было не даспадобы польскай уладзе. Ставіліся п'есы «Раскіданае гняздо» і «Адвечная песня» Янкі Купалы, «У зімовы вечар» паводле твора Элізы Ажэшкавай, «Апошняе спатканне» Уладзіслава Галубка, «Страхі жыцця» і «Шчаслівы муж» Францішка Аляхновіча, «Кветка-папараць» Канстанцыі Буйло ды інш. Прыбытак ад тэатральных паказаў, як правіла, ішоў на дабрачынныя мэты: на дапамогу бедным гімназістам, утрыманне інтэрната гімназіі, на карысць дзіцячага прытулку Таварыства помачы пацярпелым ад вайны ў Вільні.

Але для стварэння прафесійнай трупы, для таго, каб мець сталую сцэну і добры рэквізіт, патрабаваліся значныя фінансавыя сродкі, якіх у віленскіх беларусаў не было. У тым жа 1922 г. кіраўніцтва БДМ звярнулася за падтрымкай у Коўна, да Вацлава Ластоўскага, тагачаснага старшыні эміграцыйнага ўрада БНР. На рэарганізацыю Майстроўні ў прафесійны тэатр прасілася 2 млн. 700 тыс. дарэформенных польскіх марак. Такой сумы Рада Народных Міністраў БНР не мела, таму пры ўсім жаданні Ластоўскі дапамагчы Мікалаю Красінскаму і яго калегам не мог. У выніку гэты праект так і застаўся на паперы.

Сёння ўжо не таямніца, што разам з тэатральнымі пастаноўкамі сябры БДМ актыўна ўдзельнічалі і ў падпольнай палітычнай працы. Амаль усе яны з'яўляліся актывістамі Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Пра гэта другое захапленне «чырвонай трупы» неўзабаве даведалася польская паліцыя. Ва ўмовах паліцэйскага праследу і рэпрэсій чыннасць БДМ была згорнута ў пачатку 1923 г.

Мікалай Красінскі быў таксама ініцыятарам стварэння ў 1921 г. пры ВБГ гісторыка-літаратурнага гуртка. Гурток ставіў за мэту пашырэнне сярод беларускіх вучняў паглыбленых ведаў па беларусазнаўству. На факультатыўных занятках вучнёўскай арганізацыі чыталіся лекцыі па беларускай мінуўшчыне, па гісторыі беларускай мовы і літаратуры, вуснай народнай творчасці і дойлідству. У якасці лектараў выступалі як выкладчыкі самой гімназіі (Мікалай Красінскі, Антон Луцкевіч, Генадзь Багдановіч, ксяндзы Адам Станкевіч і Уладзіслаў Талочка), так і запрошаныя лектары (Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Аляксандр Уласаў, Язэп Драздовіч ды інш.). Многім стаў памятным цыкл лекцый Я. Драздовіча ў 1922 г., прысвечаны беларускаму старажытнаму дойлідству. Выступленне мастака было аздоблена яго малюнкамі даўніх беларускіх замчышчаў, бажніц, княскіх і магнацкіх палацаў, традыцыйных хатаў і лямусаў насельнікаў старажытнай Беларусі. Дададмо да гэтага, што нейкі час Я. Драздовіч выкладаў у гімназіі маляванне і нават арганізаваў тут уласную майстэрню, праз якую прайшлі ўжо згаданыя вышэй мастакі Міхась Васілеўскі і Васіль Сідаровіч.

Падчас гэтых лекцый часта адбываліся вострыя дыскусіі, якія



*Вучаніцы 4 класы Віленскай беларускай гімназіі на занятках па ручной працы. 1926 г. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.*

ўзбагачалі навуковы і духоўны досвед гімназістаў. Гуртк оўцы не раз выязджалі ў краязнаўчыя вандроўкі па ваколіцах Вільні, у іншыя гарады Заходняй Беларусі, славутыя сваімі гістарычнымі і культурнымі здабыткамі: Трокі, Наваградак, Нясвіж, Мір, Горадню ды інш.

Няўдача са стварэннем беларускага прафесійнага тэатра ў Вільні, а таксама пераслед з боку польскіх уладаў за ўдзел у чыннасці Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі прымусілі Мікалая Красінскага з'ехаць у Савецкую Беларусь, дзе ён у 1926 г. узначаліў Беларускі дзяржаўны тэатр у Віцебску.

Асобнай тэмы заслугоўвае гісторыя развіцця музычнай і харавой самадзейнасці ў ВБГ. Школьны хор у гімназіі быў арганізаваны яшчэ ў 1920 г. стараннямі настаўніка спеваў, ужо вядомага шырокай публіцы хормайстра Арона Згірскага. Калі апошні з'ехаў у 1921 г. у БССР, яго замяніў Альбін Стаповіч (родны брат беларускага каталіцкага святара і паэта Канстанціна Стаповіча (Казіміра Сваяка)). Той прыклаў шмат сіл для станаўлення самадзейнага харавога калектыву. Але найбольшую славу беларускаму харавому мастацтву ў Заходняй Беларусі прынёс Рыгор Шырма. Гэты чалавек з 1915 г. знаходзіўся ў бежанстве ў Расіі, і толькі ў 1922 г. звярнуўся з Варонежа ў Пружаны, а затым на Віленшчыну, калі тая ўжо адыйшла да Польшчы. Выхаванец Седлецкага настаўніцкага інстытута, у якім, акрамя педагагічнай адукацыі, ён атрымаў добрую сольную і рэгенцкую падрыхтоўку, Р. Шырма з 1926 г. заступіў на пасаду выкладчыка музыкі і спеваў у ВБГ, стаўшы адначасова кіраўніком школьнага хору. Але разам са школьным хорам ён паступова пачаў фармаваць прафесійную харавую капэлу з гімназістаў ВБГ і беларусаў-студэнтаў, што навучаліся ў Віленскім універсітэце. Праз нейкі час аб'яднаны студэнцка-гімназічны хор Шырмы па свайму майстэрству пераўзышоў не толькі падобныя калектывы іншых навучальных установаў (польскіх, літоўскіх, габрэйскіх, расійскіх), але і многія прафесійныя калектывы Вільні. Хормайстар і яго выхаванцы зрабілі вельмі шмат для папулярызацыі беларускай народнай песні ў краі. Меліся ў гімназіі і ўласныя струнны і духавы аркестры, якія ладзілі разам з хорам Шырмы сумесныя канцэрты.

Канцэртныя выступленні, тэатральныя пастаноўкі, мастацка-літаратурныя імпрэзы вучняў ВБГ ахвотна наведвалі школьнікі іншых нацыянальнасцяў горада. Сумесна з літоўцамі, габрэямі, сябрамі польскіх маладзёвых суполак, салідарных з нацыянальнымі памкненнямі беларусаў, навучэнцы Віленскай беларускай гімназіі штораз арганізоўвалі сумесныя інтэрнацыянальныя вечарыны, якія карысталася нязменным поспехам.

Для ўзмацнення патрыятычнага выхавання ў сценах ВБГ рабіліся спробы стварэння свайго нацыянальнага скаўтынгу і розных спартовых каманд. Першая беларуская дружына скаўтаў ВБГ узнікла ў канцы 1922 г. Застрэльшчыкамі тут выступілі Сымон Рак-Міхайлоўскі, Антон Луцкевіч і Аркадзь Смоліч. Камандзірам скаўцкай дружыны стаў вучань выпускнога класа Аляксандр Прохараў. Пад яго загадам было сфармавана 4 узроставыя аддзелы. Але дружына без належнай вонкавай фінансавай падтрымкі, неабходнай для набыцця амуніцыі і пашыву ўніформы, на голым энтузіязме доўга існаваць не магла. Праз нейкі час яна распалася.

Да стварэння дзявочай скаўцкай дружыны спрычыніліся амерыканскія баптысты, якія ўтрымлівалі за свой кошт інтэрнат для незаможных вучаніц ВБГ. Пры іх фінансавай падтрым-




*Вокладка часопісу «Маладое жыццё». 1923 г.*

цы ў 1926 г. узнікла суполка «Сёстры вогнішча», у якой беларускія дзяўчаты выхоўваліся ў пратэстанцкім духу, дзе шмат увагі надавалася не толькі асновам хрысціянства, але і фізічнаму выхаванню. Пры гэтым амерыканскія місіянеры былі не супраць нацыянальнага характару дружыны, які праяўляўся ў тым, што сярод «сясцёр» ужывалася беларуская мова, спяваліся песні і ўся камунікацыя адбывалася на роднай мове. Суполка праіснавала да 1929 г. Пачатак сусветнага эканамічнага крызісу змусіў Віленскую місію амерыканскіх баптыстаў згарнуць многія свае праекты, у тым ліку і беларускі дзявочы скаўтынг.

У міжваеннай Вільні знайшоўся яшчэ адзін энтузіяст, які праз скаўцкую рамантыку імкнуўся ўзняць у беларускай вучнёўскай моладзі пачуццё нацыянальнай годнасці і патрыятызму. Гэта быў Уладзіслаў Казлоўскі, адстаўны паручнік польскага войска, больш вядомы ў беларускім грамадскім асяродку як паэт і рэдактар-выдавец. У 1928 г. на адной з пустак віленскай Кальварыі ён згуртаваў вакол сябе хлапцоў і дзяўчат — вучняў ВБГ — з мэтай стварыць звяз «лясных выведнікаў». У. Казлоўскі сам напісаў для гуртка статут і гімн, дапамагаў юнакам прыдумаць для арганізацыі арыгінальную сімволіку і ўніформу, а таксама правілы субардынацыі паміж яе сябрамі — адмысловыя звароты і каманды па-беларуску. Гурток атрымаў назоў «Гайсак». Гэта была спроба знайсці беларускі заменнік ангельскаму слову scout, якое «для беларускага слуху было чужым, пустым гукам, і таму скаўцкі рух з’яўляецца незразумелым для народу». Гайсак — вытворны назоў ад слова гойсаць, што значыць бегаць, гуляць, спаборнічаць. У рамках новай арганізацыі была сфармавана футбольная каманда пад той самай назвай. Гайсакі пачалі спаборнічаць з іншымі вучнёўскімі камандамі Вільні на гарадскіх футбольных пляцоўках.

Заяўка на зацвярджэнне «Гайсака» была пададзена У. Казлоўскім у Варшаву, у Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, у 1929 г. Але польскія чыноўнікі палічылі немэтазгоднай чыннасць беларускай маладзёвай арганізацыі, якая ставіла за мэту выхаванне падрастаючага пакалення ў беларускім народным духу, і адмовілі ёй у рэгістрацыі. Ад усяго праекту ў выніку захавалася толькі футбольная дружына, якая пэўны час удзельнічала ў гарадскіх спаборніцтвах.

У 1935 г. была зроблена яшчэ адна спроба арганізаваць беларускі скаўтынг. На гэты раз ініцыятыву праявілі вучні 7-га класа ВБГ. Са свайго складу яны вылучылі дэлегацыю на чале з братамі Паўлямі, якая распачала перамовы з Віленскай харугвай польскага харцэрства на прадмет стварэння ў складзе апошняй беларускай скаўцкай філіі на правах аўтаноміі. Польскія харцэры былі схільныя падтрымаць беларусаў пры ўмове, што тыя прызнаюць статут і галоўныя прынцыпы іх харугвы.

Ініцыятары арганізацыі беларускага скаўтынгу распачалі працу над узорамі сваёй уніформы і сімволікі, пачалі выдаваць уласную газету «Беларускі скаўт». Жадаючых уступіць у дружыну, якую назвалі ў гонар Францішка Багушэвіча, набралася на тры аддзелы. Маюцца звесткі, што багушэўцы ў верасні 1935 г. прынялі ўдзел ва Усеславянскім скаўцкім злёце ў горадзе Спале, які праходзіў пад знакам 25-х угодкаў утварэння польскага харцэрства. Апошнія звесткі пра чыннасць беларускіх скаўтаў у Вільні датаваныя 1937 г. На жаль, пра далейшы лёс гэтай скаўцкай «кампаніі» на сёння інфармацыя адсутнічае.

У сярэдзіне 1930-х гг. у прэсе з’явілася інфармацыя пра намеры ўтварыць масавую беларускую скаўцкую асацыяцыю, якая павінна была ахапіць сваёй чыннасцю большасць моладзі Заходняй Беларусі. Але гэты заклік чарговы раз аказаўся летуценным, бо, зноў жа, не быў падмацаваны сур’ёзнымі фінансавымі і арганізацыйнымі рэсурсамі. Рэалізацыі падобнага праекту не спрыяла і тагачасная ўнутрыпалітычная сітуацыя ў краіне.

Плённай і выніковай працы самадзейных вучнёўскіх гурткоў у сценах Віленскай беларускай гімназіі перашкаджала моцная

палітызацыя школьнікаў, якую правакавала польская ўлада праз палітычны ціск і рэпрэсіі, імкнучыся задушыць беларускі маладзёвы рух. Але прычына былі не толькі ў гэтым. У вялікую палітыку школьнікаў безадказна ўцягвалі актывісты заходнебеларускіх партый, у першую чаргу звязаныя з камуністычным падполлем. Былі такія і сярод выкладчыкаў Віленскай беларускай гімназіі.

Асабліва вызначыўся тут Радаслаў Астроўскі, які дырэктарстваваў у ВБГ з 1924 г. па 1936 г. Не без яго маўклівай згоды гімназісты старэйшых класаў актыўна ўцягваліся ў антыпольскую палітычную дзейнасць, а ў сценах гімназіі спакойна распаўсюджваліся ўлёткі і іншая агітацыйная літаратура КПЗБ і БСРГ. У сярэдзіне 1920-х гг. у гімназіі стала дзейнічала камсамольская ячэйка, у склад якой у розны час уваходзілі Валянцін Таўлай, Язэп Урбановіч, Міхась Васілёк, Якуб Міско, Іван Тарасюк, Алесь Салагуб, Пятро Радзюк, Юльян Саковіч ды іншыя. Камсамольцы актыўна выкарыстоўвалі легальныя вучнёўскія гурткі гімназіі для пашырэння камуністычнай і прасавецкай агітацыі сярод сваіх аднакласнікаў. Былі выпадкі, калі старшакласнікаў-камсамольцаў выкарыстоўвалі ў якасці нелегальных кур'ераў для перапраўкі праз польска-савецкі кардон забароненай польскай цэнзурай літаратуры і таемнай карэспандэнцыі. Бальшавіцкія эмісары мелі на мэце пераўтварыць ВБГ у свой ідэалагічны плацдарм. Імі ставілася канкрэтная задача паступова размыць нацыянальна-асветніцкі кірунак у чыннасці гімназіі, падмяніўшы яго пралетарскім інтэрнацыяналізмам.

Разгром Грамады ў 1927–1928 гг., часовае затрыманне Р. Астроўскага і А. Луцкевіча вызначылі паварот пазіцыі дырэкцыі і большасці педагогаў гімназіі ў дачыненні да кампартыі і камсамолу на 180 градусаў. Ад талеравання камуністычнай працы ў сценах ВБГ яны перайшлі да яе выкаранення, а дырэктар Радаслаў Астроўскі з «хроснага бацькі» камсамольскай гімназічнай суполкі стаў яе «тэрмінатарам». Пачалося выкрыццё актывістаў камуністычнага падполля ў сценах навучальнай установы.

Функцыянеры КПЗБ, зразумеўшы, што гімназія перастае быць іх «аперацыйнай базай», праз сваіх агентаў далі заданне справакаваць у школе масавыя хваляванні, каб даць польскай уладзе падставу для яе ліквідацыі. Зручнага выпадку доўга чакаць не прыйшлося. 18 снежня 1928 г. паводле загаду віленскага школьнага куратара за ўдзел у нелегальным з'ездзе ТБШ у Вільні з гімназіі было выключана 18 вучняў старэйшых класаў. Камсамольцы, якія засталіся ў ВБГ, з падказкі «старэйшых таварышаў» пастанавілі на знак пратэсту распачаць вучнёўскі страйк. 27 снежня 1928 г. была інспіравана стыхійная дэманстрацыя школьнікаў (пераважна малодшых класаў), якія падверглі абструкцыі за «згодніцтва з польскай уладай» Р. Астроўскага. У адказ дырэкцыя выклікала ў школу паліцыю, пасля чаго многія завадатары акцыі былі затрыманыя, а пазней выключаныя са школы. Але на гэтым пратэстныя акцыі не спыніліся. Чарговы вучнёўскі мітынг адбыўся ў Базыльянскіх мурах роўна праз 2 месяцы — 27 лютага 1929 г. Вынікам усіх гэтых выступленняў стала вы-




*Выкладчыкі і матурысты Віленскай беларускай гімназіі за 1935/36 навучальны год. Віньетка.*



*Урачысты вечар з нагоды 10-х угодкаў заснавання Віленскай беларускай гімназіі. Вільня, студзень 1931 г. Друкуецца ўпершыю*

ключэнне са школы звыш 60 гімназістаў.

З рашучым пратэстам на адрас камуністычных лідараў, якія ў імя сваіх палітычных мэтаў падстаўлялі пад рэпрэсіі зусім яшчэ недасведчаных юнакоў, выступіў Беларускі студэнцкі саюз пры Віленскім універсітэце Стэфана Баторыя. У яго рэзалюцыі адзначалася: «Уцягванне школьнай моладзі (асабліва малодшых класаў), якая не можа адказваць за свае ўчынкі, якіх не разумее, а за якія аднак панясла і нясе прыкрыя кансэквенцыі — прыносіць ганьбу тым, хто сведама да такіх выступленняў яе пхае... Беларускае студэнцтва стаіць на тым становішчы, што палітычная барацьба сярод старэйшага грамадзянства не можа ніколі ў сваіх скутках даводзіць да руіны ўсё тое, што з такім высілкам усяго грамадзянства ўдалося збудаваць і да гэтай пары ўтрымаць, Асабліва маем на думцы культурна-асветныя ўстановы... Замест таго, каб крок за крокам будаваць ці ўтрымліваць збудаванае, бурыцца нават тое, што і так не стаіць на трывалых фундаментах. Калі, нарэшце, наступіць апамятанне?».

Хваляванні ў сценах ВБГ працягваліся яшчэ некаторы час. 7 снежня 1929 г., паводле загаду польскай школьнай адміністрацыі, з гімназіі былі выключаны яшчэ 6 старшакласнікаў за ўдзел у палітычным мітынгу, арганізаваным падчас пахавання грамадоўца Ю. Юхны. Гэта быў адзін з апошніх палітычных эксцэсаў у Базыльянскіх мурах, калі вучняў выганялі са школы за іх палітычныя погляды. Пратэстныя акцыі ў гімназіі спыніліся.

У выніку зачысткі камсамольскага актыву і яго прыхільнікаў у ВБГ рэвалюцыйны парыў сярод радыкальна настроенай часткі гімназістаў змяніўся на адчай і дэпрэсію. Гэта негатыўна адбілася на ўсім навучальным працэсе ў школе: пагоршылася дысцыпліна, знізілася агульная паспяховасць, у некаторых вучняў прапалі матывацыя і жаданне далей працягваць вучобу ў беларускай гімназіі.

Гэта быў адзін з самых складаных перыядаў у гісторыі ВБГ. Рэпрэсіі моцна ўдарылі па вучэбнай і пазашкольнай працы, па ўсёй культурніцкай самадзейнасці гімназістаў. З канца 1928 г. праца вучнёўскіх гурткоў часова прыпынілася, перасталі выдавацца часопісы і газеты, фактычна распаўся вучнёўскі кааператыў.

Але разам з гэтым спаў і камуністычны чад у настроях навучэнцаў. Гімназію ўдалося захаваць. Педагагічнай карпарацыі, бацькоўскаму камітэту прыйшлося прыкласці шмат намаганняў, каб аднавіць нармальную атмасферу ў школе і адарваць дзяцей ад дэструктыўнага ўплыву пракамуністычных сілаў. Духоўнае апякунства над вучнямі бяруць на сябе каталіцкія святары Адам Станкевіч і Станіслаў Глякоўскі. Пасільную матэрыяльную дапамогу школе аказваюць Беларускае дабрачыннае таварыства, Віленскі Беларускі нацыянальны камітэт, БІГіК ды іншыя арганізацыі. Беларуская дэмакратычная супольнасць Вільні імкнулася сарыентаваць моладзь не на палітыку, а на культурнае і духоўнае самаўдасканаленне.

Вясной — восенню 1929 г. Рыгор Шырма з дапамогай сяброў Беларускага студэнцкага саюза аднаўляе чыннасць спеўна-драматычнага гуртка гімназіі. Апошні ў сакавіку гэтага ж года з дапамогай віленскай суполкі БІГіК зладзіў некалькі суботнікаў-спектакляў у Вільні і шэрагу вёсак Віленска-Троцкага павета. У 1930-я гг. пад рэгентствам Р. Шырмы сумесны хор віленскіх гімназістаў і студэнтаў Універсітэта Стэфана Баторыя па-

спяхова канцэртуе ў Вільні і іншых населеных пунктах краю.

Вучнёўская самадзейная чыннасць у сценах Віленскай беларускай гімназіі перажывала розныя перыяды. Былі сапраўдныя ўздымы і сур'ёзныя дасягненні ў справе выхавання будучых грамадскіх і палітычных лідараў Беларусі, а былі і правалы, калі з-за негатыўных палітычных працэсаў уся творчая, стваральная праца гімназістаў на пэўны час замірала. Але, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, на палітычны ціск і пераслед польскіх уладаў, гэтая праца заўсёды аднаўлялася. Вера ў сваё прызначэнне, у свае сілы зноў уздымала патрыятычны гарт сярод вучняў.

Беларуская гімназія ў Вільні ўзгадавала цэлую кагорту беларускіх патрыётаў, чынных актывістаў нацыянальна-вызвольнага руху, таленавітых літаратараў, навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў. Аналіз больш як дваццацігадовай чыннасці школы дазваляе сцвярджаць, што гэта быў самы ўдалы праект па ўзгадаванні нацыянальнай эліты беларусаў у XX ст. Віленская беларуская гімназія стала *alma mater* для выбітнай беларускай паэтэсы Наталлі Арсенневай, вядомых літаратараў Яўгена Бартуля, Сяргея Сарокі і Хведара Ільяшэвіча, будучага дырэктара Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку, знанага скарыназнаўцы Вітаўта Тумаша, гісторыка Мікалая Ільяшэвіча, будучага Прэзідэнта Рады БНР Вінцэнта Жук-Грышкевіча[15], Віцэ-Прэзідэнта БНР Лявона Рыдлеўскага, знаных палітычных і грамадскіх дзеячаў Адольфа Клімовіча, Язэпа Найдзюка, Янкі Шутовіча, Мар'яна Пецюкевіча, Зоі Каўшанкі, Янкі Багдановіча, Леаніда Галяка ды яшчэ некалькіх дзясяткаў вядомых і малавядомых беларускіх адраджэнцаў.

### Школьнае жыццё ў сценах Навaградскай, Радашковіцкай і Нясвіжска-Клецкай беларускіх гімназій

Гісторыя Навaградскай беларускай гімназіі пачынаецца з 1918 г.[16], калі з дазволу нямецкай акупацыйнай адміністрацыі ў Навaградку замест былой расійска-габрэйскай жаночай прыватнай гімназіі Гамбурга, эвакуяванай у 1915 г. у горад Вяліж Віцебскай губерні, была ўтворана новая сярэдняя школа з 2-х падрыхтоўчых і 2-х пачатковых класаў з расійскай мовай выкладання. У 1919 г., падчас польска-савецкай вайны, школа была рэарганізавана ў гімназію і ўжо складалася з 7 класаў. Першы выпуск з яе адбыўся ў 1920 г., а з 1923/24 навучальнага года яна стала паўнавартаснай 8-класнай сярэдняй навучальнай установай.

Па ініцыятыве педагагічнай рады і бацькоўскага камітэта ў 1921/22 навучальным годзе пачалася рэформа школы, звязаная ў першую чаргу з яе беларусізацыяй. У гэтай справе быў выкарыстаны досвед Віленскай беларускай гімназіі. З восені 1921 г., акрамя падрыхтоўчых класаў, выкладанне прадметаў па-беларуску пачалося ў 1-ым пачатковым класе. Кожны наступны навучальны год колькасць беларускамоўных класаў у гімназіі павялічвалася на адну адзінку, а колькасць расійскамоўных адпаведна змяншалася[17]. Поўная «нацыяналізацыя» школы была завершана ў 1927/28 навучальным годзе. Да гэтага часу, паводле патрабавання польскага школьнага куратара, у школе меласяа два загадчыкі. Беларускамоўнымі камплектамі загадваў ураджэнец Рэчыцкага павета Ян Цеханоўскі, які перад Першай сусветнай вайной скончыў Менскую праваслаўную духоўную семінарыю і Пецярбургскі політэхнічны інстытут (выкладаў беларускую мову і літаратуру, лаціну, гісторыю



*У Савецкай Беларусі… Навучэнцы-рэпатрыянты Віленскай беларускай гімназіі пасля прыбыцця ў Мінск. 1929 г.*

Беларусі і прыродазнаўства). За расійскамоўныя класы адказваў Пятро Скрабец, выпускнік Віленскага настаўніцкага інстытута і Кіеўскага камерцыйнага інстытута (вёў матэматыку, фізіку, расійскую мову і літаратуру).

Апрача ўзгаданых асоб у розны час у складзе педагагічнай карпарацыі гімназіі працавалі Аляксандр Данілевіч (матэматыка, фізіка і хімія — па-беларуску), Зося Баранкевіч (польская мова і літаратура, геаграфія Польшчы), Гіта Гецава (нямецкая мова), Ніна Трусевіч (французская мова), Леў Львоў (прыродазнаўства), Аляксандр Шумскі (матэматыка, усеагульная геаграфія па-беларуску), кампазітар Антон Валынчык (спевы і харавое рэгенцтва), айцец Васіль Бабкоўскі (Закон Божы для праваслаўных вернікаў), а таксама Жазэфіна Запольская, Вольга Русак, Наталля Орса, Яўген Мілаў, Пётра Якімовіч, Міхал Чатырка. У 1927–1930 гг. у НБГ маляванне выкладаў мастак Язэп Драздовіч, а ў 1930–1934 гг., пасля заканчэння Карлава ўніверсітэта ў Празе, у гімназію прыйшлі працаваць былыя яе выпускнікі — доктар Аляксандр Орса (прыродазнаўства) і інжынер Вячаслаў Лаўскі (матэматыка). Акрамя ўзгаданых асоб, універсітэцкую адукацыю мелі Гецава (Бернскі ўніверсітэт), Л. Львоў (Варшаўская політэхніка), З. Барановіч (Петраградскі ўніверсітэт), Н. Трусевіч (Харкаўскі ўніверсітэт).

Высокі адукацыйны цэнз выкладчыкаў НБГ адзначаецца ва ўспамінах былых навучэнцаў школы. Выпускнікі Навагрудскай беларускай гімназіі, доўгі час пазбаўленыя права паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Польшчы, паспяхова вучыліся ва ўніверсітэтах і педагагічных ды тэхнічных інстытутах Чэхаславакіі, Нямеччыны, ЗША і Канады.

Вучэбная праграма гімназіі складалася з 23-х навучальных дысцыплін. Ухіл рабіўся на вывучэнне прыродазнаўчых прадметаў. У навучальным працэсе ставілася задача, каб выпускнікі школы былі падрыхтаваныя да практычнай дзейнасці, звязанай з сельскай гаспадаркай і прамысловай вытворчасцю. Але, разам з гэтым, разумелася важнасць вывучэння дысцыплін гуманітарнага цыклу, асабліва гісторыі Беларусі, роднай мовы і літаратуры ды іншых прадметаў беларусазнаўства. Не зважаючы на абраную прафесію і месца працы, большасць выпускнікоў школы, дзякуючы атрыманай «патрыятычнай прышчэпцы», не забываліся, што яны беларусы, імкнуліся спрыяць гаспадарчаму і нацыянальна-культурнаму развіццю Беларусі.

Увесь час сваёй чыннасці гімназія мела вялікія праблемы з фінансаваннем. Школа доўгі час месцілася разам з пачатковай габрэйскай вучэльняй у доме на Вялікім рынку, 37. Габрэі вучыліся раніцай, а беларусы — пасля абеду. Класныя пакоі не былі прыстасаваныя для паўнавартаснага навучання. Першыя гады гімназія не мела ўласнай хімічнай лабараторыі і фізічнага кабінета. Толькі дзякуючы ахвяраванням заможных габрэяў —бацькоў навучэнцаў НБГ, у 1923 г. удалося набыць неабходнае абсталяванне, прылады і рэчывы для паўнавартаснага правядзення заняткаў па хіміі, фізіцы і прыродазнаўству.

Шмат высілкаў па матэрыяльнай і фінансавай падтрымцы школы прыкладаў яе бацькоўскі камітэт, які ўзначальваў законавучыцель айцец В. Бабкоўскі. Была надзея, што ўтворанае ў канцы 1922 г. у Наваградку Таварыства беларускай пачатковай і сярэдняй школы фінансава падтрымае гімназію. Але дадзеная інстытуцыя нічым школе не дапамагла і ў хуткім часе распалася.

Польская школьная адміністрацыя імкнулася адміністрацыйнымі і эканамічнымі сродкамі знішчыць беларускую сярэднюю школу ў Наваградку. Штогод кіраўніцтву НБГ з вялікай цяжкасцю ўдавалася атрымліваць канцэсію (ліцэнзію) на далейшае існаванне навучальнай установы. Яе выпускнікі да 1928 г. не мелі права паступаць ва ўніверсітэты і вышэйшыя інстытуты Польшчы. Больш таго, у 1923 г. беластоцкі школьны куратар, якому падпарадкоўвалася НБГ, самавольна пазбавіў яе статусу прыватнай гімназіі і прыраўняў да прамыслова-камерцыйных курсаў. Гэта паставіла школу на мяжу выжывання: па-першае, вучэльня пазбаўлялася права на атрыманне хоць нейкай дзяржаўнай субсідыі, а па-другое, паводле польскіх законаў, як «камерцыйная, прадпрымальніцкая інстытуцыя», гімназія павінна была плаціць у дзяржаўны бюджэт значна большы падатак, чым пры ранейшым статусе. Калі ў 1922 г. гэты падатак складаў 12 тыс. злотых, то ў 1923 г. — ужо 30 тыс. злотых.

Дырэктар школы Я. Цеханоўскі ў сваёй справаздачы кіраўніцтву ТБШ за травень 1923 г. пісаў: «У фінансавым сэнсе гімназія, мож-

на сказаць, ніколі не выходзіць з крызісу. Нягледзячы на вельмі нізкую аплату працы вучыцялёў, нягледзячы на самую строгую эканомію, гімназія не можа ніяк звесці канцы з канцамі. Асабліва цяжка для гімназіі ўтрыманне чыста беларускіх класаў, вельмі малалюдных, ад чаго збор аплаты за навуку ніякім чынам не дазваляў бы іх утрымліваць. Утрыманне іх адбывалася за кошт рускіх класаў, у якіх вучняў было болей і аплата — вышэй. Адзіная крыніца папаўнення дэфіцыту — гэта здароўе і празмерная праца вучыцялёў, змушаных працаваць праз сілу… у 2 змены».

Да таго ж, у адрозненне ад вучняў польскіх гімназій, якія пры дасягненні 18-гадовага ўзросту мелі права на адтэрміноўку ад службы ў войску падчас вучобы, старшакласнікі НБГ такога права не мелі, бо беларуская гімназія тады не была прыроўнена да дзяржаўнай навучальнай установы.

20 лютага 1923 г. педагагічная рада НБГ звярнулася ў Беларускі пасольскі клуб польскага сейма з мемарандумам, у якім імкнулася дамагчыся:

- прыраўнення НБГ да статусу дзяржаўнай навучальнай установы, каб яе выпускнікі маглі бесперашкодна паступаць у вышэйшыя школы Польшчы;
- прадстаўлення вучням гімназіі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, права на адтэрміноўку ад службы ў войску да заканчэння навучання;
- выдзялення для беларускіх выпускнікоў НБГ 15 стыпендый на вучобу ў вышэйшых школах Чэхаславакіі;
- прыняцця ўтрымання беларускамоўных класаў гімназіі за кошт дзяржаўнага каштарысу;
- скасавання практыкі здабыцця штогодняй канцэсіі, што магло ў любы момант спыніць дзейнасць школы.



*Дырэктар Нясвіжскай беларускай гімназіі Язэп Шнаркевіч з гімназістамі, удзельнікамі мастацкай самадзейнасці. Фота 1922 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

Дзякуючы стараннямбеларускіх паслоў і грамадскасці матэрыяльнае становішча НБГ трохі палепшылася. У 1923 г. праз ТБШ гімназія атрымала для сваіх выпускнікоў каля 10 стыпендый для вучобы ў Карлавым універсітэце ды іншых вышэйшых навучальных установах Чэхаславакіі. У Прагу паехалі вучыцца Вячаслаў Лаўскі, Мікалай Гарошка, браты Аляксандр і Пётра Орсы, тры браты Сакі, Ігнат Сланеўскі, Мікола Абрамчык, Хведар Клаўсуць і іншыя выпускнікі НБГ.

Пэўную падтрымку НБГ аказваў наваградскі ваявода Зыгмунт Бячковіч. Як згадваў пазней Барыс Кіта (Кіт), гэты чыноўнік быў адным з нямногіх прадстаўнікоў мясцовай польскай адміністрацыі, хто імкнуўся спрыяць культурна-асветнай працы беларусаў, каб тым самым вырваць іх з-пад камуністычнага ўплыву. Менавіта ён дапамог атрымаць школе статус, роўны з польскімі ўрадавымі гімназіямі, што дало права выпускнікам НБГ паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Польшчы.

Нягледзячы на цяжкія матэрыяльныя і пабытовыя варункі, школьнае жыццё ў сценах Наваградскай беларускай гімназіі было багатым на культурныя падзеі. У школе паспяхова дзейнічалі гурткі па беларусазнаўству, прыродазнаўству, сусветнай літаратуры. Для паглыблення ведаў па беларускай мове вучні складалі «Слоўнік да твораў Ядвігіна Ш.», а таксама збіралі беларускі фальклор. Старшакласнікі займаліся ўкладаннем беларускай навуковай тэрміналогіі мясцовай флоры і фаўны, а літаратурны вучнёўскі гурток выдаваў рукапісны часопіс «Жаўранак». Гімназічны хор і аркестр пад кіраўніцтвам выкладчыка і кампазітара Антона Валынчыка меў сваю аўдыторыю



*Навучэнцы Клецкай беларускай гімназіі. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

не толькі ў сценах гімназіі, але і сярод шырокай гарадской публікі. У штогадовай справаздачы дырэкцыі гімназіі за 1924 г. адзначалася: «Для эстэтычнага развіцця навучэнцаў рабіліся тэатр і ігрышчы, на якіх гуляліся беларускія п'есы і пяюцца беларускія песні. У болей вольны ад заняткаў час рыхтуюцца вучнёўскія вечарыны... На гэтых вечарынах вучні і вучаніцы прызвычайваюцца да грамадскасці». Пры гімназіі дзейнічалі розныя спартовыя секцыі: летам — па лёгкай атлетыцы, футболе, боксе, а зімой — лыжная.

Пасля 1928 г. фінансавы стан гімназіі значна пагоршыўся. З дзяржаўнай скарбніцы выплачвалася пенсія толькі чатыром з 20-ці выкладчыкаў. Гэтыя чатыры пенсіі дзяліліся паміж усімі сябрамі педагагічнай карпарацыі. Прыток грошай на карысць НБГ ад беларускіх грамадскіх установаў і прыватных фундатараў у гэты час фактычна спыніўся. З кожным наступным годам колькасць навучэнцаў у НБГ змяншалася. Чэрвень 1934 г. стаўся апошнім месяцам яе існавання. Таму, хто не паспеў атрымаць матуры ў НБГ, польская школьная адміністрацыя прапанавала перайсці ў мясцовую польскую гімназію імя Адама Міцкевіча. Аднак абсалютная большасць беларускіх вучняў (каля 80%) вырашыла паехаць у Вільню, каб прадоўжыць навучанне ў тамтэйшай беларускай гімназіі.

Так завяршылася гісторыя 16-гадовай чыннасці беларускай сярэдняй школы ў Наваградку. Беларускаму грамадству гэта гімназія дала вядомага матэматыка Барыса Кіта, фізіка Леаніда Барысаглебскага, паэтэсу Ніну Тарас, педагога Барыса Сладоўскага, будучых прэзідэнтаў БНР у эміграцыі Мікалая Абрамчыка і Язэпа Сажыча, віцэстаршыню Рады БНР у эміграцыі Барыса Рагулю, яшчэ аднаго знанага дзеяча беларускай пасляваеннай эміграцыі Уладзіміра Набагеза. Наваградскую беларускую гімназію скончыў выбітны беларускі рэлігійны дзеяч, будучы рэктар беларускіх каталіцкіх місій у Парыжы і Лондане, дзейны сябра Згуртавання беларусаў Вялікай Брытаніі архімандрыт Леў Гарошка. Сярод яе выпускнікоў былі старшыня Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый у эміграцыі і Заходняй Беларусі В. Лаўскі, ветэран беларускага вызвольнага руху Уладзімір Сіўко. У гэтым пераліку слаўных імён не забудземся і пра летапісца НБГ, пісьменніка, педагога і журналіста Аляксея Анішчыка (Андрэя Чэмера).

Ініцыятарам стварэння ў 1922 г. і сталым апекуном Радашковіцкай беларускай гімназіі, якая была названа ў гонар Францішка Скарыны, з'яўляўся Аляксандр Уласаў. Спачатку школа месцілася ў будынку былой габрэйскай пачатковай школы, а праз нейкі час перабралася ў больш прыстасаваны для заняткаў будынак у цэнтры горада, на рагу Менскай вуліцы і Касцельнага пляцу. Для ўласных патрэб і для практычных заняткаў школьнікі карысталіся вялікім садам; мелася таксама спартовая пляцоўка на адкрытым паветры.

Гімназія была гуманітарнага тыпу з васьмігадовым курсам навучання. У старэйшыя класы маглі адразу паступаць тыя, хто закончыў пачатковыя школы павышанага тыпу і гарадскія вучэльні, або меў 4 класы гімназічнай адукацыі.

Плата за навучанне была памяркоўнай, што прываблівала паступаць у школу сялянскіх дзяцей з-пад Ракава, Вілейкі, Мядзела, Смаргоні, Маладзечна, Валожына. Як і ў выпадку з Віленскай і Наваградскай беларускімі гімназіямі, у першыя гады ў РБГ вучылася такса-

ма шмат габрэяў. Першы выпуск гімназіі (11 чалавек) адбыўся ў 1924 г. За 7 гадоў існавання школы ў ёй навучалася каля 800 чалавек, з якіх толькі 86 беларусаў атрымалі атэстаты.

У першы склад педагагічнай карпарацыі ўваходзіў Аляксандр Вернікоўскі (дырэктар), Язэп Гаўрылік (выкладчык беларускай мовы і літаратуры, геаграфіі і спеваў), Фелікс Стацкевіч (лацінская мова), Сымон Кароль (беларуская мова і літаратура), Антон Крачкоўскі (матэматыка), Мікалай Ласковіч (фізіка), Валянціна Чаенкава (гісторыя і французская мова), Валянцін Чаенкаў (логіка і псіхалогія), Браніслаў Тэраевіч (польская мова), Лідзія Ліманоўская (нямецкая мова). Доўгі час адміністратарам гімназіі з'яўляўся раней вядомы беларускі палітычны дзеяч, колішні міністр урада БНР Тодар Вернікоўскі. Некалькі гадоў маляванне ў школе вёў «вечны вандроўнік» Язэп Драздовіч.

Вучні жылі насычаным культурным і грамадскім жыццём. Пры школе намаганнямі Язэпа Гаўрыліка быў створаны вучнёўскі хор і драматычны гурток. Пад яго кіраўніцтвам развучваліся і ставіліся п'есы Францішка Аляхновіча, Янкі Купалы, Уладзіслава Галубка ды іншых аўтараў. Хор і самадзейная драматычная дружына рэгулярна праводзілі беларускія вечарыны, арганізоўвалі пастаноўкі і канцэрты ў дні адзначэння беларускіх нацыянальных святаў і юбілейных дат, прысвечаных выбітным дзеячам беларускай гісторыі і культуры. Найлепшымі акцёрамі сярод вучняў былі Ганна Куніцкая і Фелікс Вольскі.



*Навучэнцы Клецкай беларускай гімназі падчас гімнастычных практыкаванняў. 1920-я гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

Праўда, трэба адзначыць, што педагог Я. Гаўрылік, які быў любімцам гімназістаў, сеяў сярод іх не толькі зерне асветы і запаветы хрысціянства (з другой паловы 1920-х гг. ён перайшоў у баптызм. Вера ў Бога не перашкаджала яму шчыраваць на грунце камуністычнай ідэалогіі. У 1928 г. ён будзе выбраны паслом у польскі сейм і ўзначаліць там Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб «Змаганне». Польскія ўлады пазбавяць яго пасольскага імунітэту і ў 1931 г асудзяць да 9,5 гадоў турмы. У 1932 г. Гаўрылік будзе абменены на палітычных вязняў-палякаў і дэпартаваны ў СССР. У 1934 г. савецкія карныя органы асудзяць яго, як «ворага народа», па справе «Беларускага нацыянальнага цэнтру» на 10 гадоў высылкі, а ў 1937 г. паводле прысуду «тройкі» НКВД ён будзе расстраляны.

Пры Радашковіцкай беларускай гімназіі таксама працавалі гістарычна-краязнаўчы і літаратурны гурткі, выходзілі вучнёўскія часопісы ў рукапісным варыянце і насценныя газеты, дзе спрабавалі свае сілы ў літаратуры маладыя таленты. Праз гэтыя выданні пачынаў свой творчы шлях у літаратуры вучань школы Яўген Скурко, больш вядомы як Максім Танк. Пра яго літаратурны дэбют пазней успамінала ягоная аднакласніца Люся Валынец-Грышкевіч: «Аднойчы выкладчык беларускай літаратуры Язэп Гаўрылік даў нам творчае сачыненне на тэму «Чатыры пары года». І вось мы напісалі яго. Праз які тыдзень настаўнік прынёс у клас сшыткі з сачыненнямі. Аказалася, што Яўген Скурко яго напісаў вершам. Гэта сачыненне як лепшае ў класе [выкладчык] зачытаў на ўроку. Аўтар расказваў аб сялянскай працы і яе цяжкасцях ва ўсе поры года. Памятаю заключныя радкі гэтага верша: «Селяніну толькі знай // Жні, касі і засявай…». З таго часу мы нейкімі іншымі вачыма пачалі глядзець на свайго сябра — высокага, хударлявага хлопца ў даматканай вопратцы». Акрамя названых гурткоў, некаторы час дзейнічала мастацкая майстэрня, якой кіраваў Язэп Драздовіч.




*Выкладчыкі і выпускнікі Радашковіцкай беларускай гімназіі 1923/23 навучальнага году.*

У 1924 г. па запрашэнні Аляксандра Уласава ў гімназію прыехалі амерыканскія метадысты з Варшавы, якія арганізавалі і апекаваліся вучнёўскім інтэрнатам, дзе дзеці з далёкіх вёсак мелі сталы прытулак. Максім Танк успамінаў з гэтай нагоды: «Загадчыцай інтэрната была пажылая амерыканка, якая добра гаварыла па-беларуску і сачыла, каб кожны дзень, выстраіўшыся ў сталовай, усе раніцай і вечарам праспявалі малітву. Гэта быў своеасаблівы інтэрнат, у якім мы за невялікую месячную плату мелі забяспечаны начлег і гарачую ваду».

Апошнія 5 гадоў РБГ кіраваў вядомы беларускі грамадскі і культурны дзеяч Фелікс Стацкевіч. У канцы 1920-х гг. матэрыяльны стан школы значна пагоршыўся. З-за ад'езду метадыстаў спыніў існаванне і інтэрнат. З кожным месяцам усё цяжэй удавалася знаходзіць грошы для выплаты пенсій выкладчыкам. 1928/29 навучальны год стаў апошнім для гімназіі. Увесну 1929 г. яна спыніла сваё існаванне.

У гісторыі Нясвіжска-Клецкай беларускай гімназіі было шмат розных падзей, як светлых, так і змрочных. Яе 10-гадовая чыннасць — гэта ўзор гераічнага змагання за нацыянальную школу, за сваю чалавечую годнасць, урок патрыятычнага гарту для сённяшніх пакаленняў маладых беларусаў.

Арганізатарам Нясвіжскай беларускай гімназіі па праву можна лічыць вядомага беларускага нацыянальнага дзеяча, аднаго з пачынальнікаў беларускай школьнай справы Язэпа Шнаркевіча. Яшчэ ў верасні 1920 г. ён кіраваў Беларускім аддзелам Наркамасветы ССРБ у Менску, а ўжо праз месяц па заданні Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў быў перапраўлены ў Заходнюю Беларусь для падпольнай палітычнай працы. Мы яшчэ дастаткова мала ведаем пра ўсе акалічнасці яго палітычнай дзейнасці ў пачатку 1920-х гг., затое добра ўсведамляем ягоную ролю ў стварэнні і чыннасці беларускай сярэдняй школы ў Нясвіжы.

Усё пачалося з арганізацыі Язэпам Шнаркевічам у снежні 1920 г. дадатковага беларускамоўнага педагагічнага класа ў сценах былой Нясвіжскай прыватнай жаночай гімназіі, канцэсіянерам якой з'яўляўся Георгі (Юры) Жаўняркевіч, а дырэктарам — Кандрат Шчансновіч[18]. Пасля доўгіх мытарстваў Жаўняркевічу ўдалося здабыць ад Брэсцкага школьнага куратория дазвол на рэарганізацыю былой расейскай гімназіі ў беларускую, у якой у першы год існавання былі арганізаваны першыя два беларускамоўныя пачатковыя класы.

Перашкоды ў працы беларускай школы з боку польскіх чыноўнікаў пачаліся адразу. Улетку 1921 г., падчас уступных іспытаў, гімназія, па загаду павятовага старасты, была гвалтоўна выселена з двухпавярховай камяніцы на вуліцу. Гімназіі прыйшлося доўгі час цясніцца ў двух пакоях прыватнай кватэры, якія ласкава прадставіла выкладчыца нямецкай мовы, габрэйка Рыта Эпштэйн. У такіх напружаных умовах (у перапоўненых класах і ў тры змены) школа працавала амаль год.

Насуперак мясцовай польскай адміністрацыі, на дапамогу гімназіі прыйшлі жыхары Нясвіжа Апанас Вітушка, Нікадзім Дылеўскі і Міхал Кулакоўскі, якія аддалі пад патрэбы беларускай сярэдняй школы свае прыватныя кватэры. Арэндная плата за іх была чыста сімвалічнай, а Кулакоўскі, які прытуліў у сябе

беларускамоўныя камплекты, зусім адмовіўся ад платы. Так гімназія праіснавала ў Нясвіжы 3 гады. Школа ў гэты час утрымлівалася за кошт сціплай аплаты за навучанне і ахвяраванняў «натурпрадуктамі» (зерня, мукі, свежаніны, яек, бульбы) мясцовых жыхароў.

У педагагічную раду Нясвіжскай беларускай гімназіі ў першыя гады яе існавання, акрамя Язэпа Шнаркевіча, які чытаў фактычна ўсе прадметы ў беларускамоўных школьных камплектах і нават практыкаваў вучняў у гімнастыцы, уваходзілі Кандрат Шчансновіч (расійская мова і літаратура) , Надзея Шчансновіч (нямецкая мова), законавучыцель, настаяцель праваслаўнай царквы ў мястэчку Лань айцец Васіль Валасовіч ды іншыя. Троху пазней прыйшлі Ганна Малойла і Рыгор Якубёнак. Апошні быў ужо добра вядомы беларускаму грамадству як адданы прыхільнік беларускай нацыянальнай асветы і знаны беларусазнаўца.

У вельмі неспрыяльных пабытовых умовах вучні гімназіі праяўлялі зайздросную актыўнасць пры арганізацыі школьнай самадзейнасці. Пры школе функцыянавалі краязнаўчы, літаратурны і драматычны гурткі, вучнёўскі хор, а таксама, некаторы час, скаўцкая дружына,.

1921/22 навучальны год у Нясвіжскай беларускай гімназіі завяршыўся вялікай урачыстай вечарынай. Была паказана пастаноўка па п'есе Францішка Аляхновіча «Чорт і баба», дэкламаваліся творы класікаў беларускай літаратуры, а школьны хор спяваў народныя песні, а таксама музычныя творы на вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі, Максіма Багдановіча і Канстанцыі Буйло. Вечар быў завершаны выкананнем скокаў пад «Лявоніху» і «Юрачку». У 1922/23 навучальным годзе было арганізавана некалькі такіх вечарын, падчас якіх на суд мясцовай публікі былі прадстаўлены тэатральныя пастаноўкі купалаўскай «Паўлінкі» і «Дзядзькі Якуба» (паводле твораў Якуба Коласа).

Чыннасць беларускай сярэдняй школы ў радавым гняздзе Радзівілаў з'яўлялася «косткай у горле» мясцовай польскай адміністрацыі і берасцейскага школьнага куратара. Апошні адмовіў даць фундатарам гімназіі канцэсію на яе функцыянаванне ў 1923/24 навучальным годзе. Але педагогі і бацькі вучняў не змірыліся з гэтым рашэннем. Увесь год школа працягвала існаваць як таемная навучальная ўстанова. Як усё гэта адбывалася, узгадаў у сваіх успамінах паэт Сяргей Новік-Пяюн: «Каб захаваць сваіх навучэнцаў для гімназіі, настаўнікі без дазволу куратара арганізавалі групавыя заняткі ў сваіх прыватных кватэрах. Групаў было восем. Прадметы выкладаліся па праграме 1–7 класаў гімназіі. Заняткі былі арганізаваны па тыднёваму раскладу лекцыяў, як у гімназіі, з вызначэннем дня, гадзіны, прадмета, настаўніка з адрасам ягонай кватэры...». Гэтае патаемнае існаванне Нясвіжскай беларускай гімназіі мела вялікае значэнне. Яно захавала ядро школы, з якога ў 1924/25 школьным годзе паўстала Клецкая беларуская гімназія.

Каб абезгаловіць гімназію, польская адміністрацыя распачала кампанію па дыскрэдытацыі дырэктара беларускамоўных класаў Я. Шнаркевіча як «ворага польскай дзяржавы і існуючага ладу». Пад пагрозай арышту апошні мусіў у хуткім часе з'ехаць у Вільню. На пасадзе дырэктара яго замяніў Рыгор Якубёнак, а клопат пра атрыманне канцэсіі для гімназіі на наступны год узяў на сябе жыхар Клецка Антон Якімовіч. Гімназія пераехала працаваць у гэты горад.

Наступ на гімназію не спыняўся. Ужо ў Клецку пачалі распаўсюджвацца ілжывыя і абразлівыя плёткі пра выкладчыкаў беларускай школы, цынічна зрываліся ўлёткі пра запіс у пачатковыя класы гімназіі. Каб пазбавіць КБГ памяшкання, мясцовай польскай адміністрацыі ўдалося настроіць супраць беларусаў тамтэйшых сіяністаў з культурніцкай арганізацыі «Тарбут». Улетку 1924 г. «тарбутаўцы» пад кіраўніцтвам нейкага Цырковіча ўварваліся ў будынак беларускай школы і занялі яго для арганізацыі сваёй вучэльні з выкладаннем прадметаў на іўрыце. Гэты захоп «узаконіў» нясвіжскі павятовы староста, які выдаў габрэйскім актывістам паперы на арэнду дадзенага будынку. Да агульнага змагання з польскай адміністрацыяй дадалася непрыемная валтузня з сіяністамі. Знайсці кампраміс не ўдалося нават пры згодзе беларусаў працаваць у другую змену. Не дапамагло пасрэдніцтва ў развязанні канфлікту паслоў польскага сейму — старшыні Беларускага пасольскага клуба Браніслава Тарашкевіча і вядомага сіяніста, ураджэнца Бабруйска Якава Выгодскага. Патаемныя ўплывы мясцовых польскіх уладаў аказаліся мацнейшымі.

Некалькі месяцаў у 1924/25 навучальным годзе гімназія мусіла існаваць у аўральным рэжыме — у 2-х пакоях прыватнай кватэры, дзе жыў адзін з выкладчыкаў. Уначы на саломе тут спалі самі педагогі разам з вучнямі з адаленых вёсак, а днём ставіліся парты і праводзіліся заняткі. Па загаду школьнага куратара ў гэтым навучальным годзе ў гімназіі былі скасаваны старэйшыя 5–8 класы і засталіся функцыянаваць толькі падрыхтоўчыя і пачатковыя. Але беларуская школа працягвала змагацца за сваё існаванне.

Пасільную дапамогу ў гэты час КБГ аказвала нясвіжскае Таварыства белрускай сярэдняй і пачатковай школы. Фінансавае становішча вучэльні трохі стабілізавалася. Разам са старымі працаўнікамі ў гімназію прыходзяць працаваць новыя выкладчыкі: выпускнік Варшаўскага ўніверсітэта Вячаслаў Арэнь (якога за грунтоўныя веды ў розных галінах навукі празвалі «хадзячай энцыклапедыяй»), Надзея Шэмберг, Аляксей Кішкель, Вера Сініцына-Крукоўская, Мікалай Рудакевіч, Ярэмі Драчан ды іншыя. З Наваградка ў Клецк пераводзіцца кампазітар Антон Валынчык, які надаў працы вучнёўскага драмгуртка і хору новы імпульс. З Прагі, пасля заканчэння Карлава ўніверсітэта, прыязджае на выкладанне вядомы эсэраўскі дзеяч, доктар філасофіі Мікалай Чарнецкі.

З дапамогай беларускіх і амерыканскіх метадыстаў пры гімназіі з 1926 г. пачаў функцыянаваць вучнёўскі інтэрнат, што дазволіла вучыцца ў школе дзецям з далёкіх вёсак нават з іншых паветаў. Існавала ў сценах гімназіі і таемная камсамольская суполка. Пад уздзеяннем метадыстаў і камуністычнай прапаганды ў свядомасці школьнікаў сфармаваўся незвычайны ідэалагічны сімбіёз: ідэі хрысціянства дзіўным чынам перапляталіся з камуністычнай утопіяй. Некаторыя з выпускнікоў засталіся ў палоне гэтага «дуалізму» да канца сваіх дзён.

Пад прыкрыццём барацьбы з бальшавізацыяй у 1928 г., у год выбараў у Ссейм, польскія ўлады распачалі чарговы паход супраць усяго беларускага. У выніку палітычнага і адміністрацыйнага ціску чыннасць Нясвіжскай рэгіянальнай суполкі ТБШ, што падтрымлівала гімназію, фактычна была спынена. У такіх умовах Клецкая беларуская гімназія доўга пратрымацца не магла. У 1931 г. яна завяршыла сваю гісторыю.

У розны час у Нясвіжска-Клецкай беларускай гімназіі навучалася каля 800 чалавек. З гэтай беларускай школы выйшла таксама нямала знаных беларусаў. Сярод іх трэба назваць колішнюю сувязную слуцкіх паўстанцаў Любу Зянькавічанку, якая пазней вучылася спачатку ў БДУ ў Менску, а затым здолела перабрацца ў Прагу, дзе скончыла Карлаў універсітэт з дыпломам медыка. У 1930-я гг. яна ўжо прафесар медыцыны, паспяхова практыкуе як лекар і адначасова выкладае ва ўніверсітэце. Узгадаем таксама таленавітага мастака Зміцера Чайкоўскага, а таксама айца Васіля Кендыша, святара Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў ЗША, які ў розны час узначальваў парафіі БАПЦ у Гайленд Парку і св. Кірылы Тураўскага ў Брукліне. Канешне, не забудземся і пра ўжо ўзгаданага выпускніка школы, беларускага паэта Сяргея Новіка-Пяюна, якога ўсе свядомыя беларусы свету ведаюць як аўтара верша «Зорачкі», пакладзенага на музыку. Перажыўшы польскія высылкі, гітлераўскія і сталінскія канцлагеры, гэты чалавек застаўся нязломным патрыётам сваёй Бацькаўшчыны.

*Крытычна разглядаючы гісторыю чыннасці заходнебеларускіх гімназій, аддаючы належнае тым здабыткам у справе выхавання будучай інтэлектуальнай эліты Беларусі, варта ўсё ж такі сказаць пра слабое ўзаемадзеянне паміж беларускімі вучнёўскімі гурткамі гэтых школ. Кожны з іх дзейнічаў сам-насам, без належнай каардынацыі супольнай працы. Ёсць факты, што вучнёўская арганізацыя пры Віленскай беларускай гімназіі ў другой палове 1920-х гг. імкнулася кансалідаваць чыннасць усіх вучнёўскіх суполак пры беларускіх сярэдніх школах у Наваградку, Радашковічах і Клецку. Меўся нават праект аб стварэнні Цэнтральнага хаўрусу беларускай моладзі Заходняй Беларусі, і сур'ёзна абмяркоўвалася думка аб правядзенні агульнага ўстаноўчага з'езда прадстаўнікоў ад усіх гэтых гурткоў у Вільні. Аднак далей размоў справа ў той час не зрушылася.*

# Кароткі агляд гісторыі Беларускага студэнцкага саюза і іншых арганізацый беларусаў-студэнтаў Віленскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя ў 1920–1939 гг.

*Гісторыя Беларускага студэнцкага саюза (БСС) ды іншых згуртаванняў беларусаў-студэнтаў пры Універсітэце Стэфана Баторыя ў Вільні, безумоўна, заслугоўвае асобнай манаграфіі. Дзеля гэтага ёсць неабходныя ўмовы: дастаткова добра захаваная архіўная база (цэлы архіўны збор БСС і асобныя справы, дзе «рассыпана» фактура з чыннасці Саюза і іншых студэнцкіх арганізацый). Цяпер гэтыя дакументы захоўваюцца ў сховішчах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва ў Вільні. Шмат фактаў аб дзейнасці БСС маецца ў аддзелах хронікі тагачасных газет і часопісаў, а таксама ў апублікаваных успамінах актывістаў беларускага студэнцкага руху міжваеннага часу. Але і дагэтуль азначаная тэма застаецца слаба вывучанай у гістарычнай літаратуры. У дадзеным даследаванні на аснове вядомых і новых крыніц робіцца спроба адлюстраваць важнейшыя моманты дзейнасці беларускіх студэнцкіх згуртаванняў у сценах Віленскага ўніверсітэта ў 1920–1939 гг. і асэнсаваць іх.*

## ПАЎСТАННЕ І КРУГАБЕГ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЙ ЧЫННАСЦІ БЕЛАРУСКАГА СТУДЭНЦКАГА САЮЗА Ў ВІЛЬНІ

Віленскі ўнівэрсітэт Стэфана Баторыя (УСБ) быў адноўлены ў 1919 г. і з'яўляўся адзінай вышэйшай школай падобнага тыпу для ўсяго заходнебеларускага абшару. Нягледзячы на тое, што абсалютную большасць тутэйшага насельніцтва складалі этнічныя беларусы, іх доля сярод студэнтаў УСБ ніколі не перавышала 3%. У 1930–1936 гг. яна вагалася ад 1,6 да 2,6%. У той жа час колькасць палякаў пастаянна ўзрастала з 63,2% у 1930/31 навучальным годзе да 72,6% у 1937/38-м. Адзначым ужо згаданы факт, што да 1928 г. выпускнікі беларускіх сярэдніх школ не мелі права пастунаць у вышэйшыя школы Польшчы і вымушаны былі ехаць для здабыцця вышэйшай навукі далей на захад: пераважна ў Чэхаславакію, але таксама ў Нямеччыну, Бельгію, Францыю ды іншыя краіны. Усё гэта заўважна змяншала колькасць патэнцыйных беларускіх навучэнцаў у сценах Віленскага ўніверсітэта[19].

Большасць беларускага насельніцтва прадстаўляла незаможнае сялянства, якому было вельмі цяжка знайсці неабходныя грошы для аплаты ўніверсітэцкай навукі сваіх дзяцей, хоць адукаваныя людзі ў тутэйшым грамадскім асяродку з кожным годам набывалі ўсё больш папыт. Той вясковы гаспадар, сын або дачка якога вучыліся ва ўніверсітэце ці вышэйшым інстытуце, карыстаўся на вёсцы вялікім аўтарытэтам. Многія бацькі з усіх сілаў імкнуліся знайсці сродкі, каб пасляць на вучобу ва ўніверсітэт ці іншую вышэйшую навучальную ўстанову хоць аднаго са сваіх дзяцей.

Акрамя лекцый, семінараў, студый і калоквіумаў, навучэнцы ў сценах універсітэта, дзеля задавальнення сваіх інтэлектуальных і фізічных патрэб, запісваліся ў розныя навуковыя, літаратурныя, тэатральныя і музычныя гурткі, спартовыя ці турысцкія клубы і секцыі, а таксама ў самадзейныя аб'яднанні (карпарацыі), якія фармаваліся паводле культурнага, этнічнага ці тэрытарыяльнага крытэрыяў, а таксама з дабрачынных меркаванняў. Мэты і задачы ўсіх гэтых згуртаванняў былі розныя: ад аказання матэрыяльнай дапамогі сваім калегам, пашырэння сярод навучэнцаў і тутэйшага насельніцтва асветы да сумеснай гульні ў футбол ці гольф.

Чыннасць студэнцкіх арганізацый падпарадкоўвалася палажэнню «Аб акадэмічных школах» Міністэрства публічнай асветы і веравызнанняў Польшчы,

якое некалькі разоў мянялася (1920, 1933 і 1937 гг.). Кожная новая яго рэдакцыя характарызавалася больш жорскімі патрабаваннямі, якія тычыліся рэгістрацыі і дзейнасці самадзейных навучэнскіх аб'яднанняў[20]. Звязана гэта было з узрастаннем палітызацыі студэнцтва, узмацненнем у яго асяродку радыкальных палітычных настрояў, а таксама з ростам аўтарытарных тэндэнцый ва ўнутранай палітыцы польскай дзяржавы.

Тым не менш, аўтаномія вышэйшай школы ў Польшчы захоўвалася і давала студэнтам для рэалізацыі сваіх грамадскіх і культурніцкіх праектаў больш шырокія магчымасці, чым для прадстаўнікоў іншых арганізацый няўрадавага сектара. Універсітэты і ў перыяд наступу аўтарытарызму ў краіне ў 1930-я гг. заставаліся невялікімі «выспамі» лібералізму, дзе працягвалася самадзейная грамадская і культурна-асветная чыннасць. Калі, напрыклад, у 1937 г. у Польшчы былі забаронены амаль усе беларускія грамадскія арганізацыі, Беларускі студэнцкі саюз і Таварыства прыяцеляў беларусаведы ў Вільні працягвалі сваю легальную чыннасць у сценах Універсітэта С. Баторыя.

За міжваенны час існавання УСБ (1919–1939) у яго мурах дзейнічалі дзясяткі студэнцкіх карпарацый і гурткоў, якія прадстаўлялі розныя нацыянальнасці краю. Вядома, былі сярод іх і беларускія. Як ужо адзначалася, самым аўтарытэтным і масавым сярод апошніх лічыўся Беларускі студэнцкі саюз. БСС хоць і дэклараваў у статутных дакументах сваю апалітычнасць, але рэаліі штодзённага жыцця давалі шмат падстаў для яго палітызацыі. Беларускія студэнты вымушаны былі так ці інакш рэагаваць на падзеі, якія адбываліся ў грамадска-палітычным жыцці тутэйшага грамадства, а таксама ў Савецкім Саюзе і іншых замежных краінах.

Гісторыя Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні пачынаецца з восені 1920 г., калі адбылася першая арганізацыйная зборка навучэнцаў-беларусаў у адной з аўдыторый Віленскага ўніверсітэта на прадмет стварэння нацыянальнага студэнцкага асяродка. Пад назовам «Гурток студэнтаў-беларусаў» арганізацыя не прайшла ў тым годзе рэгістрацыі, і толькі ў 1921 г. яе статутныя дакументы былі зацверджаны сенатам УСБ пад шыльдай «Беларускі студэнцкі саюз». На пасаду першага старшыні БСС быў абраны Антон Абрамовіч, удзельнік беларускага руху на Случчыне ў 1919–1920 гг., колішні інструктар Часовага Беларускага нацыянальнага камітэта ў Менску. У склад урада Саюза таксама ўвайшлі вядомыя ў будучыні дзеячы хрысціянскай дэмакратыі — Браніслаў Туронак і Станіслаў Грынкевіч, а таксама Сяргей Малафееў.

Сваю чыннасць згуртаванне пачынала, маючы ў сваім складзе не больш за 30 сябраў. У 1920-я гг. іх колькасць не перавышала 50 чалавек. 1930 год у гэтым плане быў, напэўна, рэкордным: у БСС было запісана каля 80 чалавек. Але ў 1931 г., у выніку арганізацыйнага расколу БСС (зыходу прыхільнікаў Цэнтрасаюза), у шэрагах студэнцкай арганізацыі засталіся толькі 45 чалавек. Аднак праз год колькасць сяброў БСС дасягнула ўжо 68 чалавек.

Пакуль ніхто сур'ёзна не аналізаваў сацыяльны, маёмасны і канфесійны склад сябраў Беларускага студэнцкага саюза. З пэўнай доляй пагрэшнасці можна канстатаваць, што большасць актывістаў БСС складалі сялянскія дзеці, але былі і выхадцы з гарадскога асяродку, а таксама дзеці прадстаўнікоў інтэлектуальнай эліты. Напрыклад, у левага радыкала і таленавітага паэта Германа Вялецкага бацька быў былым прафесарам Кіеўскага ўніверсітэта. Сярод студэнтаў, якія ў палітычным плане гарнуліся да Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, абсалютную большасць складалі каталікі. У адрозненне ад іх, для актывістаў БСС праваслаўнага веравызнання пытанні веры не былі настолькі прыярытэтнымі. Хутчэй у іх светапоглядзе дамінавала сацыялістычная ідэалогія. Але «левых» хапала і сярод прадстаўнікоў каталіцкага веравызнання (узгадаем хаця б Юльяна Саковіча). Траплялiся і праваслаўныя «фундаменталісты» (Сяргей Сарока). Паводле маёмаснага стану сярод сяброў БСС таксама не было роўнасці. Большасць прадстаўлялі сярэдняе і бяднейшае сялянства, але былі таксама дзеці заможных вясковых гаспадароў (Канстанцін Глінскі) ці служачых (Наталля Арсеннева).

Паводле свайго статута[21], БСС у Вільні з'яўляўся непалітычным культурна-асветным згуртаваннем, галоўнай мэтай якога, побач з рэпрэзентацыяй беларускасці ў сценах Віленскага ўніверсітэта, было «таварыскае збліжэнне сваіх сяброў у агульную працу над самавызначэннем на грамадска-

нацыянальным і навуковым падкладзе». Падкрэслівалася, што да гэтай мэты Саюз няспынна будзе ісці, «выстаўляючы [перад сабой] вялікі лозунг — Бацькаўшчына і Навука». За найважнейшыя задачы Саюза вызначаліся «шырокае нацыянальнае асветніцтва беларускага насельніцтва не толькі ў Вільні, але і ў самых аддаленых кутках краю» праз чытанне лекцый, правядзенне тэатральных спектакляў і канцэртаў, сустрэч з людзьмі для абмеркавання з імі злабадзённых пытанняў; наладжванне ўзаемадзеяння з іншымі студэнцкімі згуртаваннямі, арганізацыя дзейснай студэнцкай самапомачы на карысць незаможных навучэнцаў. Пры гэтым «кааперацыя ўсяго свядомага студэнцтва беларускага» мусіла адбывацца на грунце «апалітычнай прафесійнасці»[22]. «Перадусім, — пісаў у сваім артыкуле «Ідэал незалежнасці і беларускае студэнцтва», змешчаным у часопісе «Студэнцкая думка» за 1928 г. (№ 3), А. Коўзан, — трэба даць заўсёды першынство грунтоўнасці перад павярхоўнай плыткасцю, усюды, а асабліва ў навуцы, пры распрацаванні светапогляду і г. д. Нельга пры гэтым абмінуць ужо цяпер тае праўды, што будучая нацыяналізаванне ўсяго жыцця ў краі будзе базавацца не на чым іншым, як на вырабленасці і канкурэнцыйнай здольнасці, вышасці беларускага духу над духам чужым, у нас сёння ўсемагутна пануючым».

Але пры гэтым БСС не разумеў увасабленне беларускасці як вузка нацыяналістычную дактрыну. Яго ідэйная платформа грунтавалася на дэмакратычных каштоўнасцях і гуманістычным светапоглядзе. Яшчэ на пачатку чыннасці Саюза адзін з яго кіраўнікоў, Сяргей Малафееў, на старонках студэнцкага часопіса «Наш шлях» (1922 г., № 2–3) заявіў: «Мы павінны выхаваць сябе на тых гуманістаў, якія агульныя грамадскія справы паставяць вышэй усяго, якія будуць дбаць аб дабры, не толькі беларускім, але агульналюдскім, аб шчасці тых народаў, якія будзе абыймаць сваімі крыльямі наша Маці-Беларусь. Трэба дбаць, каб не пайсці тым шляхам, якім пайшлі нашы ўваскрошаныя суседзі[23], захопленыя нацыяналізмам. Гэта нашыя заданні».


*Студэнты Віленскага ўнівэрсітэту С.Баторыя. 1927 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

Адзначым, што ў прафесарскім асяродку і ўвогуле сярод педагагічнай карпарацыі УСБ знаходзілася нямала ліберальна настроеных людзей, што шчыра спачувалі грамадскім і нацыянальна-культурным памкненням беларускіх студэнтаў.

Апошняе справядліва ў дачыненні да тых навукоўцаў і педагогаў, якія ў якасці куратараў апекаваліся дзейнасцю БСС. Гэта былі вядомыя і паважаныя ў акадэмічных колах Вільні прафесары і дацэнты. З першага дня заснавання БСС і да лета 1932 г. беларускім куратарам з'яўляўся прафесар неўралогіі Станіслаў Уладычка. Ён быў дастаткова прыязным да беларусаў, не раз адстойваў інтарэсы Саюза перад кіраўніцтвам УСБ, дапамог згуртаванню знайсці вольнае памяшканне для сядзібы на вуліцы Св. Ганны, 2, дзе праходзілі не толькі арганізацыйныя сходы, але ўсе асноўныя культурніцкія і грамадскія мерапрыемствы БСС. Пра папулярнасць прафесара ў асяродку беларускіх студэнтаў кажа тое, што кожны год апошнія выказвалі прафесару шчырую падзяку за ўвагу і падтрымку ў іх справах і хадайнічалі перад рэктарам і сенатам універсітэта, каб С. Уладычка і надалей апекаваўся імі.

Але ў адзін момант яму абрыдла быць «арбітрам» у канфліктах у беларускім студэнцкім коле, якія пачасціліся ў пачатку 1930-х гг. У




*Сябры ўраду і актывісты Беларскага студэнцкага саюзу. Пачатак 1930-х гг. У 1-м радзе сядзяць (злева направа): ?, ?, ?, Вітаўт Тумаш, ?, Мікалай Шчорс; У 2- м радзе: ?, Усевалад Кароль, ?, Мацвей Смаршчок (Анатоль Бярозка). Другая палова 1920-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Друкуецца ўпешыню.*

1932 г., пасля чарговай сутычкі паміж «левымі» і «правымі», прафесар не вытрымаў і адмовіўся ад «беларускага куратарства». З чэрвеня 1932 г. і да пачатку лета 1939 г. гэтую пасаду займаў другі кафедральны прафесар — доктар славянскай філалогіі гуманітарнага факультэта, этнічны немец паводле свайго паходжання Эрвін Кашмідэр[24].




*Беларусы-студэнты медычнага факультэту Віленскага ўніверсітэта С. Баторыя, Сябры Беларускага студэнцкага саюза. У цэнтры за сталом сядзяць (злева направа): ?, Л. Марцінчык, В. Тумаш, К. Грыгарчук, М. Шчорс; у 2-м радзе стаяць: Уладзімір Стома, ?, ?, ?, ?, ?, Усевалад Кароль. Фота 1936 г. Нацыянальны гістарычны музей Беларусі. Друкуецца ўпершыню.*

Э. Кашмідэр таксама прыязна ставіўся да патрэбаў беларускіх студэнтаў, сімпатызаваў іх поглядам, праяўляў цярпенне і непрадузятасць у ідэйных спрэчках. Яго рашэнні прызнаваліся большасцю сябраў БСС аб’ектыўнымі і справядлівымі. Прафесар імкнуўся прысутнічаць на ўсіх арганізацыйных і культурніцкіх мерапрыемствах Саюза, але пры гэтым ніколі не парушаў студэнцкага самакіравання і не ўмешваўся ў самадзейную працу студэнтаў. Немалаважны факт — Э. Кашмідэр добра размаўляў па-беларуску, а ў 1937/38 навучальным годзе на кафедры славянскай філалогіі распрацаваў 20-гадзінны спецкурс беларускай мовы, які чытаў студэнтам свайго аддзялення. Ён шчыльна супрацоўнічаў у гэтым пытанні з Янам Станкевічам, які меў на гэтым самым аддзяленні лектарат беларускай мовы.

На жаль, пасля заканчэння 1938/39 навучальнага года Э. Кашмідэр вымушаны быў пакінуць Віленскі ўніверсітэт. Уздым антынямецкіх настрояў у польскім грамадстве, адчуванне недаверу з боку калегаў-выкладчыкаў падштурхнулі яго вярнуцца на бацькаўшчыну — у Баварыю. З ад’ездам Э. Кашмідэра ў Мюнхен з канца чэрвеня 1939 г. рашэннем універсітэцкага сената беларускім куратарам быў прызначаны дацэнт Ежы Хопен, больш вядомы як прафесійны мастак. Яго праца на гэтай пасадзе была нядоўгай, бо 1 верасня 1939 г. пачалася Другая сусветная вайна.

У міжваеннай Польшчы для матэрыяльнай падтрымкі студэнцтва была створана цэлая сетка грамадскіх дабрачынных арганізацый, якія наўпрост ці праз

студэнцкія карпарацыі выплачвалі стыпендыі і аднаразовыя дапамогі бяднейшым навучэнцам вышэйшых школ, а таксама матэрыяльна падтрымлівалі розныя маладзёвыя культурніцкія і грамадскія ініцыятывы. У Вільні існавала рэгіянальная філія «Funduszu opłat akademickich», а пры мясцовым універсітэце функцыявалі «Braterska pomoc USB» ды іншыя дабрачынныя ўстановы. Але амаль усе сродкі з гэтых фундацый адрасаваліся на патрэбы польскіх студэнтаў і іх арганізацыйных асяродкаў. У статуце арганізацыі «Braterska pomoc USB» было адмыслова пазначана, што апошняя аказвае матэрыяльную падтрымку «польскаму студэнцтву», без уліку таго, што ў Віленскім універсітэце, акрамя палякаў, навучаліся сотні беларусаў, літоўцаў, украінцаў, габрэяў і г. д. За ўвесь час сваёй чыннасці БСС толькі эпізадычна атрымліваў сціплыя грашовыя субсідыі ад польскіх дабрачынных арганізацый.

На працягу свайго існавання Беларускі студэнцкі саюз дзейнічаў у даволі цяжкіх фінансавых варунках. Не будзем галаслоўнымі і разгледзім гадавы каштарыс даходаў і выдаткаў БСС за адзін з навучальных гадоў, напрыклад, за 1934/35. Даходная частка каштарыса Саюза ў гэтым годзе склала 1172 злотых 40 грошаў. Галоўным артыкулам даходаў згуртавання была арганізацыя тэатральна-мастацкіх суботнікаў і вечарын — 664 злотых (каля 57%). Доля фінансавай дапамогі ад «Funduszu opłat akademickich» склала ўсяго 200 злотых (17%), сяброўскія складкі БСС прынеслі ў скарбніцу Саюза 157 злотых (каля 14%), прыватныя і грамадскія ахвяраванні — 133,85 злотых (11,6%). Здабытыя сродкі ішлі на набыццё тэатральнага рэквізіту, вопратку для хору і струннага аркестра, закупку музычных інструментаў ды інш. — 659,45 злотых (каля 56%); стыпендыі і аднаразовыя выплаты незаможным сябрам Саюза — 189,75 злотых (каля 16%), утрыманне памяшкання Саюза — 175,6 злотых (15%), на патрэбы бібліятэкі і канцылярскія прылады трохі болей за 43 злотых (каля 4%), зварот даўгоў — 15 злотых (1,2%) і на іншыя патрэбы. Станоўчае сальда ад дзейнасці БСС склала ўсяго трохі больш за 89 злотых (7,6%). Маючы такі сціплы прыбытак, цяжка было разгарнуць на поўную моц культурна-асветную і навуковую чыннасць. Мізэрнай была і матэрыяльная дапамога незаможным навучэнцам. Напрыклад, калі ўзяць тыя 189,75 злотых, што выдаткоўваліся на гэтыя мэты, ды падзяліць іх на 25 злотых (максімальны памер аднаразовай дапамогі, якую выдаваў БСС), то атрымаецца, што матэрыяльную дапамогу адзін раз у год маглі атрымаць не больш за 8 чалавек(!).

У дадзеным каштарысе БСС адсутнічаюць даходы і выдаткі на выданне студэнцкай перыёдыкі. Сродкі на выдавецкую чыннасць Саюза паступалі амаль выключна ад грамадскіх і прыватных ахвяраванняў, якія збіраліся праз калектыўныя «падпісныя лісты». Адзначым, што пэўныя палітычныя сілы (найперш КПЗБ) у сваіх інтарэсах неаднаразова субсідавалі выдаткі на тыя студэнцкія выданні, якія адпавядалі іх ідэалагічнаму кірунку.

Для аптымізацыі дабрачыннай падтрымкі з боку грамадскасці на карысць БСС у складзе апошняга ў 1929 г. была створана асобная секцыя нясталых даходаў пад кіраўніцтвам Тодара Куніцкага. Але гэта не нашмат павялічыла памеры добраахвотных унёскаў у скарбонку Саюза.

Пасільную дапамогу беларускім студэнтам аказвала Беларускае дабрачыннае таварыства, якое на працягу 1928–1930 гг. накіроўвала на рахунак БСС сталую месячную субсідыю. Эпізадычна невялічкія сумы БСС выдаткоўваў Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. Ёсць звесткі, што адзін ці два разы БСС фінансава падтрымала таварыства «Беларуская хатка», якое ўзначальваў былы кіраўнік Беларускай вайсковай камісіі палкоўнік Гасан Канапацкі. У 1930 г. аднаразовую грашовую пазыку на адрас БСС даслаў таксама Цэнтрасаюз.

У 1929 г. на заклік кіраўніцтва БСС да беларускіх паслоў польскага сейма штомесяц выдаткоўваць на патрэбы студэнцтва 5% сваіх дыетаў адгукнуліся толькі дэпутаты ад Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба «Змаганне», але гэтыя выплаты спыніліся на другім месяцы. Магчыма, гэта адбылося таму, што тагачаснае кіраўніцтва БСС цвёрда трымалася прынцыпу апалітычнасці і не падтрымлівала леварадыкальнай ідэалогіі. Варта адзначыць, што прабальшавіцкія эмісары даволі часта выкарыстоўвалі цяжкое матэрыяльнае становішча беларускіх студэнтаў, каб праз свае «субсідыі» вербаваць сярод іх новых «байцоў» для класавых баёў.

Адзначым і тых прыватных асоб-дабрадзеяў, што рэгулярна



*Пячатка Беларускага студэнцкага саюзу Віленскага ўнівэрсітэту. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

ахвяравалі свае ўласныя грошы на патрэбы бяднейшага студэнцтва. Гэта Антон Луцкевіч, Адам Станкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Лявон Вітан-Дубейкаўскі, Ігнат Дварчанін, Уладзімір Самойла, Антон Неканда-Трэпка, Янка Станкевіч ды інш.

У 1928 г. урад Беларускага студэнцкага саюза звярнуўся да валасных і павятовых самаўрадаў Заходняй Беларусі з просьбай аказаць пасільную фінансавую помач незаможным беларускім студэнтам. Абсалютная большасць з самаўрадаў праігнаравала гэты зварот, але некаторыя кіраўнікі старастваў, пераважна з Наваградчыны, не ў апошнюю чаргу дзякуючы добраму стаўленню да беларусаў тамтэйшага ваяводы З. Бэчковіча, прыхільна сустрэлі гэтую просьбу. Яны пастанавілі выдаткаваць БСС пэўныя грашовыя субсідыі, але іх рашэнні былі заблакаваны большасцю лаўнікаў павятовых сеймікаў, якія на дух не пераносілі нават самога слова «Беларусь».




*Штэмпель бібліятэкі Беларускага студэнцкага саюзу ў Вільні. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

Аналізуючы тую неадпаведна сціплую фінансавую падтрымку беларускага арганізаванага студэнцтва з боку старэйшага грамадзянства, прыходзіш да высновы, што гэта ёсць наступствам не толькі той сацыяльна-палітычнай атмасферы, што панавала ў Заходняй Беларусі, калі ўсё беларускае афіцыйнай уладай успрымалася як апазіцыйнае і антыдзяржаўнае, з-за чаго мала хто асмельваўся даць грошы беднаму беларускаму студэнту. Гэта таксама сведчыла пра адсутнасць моцнай грамадскай салідарнасці і згуртаванасці сярод беларусаў і характарызавала вузкасць сацыяльнай і эканамічнай базы беларускага вызвольнага руху, слабасць яго фінансавых і гаспадарчых структур у краі.

У паведамленнях прэсы таго часу ёсць звесткі пра стварэнне пры БСС у канцы 1925 г. бюро працы, якое павінна было клапаціцца аб пошуку вакансій для падпрацоўкі сябраў згуртавання. Але нейкія дакладныя факты пра чыннасць дадзенай структуры на сёння не выяўлены. Не ўдалося кіраўніцтву БСС здзейсніць праект па стварэнні ў 1930/31 навучальным годзе сваёй уласнай студэнцкай страўні, якой далі прыгожы назоў «Беларуская сытніца». Проста тады не ўдалося сабраць патрэбную колькасць студэцкіх паёў для яе рэгістрацыі.

У снежні 1930 г. пры фінансавай падтрымцы Цэнтрасаюза сябры БСС арганізавалі для ахвотных беларускамоўныя 10-месячныя завочныя кааператыўна-карэспандэцкія курсы, на якіх выкладаліся беларуская мова, гісторыя кааперацыі, тэхнічнае забеспячэнне гандлю, таваразнаўства і бухгалтарскі ўлік. Адразу на курсы запісалася звыш 150 чалавек, але з-за адмовы на пачатку 1931 г. Цэнтрасаюза ў далейшым іх фінансаванні колькасць курсантаў скарацілася ў 3 разы. Намаганнямі Міхала Тулейкі і Станіслава Станкевіча курсы ўдалося давесці да канца: 10 траўня 1931 г. адбыліся выпускныя іспыты, якія паспяхова здалі 50 чалавек.

19-гадовая праца БСС на ніве навуковай і культурнай чыннасці была няроўнай па сваймү змесце і выніковасці. Былі гады асаблівай актыўнасці, што праяўлялася ў правядзенні шматлікіх культурніцкіх імпрэзаў, у рэалізацыі выдавецкіх ды іншых праектаў. У той жа час былі і гады відавочнага застою, спароджанага палітычнымі варункамі і цяжкасцямі матэрыяльнага быцця.

Пасля кароткага перыяду арганізацыйнага станаўлення (1920–1921 гг.) 1922/23 навучальны год аказаўся багатым на падзеі ў жыцці Саюза. Нягледзячы на тое, што многія студэнты ў адзначаны час прынялі ўдзел у працы Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта ў якасці валанцёраў па агітацыі сярод выбаршчыкаў напярэдадні і падчас выбараў у польскі сейм на карысць беларускіх кандыдатаў), актыўна працавалі ўсе тры секцыі згуртавання: культурна-

асветная, навуковая і выдавецкая. Была арганізавана цэлая нізка публічных рэфератаў на гістарычную, эканамічную і культурную тэматыку; выдадзена 4 нумары часопіса «Наш шлях»; ладзіліся тэатральныя вечарыны, закладзена сяброўская бібліятэка БСС.

Пасля кароткага «перадыху» ў 1923/24 навучальным годзе, звязаным у першую чаргу са «зменай пакаленняў» у шэрагах БСС, у 1924/25 і 1925/26 гг. была зноў заўважна актыўнасць Саюза: пачаў выходзіць новы часопіс «Студэнцкая думка», якога было выдадзена за гэты адрэзак часу ажно 7 сшыткаў (адзін быў канфіскаваны па палітычных матывах урадавым камісарам Вільні); працягвалася чытанне навуковых рэфератаў. У дадатак да рэфераторыума ў 1925 г. быў арганізаваны лектарат па беларусазнаўству, на якім выступалі А. Луцкевіч, А. Неканда-Трэпка, Я. Станкевіч, А. Станкевіч, Р. Астроўскі ды інш. У тым жа годзе сіламі драматычнага гуртка зладжана прэм'ера спектаклю па п'есе Францішка Аляхновіча «Шчаслівы муж».

Для павелічэння грамадскага рэзанасу самыя цікавыя і актуальныя рэфераты і лекцыі, прачытаныя ў сценах БСС, пачалі друкавацца на старонках «Студэнцкай думкі». Прынамсі, у 1925/26 г. былі апублікаваны змястоўныя эсэ А. Луцкевіча («Вільня ў беларускай літаратуры», «Эвалюцыя беларускай адраджэнскай ідэалогіі і адбіццё яе ў літартатуры»), Янкі Станкевіча («Аб назову «крывічы» і «Крывія»»). На старонках названага перыёдыка ў 1925 г. пабачыла свет адно з лепшых эсэ былога прэм'ера ўрада БНР Аляксандра Цвікевіча «Аб аргументах ад розуму і аб аргументах ад сэрца», адрасаванае якраз моладзі і прысвечанае яе маральнаму выбару на карысць беларушчыны. Таксама цікавым быў літаратурны аддзел часопіса, дзе змяшчаліся творы маладых аўтараў: Наталлі Арсенневай, Алеся Салагуба, Пятра Сакола, Яўгена Бартуля, Міхася Тулейкі, Міхася Васілька, Хведара Ільяшэвіча. Запомніліся гэтыя гады таксама арыштамі і зняволеннямі ў вязніцу па абвінавачванні ў антыўрадавай дзейнасці аўтара «Студэнцкай думкі», камсамольца Алеся Салагуба і аднаго з кіраўнікоў БСС Браніслава Туронка, які адначасова з'яўляўся рэдактарам хадэцкай газеты «Krynica». Дарэчы, з надрукаваных у гэты час у «Студэнцкай думцы» вершаваных нізак найперш запомніліся лірычныя творы Наталлі Арсенневай і «рэфлексіі» Алеся Салагуба, напісаныя апошнім за кратамі віленскіх Лукішак («Не для славы...», «О, дні вясны маёй...», «Ох, сумна вясной...», «Песня ў вастрозе»).

1926/27 навучальны год найбольш выбіваецца з агульнага летапісу чыннасці БСС. У гэты час не выйшла ніводнага нумарf «Студэнцкай думкі», не пастаўлена ніводнай новай тэатральнай пастаноўкі, зладжана ўсяго некалькі культурніцкіх вечарын і навуковых рэфератаў. Значную частку свайго часу і энэргіі сябры Саюза аддалі ў гэты час на палітычную працу пад шыльдай Беларускай сялянска-работніцкай грамады.




*Віншавальны адрас беларускага паэта Сяргея Новік-Пяюна з высылкі ў Свеце над Віслай кіраўніцтву Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні з нагоды 10-угодкаў утварэння арганізацыі. 20 лістапада 1930 г. З фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Друкуецца ўпершыню.*

Але сустракаюцца ў гэтым годзе і пазітыўныя праявы. Менавіта ў гэтым навучальным годзе бярэ адлік сваёй чыннасці Беларускі студэнцкі хор пад рэгенцтвам Рыгора Шырмы. Узнік ён, як ужо адзначалася, на аснове злучэння з ранейшым вучнёўскім хорам Віленскай беларускай гімназіі. У лістападзе 1926 г. выканаўца абавязкаў дырэктара ВБГ Сяргей Паўловіч звярнуўся да беларускіх студэнтаў УСБ з наступным за-


Я. М. Гр. Беларускі Інстытут Гасп. і Культ.

Беларускі Студэнцкі Саюз У. С. Б. ў Вільні гэтым ветліва просіць Вас ушанаваць сваёй прысутнасцю

УРАЧЫСТАЕ СЬВЯТКАВАНЬНЕ
XV
УГОДКАЎ ІСТНАВАНЬНЯ БЕЛ. СТУД. САЮЗУ,
якое адбудзецца ў нядзелю 1-га сьнежня 1935 году.

БЕЛ. СТУД. САЮЗ
Вільня, Завальная 1—1.

ПРАГРАМА СЬВЯТКАВАНЬНЯ

А 9-тай гадзіне Урачыстае Набажэнства ў касьцеле сьв. Мікалая (зав. сьв. Мікалая 8).

А 12-тай гадзіне Малебен у Пятніцкай Царкве (вул. Вялікая).

А 16-тай гадзіне Урачыстая Акадэмія ў залі Сьнядэцкіх (Галоўны Будынак У. С. Б.).

А 20-тай гадзіне Вечарына ў залі Літ. Студ. Саюзу (Віленская 28—1).

*Запрашэнне Беларускага студэнцкага саюзу ў Вільні з праграмкай святочных мерапрыемстваў у адрас кіраўніцтва Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры з нагоды святкаванне 15-угодкаў БСС 1 снежня 1935 г. З фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Друкуецца ўпершыню.*

прашэннем: «Віленская беларуская гімназія заклікае студэнтак і студэнтаў, якія маюць адпаведныя галасы і больш ці менш музычны навык, прыняць сталае ўчасце ў новаарганізаваным хоры гімназіі. Ёсць добры кіраўнік, які хацеў бы пачаць працу над утварэннем нацыянальнага беларускага хору. У сучасны момант у хоры ўжо ёсць 35 чалавек — пераважна вучняў і вучаніц гімназіі. Недастатак галоўным чынам мужчынскіх галасоў, але вельмі пажаданы і жаноцкія». На заклік С. Паўловіча і Р. Шырмы ў хор прыйшлі 12 сябраў БСС. Першыя гады свайго існавання капэла ўяўляла з сябе змешаны вучнёўска-студэнцкі калектыў, а ў пачатку 1930-х гг. Беларускі студэнцкі саюз узяў хор Рыгора Шырмы пад сваю апеку.

Сябры БСС актыўна супрацоўнічалі з навучэнцамі ВБГ і ў іншых напрамках, напрыклад, дапамагалі ладзіць у сценах гімназіі пазашкольныя заняткі па беларусазнаўству, арганізоўваць канцэрты і спектаклі. У траўні — чэрвені 1929 г. студэнцкія актывісты пры фінансавай падтрымцы Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры дапамаглі сваім малодшым таварышам здзейсніць творчую вандроўку ў вёскі Святліцы Вішнеўскай гміны Валожынскага павету, Жодзішкі Вілейскага павету і Меднікі Віленска-Троцкага павета, падчас якой былі паказаны тэатральныя пастаноўкі і адбыліся выступленні хору.

Забарона БСРГ у 1927 г. вярнула многіх сябраў Беларускага студэнцкага саюза да «хатніх» спраў. Але не толькі гэтым тлумачыцца пэўная актывізацыя культурніцкай і выдавецкай дзейнасці сябраў БСС у 1928–1930 гг. У першую чаргу гэта звязана з прытокам у Саюз новых актывістаў — цэлай кагорты выпускнікоў беларускіх гімназій у Вільні і Наваградку, якія з 1928 г. атрымалі дазвол на паступленне ў вышэйшыя школы Польшчы.

У 1929 г. адбылася рэарганізацыя працы секцый Саюза. Пачалі працаваць у новым складзе літаратурна-навуковая (старшыня С. Станкевіч), музычна-драматычная (С. Сарока, пазней Я. Хвораст) і секцыя нясталых даходаў (Т. Куніцкі).

У гэты час актыўна дзейнічаў рэфератарыум БСС. У яго рамках было прачытана больш за 20 навуковых дакладаў па розных тэмах. Узгадаем некаторыя з іх: «Усебеларускі з’езд 1917 г.» і «Трагедыя беларускай інтэлігенцыі» Макара Краўцова (Касцевіча), «Развіццё беларускага руху ад 1917 г. да сённяшніх гадоў» Язэпа Мамонькі, «Асадніцтва ў Беларусі» Адольфа Зянюка, «Газавая і бактэрыялагічная вайна» Усевалада Шырана.

У 1930 г., дзеля больш сістэматычнай і прадуктыўнай працы рэфератарыума, была ўтворана адмысловая рэфератная секцыя БСС, якой кіраваў спачатку Я. Бартуль, а затым Міхась Маскалік. На той час Саюз меў ужо пастаянна дзейсную сяброўскую бібліятэку, якая складалася з некалькіх сотняў найменняў. Шмат намаганняў па яе фармаванні і ўпарадкаванні прыклалі У. Гнароўскі і Наста Гаўрылік.

У 1928–1929 гг. для студэнтаў УСБ і навучэнцаў ВБГ аднавіў працу сталы лектарат па беларусазнаўству, якім кіраваў сябра БСС Янка Шутовіч. Лектарат адкрыўся 14 кастрычніка 1928 г. чытаннем двух дакладаў: «Галоўныя моманты беларускага адраджэнскага руху» Антона Луцкевіча і «Месца крывіцкай (беларускай) мовы сярод іншых славянскіх моваў і час яе ўзнікнення» Янкі Станкевіча. Сярод двух дзясяткаў прачытаных лекцый запомніліся выступленні М. Ільяшэвіча («Паходжанне, старадаўнія весткі і антрапалагічныя адзнакі беларусаў у свеце мінуўшчыны і будучыні»), архітэктара Лявона Вітан-Дубейкаўскага («Рэформа драўлянага будаўніцтва ў Беларусі») ды некаторыя іншыя.

Тэатральная дружына БСС пад кіраўніцтвам Мікалая Марцінчыка ў адзначаны перыяд паставіла 6 спектакляў па творах Янкі Купалы, Францішка Аляхновіча, Максіма Гарэцкага, Элізы Ажэшкавай і Антона Чэхава. Усім запомніўся аўтарскі літаратурны вечар за 28 лютага 1928 г. у сценах сядзібы БСС, на якім на суд шырокай публікі прадставілі свае творы маладыя літаратары Яўген Бартуль, Усевалад Шыран, Міхась Тулейка, Міхась Васілёк ды іншыя. Кароткае быццё ў Вільні кампазітара Антона Валынчыка засталося памятным дзякуючы стварэнню студэнцкага струннага аркестра.

Шмат мерапрыемстваў актывістаў БСС было звязана з арганізацыяй урачыстых навуковых акадэмій, прысвечаных святкаванню розных юбілеяў: Акту 25 Сакавіка, датаў народзінаў і смерці выбітных беларускіх грамадскіх і культурных дзеячаў ды іншых падзеяў. З 1930 г. аднавілася традыцыя святкавання ўгодкаў Слуцкага збройнага чыну, якія не адзначаліся ў Заходняй Беларусі з 1922 г.

На лістападаўскіх мерапрыемствах, прысвечаных 10-й гадавіне слуцкіх падзеяў, выступіў з дакладам былы слуцкі паўстанец Сяргей Бусел, які нядаўна прыехаў з Прагі пасля завяршэння вучобы.

1930 г. быў звязаны з 10-гадовым юбілеем чыннасці самога Беларускага студэнцкага саюза. 23 лістапада гэтага года ва ўніверсітэцкай зале імя Снядэцкіх адбылася ўрачыстая акадэмія, на якой прысутнічалі многія вядомыя беларускія грамадскія і палітычныя дзеячы, прадстаўнікі ўкраінскіх, літоўскіх і габрэйскіх студэнцкіх зямляцтваў, польскага маладзёвага згуртавання «Legion Młodych», а таксама Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый у Празе, Таварыства беларускай школы, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларускага навуковага таварыства, Цэнтрасаюза і іншых інстытуцый. Было агучана звыш 20 віншавальных адрасоў ад розных беларускіх і небеларускіх арганізацый, дасланых на адрас БСС з нагоды яго юбілею. Падчас акадэміі былі прачытаны даклад С. Станкевіча, прысвечаны гісторыі беларускага студэнцкага руху XIX — першай трэці XX стст., а таксама кароткі агляд Я. Бартуля 10-гадовай чыннасці БСС. Усе актывісты Саюза былі апрануты ў сяброўскія капелюшы-фуражкі, адмыслова пашытыя для юбілею яшчэ ў сакавіку 1930 г.[25] Вечарам у прысутнасці рэктара УСБ Янушкевіча адбыўся святочны баль-канцэрт у канцэртнай зале «Apollo», на якім выступалі студэнцкі хор і струнны аркестр БСС, а таксама народная харэаграфічная танцавальная група.

Намаганнямі выдаўцоў-рэдактараў Ігната Гагалінскага, Янкі Шутовіча, Мікалая Шкялёнка і Станіслава Станкевіча ды іншых супрацоўнікаў у 1928–1930 гг. выйшлі ў свет 7 сшыткаў «Студэнцкай думкі». На наш погляд, гэты студэнцкі перыёдык адрозніваўся ад свайго маладзёвага «хадэцкага» партнёра, часопіса «Шлях моладзі», з аднаго боку, ухілам да акадэмічнасці, а з другога — большай інфарматыўнасцю, разнастайнасцю матэрыялаў і большым плюралізмам думак. Запомніліся, напрыклад, цыкл сацыяльна-псіхалагічных нарысаў Станіслава Грынкевіча «Узгадаванне характару» (1928, № 2) і «Аб прывычцы ў самаўзгадаванні» (1928, № 3), праграмныя артыкулы Тамаша Грыба «Да пытання аб навуковым доследзе і вывучэнні Беларусі» і Адольфа Клімовіча «Студэнцкім шляхам» (1928, № 1), літаратурна-біяграфічныя эсэ Станіслава Станкевіча «Іван Луцкевіч», «Істота і значэнне песні ў творчасці Янкі Купалы» (1929, № 1), даследаванне Ігната Сланеўскага «Аб гістарычных імёнах беларусаў» (1929, № 1), «абразок на злобу дня» Францішка Грышкевіча «Думкі» (1928, № 1). Уражвае сваёй аналітычнасцю артыкул Мікалая Шкялёнка «Проба аналізы народнай гаспадаркі Беларусі з пункту гледжання яе эканамічнай самавыстарчальнасці» (1930, № 2, на жаль, без заканчэння), у якім аўтар паспрабаваў разгледзець тагачасны стан эканомікі і гаспадаркі Беларусі ў кантэксце галоўнага пытання вызвольнага руху: «Ці Беларусь можа быць эканамічна самастойнай? Ці народнага даходу Беларусі хопіць дзеля зраўнаважання ўсяго неабходнага ёй імпарту чужых, замежных тавараў?». У сваім даследаванні аўтар прыходзіў да высновы, што для забеспячэння эканамічнай незалежнасці Беларусі патрэбна, па-першае, кардынальная перабудова ўсяго гаспадарчага комплексу ў бок яго інтэнсіфікацыі, перавод на рэйкі міжнароднвай канкурэнцыі, праз мэтавае інвеставанне экспартнаскладовых галін сельскай гаспадаркі і прамысловасці, а па-другое, першачарговае развіццё тых сектараў эканомікі, якія забяспечаныя мясцовай сыравінай. Аўтар таксама адзначаў важнасць мадэрнізацыі шляхоў зносін і іншых сродкаў камунікацыі ў краі, шырокага развіцця гандлю і кааперацыі.

Даволі добра прэзентавана ў часопісе творчасць Яўгена Бартуля, Сяргея Сарокі, Хведара Ільяшэвіча, Міхася Тулейкі, Германа Вялецкага, Янкі Хвораста ды іншых маладых літаратараў.

Неадназначнай у летапісе гісторыі БСС была першая палова 1930-х гг. Эканамічны крызіс і пазнейшая стагнацыя, а таксама новая хваля рэпрэсій у дачыненні да беларускага руху не дазволілі Саюзу ў поўнай меры рэалізаваць свае выдавецкія праекты (за гэты час выйшаў толькі адзін сшытак «Студэнцкай думкі» — у 1935 г.), а таксама аказваць належную матэрыяльную падтрымку сваім незаможным сябрам. Але культурна-асветная праца згуртавання ад гэтага не спынілася і ў нейкіх праявах нават пераўзышла дасягненні мінулых гадоў.

За восень 1930 г. — лета 1935 г. БСС было прачытана звыш 20 навуковых рэфератаў, зладжана некалькі канцэртаў і новых тэ-

атральных пастановак. Адзначым, што ў рэпертуары студэнцкай самадзейнай тэатральнай трупы з'яўляецца свежы драматычны матэрыял — аўтарскія п'есы саміх сябраў Саюза, а таксама творы польскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову.

У гэтыя гады па-сапраўднаму заззяла зорка беларускага хормайстра Рыгора Шырма і яго калектыву. Асаблівую славу ім прынеслі канцэрты 1932 г., на якіх разам з хорам саліраваў не хто іншы, як слынны тэнар, «беларускі салавей» Міхась Забэйда-Суміцкі. Першы канцэрт адбыўся 4 чэрвеня ў зале Віленскага гандлёва-прамысловага клуба, а другі — 15 чэрвеня ў мясцовым гарадскім парку імя генерала Люцыяна Жалігоўскага. Канцэрты сабралі тысячы слухачоў, якія яшчэ доўга ўспаміналі харавое выкананне беларусаў.

Шмат для папулярызацыі «шырмаўскай капэлы» зрабіў былы сябра БСС Адольф Зянюк, які ў 1928 г., пасля заканчэння праўнага аддзялення УСБ, працаваў на Віленскім радыё і ўзначаліў там беларускую рэдакцыю. Свае радыёлекцыі па беларусазнаўству ён ўдала аздабляў музыкальнымі нумарамі з рэпертуару калектыву Р. Шырмы. Дзякуючы таму, што гэтыя перадачы трансляваліся на ўсю Польшчу, беларускі хор БСС стаў добра вядомым не толькі ў Заходняй Беларусі, але далёка па-за межамі краю.

Сярод іншых культурніцкіх акцый гэтага года трэба назваць удзел БСС ва ўніверсітэцкай фотавыставе, на якой прэзентаваліся фотастэнд і фотаальбомы з адлюстраваннем дзейнасці Саюза за апошнія гады. Былі прадстаўлены на выставе таксама і перыядычныя выданні беларускіх студэнтаў за розны час.

У 1933 г., па просьбе Галоўнай управы ТБШ, БСС дэлегаваў двух сваіх сябраў, Марыю Мілючанку (Мілюк) і Пётру Першукевіча, на Беласточчыну для чытання навукова-папулярных лекцый па беларускай гісторыі, літаратуры і прыродазнаўству для тутэйшых жыхароў. Апошнія працавалі ўсё лета, аб'ездзіўшы Беласток і больш як дзясятак мястэчак і вёсак ваяводства. З іх жа ініцыятывы ў ваяводскім цэнтры была арганізавана публічная выстава «Змагары за ідэю», прысвечаная выбітным дзеячам беларускага нацыянальнага адраджэння.

### Узамадзеянне БСС з іншымі нацыянальнымі студэнцкімі згуртаваннямі ў Польшчы і яго міжнародныя сувязі

У сваёй чыннасці ў сценах Віленскага ўніверсітэта Беларускі студэнцкі саюз шчыльна супрацоўнічаў са згуртаваннямі літоўскіх і ўкраінскіх студэнтаў[26]. Гэтае ўзаемадзеянне і арганізацыйнае збліжэнне студэнцкіх аб'яднанняў «этнічных меншынь» у сценах УСБ было крайне неабходна для адстойвання імі сваіх нацыянальных правоў і карпаратыўных інтарэсаў, каб разам супрацьстаяць наскокам польскіх шавіністаў. Дадзеная супраца была таксама карысная і ў справе рэалізацыі культурніцкіх і выдавецкіх праектаў, дзеля здабыцця сродкаў для дапамогі незаможным навучэнцам.

Хоць стварыць супольную беларуска-літоўска-ўкраінскую студэнцкую канфедэрацыю у УСБ па розных аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах не ўдалося[27], сябры гэтых нацыянальных згуртаванняў з 1929 г. пачалі ўсё часцей кансалідавана выступаць на розных арганізацыйных сходах, адстойваючы падчас іх свае агульныя інтарэсы: па пытаннях студэнцкага самакіравання, матэрыяльнай самапомачы, культурнай чыннасці прадстаўнікоў «нетытульнай нацыі».

Так, у пачатку траўня 1929 г. прадстаўнікі гэтых трох саюзаў салідарызаваліся адносна свайго ўдзелу ў працы ўніверсітэцкай дабрачыннай арганізацыі «Братняя помач УСБ». На агульным сходзе гэтай фундацыі яны вынеслі сваю супольную прапазіцыю аб скасаванні з яе статута назвы «польская», матывуючы гэта тым, што ва ўніверсітэце вучацца не толькі палякі. Пасля таго, як большасць адхіліла іх праект рэзалюцыі, сябры ўсіх трох згуртаванняў у знак пратэсту дэманстратыўна пакінулі залу пасяджэння[28].

Карыснай для БСС і яго саюзнікаў стала іх сумесная канферэнцыя з прадстаўніком уплывовай арганізацыі «Міжнародная студэнцкая помач» (*International Student Service*) Ірвінам Паркесам у лютым 1930 г. На ёй прадстаўнікі нацыянальных студэнцкіх меншыняў выказалі сваю пазіцыю адносна розных аспектаў іх дзейнасці ў сценах УСБ.

Беларускія, літоўскія і ўкраінскія студэнты разам святкавалі свае нацыянальныя і студэнцкія святы, арганізоўвалі сумесныя сяброўскія гарбаткі, на якіх разам спявалі свае нацыянальныя песні, дэкламавалі вершы сваіх паэтаў-песняроў, проста добра праводзілі вольны

час[29]. Была спроба рэалізаваць таксама сумесны культурніцкі праект — у 1929 г. быў утвораны беларуска-ўкраінскі студэнцкі хор пад кіраўніцтвам украінскага хормайстра Юліяна Фарэнды. Праўда, праіснавала капэла толькі кароткі час і распалася з прычыны той жа «змены пакаленняў», калі большасць харыстаў, закончыўшы ўніверсітэт, раз'ехалася ў іншыя месцы. Пачынаючы з 1930 г., штогод па чарзе ў сядзібах кожнага са студэнцкіх саюзаў арганізоўваліся рэпрэзентацыйныя беларуска-літоўска-ўкраінскія канцэрты-балі. Гэта стала добрай традыцыяй да самага пачатку Другой сусветнай вайны.

Кантакты сябраў БСС не абмяжоўваліся толькі сцэнамі Віленскага ўніверсітэта. Яны падтрымлівалі шчыльную сувязь з украінскімі студэнцкімі арганізацыямі ў Львове (прынамсі з Таварыствам украінскіх студэнтаў «Аснова» пры Львоўскай політэхніцы), Познані і Гданьску (Данцыгу).

Беларускі студэнцкі саюз у пачатку 1930-х гг. станавіўся важнейшым звяном ва ўсёй міжнароднай працы беларускага студэнцтва за кардонам. Узаемадачыненні з пражскім кіраўніцтвам Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА) БСС наладзіў яшчэ ў 1924 г., калі ў Варшаву, дзе адбываўся з'езд Канфедэрацыі міжнароднага студэнцтва, ад пражскіх беларусаў прыехаў Уладзімір Жылка. Планавалася, што на 3-ці з'езд АБСА 1927 г. у Прагу прыедуць і дэлегаты з Вільні. З розных прычын гэта не адбылося, але ўжо на наступным, 4-м з'ездзе АБСА, дэлегацыя ад БСС у складзе Станіслава Станкевіча і Яўгена Бартуля прысутнічала. Факт уваходу абодвух віленчукоў у склад кіраўніцтва асацыяцыі сведчыў, па-першае, пра высокі аўтарытэт БСС сярод усяго беларускага студэнцтва, а, па-другое — што ў 1930 г. цэнтрам грамадскай і культурнай чыннасці беларускіх студэнтаў-незалежнікаў была ўжо не Прага, а Вільня.

Пазней, акрамя Станіслава Станкевіча (загадчыка эканамічнага аддзела АБСА) і Яўгена Бартуля (кіраўніка яго прэсавага аддзела) у склад аб'яднання ўвайшоў таксама Мікалай Шкялёнак (старшыня спартовага аддзела). Натуральна, што сядзібай і месцам працы гэтых найважнейшых аддзелаў стала таксама Вільня.

На жаль, змены ў польскім заканадаўстве, якія адбыліся ў пачатку 1930-х гг., пазбавілі БСС юрыдычных магчымасцяў для развіцця надалей свайго міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках АБСА. У выкананне ўрадавага палажэння «Аб акадэмічных школах» ад 1 красавіка 1933 г. міністр асветы Польшчы загадаў забараніць студэнцкім згуртаванням «неагульнанацыянальнага характару» ўваходзіць у склад замежных і міжнародных студэнцкіх аб'яднанняў. У верасні таго ж года кіраўніцтва Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні звярнулася ў міністэрства асветы з хадайніцтвам аб дазволе далейшага сяброўства ў складзе АБСА. Але вердыкт польскіх чыноўнікаў быў адназначна адмоўны.

### Таварыства прыяцеляў беларусаведы

У канцы 1920-х гг. кіраўніцтва БСС паставіла задачу разам з папулярызацыяй ведаў па беларусазнаўству распачаць грунтоўнае і ўсебаковае навуковае вывучэнне заходнебеларускага рэгіёну. Дзеля рэалізацыі гэтай праграмы патрэбна было ствараць новую арганізацыю.

Увесну 1928 г. была сфармавана ініцыятыўная група па ўтварэнні Беларускага студэнцкага краязнаўчага таварыства (БСКТ). 13 чэрвеня 1929 г. ініцыятары стварэння новай арганізацыі (Віктар Уласевіч, Янка .Хвораст, Барыс Кіта (Кіт), Алена Казлоўская і Пятро Шчасны) звярнуліся да рэктара Віленскага ўніверсітэта з просьбай яе легалізацыі. Пад заявай свае подпісы паставілі ўсе сябры БСС — студэнты-беларусы, што навучаліся ў УСБ. Паводле прадстаўленага праекта статута, БСКТ павінна было спрыяць паглыбленню ведаў па беларускай геаграфіі, этнаграфіі, літаратуры і гісторыі. З гэтай мэтай меркавалася ладзіць акадэмічныя чытанні, дыскусійныя семінары (рэфераты) па беларусазнаўчай тэматыцы, ладзіць краязнаўчыя вандроўкі па тэрыторыі краю. Разам з гэтым планавалася рабіць для тутэйшага беларускага жыхарства тэатральныя прадстаўленні і канцэрты. Сярод праграмных задач было таксама запланавана выданне адмысловага краязнаўчага часопіса, заснаванне бібліятэкі.

Дадзенае таварыства тады легалізаваць не ўдалося. Затое дзякуючы намаганням беларускіх студэнтаў пры падтрымцы дэмакратычна настроенай польскай прафесуры была рэалізавана ініцыятыва маладога доктара філалогіі Янкі Станкевіча — у тым жа 1929 г. была ўтворана кафедра беларусазнаўства пры гуманітарным факультэце УСБ. Сапраўдным святам беларушчыны стаў дзень 15 лістапада




*Удзельнікі хору Беларускага студэнцкага саюзу ў Вільні разам з хармацстрам Р. Шырмай і адным з лідэраў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Я. Пазняком. Пачатак 1930-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

1930 г., калі адбылася першая публічная лекцыя па беларускай мове, прачытаная Я. Станкевічам. У аўдыторыі былі не толькі студэнты, прыйшлі многія прыхільнікі роднага слова. Зала была набіта людзьмі. «Першая гэтая лекцыя была нейкай дзіўна радаснай, — пісаў па гарачых слядах карэспандэнт часапісу «Шлях моладзі». — Заля ледзь змясціла ўсіх жадаючых. Прыйшлі студэнты, беларускія інтэлектуалы, прыйшоў нават 10-гадовы хлапец».

Ідэя стварэння беларускай навуковай студэнцкай арганізацыі не згасла. Яна была ўвасобленая ў жыццё ў пачатку 1931 г., калі ўзнікла «Таварыства прыяцеляў беларусаведы пры УСБ у Вільні». Каля 2 гадоў арганізацыя дзейнічала без легалізацыі яе ў рэктараце ўніверсітэта, і толькі 27 лістапада 1933 г. статут Таварыства прыяцеляў беларусаведы (ТПБ) быў нарэшце зацверджаны сенатам універсітэта, а яго куратарам быў прызначаны шчыры прыяцель беларускіх студэнтаў доктар Э. Кашмідэр. На 1933 г. гурток складаўся з 23-х чалавек. На працягу свайго існавання колькасць яго дзейсных сяброў вагалася ад 14 да 20. Паводле дадзеных на 1935 г., у склад урада гуртка ўваходзілі Вітаўт Тумаш (старшыня), Таццяна Мацвеева, Зоя Каўшанка, Ігнат Будзьчанка, Пятро Засім, Алесь Махонька, Віктар Войтанка, Мікалай Шчорс, Язэп Бурак і іншыя.

Паводле статута, характар чыннасці ТПБ вызначаўся як чыста навуковы: «Пашырэнне ведаў у галіне беларусаведы (мова, літаратура, гісторыя, этнаграфія ды інш.)». Таксама меркавалася, што гурток будзе аказваць вучэбна-навуковую падтрымку беларускаму студэнцтву («паглыбленне ведаў па беларусазнаўству праз арганізаванне навуковых сходаў і доступ да бібліятэкі гуртка») і прапагандаваць беларускія навуковыя дасягненні.

Рэалізацыя пастаўленых мэтаў бачылася ў вывучэнні і аналізе навуковай літаратуры па беларусістыцы, распрацоўка і выданне ўласных даследаванняў па гісторыі, мовазнаўстве, літаратуры




*Спявак М. Забейда-Суміцкі, кампазітар Л. Галкоўскі і хармайстр Р. Шырма разам з удзельнікамі хору Беларускага студэнцкага саюзу. Вільня, 1932 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь*

і этнаграфіі, выяўленне, археаграфічнае апісанне дакументаў і матэрыялаў, звязаных з беларускай тэматыкай у мясцовых архівах, музеях і бібліятэках. Найважнейшымі задачамі Таварыства былі ўтварэнне ўласнай бібліятэкі і навуковае ўзаемадзеянне з іншымі беларускімі навуковымі асяродкамі як у Польшчы, так і за яе межамі.

Уся праца Таварыства была падзелена на 4 секцыі: філалагічную, этнаграфічную, літаратурную і гісторыка-эканамічную. У рамках адзначаных секцый арганізоўваліся навуковыя сходы, тэматычныя вечарыны, дыскусійныя сустрэчы, чытанні рэфератаў, публічна абмяркоўваліся новыя літаратурныя творы.



*Спявак М. Забейда-Суміцкі, хармайстр Р. Шырма, прафесар Э. Кашмідэр з хараістамі і актывістамі Беларускага студэнцкага саюзу пад бел-чырвона-белай сімволікай згуртавання. Вільня, 1932 г. Нацыянальны гістарычны музей Беларусі.*

За час чыннасці (1931–1939 гг.) ТПБ былі прачытаны дзясяткі навуковых рэфератаў і лекцый па розных галінах ведаў, звязаных з беларусазнаўчай тэматыкай. Акрамя студэнтаў, на пасяджэнні гуртка прыходзілі ўсе жадаючыя: ад гімназістаў да настаўнікаў і сталых працаўнікоў. Так, у 1934/35 навучальным годзе ў сценах таварыства былі прачытаныя і абмеркаваныя 9 навуковых дакладаў: Янкі Хвораста «Аб вясельных абрадах на Палессі», Янкі Станкевіча «Беларусіка на 2-м з’ездзе славянскіх філолагаў у Варшаве ў 1934 г.», «Месца паходжання і аўтары беларускага летапісу», «Аб беларускай мове Віленшчыны ў XVI ст.» і «Урадавы і літаратурны язык Вялікага Княства Літоўскага. Памяткі беларускія і ўкраінскія», Мар’яна Пецюкевіча «Марксісцкія метады ў этнаграфічных доследах у СССР», Станіслава Станкевіча «Беларускі фальклярыстычны элемент у баладах Адама Міцкевіча», сумеснае навуковае паведамленне Я. Станкевіча, С. Станкевіча і В. Тумаша «Мова беларускай прэсы ў Вільні». Апошні калектыўны даклад выклікаў вялікі рэзананс сярод беларускай грамадскасці ў Вільні. У гэтым паведамленні крытычна аналізаваўся ўзровень моўнай культуры заходнебеларускіх газет і часопісаў. Адзначалася засмечванне беларускай прэсы паланізмамі і русізмамі (апошняе было ўласціва для выданняў камуністычнага кірунку). Пад уплывам гэтага даследавання група беларускіх філолагаў, педагогаў і публіцыстаў пачала ладзіць сістэматычныя зборкі, на якіх абмяркоўваліся пытанні «чысціні беларускай літаратурнай мовы» і практычныя крокі па ўпарадкаванні беларускага правапісу. Разам з тым філалагічная секцыя Таварыства распачала працу над укладаннем польска-беларускага слоўніка. Добрыя вынікі чыннасці працы гэтай секцыі тлумачацца ў першую чаргу тым, што праца




*Афіша канцэрта хору Беларускага студэнцкага саюзу ў Вільні за 15 чэрвеня 1932 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*



*Рыгор Шырма і Канстанцін Галкоўскі разам з маладымі беларускімі літаратармі Натальляй Арсеневай, Максімам Танкам, Хведарам Ільяшэвічам, Яўгенам Бартулем, Міколам Шчорсам і іншымі. Канец 1920-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*



*Сябры заходнебеларускага літаратурнага аб'яднання «Веснаход». У 1-м радзе сядзяць (злева направа): Яўген Бартуль, Наталля Арсеннева, Антон Луцкевіч, Міхась Васілёк; у 2-м радзе стаяць: Ігнат Дварчанін, Вінцук Грышкевіч, ?, ?, Хведар Ільяшэвіч, ?. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Друкуецца ўпершыню.*

студэнтаў адбывалася пры падтрымцы больш сталых і дасведчаных калегаў (Янкі Станкевіча, Станіслава Грынкевіча і інш.), якія, дзякуючы сваім ведам, дапамагалі студэнтам і кіравалі іх навуковай працай.

Асобна трэба сказаць пра літаратурныя дыспуты, што даволі рэгулярна арганізоўвала Таварыства для абмеркавання твораў і творчага крэда заходнебеларускіх пісьменнікаў: Наталлі Арсенневай, Максіма Танка, Хведара Ільяшэвіча, Яўгена Бартуля, Янкі Хвораста, Міхася Тулейкі ды інш. Як правіла, гэтыя персанальныя абмеркаванні адбываліся ў прысутнасці аўтараў, каб прыхільнікі і крытыкі іх творчасці маглі непасрэдна задаваць ім пытанні.

Перманентнай праблемай для ТПБ была адсутнасць адпаведнага памяшкання для правядзення паўнавартаснай навуковай працы. Сядзіба Таварыства месцілася ў Вільні ў адзіным пакойчыку на Замкавай, 13. Для арганізацыі навуковых акадэмій і пасяджэнняў даводзілася заўсёды выпрошваць у гаспадарчага аддзела УСБ патрэбнай аўдыторыі. Прыходзілася туліцца па цесных універсітэцкіх закутках.

Сябры Таварыства праводзілі навукова-даследчую працу па збіранні этнаграфічнага і мовазнаўчага матэрыялу на тэрыторыі Віленшчыны, Дзісеншчыны, Палесся і іншых рэгіёнаў Заходняй Беларусі. Дзеля ўпарадкавання і навуковай сістэматызацыі палявых даследаванняў ТПБ у 1935 г. выдала 2 анкетных апытальнікі: 1) Мар'яна Пецюкевіча «Увагі дзеля запісываньня пахаронных абрадаў і абрадаў памінальных дзён»[30] і 2) Янкі Станкевіча «Апытальнік да запісываньня дыялектычных асаблівасьцяў крывіцкага (беларускага) языка» (накладам у 500 асобнікаў). Таксама ў 1931 г. пабачыла свет брашура Я. Станкевіча (Б. Скарыніча) «Нашто і як зьбіраці геаграфічныя і асабовыя назовы беларускія» (выданне фінансавалася Беларускім студэнцкім саюзам).

Сябры этнаграфічнай і моўнай секцый сабралі вялікую калек-




*Паэтэса Наталля Арсеннева разам з Мікалаем Шчорсам (злева) і Станіславам Станкевічам падчас шпацыру па вуліцы Вільні. Другая палова 1930-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

цыю матэрыялаў, якія ўвайшлі ў «Збор этнаграфічных і языкаведных матэрыялаў». Гэта ўнікальная база звестак, падзеленая на 18 блокаў (народныя песні, казкі, байкі, абрады, варожбы, вераванні і г. д.), якія штогод папаўняліся новымі матэрыяламі, назапашанымі студэнтамі падчас летніх вакацый[31]. Дадзены этнаграфічны збор пазней трапіў у Беларускі музей імя І. Луцкевіча ў Вільні і захаваўся падчас Другой сусветнай вайны.

Не абмінём увагай таксама грунтоўны дапаможнік «Анкетны апытальнік вясковых гаспадарак Заходняй Беларусі», складзены гісторыка-эканамічнай секцыяй ТПБ па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам Мікалая Шкялёнка яшчэ ў 1931 г. Мэта дадзенай анкеты, якая складалася з 57 пытанняў, вызначэнне аптымальных памераў зямельнага надзелу беларускага селяніна і яго бюджэту для эфектыўнага вядзення сваёй гаспадаркі. У рамках палявых даследаванняў планавалася сабраць разнастайныя звесткі сацыяльна-эканамічнага і культурнага характару з жыцця прыватных гаспадарак краю, падзяляючы іх на тры групы: найбуйнейшыя (абшарніцкія), сярэднія і малазямельныя. Пры гэтым асобна выдзяляліся хутарскія гаспадаркі і гаспадаркі вайсковых асаднікаў. На аснове праведзенага апытання аўтары праекту імкнуліся выявіць заканамернасці ў развіцці заходнебеларускай вёскі, каб аргументавана даказаць дыскрымінацыйны характар аграрнай палітыкі польскага ўрада на «kresach wschodnich», а таксама намагаліся выпрацаваць уласную праграму рацыянальнага гаспадарання, адрасаваную тутэйшым сялянам.

Галоўным недахопам у дзейнасці Таварыства прыяцеляў беларусаведы трэба прызнаць яго выключны ўхіл да гуманітарных даследаванняў і адсутнасць увагі да пытанняў, звязаных з вывучэннем геалогіі, заалогіі, флоры і фаўны Беларусі і іншых галінаў прыродазнаўства.

У 1934 г. была закладзена ўласная навуковая бібліятэка Таварыства. Без дапамогі звонку сябры ТПБ за ўласныя сродкі здолелі сабраць за 2 гады (стан на 1935 г.) каля 400 найменняў кніг навуковага і літаратурнага зместу.

Чыннасць ТПБ аказалася вельмі прадуктыўнай. Апошні яе старшыня Вітаўт Тумаш пісаў у 1935 г.: «Трэба адзначыць, што на беларускай навуковай ніве ў Заходняй Беларусі, — нягледзячы на многія яшчэ недахопы, — Таварыства ў сучасны момант з’яўляецца найбольш рухомай арганізацыяй. Дзейнасць Таварыства часта не агранічваецца мурамі ўніверсітэта, але дае водгук у шырэйшым грамадстве... Сябры, скончыўшыя ўніверсітэт, звычайна не губляюць лучнасці з Таварыствам, хаця фармальна і не могуць ужо да яго належаць. І калі Таварыства можа пахваліцца



*Рыгор Шырма разам з маладымі беларускімі літаратарамі Х. Ільяшэвічам, Я. Бартулем, М. Танкам, М. Шчорсам, М. Машарай ды інш. Вільня, другая палова 1920-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

вялікай, адносна да сваіх сіл, працай, дык гэта галоўным чынам дзякуючы супрацоўніцтву сваіх былых сяброў». Шмат чаго не паспелі зрабіць маладыя прыяцелі навукі, а шмат здзейсненага захавалася ці стала падмуркам для сур'ёзных навуковых даследаванняў, для напісання новых кніг па беларусазнаўству.

У 1927 г. была спроба стварэння згуртавання маладых беларускіх пісьменнікаў Заходняй Беларусі. У гэтым годзе была пададзена заяўка на рэгістрацыю літаратурнага аб'яднання «Веснаход», куды ўвайшлі Наталля Арсеннева, Яўген Бартуль, Язэп Бурак, Герман Вялецкі, Міхась Васілёк, Хведар Ільяшэвіч, Міхась Машара, Максім Танк, Міхась Тулейка, Янка Хвораст ды шэраг іншых маладых аўтараў. Але ініцыятыва творчай моладзі аказалася непажаданай для польскіх улад.

## СПРОБЫ РАСКОЛУ БСС І ДЗЕЙНАСЦЬ ПАРАЛЕЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ СТУДЭНТАЎ-БЕЛАРУСАЎ У ВІЛЬНІ

Канец 1920-х — пачатак 1930-х гг. — гэта час разброду ў беларускім студэнцкім руху з ідэйнага пункту гледжання. Да пачатку 1930 г. у Беларускім студэнцкім саюзе адчуваўся моцны ўплыў КПЗБ. Маладыя актывісты і прыхільнікі гэтай партыі Ю. Саковіч, Г. Вялецкі, Я. Хвораст, І. Касяк, М. Скурчанка ды іншыя ў канцы 1929 г. паспрабавалі перахапіць кіраўніцтва ў Саюзе ў свае рукі і скінуць «цэнтрыстаў», што адстойвалі палітычны нейтралітэт. Заснаваўшы на сродкі КПЗБ уласны часопіс «Вольная думка» (выйшла ўсяго 2 нумары), «паступоўцы» распачалі ідэалагічную атаку па дыскрэдытацыі тагачаснага ўрада БСС, а разам з ім і Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА), абвінавачваючы іх у здрадзе інтарэсам беларускіх сялянскіх мас. Але большасць актывістаў БСС не пайшлі за імі і засталіся вернымі старой ідэйнай платформе. Пад рэзалюцыяй «зменавехаўцаў» падпісаліся ўсяго 9 чалавек.




*Адбітак вуглавога штэмпеля заходнебеларускага часопіса «Калоссе». Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

Падзеі ў Савецкай Беларусі 1930–1931 гг., звязаныя з пачаткам масавых рэпрэсій супраць беларускай нацыянальнай эліты па сфабрыкаванай справе «Саюз вызвалення Беларусі», хітнулі маятнік сімпатый маладых беларусаў у іншы бок. Глянец бальшавіцкай ідэалогіі пачаў тускнець. У выніку адбылося ачышчэнне шэрагаў БСС ад камсамолу.

У студзені 1930 г. у Празе адбыўся з'езд АБСА, на якім прысутнічалі і сябры віленскага




*Адбітак пячаткі заходнебеларускага часопіса «Маладая Беларусь».*



*Акруговы з'езд Таварыства беларускай школы ў Баранавічах. У цэнтры сядзяць Р. Шырма і А. Уласаў. Фота другой паловы 1920-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

БСС — Станіслаў Станкевіч і Яўген Бартуль. З'езд прыняў рэзалюцыю з пратэстам супраць наяўнага палітычнага становішча ў СССР і пераследу беларускіх нацыянальных дзеячаў, а таксама выступіў за паляпшэнне ўмоў жыцця і нацыянальна-культурнай дзейнасці беларускіх студэнтаў у Польшчы.

Беларускае студэнцтва Вільні было добра інфармавана пра справу «СВБ» і масавыя арышты ў БССР. 18 сакавіка 1930 г. сябры БСС правялі першае «пратэстацыйнае веча», на якім Станіслаў Станкевіч, Яўген Бартуль і Сяргей Сарока ад імя ўсяго Саюза выказалі абурэнне арыштамі дзясяткаў беларускіх нацыянальных дзеячаў. На сходзе была прынята агульная рэзалюцыя пратэсту, тэкст якой быў змешчаны не толькі ў заходнебеларускай прэсе, але і ў некаторых польскіх і расійскіх эміграцыйных газетах, перыёдыках Чэхаславакіі, Літвы і Латвіі. Чуткі пра самагубствы Усевалада Ігнатоўскага і Янкі Купалы[32] выклікалі хвалю абурэння сярод маладых беларусаў Заходняй Беларусі. Хто ведае, можа, якраз той шырокі рэзананс гэтых пратэстаў і выратаваў тады жыццё Янку Купалу, і бальшавікі ў рэшце рэшт замест выпісвання ордэра на ягоны арышт узнагародзілі паэта ордэнам Леніна.

Помста бальшавіцкіх памагатых не прымусіла доўга чакаць. Падчас святкавання 24 сакавіка 1930 г. 12-х угодкаў святкавання Акта Незалежнасці Беларусі ў залу, дзе адбываліся ўрачыстасці з ініцыятывы БСС, уварваліся каля 200 камсамольцаў розных нацыянальнасцяў, якія пачалі закідваць беларускіх актывістаў каменнямі, паліваць прысутных чырвонай фарбай і скандаваць камуністычныя лозунгі. Беларусам удалося адбіць гэты бандыцкі напад, але ў выніку пагромнай акцыі адзін студэнт атрымаў раненне, былі пабітыя шыбы, пашкоджана мэбля. У адказ на «франдзіраванне» і спробы расхалоць Саюз, на агульным сходзе арганізацыі было пастаноўлена выключыць Юльяна Саковіча, Германа Вялецкага і шэраг іншых асобаў са складу БСС.

У гэты ж час іншыя палітычныя групоўкі імкнуліся таксама



*На «літаратурнай гарбатцы» ў гасцях у інжынера Антона Неканды-Трэпкі. Стаяць (злева направа): Пётра Сяргіевіч, М. Мілючанка, Станіслаў Станкевіч, А. Неканда-Трэпка; сялзяць: Янка Шутовіч, Максім Танк, Наталля Арсеннева, Антон Луцкевіч, Рыгор Шырма, Г. Трэпчыха. Вільня, 1937 г.*



*Акруговы з’езд Таварыства беларускай школы ў м. Мір. У 2-м радзе ў цэнтры сядзіць С. Паўловіч і П. Валынец. Фота пачатку 1930-х гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

зацвердзіць свой уплыў на беларускае студэнцтва. Але не толькі сутыкненні на глебе ідэйных перакананняў пагражалі арганізацыйнаму расцярушванню Саюза. Дэзарганізацыю дзейнасці БСС таксама правакавалі асабістыя амбіцыі лідараў палітычных груп у барацьбе за сімпатыі студэнцкай моладзі.

З канца 1920-х гг. у БСС паступова ўзмацняюцца пазіцыі прыхільнікаў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Апошнія пры падтрымцы Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры з 1929 г. пачынаюць выдаваць уласны часопіс «Шлях моладзі», які на працягу некалькіх гадоў амаль штомесяц рэгулярна выходзіў і набыў даволі шырокую папулярнасць сярод беларускай моладзі, дзякуючы навукова-папулярнаму і публіцыстычнаму кірунку сваіх публікацый.

У лістападзе 1929 г. маладыя «хадэкі» ініцыявалі стварэнне Таварыства беларускай моладзі «Будучыня». Сярод закладнікаў новага маладзёвага згуртавання былі супрацоўнікі рэдакцыі «Шляху моладзі» Альфонс Шутовіч, Мар’ян Пецюкевіч, Язэп Найдзюк, Язэп Малецкі, Часлаў Ханяўка і інш. Апошнія імкнуліся пашырыць кола прыхільнікаў нацыянальна-культурнага адраджэння і выйсці за рамкі чыста студэнцкай арганізацыі. Згуртаванне мела амаль тыя ж самыя мэты, што і БСС: пашырэнне беларускай асветы і культуры, развіццё самаадукацыі ў беларускім нацыянальным духу, прапаганда спорту і здаровага ладу жыцця, арганізацыя самапомачы сярод студэнцтва. У праекце статута адзначалася, што аб’яднанне ў рэалізацыі сваіх статутных заданняў будзе абапірацца на ідэі хрысціянства і хрысціянскай маралі. Двойчы ініцыятары ўтварэння арганізацыі падавалі статутныя дакументы на яе зацвярджэнне і двойчы ім адмаўлялі ў легалізацыі. Смеху вартай была матывацыя ў адмове Віленскай ваяводскай управы за 12 ліпеня 1929 г.: «Ухіл да камуністычнай ідэалогіі».

Пасля разгрому Грамады «памяркоўныя сацыялісты» (Тодар Куніцкі, Станіслаў Станкевіч, Мікалай Амельяновіч, Мікалай Шкялёнак, Канстанцін Глінскі, Сяргей Сарока ды інш.), не выходзячы са складу БСС, паспрабавалі ўтварыць «запасную» арганізацыйную пляцоўку, якую назвалі Саюзам студэнтаў-народнікаў імя Ф. Багушэвіча. Гэтая арганізацыя была арыентавана на палітычную групу Антона Луцкевіча і Радаслава Астроўскага (Цэнтрасаюз). На агульнай зборцы 26 студзеня 1930 г. студэнты-«народнікі» звярнуліся да рэктара УСБ з просьбай зарэгістраваць і зацвердзіць статут новай карпарацыі. Але праграму «народнікаў» — падтрыманне цесных сувязяў з народніцкім рухам; разгортванне шырокай культурна-асветнай працы на вёсцы дзеля паглыблення і пашырэння ідэалогіі народнікаў — сенат універсітэта палічыў занадта палітызаванай і адмовіў падавальнікам заяўкі ў легалізацыі.

У красавіку 1930 г. агульны сход Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні прыняў рэзалюцыю, у якой была агучана новая праграма дзеянняў. Яе лейтматывам стала задача абмежавання ўплыву на арганізацыю розных палітычных груповак. Са складу БСС былі выключаныя яшчэ шэраг пракамуністычных актывістаў, зробленыя крокі дзеля наладжвання рэгулярнага выхаду часопіса «Студэнцкая думка». Але гэта не спыніла палітычнай працы ў Саюзе. Ужо праз год, пасля выбараў новага ўрада БСС, у яго шэрагах пачаліся новыя сутыкненні, цяпер ужо паміж прыхільнікамі беларускай хадэцыі і тымі, хто падзяляў погляды А. Луцкевіча і Р. Астроўскага.

Увесну 1931 г. сябры БСС, што прытрымліваліся праграмы Цэнтрасаюза (Леанід Галяк, Янка Зянюк, Канстанцін Глінскі, Яўген Бартуль, Альберт Мілер ды яшчэ некалькі асоб — усяго 12 чалавек), не выходзячы са складу Саюза, паралельна ствараюць студэнцкую карпарацыю «Скарынія». Не атрымаўшы згоды большасці сябраў БСС на «падвойнае сяброўства», большасць вышэйпералічаных дзеячаў выходзяць са складу БСС і дамагацца легалізацыі вышэй згаданай новай арганізацыі. Статут згуртавання быў хутка зацверджаны кіраўніцтвам УСБ. Куратарам «Скарыніі» стаў доктар права Ежы Панейка.

З гэтага часу пачынаюцца вострыя спрэчкі паміж дзвюма групоўкамі, якая эпізадычна вылівалася на старонкі іх друкаваных органаў: часопіса БСС «Студэнцкая думка» і «санацыйнага» перыёдыка «Novaja Varta». У «палеміцы» найбольш шчыравалі прыхільнікі Цэнтрасаюза. Трэба сказаць, што пазіцыя прыхільнікаў «беларускай санацыі» не знайшла належнай падтрымкі сярод беларускага студэнцтва. Большасць студэнтаў засталася ў рамках старога Беларускага студэнцкага саюза (прыкладна 45 чалавек). «Цэнтрасаюз» і яго маладзёвае крыло «Скарынія» жорстка крытыкавалася як з боку камуністаў, так і з боку хадэкаў. У самой арганізацыі таксама штораз узнікалі ўнутраныя непаразуменні.

Палітычны развод паміж А. Луцкевічам і Р. Астроўскім прывёў да дэмаралізацыі дзейнасці «Скарыніі». 22 чэрвеня 1934 г. рашэннем сената ўніверсітэта за неадпаведнасць чыннасці карпарацыі новаму заканадаўству і з-за «поўнага маральнага ўпадку» апошняя была распушчана. Але ўжо ў траўні 1934 г. частка яе былых актывістаў дабілася рэгістрацыі новага згуртавання — «Беларускага студэнцкага таварыства імя Ф. Скарыны» на чале з Альбертам Мілерам. Яго куратарам быў прызначаны доктар Вітальд Свіда. Праграмныя мэты арганізацыі мала чым адрозніваліся ад ранейшай «Скарыніі»: «выхаванне з кожнага сябра карпарацыі сапраўднага грамадзяніна, адданага працы на карысць народу і бацькаўшчыне»; узаемная інтэлектуальная дапамога праз чытанне рэфератаў; правядзенне навуковых сходаў і матэрыяльная самапомач. Новае аб'яднанне, аднак, мала чым праявіла сябе. Аслабленне аўтарытэту Антона Луцкевіча сярод беларускага студэнцтва адбівалася і на папулярнасці «скарынаўцаў». Рашэннем ад 19 чэрвеня 1936 г. сенат УСБ скасаваў гэтае даволі інертнае і безыніцыятыўнае таварыства.

Паводле дадзеных універсітэцкай статыстыкі за 1935 г., у сценах УСБ навучалася каля 100 беларусаў, і толькі трохі больш як палова іх з'яўляліся сябрамі Беларускага студэнцкага саюза. Астатнія або праяўлялі поўную незацікаўленасць у грамадскай і культурнай чыннасці, або ўваходзілі ў іншыя студэнцкія карпарацыі. Нагадаем, што ў сценах Віленскага ўніверсітэта дзейнічалі шэраг рэгіянальных студэнцкіх аб'яднанняў (зямляцтваў), якія аб'ядноўвалі ў сваіх «колах» ураджэнцаў таго ці іншага ваяводства або рэгіёна. У траўні 1924 г. сенатам УСБ быў зарэгістраваны «Гурток студэнтаў-гродзенцаў», роўна праз год атрымаў легалізацыю «Саюз студэнтаў Навагрудскага ваяводства і Менскай зямлі», 19 чэрвеня 1931 г. універсітэцкім сенатам быў зацверджаны статут «Гуртка студэнтаў-дзісенцаў». У 1920-я — 1930-я гг. у сценах УСБ дзейнічала таксама студэнцкая карпарацыя «Полісse», куды ўваходзілі ўраджэнцы Берасцейшчыны і




*Сябры Скідзельскага гуртка Таварыства беларускае школы ў Гродзенскім павеце. Пачатак 1930-х гг.*



*Сябры тэатральна-мастацкай секцыі Скідзельскага гуртка ТБШ. Пачатак 1930-х гг.*

Піншчыны, а таксама ўкраінскай Валыні.

Статутныя палажэнні адзначаных зямляцтваў былі вельмі падобныя: матэрыяльная самадапамога студэнтаў, азнаямленне сяброў з гісторыяй, геаграфіяй і этнаграфіяй свайго рэгіёна, стварэнне ўласнай бібліятэкі, арганізацыя навуковых чытанняў, краязнаўчых вандровак, пашырэнне асветы сярод мясцовага насельніцтва. Іх прапольская арыентацыя была відавочная: у статутах гэтых аб'яднанняў мы не знойдзем вызначэнняў «Беларусь» і «беларускі». Галоўным іх прызначэннем з'яўлялася выхаванне сваіх сяброў «на грунце польскай дзяржаўнасці», умацаванне сярод тутэйшага жыхарства польскага нацыянальнага ўсведамлення. У названыя зямляцтвы забаранялася прымаць габрэяў, што характарызуе ксенафобскія настроі заснавальнікаў гэтых гурткоў. Абсалютную большасць іх актывістаў складалі асобы каталіцкага веравызнання, якія вызнавалі сваёй роднай мовай польскую. Аднак, што цікава, найбольш схільнымі да праяваў «польскага нацыяналізму» былі беларускія палешукі, якія гуртаваліся ў карпарацыі «Полісе»[33].

Колькасны склад паасобных зямляцтваў ніколі не быў стабільны. Падчас эканамічнага крызісу 1929–1932 гг. многія студэнты актыўна запісваліся ў падобныя гурткі, каб атрымаць дармовую фінансавую дапамогу. Зразумела, што праўрадавыя студэнцкія карпарацыі мелі значна большыя магчымасці матэрыяльна падтрымаць навучэнцаў. Найбольш прагматычныя студэнты «прысутнічалі» адразу ў некалькіх карпарацыях. У эканамічна стабільныя гады, наадварот, адбываўся адток сяброў з гэтых арганізацый. Напрыклад, у 1930–1932 г. «Гурток студэнтаў-гарадзенцаў» налічваў 60 сяброў, у «лепшым» 1933 г. — 23, а ў перадваенныя 1937–1939 гг. — каля 40.

Можна сказаць, што згаданыя студэнцкія «зямляцтвы» мала пакінулі пра сябе ўспаміну. Рэдка іх чыннасць выходзіла за рамкі арганізацыі, а іх праца не рабіла сур'ёзнага ўплыву на тутэйшую моладзь, на шырэйшыя колы грамадства. Не было ў іх той высокай кансалідацыйнай ідэі, якая магла б іх аб'яднаць і натхніць на вырашэнне сур'ёзных грамадскіх праблем. Усё ў іх чыннасці зводзілася галоўным чынам да пытанняў матэрыяльнага забеспячэння студэнцкага быцця.

### Напярэдадні Другой сусветнай вайны

У перадваенныя гады (1937–1939 гг.) з усіх беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый у Вільні заставаліся толькі Беларускі студэнцкі саюз і Таварыства прыяцеляў беларусаведы, а таксама Беларускае навуковае таварыства, што апекавалася Беларускім музеем імя І. Луцкевіча. Нягледзячы на ўзмацненне аўтарытарных парадкаў у краіне, у беларускім студэнцкім асяродку працягвалася грамадская і культурніцкая праца. Па-ранейшаму дзейнічала харавая капэла Рыгора Шырмы, выдаваліся перыёдыкі, праводзілася навукова-даследчая чыннасць сябрамі ТПБ. З'явіліся новыя студэнцкія выданні. Са снежня 1935 г. Вацлаў Папуцэвіч, Адам Дасюкевіч, Мітрафан Смаршчок і Міхась Канцэлярчык пачалі выпускаць дадатак «Студэнцкая трыбуна» да газеты «Беларуская крыніца», у 1938 г. пабачылі свет першыя нумары «Шляху беларускага студэнта». Найбольшую ўвагу звяртае на сябе часопіс беларускай каталіцкай моладзі «25 Sakavika». Па актуальнасці,

узважанасці і аналітычнасці змешчаных матэрыялаў, прысвечаных злабадзённым праблемам заходнебеларускага грамадства і ў цэлым усёй Беларусі, дадзенае выданне выгадна адрознівалася ад многіх іншых беларускамоўных перыёдыкаў, што выходзілі тады ў Вільні.

Пэўным чынам на беларускім студэнцкім жыцці адбілася палітычнае суперніцтва паміж прыхільнікамі Адама Станкевіча і групай Вінцэнта Гадлеўскага. Першая групоўка ў якасці прапагандысцкай пляцоўкі выкарыстоўвала газету «Беларуская крыніца» і часопіс «Шлях Моладзі», а апошнія змяшчалі свае дыскусійныя матэрыялы ў газеце «Беларускі фронт» і часопісе «25 Sakavika». Мелі месца таксама і дыскусіі на тэалагічныя тэмы. Так, 25 красавіка 1936 г. у зале пасяджэнняў БСС адбыўся рэлігійны дыспут, на якім магістр Вацлаў Папуцэвіч і студэнт Бабок «з навуковага пункту погляду баранілі існаванне Бога», а супраць іх выступаў Вітаўт Тумаш.

Пра апошні перыяд чыннасці Беларускага студэнцкага саюза і Таварыства прыяцеляў беларусаведы ў Вільні ў архіўных зборах маюцца даволі скупыя звесткі. У архіўным зборы БСС, што захоўваецца цяпер у Менску, падзеі перадваенных гадоў адлюстраваны ў пратаколах арганізацыйных зборак, ліставаннях і віншавальных адрасах, матэрыялах іншага характару. Сёння маецца невялічкая бібліятэчка мемуараў тых, хто ў гэты час з'яўляўся актывістам БСС: Антона Шукелойця, Анэлі Катковіч, Раісы Жук-Грышкевіч, Віктара Ярмалковіча ды інш. У сваіх успамінах В. Ярмалковіч так



*Маладыя актывісты Беларускага народнага аб'яднання — Беларуская хрысціянская дэмакратыя — ля віленскай друкарні імя Ф.Скарыны. У цэнтры сядзяць айцец Віктар Шутовіч і Адольф Клімовіч. . Вільня, 1936 г. Аддзел рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі. Друкуеца ўпершыню.*

распавядае пра канец чыннасці Саюза: «З канцом чэрвеня [1939 г.] памешканне Беларускага Студэнцкага Саюза апусцела. Заклапочаныя экзаменамі, затрывожаныя палітычнымі падзеямі (ды няма ведама, што нясуць надыходзячыя дні) беларускія студэнты раз'ехаліся на свае летнія канікулы і болей ужо ў сваім Саюзе не спаткаліся. 1 верасня пачалася вайна».

Згадаем жа тых, хто у розныя гады ўваходзіў у склад кіраўніцтва БСС у Вільні:

Верасень 1920 г. — снежань 1922 гг.: Антон Абрамовіч (старшыня), Сяргей Малафееў (віцэ-старшыня), Тодар Куніцкі (сакратар), Браніслаў Туронак (скарбнік), Станіслаў Грынкевіч (вольны сябра ўрада).

Снежань 1922 г. — снежань 1923 г.: Сяргей Малафееў (старшыня), Адольф Зянюк (віцэ-старшыня), Т. Куніцкі (сакратар), Б. Туронак (скарбнік), Мікалай Марцінчык (вольны сябра ўрада).

Снежань 1923 г. — снежань 1924 г.: Янка Лабынец (старшыня), А. Зянюк (віцэ-старшыня), Т. Куніцкі (сакратар), Б. Туронак (скарбнік), М. Марцінчык (вольны сябра ўрада).

Снежань 1924 г. — лістапад 1925 г.: М. Марцінчык (старшыня), А. Зянюк (віцэ-старшыня), Баляслаў Грабінскі (сакратар), Ігнат Гагалінскі (скарбнік), Я. Лабынец (вольны сябра ўрада).

Лістапад 1925 г. — лістапад 1926 г.: І. Гагалінскі (старшыня), Язэп Жук (віцэ-старшыня), Марыя Шавель (сакратар), Язэп Ермаковіч (скарбнік), Марыя Касатая (вольны сябра ўрада).

Лістапад 1926 — люты 1927 г.: Усевалад Шыран (старшыня), Я. Ермаковіч (віцэ-старшыня), Марыя Гічанка (Гічан) (сакратар), Алена Астроўская (скарбнік), Міхась Тулейка (вольны сябра ўрада).

Люты 1927 г. — лістапад 1927 г.: А. Зянюк (старшыня), Мікалай Шкялёнак (віцэ-



*Падчас Другой беларускай каталіцкай пілігрымкі па ваколіцах Вільні. У цэнтры стаяць айцец А, Станкевіч і А. Клімовіч. Клюшчаны, 17 чэрвеня 1936 г. Друкуеца ўпершыню. Аддзел рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі*

старшыня), М. Гічанка (сакратар), М. Тулейка (скарбнік), Яўген Бартуль (вольны сябра ўрада).

Лістапад 1927 г. — кастрычнік 1928 г.: Т. Куніцкі (старшыня), І. Гагалінскі (віцэ-старшыня), Станіслаў Станкевіч (сакратар), Мікалай Амельяновіч (скарбнік), Я. Ярмаковіч (вольны сябра ўрада), Эдвард Крэчка і Я. Бартуль (кандыдаты)[34].

Кастрычнік 1928 г. — травень 1929 г.: М. Тулейка (старшыня), Янка Шутовіч (віцэ-старшыня), Анатоль Шкутка (сакратар), Я. Бартуль (скарбнік), Марыя Скурчанка (Скурко) (вольны сябра ўрада).

Травень 1929 г. — травень 1930 г.: Мікалай Шкялёнак (старшыня), Канстанцін Глінскі (віцэ-старшыня), Янка Зянюк (сакратар), І. Калоша (скарбнік), Наста Гаўрылічанка (Гаўрылік) (вольны сябра ўрада).

Травень 1930 г. — травень 1931 г.: Канстанцін Глінскі (старшыня), Зоя Каўшанка (віцэ-старшыня), Я. Бартуль (сакратар), Марыя Шавель-Зянюкова (скарбнік), С. Станкевіч (вольны сябра ўрада), М. Шкялёнак, М. Тулейка, Н. Гаўрылічанка (сябры рэвізійнай камісіі).

Травень 1931 г. — чэрвень 1932 г.: Барыс Арэнь (старшыня), Вітаўт (Вітальд) Тумаш (віцэ-старшыня), Н. Гаўрылянка (сакратар), Юры Кэпель (скарбнік), Язэп Клагіш (вольны сябра ўрада).

Чэрвень 1932 г. — снежань 1932 г.: Т. Куніцкі (старшыня), Яўген Аніська (сакратар), Язэп Малецкі і Язэп Бурак (сябры ўрада).

Снежань 1932 г. — студзень 1933 г.: Янка Давідовіч (старшыня), Марыя Мілючанка (Мілюк) (віцэ-старшыня), А. Аніська (сакратар), Віктар Войтанка (скарбнік), Пётра Першукевіч (вольны сябра ўрада).

Студзень 1933 г. — лістапад 1933 г.: А. Аніська (старшыня), М. Мілючанка (Мілюк) (віцэ-старшыня), П. Першукевіч (сакратар), В. Войтанка (скарбнік), Вера Чатырка (вольны сябра ўрада).

Лістапад 1933 г. — чэрвень 1934 г.: Ю. Кэпель (старшыня), В. Войтанка (віцэ-старшыня), В. Тумаш (сакратар), Яўген Тышкевіч (скарбнік), Пётра Радзюк (загадчык гаспадаркі), М. Мілючанка, Таццяна Матвейчык і Я. Бурак (сябры рэвізійнай камісіі).

Чэрвень 1934 г. — кастрычнік 1934 г.: В. Войтанка (старшыня), Мікалай Шчорс (сакратар), Я. Тышкевіч (скарбнік).

Кастрычнік 1934 г. — студзень 1935 г.(абраны на надзвычайным вальным сходзе ўсіх сябраў БСС): М. Шчорс (старшыня), В. Войтанка (віцэ-старшыня), Аляксандр Смаль (сакратар), Таццяна Трафімюк (скарбнік), Уладзімір Грамыка (загадчык гаспадаркі).

Студзень 1935 г. — сакавік 1935 г.: М. Шчорс (старшыня), Сяргей Сарока (віцэ-старшыня), В. Войтанка (сакратар), Т. Трафімюк (скарбнік), Міхась Якімец (загадчык гаспадаркі).

Сакавік 1935 г. — люты 1936 г.: М. Шчорс (старшыня), М. Якімец (віцэ-старшыня), Адам Дасюкевіч (сакратар), Піліп Засім (скарбнік), С. Сарока (загадчык гаспадаркі), Я. Бурак, В. Войтанка і Базыль Рубін (сябры рэвізійнай камісіі).

Люты 1936 г. — люты 1937 г.: М. Шчорс (старшыня), Б. Рубін (віцэ-старшыня), Міхась Канцэлярчык (сакратар), Ганна Сухава (скарбнік), Уладзімір Козак (загадчык гаспадаркі), В. Войтанка, М. Якімец, Бернард Стаповіч (сябры рэвізійнай камісіі).

Люты — снежань 1937 г.: А. Дасюкевіч (старшыня), М. Канцэлярчык (віцэ-старшыня), Уладзімір Клім (сакратар), Валянціна Жукоўская (скарбнік), П. Засім (загадчык гаспадаркі); Г. Сухава, Т. Трафімюк, Язэп Каліцкі (сябры рэвізійнай камісіі).

Люты 1938 г. — люты 1939 г.: А. Дасюкевіч (старшыня), Канстанцін Шышко (віцэ-старшыня), Віктар Ярмалковіч (сакратар), Т. Трафімюк (скарбнік), Часлаў Найдзюк (загадчык гаспадаркі); Вінцук Склубоўскі, Ксенія Грыгарчук, П. Засім (сябры рэвізійнай камісіі).

Люты — жнівень 1939 г.: Усевалад Кароль (старшыня), Ч. Найдзюк (віцэ-старшыня), Ніна Ляўковіч (сакратар), К. Шышко (скарбнік), Віталь Люсцібер (загадчык гаспадаркай), Мітрафан Смаршчок, Люба Марцінчык і В. Ярмалковіч (сябры рэвізійнай камісіі).

Розная доля спаткала былых сяброў Беларускага студэнцкага саюза ў Другую сусветную вайну і ў пасляваенны час. 1 лістапада 1943 г. быў расстраляны гітлераўцамі ў Паставах передапошні старшыня БСС, сціплы, працавіты патрыёт Беларусі Адам Дасюкевіч. 13 чэрвеня 1943 г. каля Васілішак на Лідчыне ад рукі невядомага бандыта загінуў былы «паступовец» у шэрагах БСС Юльян Саковіч. Некаторым з былых актывістаў Беларускага студэнцкага саюза, як Канстанціну Глінскаму, Станіславу Станкевічу, Віктару Войтанку, Леаніду Галяку, Язэпу Малецкаму, Міхасю Маскаліку, Язэпу Найдзюку, Вацлаву Пануцэвічу, Вітаўту Тумашу, Мікалаю Шчорсу, Мітрафану Смаршчку ды некаторым іншым удалося ацалець ад сталінскіх рэпрэсій дзякуючы таму, што яны не засталіся чакаць у ліпені 1944 г. прыходу савецкіх войск і разам з немцамі падаліся на Захад. У пасляваенны час, у эміграцыі, многія з іх працягвалі займацца беларускай грамадскай і культурніцкай працай, верачы ў «прышласць Беларусі». А тых, хто застаўся на бацькаўшчыне, бо не адчуваў за сабой віны перад савецкай уладай ці спадзяваўся схавацца ад «энкавэдыстаў», чакаў трагічны лёс, У пасляваенныя гады былі знішчаны савецкімі карнымі органамі Станіслаў Грынкевіч, Францішак Грышкевіч, Мікалай Шкялёнак, Пятро Бакач і іншыя беларускія патрыёты. Пашчасціла выжыць, прайшоўшы вязніцы і канцлагеры ГУЛАГу, Зоі Каўшанцы, Мар'яну Пецюкевічу, Пятру Радзюку, Віктару Склубоўскаму, Янку Шутовічу, Віктару Ярмалковічу... Гэты спіс можна працягваць доўга. Толькі адзінкам удалося згубіцца ў натоўпе і пазбегнуць «кары працоўнага народа».

*Бальшавіцкія органы бяспекі, уся савецкая ідэалагічная сістэма моцна пастараліся, каб вынішчыць сляды чыннасці Беларускага студэнцкага саюза і іншых нацыянальных студэнцкіх асяродкаў. Галоўнае, чаго яны дамагаліся, — гэта не дапусціць пераемнасці ў нацыянальнай творчай працы беларускага студэнцтва, каб досвед і здабыткі сяброў БСС не былі запатрабаваныя новым пакаленнем студэнцкай моладзі. Яны забівалі, застрашвалі ўдзельнікаў і жывых сведкаў гэтай чыннасці, імкнуліся навечна пахаваць у «спецхранах» дакументальную спадчыну гэтых арганізацый. Яны зрабілі ўсё магчымае... Але гісторыя сведчыць, што апошняе слова было не за імі.*

**Заўвагі**

[1] Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь была перайменавана ў Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку ў канцы 1922 г. — пасля ўтварэння СССР.

[2] Алесь Некрашэвіч пазней пераўтворыцца ў палітычнага рэнегата, у пачатку 1920-х гг. узначаліўшы Белдзяржвыдавецтва і «вызначыўшыся» актыўным шальмаваннем нацдэмаў. Але ад сталінскіх рэпрэсій гэта яго, тым не менш, не засцеражэ. Следчы ГПУ пазней усё роўна нагадае яму пра «нацдэмаўскае» юнацтва.

[3] Палітбюро ГПУ (Палітычнае бюро Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення)



*Беларуская каталіцкая моладзь падчас калядных святаў 1937 г. Друкуеца ўпершыню. Аддзел рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі.*

— кіраўнічы орган павятовага аддзела Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення, як тады называлася служба дзяржаўнай бяспекі ў ССРБ.

[4] Само паняцце «калабарацыянізм» стала ўжывацца пасля Другой сусветнай вайны. Яно азначала гатоўнасць грамадзяніна да супрацоўніцтва з чужым (акупацыйным) рэжымам. Калабарант — гэта чалавек, які ідзе на супрацоўніцтва з акупантам, здраднік. Упершыню дадзенае паняцце стала выкарыстоўвацца ў Францыі. Ім шальмавалі тых французаў, якія ў 1940–1945 гг. супрацоўнічалі з нямецкімі акупантамі. У сувязі з гэтым варта падкрэсліць, што адпаведна з нормамі міжнароднага права менавіта ўрад Вішы, а не генерала Шарля дэ Голя, з'яўляўся правапераемнікам Французскай Рэспублікі. Паводле французскіх законаў, якраз дэ Голь — здраднік, які перайшоў на службу іншай дзяржавы — Вялікабрытаніі, і арганізаваў падрыўную дзейнасць супраць законнага ўрада Францыі. У міжнародным праве таксама маюцца свае хітрыкі, якія дазваляюць надаць акупацыі статус законнасці. Пазней паняцце калабарацыянізму займела больш шырокае значэнне. Калабарантамі сталі называць усіх, хто ў гады Другой сусветнай вайны супрацоўнічаў з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. На сённяшні дзень «калабарацыянізм» — агульнае паняцце, ужыванае адносна людзей, якія супрацоўнічаюць з уладамі краіны, — суб'екта акупацыі або анексіі. Калабарацыянізмам лічыцца і супрацоўніцтва прадстаўніка прыгнечанага народа з урадам, які трымае ўладу, напрыклад, удзел «чорных» і «каляровых» афрыканераў (індыйцаў, кітайцаў ды іншых прадстаўнікоў азіяцкіх народаў) Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы ў кіраванні бантустанамі і служба ў паліцыі альбо прамаскоўская арыентацыя камуністычнай партакратыі ў краінах Балтыі. Можна канстатаваць, што «калабарацыянізм» не ёсць ні навуковым, ні юрыдычным, ні нават паліталагічным тэрмінам і не мае дакладнага вызначэння. Гэта дазваляе ўжываць яго адвольна. Акупацыя і анексія, як і зняволенасць народа, — рэальныя станы грамадства. Яны несправядлівыя, аднак жа існавалі і працягваюць існаваць дзякуючы праву моцнага. Гэта вымушае паняволены народ уваходзіць у пэўныя зносіны з дзяржавай, якая яго зняволіла. Калі чапляцца да словаў, то і гэткія кантакты можна назваць калабарацыянізмам, аднак падобная трактоўка вядзе да абсурду. У СССР сотні тысяч людзей, якія апынуліся ў зоне нямецкай акупацыі, абвінавачваліся ў калабарацыянізме адно за тое, што яны працавалі, каб пракарміць сябе, і мусілі з сваіх заробкаў плаціць падаткі акупацыйным уладам. Людзям, якія жылі на акупаванай тэрыторыі, чыніліся перашкоды ў ажыццяўленні іх права на вучобу і працу. Паколькі тэрмін «калабарацыянізм» мае ў першую чаргу ацэначны характар, ён набывае і рознае тлумачэнне. Сваю ролю тут адыгрывае ступень этнічнага самаўсведамлення народа, тып культуры, узровень адукаванасці і пэўныя каштоўнасныя арыентацыі, а таксама час пражывання пад чужою ўладай, які так або інакш уплывае на ўсе гэтыя фактары. Чым даўжэйшая акупацыя, тым шырэйшае робіцца кола кантактаў, неабходных для існавання. Іншымі словамі, межы калабарацыянізму звужаюцца з падаўжэннем тэрміну акупацыі. Тое, што будзе калабарацыянізмам праз месяц пасля пачатку акупацыі, не абавязкова лічыцца ім пасля пяцідзесяці гадоў акупацыі. На пытанне, ці можа калабарацыянізм як з'ява знікнуць праз нейкі перыяд анексіі, можна адказаць станоўча. Гэткая сітуацыя паўстае, калі заняволены народ цалкам асіміляваны або знішчаны.

[5] Паводле афіцыйных дадзеных, у Заходняй Беларусі падчас ваенных падзей 1915–1920 гг. было разбурана каля 600 тыс. будынкаў. Польскі сейм законам ад 28 лютага 1919 г. абавязваў урад выдаваць за кошт дзяржавы будаўнічы матэрыял на адбудову знішчаных у час ваенных дзеянняў жылых будынкаў і гаспадарчых пабудоў, а законам ад 18 ліпеня 1919 г. уводзілася палажэнне, паводле якога дзяржаўная дапамога магла адбывацца як у форме выдачы незваротнай субсідыі, так і праз крэдытаванне. Гэтыя прававыя акты не рабілі розніцы паміж жыхарамі розных рэгіёнаў Польшчы, а таксама паміж прадстаўнікамі польскай і няпольскай нацыянальнасці. Але на практыцы атрымаць будаўнічыя матэрыялы і дзяржаўныя субсідыі сялянам-беларусам было значна складаней, чым палякам. Так, будаўнічы лес выдаваўся ў першую чаргу вайсковым асаднікам, а беларусы часта чакалі яго гадамі.

[6] Гэта было звязана з тым, што 15 сакавіка 1923 г. упаўнаважаная Лігай Нацый Парыжская канферэнцыя амбасадараў Вялікабрытаніі, Італіі і Японіі пад старшынствам міністра замежных спраў Францыі зацвердзіла польска-літоўскую дзяржаўную мяжу і юрыдычна замацавала прыналежнасць Віленшчыны да Польшчы. Гэтая пастанова ў якасці дадатковага пратакола была далучана да Версальскай мірнай дамовы 1920 г.

[7] Супрацоўніца Галоўнай управы ТБШ у 1924–1928 гг. Надзея Шнаркевічава падае, што ў 1927 г. дзейнічала каля 500 гурткоў Таварыства.

[8] У польскіх шавіністаў асоба А. Луцкевіча выклікала, бадай, найбольшую нянавісць сярод усіх беларускіх палітыкаў. Узгадваючы пра А. Луцкевіча, яны дадавалі да яго прозвішча абразлівае азначэнне «масонскі біскуп», падкрэсліваючы гэтым яго бязбожнасць, сацыялістычныя перакананні і прыналежнасць да масонства.

[9] З успамінаў яго жонкі, Надзеі Васільевай.

[10] Міхась Казлоўскі сцвярджае, што падчас арышту Р. Семашкевіча энкавэдыстамі было забрана ў яго каля 300 карцін.

[11] Трэба сказаць, што габрэйскія студэнты Віленскага ўніверсітэта фактычна жылі ва ўмовах гета: асобна сядзелі на лекцыях, асобна харчаваліся, асобна пражывалі ад астатніх студэнтаў. У знак пратэсту супраць гэтай этнічнай сегрэгацыі сябра Беларускага студэнцкага саюза Усевалад Кароль падчас лекцый дэманстратыўна садзіўся з габрэйскімі студэнтамі за адну лаву, тым самым выказваючы ім сваю маральную падтрымку і салідарнасць.

[12] Акрамя беларускамоўных гімназій, у Заходняй Беларусі ў розны час дзейнічалі беларускія настаўніцкія курсы і семінарыі, меўшыя статус сярэдніх навучальных устаноў (у 1920–1921 гг. такія настаўніцкія курсы (семінарыі) кароткі час фунцыянавалі ў Будславе і Вільні, а ў пачатку 1930-х гг. у Вільні дзейнічала Беларуская настаўніцкая семінарыя імя Ф. Багушэвіча). Але іх чыннасць была кароткатэрміновай, таму яны не пакінулі за сабой заўважнага следу ў справе ўзгадавання моладзі і ўвогуле ў гісторыі беларускага маладзёвага руху.

[13] Гарадзенская беларуская гімназія, якая ўзнікла ў 1920 г., была зачынена ў 1922 г., пасля таго, як польскія ўлады пад выглядам барацьбы з палітычным тэрарызмам і антыдзяржаўнай дзейнасцю пайшлі на ліквідацыю ў горадзе амаль усіх беларускіх грамадскіх інстытуцый. Беларуская гімназія ў мястэчку Гарадок Вілейскага павета паўстала ў лістападзе 1920 г. з дазволу ваеннага камандавання 6-га польскага стралецкага палка і мясцовай цывільнай адміністрацыі. З-за матэрыяльных цяжкасцяў у 1923/24 навучальным годзе гімназія спыніла сваё існаванне. Пасля таго, як не ўдалося знайсці неабходнага для заняткаў памяшкання, педагагічная рада Нясвіжскай беларускай гімназіі, скарыстаўшы са здабытай канцэсіі на арганізацыю сярэдняй школы ў Клецку, вырашыла перавесці гімназію ў гэты горад. З 1924 г. замест Нясвіжскай пачала функцыянаваць Клецкая беларуская гімназія.

[14] У 1921 г. урадам Чэхаславакіі для выпускнікоў беларускіх школ з Віленшчыны, Гарадзеншчыны і Дзвіншчыны было выдзелена 25 стыпендый, у 1922 г. — каля 50, а ў 1923 г. — каля 100.

[15] Трэба адзначыць, што пасля атрымання вышэйшай адукацыі Мікалай Ільяшэвіч, Барыс Кіта і Вінцэнт Жук-Грышкевіч працавалі ў ВБГ у якасці выкладчыкаў.

[16] Паводле іншых звестак, школа пачала функцыянаваць яшчэ ў 1916 г., але гэта

была пачатковая школа павышанага тыпу. Статус сярэдняй навучальнай установы яна атрымала толькі 25 траўня 1919 г.

[17] На канец 1922/23 навучальнага года з 281 вучняў НБГ 127 з'яўляліся беларусамі, 133 — габрэямі і 1 —«русскими».

[18] Трэба сказаць, што і фундатар гімназіі Г. Жаўняркевіч, і яе дырэктар К. Шчансновіч прыхільна ставіліся да беларускай справы і да беларусізацыі школы. Узгадаем, што сын К. Шчансновіча, Палікарп, быў вядомым беларускім культурнікам, які далучыўся да нацыянальнага руху яшчэ ў студэнцкія гады ў пачатку XX ст.

[19] У цэлым у міжваеннай Польшчы доля беларускіх студэнтаў у яе вышэйшых навучальных установах не перавышала 0,5%.

[20] Напрыклад, паводле палажэння ўзору 1933 г. і 1937 г. рэгіянальныя студэнцкія карпарацыі не мелі права быць паўнамоцнымі ці асацыяванымі сябрамі замежных і міжнародных студэнцкіх арганізацый.

[21] У статуце кожнай студэнцкай карпарацыі, акрамя мэтаў і задачаў, агаворвалася яе арганізацыйная структура. Старшыню, урад (управу), рэвізійную камісію ды іншыя кіраўнічыя органы арганізацыі павінны былі абіраць на агульным сходзе большасцю галасоў. Да кампетэнцыі ўправы адносіліся выканаўчыя і прадстаўнічыя функцыі. На рэвізійную камісію ўскладаліся абавязкі праверкі і кантролю чыннасці ўрада. Спрэчныя пытанні, якія ўзнікалі ў арганізацыі, вырашаў, як правіла, «каляжанскі суд гонару». Паводле пастановы сената УСБ, кожнае студэнцкае таварыства павінна было мець свайго куратара з ліку аўтарытэтных выкладчыкаў ці прафесараў універсітэта, якія здзяйснялі нагляд за чыннасцю карпарацыі, каб яна не выходзіла за вызначаныя прававыя і арганізацыйныя рамкі зацверджанага статута. Кандыдатуру куратара маглі прапаноўваць і самі студэнты, але зацвярджаць яе павінен быў універсітэцкі сенат.

[22] Беларускі студэнцкі саюз увесь час імкнуўся адстойваць свой нейтралітэт у палітычным супрацьстаянні розных палітычных груповак, каб не дапусціць арганізацыйнага расцярушвання сваіх шэрагаў паводле партыйнай адзнакі. «Саюз, — адзначалася ў заяве кіраўніцтва БСС у 1935 г., — існуе з мэтай згуртаваць студэнтаў-беларусаў ва УСБ у адну сям'ю ў супольным перамаганні перашкод матэрыяльнага і духовага характару для здабыванні вышэйшай асветы, каб прыгатавацца да якой больш прадуктыўнай працы для сваёй Бацькаўшчыны… І таму, пакідаючы індывідуальную свабоду сваім сябрам у іх палітычных поглядах, Саюз востра змагаецца з накідваннем поглядаў нейкай палітычнай групы на ўсю арганізацыю».

[23] Пад «уваскрошанымі суседзямі» аўтар разумеў дзяржаўныя ўлады і шавіністычныя грамадскія колы Польшчы.

[24] Адначасова Э. Кашмідэр з'яўляўся куратарам яшчэ аднаго беларускага студэнцкага гуртка — Таварыства прыяцеляў беларусаведы.

[25] Капелюшы былі круглай формы з белага аксаміту. На версе анфаснага боку капелюша былі замацаваныя залатыя літары «БСС», абведзеныя залатымі каласамі, а абвод выкананы ў бел-чырвона-белых колерах, узятых у чорнае абрамленне.

[26] Саюз віленскіх літоўскіх студэнтаў узнік у УСБ у 1926 г. У 1929 г. згуртаванне ўзначальваў І. Блажыс. Дзякуючы фінансавай падтрымцы ўрада і грамадскасці Ковенскай Літвы, згуртаванне стварыла багатую на выданні бібліятэку (звыш 1000 кніг), наладзіла на добрым узроўні працу драматычнай, літаратурна-навуковай, спартовай і жаночай секцый. У 1928 г. быў заснаваны Гурток студэнтаў-украінцаў у Вільні (у складзе 33 чалавек), якому з-за адсутнасці доўгі час уласнай сядзібы даў прытулак БСС. Першым старшынёй гэтага згуртавання быў абраны Іван Рудакевіч.

[27] Першым, хто высунуў ідэю аб стварэнні супольнай беларуска-літоўска-ўкраінскай студэнцкай «меншасцёвай» арганізацыі, быў Міхась Тулейка (Т. М.), апублікаваўшы ў рубрыцы «Вольная трыбуна» часопіса «Студэнцкая думка» (1928 г., № 3) артыкул па гэтым пытанні.

[28] Трэба сказаць, што не абыйшлося без «штрэйкбрэхераў» з боку беларусаў, якімі аказаліся 5 «інтэрнацыяналістаў», парушыўшых папярэднюю дамоўленасць.

[29] Першы сумесны таварыскі студэнцкі вечар беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх студэнтаў адбыўся 10 лютага 1929 г.

[30] У 1933 г. гэтае даследаванне М. Пецюкевіча пад грыфам Таварыства прыяцеляў беларусаведы пры УСБ у Вільні выйдзе пад назовам «Увагі дзеля запісаваньня беларускай народнай творчасьці і абрадаў».

[31] Трэба сказаць, што сябры ТПБ не былі піянерамі ў гэтай справе. Першымі, хто яшчэ ў 1909 г. распачаў збор беларускіх гаворак, песняў і іншых элементаў народнай творчасці на Віленшчыне, было папярэдняе пакаленне беларускай студэнцкай і вучнёўскай моладзі.

[32] Як вядома, Янка Купала пасля спробы суіцыду застаўся жывы.

[33] Дзеля аб'ектыўнасці варта адзначыць, што некаторыя культурна-асветныя мерапрыемствы сябраў названых «зямляцтваў» мелі пэўную карысць. Напрыклад, актывісты Гарадзенскага студэнцкага зямляцтва А. Драбняк і Т. Бянецкі ўлетку 1935 г. удзельнічалі ў прапагандысцкіх асветных экспедыцыях па Віленшчыне, якія арганізавалі польскія «крэсовыя» студэнцкія арганізацыі. У Шчучынскім павеце Навагрудскага ваяводства названыя студэнты правялі каля 50 тлумачальных гутарак з тутэйшымі жыхарамі на тэмы карысці прытрымлівання нормаў асабістай гігіены, аб шкодзе п'янства, аб прафілактыцы і лячэнні сухотаў і венерычных захворванняў ды інш.

[34] У сакавіку1928 г. Тодар Куніцкі адмовіўся ад старшынства ў БСС. Замест яго быў абраны Ігнат Гагалінскі.

## Архіўныя крыніцы

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь

Ф. 4. Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі Беларусі. 1917–1991.

Ф. 42. Народны камісарыят асветы БССР. 1917–1941.

Ф. 221. Менскі інстытут народнай адукацыі. 1919–1922.

Ф. 325. Рада Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі. 1917–1925.

Ф. 879. Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні. 1919–1938.

Ф. 880. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. 1925–1938.

Ф. 883. Таварыства беларускай школы. 1921–1938.

Ф. 884. Беларускі студэнцкі саюз у Вільні. 1920–1939.

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва

Ф. 3. Калекцыя дакументаў Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні. 1906–1944.

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці

Ф. 322. Мінскі гарадскі аддзел народнай адукацыі. 1919–1941.

Ф. 406. Беларускае навукова-літаратурнае таварыства ў Барысаве. 1919–1926.

Цэнтральная навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі імя Якуба Коласа. Аддзел рукапісаў і старадрукаў

Ф. 4. Калекцыя дакументаў Янкі Шутовіча.

Ф. 5. Калекцыя дакументаў Адольфа Клімовіча.

Ф. 23. Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры. Воп.1.

Lietuvos centrinis valstybės archyvas

F. 172. Кураторыюм Віленскай школьнай акругі. 1918–1939.

F. 175. Віленскі ўніверсітэт Стэфана Баторыя. 1919–1939.

F. 582. Рада Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі. 1917–1938.

F. 905. Віленская беларуская гімназія. 1919–1944.

Archiwum Akt Nowych w Warszawie

Фонд Таварыства стражы крэсовай (Akta Towarzystwa Straży Kresowej) (1919–1922).

Lietuvos mokslų akademijos Vrublievskių biblioteka. Rankraščių skyrius.

F. 21. Калекцыя дакументаў Беларускага музея імя І. Луцкевіча (1905–1944).

## Апублікаваныя зборы дакументаў і статыстычных матэрыялаў

Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі / Уклад. С. Шупа. Т. 1. Кн. 1–2. Вільня–Менск–Нью-Ёрк–Прага, 1998.

Заходняя Беларусь на лаве падсудных: Процэс Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады 23 лютага — 22 мая 1928 г. Менск, 1929.

Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918–1945: Сб. документов. В 2 ч. Ч. 1. 1918–1928 / Сост. Н. С. Сташкевич и др. Минск, 1990.

Слуцкі збройны чын у дакумэнтах і ўспамінах / Укл. А. Гесь, У. Ляхоўскі, У. Міхнюк. 2-ое выд. Мінск, 2006.

Гадавікі газет і часопісаў, зборнікі і альманахі, адкуль былі выкарыстаныя паведамленні прэсы

Бацькаўшчына (Мюнхен), 1947–1969.

Беларус (Нью-Ёрк), 1954–1972.

Беларуская газэта (Менск), 1941–1944.

Biełaruskaja Krynica (Беларуская крыніца) (у 1917–1925 гг. мела назву «Krynica»; Петраград–Менск–Вільня), 1917–1939.

Беларуская ніва (Вільня), 1924–1925.

Беларуская студэнцкая думка (Вільня), 1924–1935.

Беларускі дзень (Вільня), 1927–1928.

Беларускі звон (Вільня), 1921–1922.

Беларускі каляндар на 1921 год. Вільня, 1921.

Беларускі календар на 1923 год. Вільня, б. г.

Беларускі каляндар на 1924 год. Вільня, 1924.

Беларускі каляндар на 1927 год. Вільня, 1927.

Беларускі каляндар на 1929 год. Вільня, 1929.

Беларускі каляндар на 1921 год Таварыства беларускай школы. Вільня, 1921.

Беларускі студэнт (Прага), 1923–1924.

Беларускі фронт (Вільня), 1936–1939.

Бюлетэнь Пасольскага Клюбу Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады. Вільня, 1925.

Вольная думка (Вільня), 1929.

Вучнёўскі звон (Вільня), 1929.

Жыцьцё беларуса (Вільня), 1923–1924.

Заходняя Беларусь. Зборнік грамадзкае мысьлі, літаратуры, ма-

стацтва Заходняй Беларусі. Вільня, 1924.

Калосьсе (Вільня), 1934–1938.

Летапіс Таварыства беларускай школы (Вільня) (Беларускі летапіс), 1931–1936.

Маладое жыцьцё (Вільня), 1921–1922.

Наперад (Вільня), 1929–1930.

Народны звон (Вільня), 1926–1927.

Наш шлях (Вільня), 1922.

Наша думка (Вільня), 1920–1921.

Новая варта (Вільня), 1931–1934.

Новы прамень (Прага), 1926.

Перавясла (Прага), 1923.

Прамень (Прага), 1925.

Раніца (Санкт-Пецярбург), 1914.

Родны край (Вільня), 1934.

Савецкая Беларусь (Менск), 1921–1929.

Шлях моладзі (Вільня), 1929–1938.

Almanach szkolnictwa Ziemi Wileńskej 1919–1925. Wilno, 1925.

25 Sakawika: Časopiś biełaruskich studentaŭ. 1936–1938.

### Мемуары, дзённікі і аўтабіяграфічныя матэрыялы

А. Н. [А. Луцкевіч]. 1-я Віленская Беларуская Гімназія // Наша думка. 1921. 27 траўня.

Багдановіч Я. На жыццёвым шляху. Мінск, 1992.

Галяк Л. Успаміны. Кн. 1. Б. м. (ЗША), 1982.

Ганчарык М. Шлях ад пачатку стагоддзя. Успаміны. Мінск, 2003.

Жук-Грышкевіч Р. Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні // Czasopis. 2002. № 6.

З. Б. [Бядуля З.]. Думкі беларускага адраджэнца // Савецкая Беларусь. 1923. 10 траўня.

Катковіч А., Катковіч-Клентак В. Успаміны. Беласток, 1999.

Летапіс Віленскай беларускай гімназіі. 1919–1944 // Спадчына. 1999. №1.

Луцкевіч Л. Вандроўкі па Вільні. Вільня, 1998.

Муха-Мухновский Г. М. Пути-дороги. Минск, 1973.

Новік-Пяюн С. Гісторыя Нясвіжска-Клецкай беларускай гімназіі // Настаўніцкая газета. 1995. 28 студзеня.

Орехво Н. С. Дела и люди КПЗБ. Минск, 1983.

Пецюкевіч М. У пошуках зачараваных скарбаў. Вільня, 1998.

С.-Ш. Л. [Сівіцкая–Шантыр Л.]. Успаміны аб «Гарадзенскім гуртку беларускай моладзі» // Студэнская думка. 1925. № 3(4) – 4(5).

Станкевіч Я. За родную мову й праўдзівы назоў. Вільня, 2006.

Шнаркевіч Н. Успаміны з працы ў Таварыстве беларускай школы ў Вільні (1924–1930 гады) // Рунь (Вільня). 1997. № 4, 6.

Шукелойц А. На 65-я ўгодкі Беларускага студэнцкага саюзу // Беларус. 1986. № 328.

### Манаграфіі, брашуры, зборнікі

Адамовіч А. Беларусы ў Літве: учора і сёння. Кн. 1. Вільня, 2010.

Арэхва М. С. Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі. Мінск, 1958.

Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Менск, 1928.

Вабішчэвіч А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Брэст, 2004.

Вихрев А. А. Борьба комсомола Западной Белоруссии за экономические и политические интересы трудящейся молодёжи. Минск, 1971.

Воткович Г. Б. КПЗБ в борьбе за интернациональное единство трудящихся (1929–1933 гг.). Минск, 1975.

Вяртанне да сваіх: Станіслаў Грынкевіч, Франук Грышкевіч, Уладыслаў Казлоўшчык / Прадмова, укладанне і каментарыі С. Чыгрына. Беласток, 1999.

Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск–Мюнхен, 1999.

Даніловіч В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.). Мінск, 2007.

Жук-Грышкевіч Р. Жыцьцё Вінцэнта Жук-Грышкевіча. Таронта, 1993.

Казлоўскі М. Нашчадак слаўных крывічоў. Эцюд да партрэта Адольфа Клімовіча, чалавека і грамадзяніна. Мінск, 2008.

Калубовіч А. Крокі гісторыі: Дасьледаваньні, артыкулы, успаміны. Беласток–Вільня–Мінск, 1993.

Кривуть В. И. Молодёжные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.). Минск, 2008.

Луцкевіч А. Барацьба за вызваленьне / Укл. А. Сідарэвіч. Вільня, 2009.

Лыч Л. Беларуская нацыя і мова: Літаратурна-гістарычныя артыкулы. Мінск, 1994.

Мірановіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. Санкт-Пецярбург, 2003.

Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня. Менск, 1993.

Пазьняк З. Гутаркі з Антонам Шукелойцем. Варшава, 2003.

Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Мінск, 1967.

Пашкевіч А. В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы

# Бібліяграфічны спіс выкарыстаных архіўных і літаратурных крыніц

(1921–1930 гг.) / Дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук. Мінск, 2006.

Пяцюкевіч М. Увагі дзеля запісаваньня беларускае народнае творчасьці і абрадаў. Вільня, 1933.

Скарыніч Б. [Станкевіч Я.]. Нашто і як зьбіраці географічныя і асабовыя назовы беларускія. Вільня, 1931.

Станкевіч Я. «Апытальнік да запісывання дыялектычных асаблівасцяў крывіцкага (беларускага) языка». Вільня, 1931.

Станкевіч А. З Богам да Беларусі: Збор твораў / Уклад. А. Вашкевіч і А. Пашкевіч. Вільня, 2008.

Токць С. М. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Мінск, 2007.

Туронак Ю. Людзі СБМ. Вільня, 2006.

Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня, 2006.

Чэмер А. Наваградзкая беларуская гімназія. Вільня, 1997.

Moroz M. «Krynica». Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu. Białystok, 2001.

Z dziejów Almae Matris Vilnensis. Księga pamiątkowa ku czci 400-lecia założenia i 75-lecia wskrzeszenia Uniwersytetu Wileńskiego / Pod red. L. Piechnika i K. Puchowskiego. Kraków, 1996.

## Публікацыі і артыкулы ў зборніках, альманахах і перыядычных выданнях

Беларускі партызан: Месячная безпартыйная часопісь змагароў за Бацькаўшчыну // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1994. Z. 1.

В-іч А. [Бартуль Я.] Беларускі студэнскі саюз за дзесяць год існаваньня // Студэнская думка. 1930. № 3(14).

Вабішчэвіч А. Беларускія гімназіі ў культурна-асветніцкім і грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі (1920–1930-я гг.) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2002. Z. 18.

Васілеўскі Ю (Чудзін Ю.). Беларусы на абшарах Расіі // Голас Радзімы. 1994. № 30–34.

Вашкевіч А. Вацлаў Пануцэвіч у Беларусі амаль невядомы // Куфэрак Віленшчыны. 2002. № 2 (7). С. 41–48.

Вашкевіч А. Яшчэ раз пра Вацлава Пануцэвіча // Куфэрак Віленшчыны. 2004. № 1(9).

Гесь А. Калінінская акруга: хроніка беларускага жыцьця 1920-х гадоў // Спадчына. 2001. № 3.

Грыб Т. Мэты і заданьні АБСА // Студэнская думка. 1928. № 1 (8).

Екабсонс Э. Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах // Беларуская дыяспара як пасрэдніца ў дыялогу цывілізацый: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый». Мінск, 2001.

Летапіс Беларускага студэнскага саюзу пры Ўнівэрсітэце Сьцяпана Батуры ў Вільні. (Агляд дзейнасьці БСС за час ад 23 лістапада 1920 г. да 25 чэрвеня 1935 г. // Студэнская думка. 1935. № 1 (15). С. 24–29.

Клімовіч А. Беларускае студэнцтва ў жыцьці міжнародным // Студэнская думка. 1928. № 1 (8).

Клімовіч А. Студэнскім шляхам // Студэнская думка. 1929. № 1 (11).

Лаўскі В. З жыцьця беларускага студэнцтва на чужыне // Студэнская думка. 1928. № 1 (8).

Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. Вільня–Беласток, 2010.

Лялькоў І. Да пытання аб пранямецкіх і антысавецкіх настроях у БССР перад ІІ сусветнай вайной // Беларускі гістарычны агляд. Т. 9. 2007. Сш. 1–2 (16–17).

Ляхоўскі У, Стужынская Н. Абуджаныя Слуцкім паўстаннем // Спадчына. 1998. № 3.

Ляхоўскі У. Беларускі жаночы рух у першай палове ХХ ст. // Супольнасьць. Бюлетэнь для беларускіх няўрадавых арганізацыяў. 1998. Вып. 1–2 (3–4).

Ляхоўскі У. В. Апошні перыяд дзейнасці Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1914–1919 гг.) // Мастацкая спадчына Нясвіжа. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, 12 мая 2006 г. Нясвіж, 2006.

Ляхоўскі У. В. Прадвеснік Адраджэння // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 11.

Ляхоўскі У. Беларускі маладзёвы рух у пачатку ХХ ст. // Спадчына. 2009. № 1.

Орэлэцькій В. Украінска-беларускія студэнскія ўзаемаадносіны // Студэнская думка. 1928. № 3 (10).

Рудовіч С. Рух за беларускую дзяржаўнасць і праблема грамадзянскага статусу беларускай мовы ў 1915–1918 гг. // Край=Kraj (Магілёў). 2001. № 1–2.

Рудовіч С. У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917–1918 гг. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік

навуковых прац / Уклад. І. А. Пушкін. Магілёў, 2001.

Серпухаў У. Беларускі студэнцкі саюз у Вільні — асяроддзе выхавання беларускай моладзі (1920–1939) // Гісторыя: праблемы выкладання. 2007. № 11.

Серпухаў У. Дзейнасць вучнёўскіх гурткоў Віленскай беларускай гімназіі // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3: Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. 2007. № 2.

Серпухаў У. Матэрыялы аб дзейнасці беларускіх вучнёўскіх і студэнцкіх арганізацый Вільні ў 1919–1939 гг. у фондах Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва // Архівы і справаводства. 2008. № 5.

Серпухаў У. Беларускія студэнцкія арганізацыі Віленскага універсітэта (1919–1939) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Z. 28. 2008. S. 54–68.

Сидоревич А. Антон Луцкевич: Главы из книги // Нёман. 1990. № 7.

Станкевіч С. СІЕ і ўдзел у ім беларускага студэнцтва // Студэнская думка. 1930. № 2 (13).

Станкевіч С. Гісторыя беларускага студэнскага руху // Студэнская думка. 1930. № 3 (10).

Głogowska H. Materiały do historii Białoruskiego Związku Akademickiego (Biełaruskaha Studenckaha Sajuzu) (1921–1939) // Pogranicze polsko-litewsko-białoruskie. Źródła historyczne, stan badań. Materiały z konferencji / Red. M. Kietlińskego. Białystok, 2003.

Papucevič V. Sutnaść novaje demakracyi // 25 Sakavika. 1938. № 2.

Siemakowicz M. Organizacja szkolnictwa dla ludności białoruskiej w II Rzeczypospolitej // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Z. 12. 1999.

Siemakowicz M. Organizacja białoruskich gimnazjów nauczycielskich w II Rzeczypospolitej // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Z. 11. 1999.

Sławińska I. Uniwersytet Stefana Batorego wszechnica otwarta i europejska // Z dziejów Almae Matris Vilnensis. Księga pamiątkowa ku czci 400 lecia założenia i 75 lecia wskrzesienia Uniwersytetu Wileńskiego. Kraków, 1996. S. 247–255.

## Выкарыстаныя энцыклапедычныя і даведачныя выданні

Беларускія пісьменікі. Біябібліяграфічны слоўнік. У 5-ці тамах. Мінск, 1993–1995.

Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя: Жыццярысы. Мартыралогія. Успаміны / Уклад. Ю. Гарбінскага. Мінск–Мюнхен, 1999.

Пяткевіч А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна, 2000.

Чарнякевіч А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909–1939 гг. (Біяграфічны даведнік). Мінск, 2003.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6-ці тамах. Мінск, 1993–2003.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5-ці тамах. Мінск, 1983–1987.

Ілюстрацыі да нумара падабраныя Уладзімірам Ляхоўскім

**Шаноўныя аўтары «Спадчыны»!**

Рэдакцыя часопіса будзе шчыра ўдзячная за выкананне нашых пажаданняў пры падачы матэрыялаў.

Тэкст у кампутарным наборы ў рэдактары Word, фармаце файла rtf падаецца ў рэдакцыю па дамоўленасці (тэл. 968-79-73) на дыскеце або па электроннай пошце p_university@open.by. Пажадана пазбягаць формы машынапісу. Карэспандэнцыю дасылаць на адрас: вул. Я.Коласа, 25/1-1, Мінск, 220013, Рэспубліка Беларусь.

Параметры набору: гарнітура Times, кегель 10 (асноўны тэкст) і 8 (спасылкі напрыканцы тэксту). Загалоўкі друкуюцца вялікімі літарамі, кегель 14, або малымі, кегель 16.

Увага! Матэрыялы мусяць быць ілюстраваныя (электронны выгляд або якасныя адбіткі).

Напрыканцы падаецца імя, імя па бацьку і прозвішча аўтара. Для зручнасці камунікацыі з чытачамі рэдакцыя прапануе паведамляць пры артыкулах электронны адрас аўтараў, а для патрэбаў рэдакцыі ў допісах дасылаць тэлефон і паштовы адрас.

У Інтэрнэце «Спадчыну» можна чытаць: http://kamunikat.fontel.net/spadczyna.htm